Л.С.Марціновіч Т.У.Юрэвіч Л.У.Іўліева

# СЦЯЖЫНКА



Л. С. Марціновіч
Т. У. Юрэвіч
Л. У. Іўліева

# СЦЯЖЫНКА

Мінск «Народная асвета» 1994

ББК 74.100.5
М29
УДК 373.24 (072)

**Марціновіч Л. С. і інш.**

М29 Сцяжынка / Л. С. Марціновіч, Т. У. Юрэвіч, Л. У. Іўліева. — Мн.: Нар. асвета, 1994. — 319 с.

ISBN 5-341-01123-6.

Прапануецца багаты па зместу і форме пазнавальны матэрыял (тэксты па азнаямленню з навакольным светам, казкі, вершы, апавяданні, загадкі і г. д.), якія можна выкарыстоўваць пры навучанні і выхаванні дзяцей дашкольнага ўзросту.

Адрасуецца выхавальнікам дзіцячых садоў і бацькам.

**М $\frac{3730240000 - 043}{М\ 303\ (03) - 94}$ 143 — 94** **ББК 74.100.5**

**ISBN 5-341-01123-6**

© Л. С. Марціновіч, Т. У. Юрэвіч, Л. У. Іўліева, 1994

# СЛОВА ДА ВЫХАВАЛЬНІКАЎ

Дарагія сябры! Для вас мы склалі гэту кнігу, для вашых выхаванцаў — самых маленькіх і крыху большых. Нам, аўтарам, хацелася б, каб кніга вам спадабалася, каб яна дапамагала вам выхоўваць дзяцей добрымі, разумнымі, дапытлівымі, цярплівымі і ўважлівымі да ўсяго жывога. Мы спадзяёмся, што гэта кніга дапаможа вам абуджаць у дзяцей любоў да свайго краю, яго прыроды, мовы.

Мы, аўтары, самі педагогі, любім сваю прафесію, дзяцей, родную мову. І нам здаецца, што наша кніга дасць вам магчымасць адчуць красу і багацце беларускай мовы, падвучыць яе (калі вы не вельмі добра валодаеце ёю), а дзецям навучыцца прыгожа гаварыць па-беларуску. Кніга знаёміць з вершамі, казкамі, легендамі, апавяданнямі, прыказкамі, загадкамі, са з'явамі навакольнага свету, яго тайнамі і загадкамі. Мяркуем, што гэты матэрыял прыдатны для таго, каб вучыць дзяцей здзіўляцца і захапляцца, задумвацца і разважаць, шукаць адгадкі і знаходзіць іх. У вас будзе магчымасць спяваць з дзецьмі беларускія песні, ладзіць гульні, разгадваць загадкі, развучваць і дэкламаваць з выхаванцамі вершы, ставіць спектаклі, шукаць разам адказы на розныя пытанні, адзначаць святы. Вы пераканаецеся, што можна даволі хутка і проста загаварыць на беларускай мове. І яшчэ кніга дасць вам веру, што вы зможаце выгадаваць добрага чалавека. І адначасова абудзіць веру дзіцяці, што яно вырасце добрым, патрэбным на зямлі чалавекам.

Выхаванне дзяцей павінна грунтавацца на роднай мове, на роднай гісторыі, на родным фальклоры і літаратуры, на родных традыцыях. Таму мы стараліся зрабіць кнігу багатай па зместу і дыяпазону. Разнастайнасць тэм, матэрыялу

спрыяе шматграннасці ўздзеяння на дзіця. Кожная тэма па-свойму ўзбагачае яго ўнутраны свет, стварае сваю атмасферу. Неабходна імкнуцца да таго, каб гэта была яшчэ і цёплая, загадкавая атмасфера, у якой маленькі чалавек чакае цуду і адкрывае гэты цуд. З боку педагога не павінна быць ніякіх папрокаў ці незадаволенасці рэакцыяй дзіцяці. І дарослы і малы — супрацоўнікі, творцы і сябры.

Кажуць, што далікатнасць, талерантнасць, дабрыня — характэрныя рысы беларуса. Паверым у гэта і праявім гэтыя рысы ў выхаванні нашых дзяцей. І няхай натхняе нас у працы «Малітва», напісаная Наталляй Арсенневай.

Магутны Божа, Уладар Сусветаў,
Вялікіх сонцаў і сэрц малых!
Над Беларуссю ціхай і ветлай,
Рассып праменне свае хвалы.

Дай спор у працы будняй і шэрай,
На хлеб штодзённы, на родны край,
Павагу, сілу і веліч веры
У нашу праўду, у прышласць — дай!

Дай урадлівасць жытнёвым нівам,
Учынкам нашым пашлі ўмалот,
Зрабі магутнай, зрабі шчаслівай
Краіну нашу і наш народ!

*Дзень добры, жвавая сцяжынка!*
*Па ёй і хлопчык, і дзяўчынка*
*Бягуць у край цудоўны ведаў,*
*Каб у жыцці было менш бедаў.*

# МЫ ПАЗНАЁМ СВЕТ

У гэты раздзел увайшлі тэксты, якія знаёмяць дзяцей з навакольным светам. Безумоўна, многае з таго, пра што гаворыцца ў тэкстах, дзецям вядома. Але яны не ведаюць ці слаба ведаюць беларускую мову. Таму тэксты напісаны ў размоўным стылі, з паўторам асобных слоў і граматычных канструкцый.

Як вядома, слуханне і разуменне — гэта першая ступень авалодвання мовай. Таму, калі дзеці слухаюць выхавальніка, яны вучацца разумець пачутае, вучацца гаварыць па-беларуску.

Пажадана, каб педагог не чытаў тэксты, а расказваў іх, каб лагічна даносіў думку, каб мова яго была прыгожая і мастацкі выразная, каб сваім голасам, інтанацыяй, зацікаўленасцю ў тым, пра што ён гаворыць, адухаўляў даволі звычайныя (хоць і вельмі патрэбныя) звесткі з гэтага раздзела кнігі.

Прыказкі, вершы і пытанні-падказкі дапамогуць педагогу быць цікавым субяседнікам, канцэнтраваць увагу выхаванцаў на асноўным, уцягваць усіх дзяцей у гутарку, вучыць іх лагічна думаць, рабіць высновы і абагульненні.

Змест і форма тэкстаў, умелая падача іх педагогам фармуе розум і душу дзіцяці, вучыць пазнаваць свет.

## МЫ ЖЫВЁМ У БЕЛАРУСІ

Мы з вамі жывём у Беларусі. Беларусь — гэта наша радзіма. Мы тут нарадзіліся. Тут будзем вучыцца і працаваць. Нашы дзядулі і бабулі таксама тут жывуць. Нашы мамы і таты тут працуюць. Мы ўсе любім сваіх бацькоў. Мы любім свой горад (сваю вёску). Мы любім свой садок і ўсіх, хто з намі тут, у садку. Нашы выхавацелькі, нянечкі,

наша кухарка — усе яны любяць і шкадуюць дзетак: і хлопчыкаў і дзяўчынак.

Настаўніца музыкі вучыць нас спяваць і танцаваць. Яна хоча, каб хлопчыкі і дзяўчынкі былі зграбныя і спрытныя, каб яны прыгожа хадзілі, сядзелі, рухаліся.

Кухарка варыць страву, хоча, каб дзеткі добра елі, не былі галодныя, каб раслі дужыя і здаровыя.

Нянечкі чысцяць, мыюць, прыбіраюць, ствараюць утульнасць.

Пра ўсіх у садку клапоціцца загадчыца садка. Яна хоча, каб усім тут: і дзецям і тым, хто ў садку працуе, было добра і ўтульна, як дома.

Мы ўсе жывём тут, у садку, у згодзе. Разумныя людзі кажуць: згода будуе, а нязгода руйнуе. Калі згода, тады і праца спорыцца, добра работа робіцца. А як нязгода, дык нічога не ўдаецца. Яшчэ раз прыгадаем прыказку і скажам яе хорам: «Згода будуе, а нязгода руйнуе». А яшчэ скажам хорам:

Мы жывём у Беларусі.
Наша радзіма — Беларусь.
Мы любім свой горад (сваю вёску).
Мы будзем здаровыя.
Мы будзем працавітыя.
Мы будзем добрыя.
Мы будзем жыць у згодзе.

Мы будзем жыць у згодзе, бо згода будуе, а нязгода руйнуе.

## ХУТКА МЫ БУДЗЕМ ВЕДАЦЬ БЕЛАРУСКУЮ МОВУ

Было гэта не вельмі даўно. Еду я тралейбусам. Стаю непадалёчку ад уваходу і раптам чую дзіцячы галасок: «Сядайце, калі ласка». «Дзякую табе, хлопчык», — кажу я, і радасна мне стала, што дзіцятка па-беларуску да мяне звяртаецца. Усміхнулася я Паўліку (так хлопчыка звалі) і пытаюся: «А хто ж цябе так прыгожа гаварыць навучыў?» «Гэта нас у садку так вучаць», — сказаў Паўлік... Мы разам сышлі з тралейбуса, і Паўлікава мама расказала мне, што ў садку нумар 376, які знаходзіцца на вуліцы Някрасава, усе гавораць па-беларуску.

Беларуская мова для нас святая.

Многія паэты апявалі беларускую мову ў сваіх вершах. Вось адзін з іх мы і прачытаем. Напісаў яго Кастусь Цвірка.

Мы прыйшлі ў кнігарню з мамай.
На паліцах — безліч кніг!
Тоўстых, тонкіх — розных самых,
Цэлы свет — у кніжках тых.
— Я куплю табе во гэту...
Гэту й гэту варта ўзяць...
Ты пра ўсе краіны свету
З гэтых кніжак будзеш знаць.
— О, як добра! Дзякуй, мама!
Я пра іх чытаць люблю.
Толькі б знаць хацеў таксама
Я пра нашую зямлю.
І яшчэ — за што, няйначай,
Буду ўдзячны я ўдвайне —
Ты купі на мове нашай,
Беларускай, кніжку мне.
То ж айчыны нашай мова,
Мова прадзедаў, бацькоў.
У той мове што ні слова —
Дыямент жывы вякоў.
Невук — хто яе не цэніць.
Ці ж магу я здраджваць ёй:
Я ж не нейкі адшчапенец,
Я ж не нейкі чужаземец
На святой зямлі сваёй.

Кожны чалавек павінен ведаць сваю мову. Кожны чалавек павінен умець спяваць свае народныя песні. Кожны чалавек павінен умець танцаваць свае народныя танцы. Кожны чалавек павінен ведаць прыказкі свайго народа. Кожны чалавек павінен ведаць, як святкаваліся спрадвеку святы ў нашым краі.

Чалавеку трэба шмат чаго ведаць. Трэба ведаць сваю мову і іншыя мовы. Трэба ведаць казкі свае і казкі іншых народаў. Трэба ведаць танцы свае і танцы іншых народаў.

Безумоўна, найлепш і найперш трэба ведаць усё роднае. Нам з вамі трэба ведаць найлепш усё беларускае.

А як нам лепш вывучыць беларускую мову? Трэба слухаць і гаварыць з тымі, хто ведае яе. Трэба слухаць радыёперадачы на беларускай мове. Трэба глядзець тэлеперадачы на беларускай мове. Трэба слухаць казкі на беларускай мове. Трэба слухаць калыханку на беларускай мове.

А цяпер я ў вас буду пытацца, а вы мне адказваць.

Ці ведаеце вы беларускія песні?

Ці ўмееце вы танцаваць беларускія народныя танцы?

Ці чытаеце вы кніжкі на беларускай мове?

Ці слухаеце вы калыханку на беларускай мове?

Ці ведаеце вы беларускія прыказкі?

А зараз вы запытайцеся ў мяне пра ўсё гэта. Добра?

## ХТО ШТО ЎМЕЕ РАБІЦЬ

Маленькі Петрусёк мой сусед. Ён умее чытаць. Як вырасце, ён хоча быць вучоным. Петрусёк кажа: «Без навук як без рук». Ён вельмі ахвотна чытае. Петрусёк любіць чытаць. Ён чытае кожны дзень. Найбольш ахвотна ён чытае беларускія казкі. Усе яго родныя — мама, тата, бабуля і дзядуля любяць слухаць казкі. А найбольш любіць слухаць, як чытае Петрусёк, яго малодшы брацік Міколка. «Ты будзеш чытаць, а я буду слухаць», — кажа Міколка. І ён слухае, ажно роцік разяўляе ад цікавасці.

А быў такі хлопчык Юрачка, які не любіў ні чытаць, ні слухаць, як хто-небудзь чытае. Не любіў Юрачка вучыцца. Не хацеў нічога рабіць. Быў ён гультай. Янка Купала, наш знакаміты паэт, напісаў пра яго вось які вясёлы верш:

Ой ты, Юрачка,
Што не вучышся?
Так да невукаў
Ты далучышся.
А як вырасцеш
Ты няўмекаю,
Усе высмеюць
Недарэкаю.
А ў нашага Юрачкі
З'елі сала шчурачкі,
Як пабег ён у лясок,
Каб схавацца ад кніжок.
А ў нашага Юрачкі
У капоце дзюрачкі.
Нарабіў ён іх сабе,
Як стаў лазіць па вярбе.

Ой ты, Юрачка,
Што лянуешся,
Хаткі нашае
Не пільнуешся?
Толькі бегаеш,
Забаўляешся,
Гэтак з кпінамі
Напаткаешся.
Ой ты, Юрачка,
Кінь ляніціся
Ды надумайся
Ты вучыціся.
Будзем цешыцца,
Што ты вучышся
І да невукаў
Не далучышся.

Я вам расказала пра Петруська, які вельмі любіў чытаць. А пра каго яшчэ? Так, пра Юрачку. Ён таксама любіў чытаць?

А ці памятаеце вы, хто любіў слухаць казкі, якія чытаў Петрусёк? Так, яго мама, тата, бабуля, дзядуля. А хто болей за ўсіх?

А твой брат (сястра) чытае табе казкі?

**Казкі можна чытаць, можна расказваць і можна слухаць. Вы любіце слухаць казкі? Усе? Давайце скажам хорам: «Мы любім слухаць казкі».**

**Можа хто-небудзь з вас раскажа нам маленькую казачку?**

**А цяпер яшчэ раз прыгадаем Юрачку, які не любіў вучыцца, уцякаў з дому ў лясок, каб нічога не рабіць, лазіў па вербах,ірваў вопратку і не ведаў, што дрэнна расці невукам, недарэкаю. Прачытаем увесь верш і вывучым першыя восем радкоў. Дома вы гэты маленькі вершык раскажаце сваёй бабулі, брацiку ці сястрычцы.**

## ДЗЕ ХТО ЗНАХОДЗІЦЦА

Мы з вамі ў садку. Мы з вамі ў дзіцячым садку. Мы з вамі ў мінскім дзіцячым садку. Мы з вамі ў пакоі. Мы з вамі знаходзімся не на двары, не на вуліцы, а ў пакоі. Мы ў светлым, прыгожым, вялікім пакоі. Такі пакой можна назваць залай. Мы ў зале. Мы ў прасторнай, вялікай зале. У гэтай зале многа святла, прастору. У гэтай зале многа паветра. У гэтай зале чыста, светла, утульна. На сцяне вісяць карціны. На падлозе стаіць стол, канапа, крэслы і крэсельцы. На стале ляжаць кнігі. На канапе ляжаць лялькі і іншыя цацкі. У куточку на падлозе стаяць машыны. Вы сядзіце на крэсельцах, а я на крэсле. Спаць мы будзем у спальні, абедаць у сталовай.

### Адкажыце, калі ласка, на такія пытанні

Узор. *Дзеці гуляюць у парку. Дзе гуляюць дзеці? — У парку.*

Рабочыя працуюць на фабрыцы. Дзе працуюць рабочыя?

Трактарысты працуюць на полі. Дзе працуюць трактарысты?

Краскі растуць на лузе. Дзе растуць краскі?

Цацкі ляжаць на падлозе. Дзе ляжаць цацкі?
Вопратка вісіць у шафе. Дзе вісіць вопратка?
Хлеб ляжыць на паліцы. Дзе ляжыць хлеб?
Слоікі стаяць на паліцы. Дзе стаяць слоікі?
Соль у слоіку. Дзе соль?
Соль у слоіку на паліцы. Дзе соль? А дзе слоік?

А цяпер будзе гульня з падказкай. Той, каму я кіну мячык, адкажа мне.

У з о р. *Дзе сядзіць Іванка? (На падлозе.) — Іванка сядзіць на падлозе.*

Дзе растуць яблыні? (У садзе.)
Дзе растуць кавуны? (У агародзе.)
Дзе працуюць рабочыя? (На фабрыцы.)
Дзе ездзяць машыны? (На вуліцы.)
Дзе сядзіць коцік? (На лаўцы.)

Давайце вывучым маленькі вершык:

Не хадзі, коцік, па лаўцы.
Будзем біць па лапцы.
Не хадзі, коцік, па хаце,
Не будзі, коцік, дзіцяці.

Дзе спіць дзіця? (У калысцы, у ложачку, у пасцельцы.)

### ПУШОК І МУРКА

Наша кошка завецца Мурка. Яна вельмі прыгожанькая. Сама яна чорненькая, а пыса ў яе беленькая. І ножкі беленькія. І лапкі беленькія. Раніцай Мурка ўмываецца. Паслюніць сваю беленькую лапку і мые сваю прыгожанькую пыску. Умываецца Мурка старанна, акуратна, чысценька. У яе ёсць дружок — маленькі каток. Яго завуць Пушок. Ён сам беленькі, а носік і вушкі ў яго чорныя. Пушок вельмі вясёлы. Два каткі разам гуляюць, разам мурлыкаюць. Адзін часцей за ўсё ляжыць на зялёненькай падушачцы, а другі — на ружовенькай. Гэтыя падушачкі пашыла каткам Марыська, маленькая дзяўчынка. Каткі ляжаць на падушачках і дурэюць. Але часцей за ўсё Пушок і Мурка гуляюць на двары. Яны весела гуляюць. Ім абодвум хораша разам. Яны бегаюць і скачуць.

Мы з матуляй глядзім на іх і цешымся. Мы цешымся з таго, што ў нас такія вясёлыя і прыгожыя каточкі.

Давайце іх намалюем. У нас атрымаюцца розныя цікавыя малюнкі. Некаторыя з вас намалююць, як каткі ўмываюцца. Хто-небудзь намалюе, як каткі ляжаць на падушачках. А нехта намалюе, як каткі бегаюць ці дурэюць. Самыя лепшыя малюнкі мы павесім на сцяне. Добра?

А цяпер паслухайце, як наш цудоўны паэт Якуб Колас апісаў катка.

У Савосева суседа
Быў пярэсценькі каток...
Нос чарнявы,
Хвост бялявы,
Задзірасценькі;
Кіпцік-шчыпчык
Заграбасценькі;
Лапкі-драпкі
Машастовыя,
А шарсціначчкі
Шаўковыя,
Вусы русы
Напырчастыя.

Адгадайце загадку, а затым мы яе вывучым. Хто самы першы яе вывучыць, атрымае цукерку.

Хто зялёнымі вачамі
Грозна бліскае начамі?
Мае пухленькія лапкі,
А на лапках кіпці-драпкі,
Спінку пругка выгінае,
Страх на мышак наганяе?

### У АЛІНКІ ЎСЯГО ПА АДНАМУ, А Ў АНДРЭЙКІ ЎСЯГО ПА ДВА І НЕКАЛЬКІ

На другім паверсе нашага дома жывуць двое дзетак: Алінка і Андрэйка. У Андрэйкі некалі не было мамы. У яго не было таты. У яго не было бабулі. У яго не было дзядулі. Алінчына мама пашкадавала хлопчыка і ўзяла яго ў сваю сям'ю.

Алінка палюбіла Андрэйку, як свайго роднага брацiка. Мама купіць Алінцы дзве кніжачкі і Андрэйку дзве кніжачкі, а Алінка адну аддае Андрэйку. І тады ў Алінкі адна кніжачка, а ў Андрэйкі колькі? Так, тры кніжачкі. Мама купіць два алоўкі Алінцы і два алоўкі Андрэйку. Алінка аддае адзін Андрэйку. Колькі алоўкаў будзе ў Алінкі, а колькі ў Андрэйкі? Мама дасць некалькі апельсінаў Алінцы і некалькі Андрэйку. Алінка ўсё роўна хоць адзін дае Андрэйку.

Чаму яна ўсё давала? Як вы думаеце? Андрэйка не прагны, не скупы. Ён рады, што Алінка яго любіць, шкадуе

яго, усім дзеліцца. Усміхнецца, падзякуе Алінцы, патрымае крыху тое, што яму дае Алінка, і ёй назад аддае. Так яны і жывуць дружненька.

**А цяпер давайце пагуляем.** Я скажу, напрыклад: «Адзін аловак». А вы скажаце: «Два алоўкі, шмат алоўкаў».

Адзін яблык — два яблыкі, шмат яблыкаў.
Адзін карабок — два карабкі, шмат карабкоў.
Адзін лісток — два лісткі, штат лісткоў.
Адзін двор — два двары, шмат двароў.
Адзін хлопчык — два хлопчыкі, шмат хлопчыкаў.

*Андрэйкаў аловак — Андрэйкавы алоўкі.*
Янкаў яблык — Янкавы яблыкі.
Валодзеў карабок — Валодзевы карабкі.

*Алінчына лялька — Алінчыны лялькі.*
Вольчына цацка — Вольчыны цацкі.
Аленчына спаднічка — Аленчыны спаднічкі.
Марыльчына камізэлька — Марыльчыны камізэлькі.

А вы ўсе матчыны і таткавы дзеці. Чые вы дзеці?

## Я ВАМ АПІШУ СВОЙ ПАКОЙ, А ВЫ МНЕ СВОЙ

Мы з вамі жывём у горадзе. У гарадскім доме шмат кватэр. У кватэры бывае адзін пакой або некалькі (два, тры, чатыры) пакояў, кухня, калідор, прыбіральня і ванная.

У мяне ёсць уласны пакой. Я ў ім працую: чытаю, пішу, вяжу, шыю, вышываю. У гэтым пакоі я прымаю сваіх сяброў, калі яны прыходзяць да мяне ў госці, адведваюць мяне.

Я сама прыбіраю свой пакой: мыю падлогу, выціраю пыл з мэблі, мыю акно, вытрасаю пыл з дывана, з пасцілак, засцілаю канапу. Кожную раніцу і вечар праветрываю свой пакой.

У пакоі ў мяне чыста і ўтульна. Усё зроблена так, каб было зручна працаваць і прыемна адпачываць.

У маім пакоі стаіць вялікі пісьмовы стол. Што я раблю за ім? Так, так. Я за ім пішу і чытаю. Каля стала стаіць крэсла. На стале ляжаць сшыткі, кнігі, часопісы, алоўкі, ручкі. Што ляжыць на стале і навошта ўсё гэта? На сцяне над сталом вісяць партрэты Янкі Купалы, Якуба Коласа і Максіма Багдановіча. Гэта нашы паэты. Яны пісалі ціка-

выя вершы. Яны вельмі любілі людзей, зямлю, дзе яны нарадзіліся. Яны вельмі любілі беларускую мову і хацелі, каб і мы з вамі яе любілі і добра ведалі.

Ці люблю я Якуба Коласа, Янку Купалу, Максіма Багдановіча? Як вы думаеце? Вельмі шаную і люблю. Інакш я б іх партрэты не павесіла над сваім сталом. Ці не так?

Злева каля стала стаіць шафа. Там вісяць блузкі, спадніцы, сукенкі і джынсы. У шафе вісіць таксама мая вопратка — куртка, паліто і футра. На паліцы ў шафе ляжаць мой капялюшык, зімовая шапка і берэт. Там жа ляжаць шалік і хустка.

Недалёка ад шафы, каля канапы, на якой я сплю, ляжыць маленькі, пушысценькі, яскравы дыванок. На акне вісіць белая фіранка і яскравая занавеска.

Я люблю яскравыя колеры: жоўты, чырвоны, ружовы. А вы?

Прыходзьце, калі ласка, да мяне ў госці. А я вам скажу: «Чым багата, тым і рада, а што маю, тым прымаю». І яшчэ я скажу: «Госць у дом, Бог у дом». Што я гэтым выкажу? Гэтым самым я выкажу сваю радасць, убачыўшы вас у сваёй хаце. Кажуць тыя, хто бывае ў Беларусі, што нашы людзі вельмі гасцінныя. Гэта значыць яны шчыра і добра прымаюць гасцей.

Чым вы мяне пачастуеце, як я прыйду да вас у госці? Чаем? Кавай? Яблыкамі? Цукеркамі?

## ПРЫХОДЗЬЦЕ ДА НАС ПАГУЛЯЦЬ

Наш дом вельмі вялікі. Ён высокі, многапавярховы. У ім дзевяць паверхаў. Дом прыгожы, пафарбаваны ў аранжавы колер. Двор наш вялікі, прасторны. Тут шмат высокіх дрэў. Гэта ліпы і клёны. У двары чатыры клумбы. Летам на іх растуць розныя кветкі. Кветкі яскравыя, духмяныя і вельмі прыгожыя. Дзеці іх даглядаюць: паліваюць, полюць (вырываюць пустазелле). Дзеці любяць гуляць у двары. Для іх тут пабудавалі арэлі. Арэлі цудоўныя. Дзеці на іх гушкаюцца. Для дзяцей зроблена пясочніца. Яны будуюць домікі і кажуць:

Я будую дом з пяску!
Я клічу ўсіх на талаку!
Будзем дружна працаваць,
Дом прасторны будаваць,

Высачэзны — вось такі!
На падмогу, землякі!

Дзеці любяць гуляць у пясочніцы. Для дарослых людзей, для дзядуль і бабуль зрабілі некалькі лавачак. Лавачкі пафарбаваныя ў зялёны колер.

Дзеці, якія ўжо падраслі, самі падмятаюць двор і сочаць за тым, каб у двары быў парадак. У двары чыста. Ніхто не кідае паперак, агрызкаў на зямлю. Ніхто не ламае галінак на кусціках. Ніхто не зрывае кветак на клумбах.

Наш дварочак, як вяночак. Мне ён вельмі падабаецца. А ці падабаецца вам наш дварочак?

Што ты скажаш, калі ўбачыш, як нейкі хлопчык ці дзяўчынка ламае куст альбо рве кветкі, альбо кідае паперкі на зямлю?

### ЦІ ПАТРЭБНА НАМ ЧЫСЦІНЯ

Мы хочам быць здаровыя. Каб быць здаровым, трэба не толькі працаваць, рухацца, адпачываць, спаць, есці, дыхаць свежым паветрам, трэба яшчэ жыць у чысціні. Чысціня дапамагае захаваць здароўе.

Мы ўсе з вамі любім чысціню. Мы ўсе з вамі мыемся. Рукі мыем чыста, старанна змываем пену ад мыла, а потым выціраемся ручніком. Навошта мыць рукі? Так, так. Каб былі чыстыя.

А навошта мы выціраем рукі? Каб былі сухія. А чым мы выціраем рукі? Ручніком.

Рукі трэба мыць не толькі перад ядой. Мыем рукі пасля прыбіральні. Мыем рукі пасля таго, як вернемся з прагулкі. Мы абавязкова мыем рукі пасля таго, як пагуляем з сабакам, катом, папугаем.

Мы ўсе — і вы, і я — кожны дзень чысцім зубы. Мы ўмеем чысціць зубы ці не?

Мы з вамі любім мыць цела: плюхацца ў ванне, у рэчцы. Трэба, каб усё ў нас было чыстае: цела, адзенне, цацкі. Трэба, каб усюды быў парадак. Вы ўмееце складваць цацкі, кніжкі, адзенне? Калі ўсе нашы рэчы ў парадку, вакол нас чысціня, нам прыемна, мы ў добрым настроі. А добры настрой таксама дапамагае нашаму здароўю, адганяе хваробу. «Хворы — сабе гора, а сваякам удвая», — кажа беларуская прыказка. А як разумець «сваякам удвая гора»? Сваякам яшчэ горай, як хвораму. А чаму? Мабыць, таму, што хворага трэба даглядаць? Так?

Давайце не будзем хварэць. Добра? Згода?

А цяпер прачытаем вершык пра тое, як з «нашага Юрачкі сталі кпіць і курачкі». «Сталі кпіць курачкі», значыць сталі з яго смяяцца. А чаму, вы мне самі скажаце.

А ў нашага Юрачкі
Пагублены гузічкі.
Ён тады іх пагубляў,
Як з садочку ўцякаў.

А з нашага Юрачкі
Сталі кпіць і курачкі,
Што не мыўся цэлы дзень
І бубніць, як авадзень.

Адкажыце: чаму ў Юрачкі пагублены гузічкі? Калі ён пагубляў гузічкі? Як вы думаеце, чаму ён уцякаў з садочку? Што Юрачка мог рабіць у чужым садочку? Ці можна Юрачку назваць «неўмывака»? Чаму з яго сталі кпіць і курачкі? А хто яшчэ з яго кпіў? Як вы думаеце, ці ведаў Юрачка, што трэба мыцца, каб быць здаровым?

Адгадайце загадку.

Яно слізгае ў руках,
Мае асаблівы пах.
У ваду як пападзе,
Паступова прападзе. ***(Мыла.)***

## У ТАЦЯНКІ ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ

У нядзельку ў Тацянкі быў дзень нараджэння. Да яе прыйшлі сябры: Наталка, Аленка і Сяргейка. Яны прыйшлі ўсе разам і сказалі: «Добры дзень, Тацянка! Мы віншуем цябе з днём нараджэння. Жадаем табе ўсяго самага найлепшага. Каб ты ніколі не хварэла! Каб цябе ўсе любілі! Мы прынеслі табе падарункі. І хочам, каб яны табе спадабаліся».

Тацянка разгарнула падарункі і ажно ў ладкі запляскала. Яна ўбачыла мядзведзя, злепленага з пластыліну. Ну рыхтык, як жывы! А яшчэ яна ўбачыла малюнак. Гэта Наталка намалявала хатку з чырвоным дахам і ганкам, яблыню з вялікімі жоўтымі яблыкамі і бусла. Бусел стаіць на вільчаку гумна і ў роце трымае жабу. «Ой! — узрадавалася Тацянка, — і кветкі! Рамонкі. Я вельмі люблю палявыя кветкі!» Рамонкі сабрала Аленка.

Тацянка падзякавала сваім сябрам, запрасіла да стала. Усе пачалі піць чай з пячэннем. Пячэнне пякла Тацянчына бабуля. Тацянка ёй дапамагала.

Госці папілі чаю, паелі, а потым паспявалі песні. Не забыліся і пра карагодную гульню. Гульня называецца «Груша». Гэтай гульні навучыла іх Тацянчына бабуля ў мінулым годзе (летась) на імянінах.

Усе госці становяцца ў кола, адну дзяўчынку — «грушку» — саджаюць пасярэдзіне і, узяўшыся за рукі, рухаюцца па колу і спяваюць:

А мы грушу пасадзілі,
А мы грушу пасадзілі.
А я маладзенька, топ-топ-топ.
А ўжо груша прымаецца,
А ўжо груша прымаецца.
А я маладзенька, топ-топ-топ.
А ўжо груша расце, расце,
А ўжо груша расце, расце.
А я маладзенька, топ-топ-топ.
А ўжо груша цвіце, цвіце,
А ўжо груша цвіце, цвіце.
А я маладзенька, топ-топ-топ.
А ўжо грушу пара трэсці,
А ўжо грушу пара трэсці.
А я маладзенька, топ-топ-топ.
А ўжо грушу пара есці,
А ўжо грушу пара есці.
А я маладзенька, топ-топ-топ.

«Груша» паказвае рухамі, пра што спяваюць (пасадзілі грушу — дзяўчынка нерухома сядзіць на зямлі; груша прымаецца — дзяўчынка трымаецца рукамі за зямлю; расце — дзяўчынка павалі падымаецца; цвіце — на яе накідваюць белую хустку; груша паспела, яе трэба трэсці — дзяўчынку ўсе разам падкідваюць угару).

Вось так было. І я там была і гарбату піла. А цяпер давайце развучым гульню «Груша».

### ШТО Я БАЧУ Ў СВАІМ ГОРАДЗЕ

Наш горад называецца Мінск. Раней ён называўся Менск. Горад старажытны. Яму больш за 900 гадоў.

Горад вялікі, у ім жыве больш як мільён чалавек. Мінск — горад прыгожы. У ім шмат вуліц. Ёсць вуліцы шырокія — праспекты, ёсць вуліцы вузкія, вуліцы доўгія, кароткія. Усе вуліцы розныя. Летам горад упрыгожваюць дрэвы, якія растуць паабапал вуліц. На некаторых вуліцах ёсць газоны з кветкамі. Вуліцы, якія аздабляюць дрэвы альбо кветкі, прыгожыя. Дамы на вуліцах розныя: высокія, не вельмі высокія і нізкія; вялікія і малыя; новыя і старыя. Наш горад не багаты старажытнасцю. Мала тут помнікаў, старажытных будынкаў, цэркваў, касцёлаў. Многія славутасці горада былі вынішчаны ў нядобры час.

Па вуліцах Мінска ходзяць розныя машыны, тралейбусы, аўтобусы, трамваі. У нашым горадзе ёсць метро. На ім цікава і зручна перасоўвацца. «Я люблю свой горад, — кажа Змітрок, сын маёй сяброўкі. — Тут мае тата і мама, тут усе мае родныя. Калі вырасту, і я буду старацца рабіць усё, каб наш горад быў яшчэ прыгажэйшы, яшчэ багацейшы і чысцейшы. Я таксама пастараюся, каб многія вуліцы нашай сталіцы насілі імёны выдатных беларускіх дзеячаў, тых, хто любіў сваю радзіму і зрабіў шмат добрага для яе».

А вось што гавораць прыказкі пра месца, дзе ты нарадзіўся. Давайце іх вывучым:

*Дарагая тая хатка, дзе радзіла мяне матка.*
*Родная зямелька, як змoранаму пасцелька.*
*Родная зямля мякчэй, як чужая пярына.*
*Няма смачней вадзіцы, як з роднай крыніцы.*
*Усюды добра, а дома найлепш.*

Адгадайце загадку, вывучыце яе на памяць і запомніце на ўсё жыццё:

Ён над вуліцай сядзіць,
Ён на вуліцу глядзіць.
Як зялёным заміргае —
Пераходзіць дазваляе,
Жоўты — знак перасцярогі,
Уцякай хутчэй з дарогі.
А чырвоны загарыцца —
Трэба тут жа прыпыніцца. *У. Мацвеенка.*

Так нас вучыць святлафор, і мы так будзем рабіць. Дамовіліся?

## СЦЯПАНКАВА СВЯТА

Сцяпанкава вёска называецца Заполле. Яна даволі далёка ад Мінска. Размясцілася вёска за невялікай горкай. Недалёка працякае рэчка. Ёсць і крынічка. У крынічцы летам чысцюткая вада, халодная, як лёд.

Заполле невялікая вёска, але прыгожая. Каля кожнай хаты гародчык, а ў гародчыку кветкі: півоні, вяргіні, касачы, лазіца, бэз, астры. У канцы вёскі — школа. Туды з самай раніцы бягуць дзеці, і разам з імі спяшаецца Сцяпанка.

Калі канчаюцца палявыя работы, глыбокай восенню, для вяскоўцаў наладжваецца паездка ў Мінск. Людзі едуць у музеі, тэатры, у цырк. Для Сцяпанкі гэта вялікае свята.

Яшчэ загадзя дарослыя і дзеці рыхтуюцца да паездкі. Татам і мамам хочацца прыгожа апрануць сваіх дзяцей. І самім бацькам хочацца хараша апрануцца. Адзенне ў святочны дзень адрозніваецца ад паўсядзённага. Жаноцкае адзенне ўпрыгожваецца касынкай, шалікам, пацеркамі, якім-небудзь драўляным ці металічным аздабленнем (упрыгожваннем). Мужчынскае адзенне аздабляецца светлай кашуляй, гальштукам.

А дзеці? Дзеці любяць джынсы, світэры, курткі. Ім падабаюцца яркія, радасныя колеры.

Сцяпанка любіць спартыўную вопратку: з кішэнямі, з замочкамі. Калі ён едзе ў Мінск, то надзявае джынсы і яркі світэр з арнаментам. Яго сястрычка, Аміля, на звычайную сукеначку надзявае белы карункавы каўнерык і белы ў палоску бант, і сукенка робіцца святочная, прывабная. Яна вельмі пасуе Амілі. Ад Амілі вачэй не адарваць.

Сцяпанкаў тата надзявае цёмны гарнітур, светлую кашулю з паласатым гальштукам. Ну а мама? Мама заўсёды прыгожая, нават без пацеркаў і кліпсаў.

Ці трэба, каб мы прыгожа апраналіся? Чаму?

## ДЗЕ МЫ ЖЫВЁМ

Навошта мы будуем дамы, хаты? Так, так. Мы будуем хаты, каб у іх жыць. Жыллё нам патрэбна. Без жылля людзі не могуць жыць. Зімой жыллё хавае нас ад холаду, ад марозу. Нам трэба жыллё ў дрэннае надвор'е. А летам? Летам жыллё хавае нас ад сонца, спёкі. Нам трэба жыллё,

каб мы маглі ў ім працаваць. Нам трэба жыллё, каб мы маглі ў ім адпачываць, спаць.

Жыллё ахоўвае нас ад злодзеяў, дрэнных людзей. А як яно нас ахоўвае? Што мы робім, каб злодзей не мог забрацца ў нашу хату? Мы зачыняем вокны, замыкаем дзверы.

А з чаго будуюць дамы, хаты? У далёкім мінулым чалавек жыў у ямах, пячорах, потым пачаў рабіць сабе жыллё з зямлі. Пасля будаваў з дрэва маленькія хаткі — курныя, дымныя. Пазней прыдумаў лепшыя, прыгожыя хаты з дрэва. А потым пачаў будаваць хаты з цэглы. Сёння людзі ўзводзяць вялізныя, дзівосныя, шматпавярховыя дамы.

Каб пабудаваць нават маленькі домік, патрэбны шмат якія матэрыялы: цэгла, дрэва, жалеза, цэмент, пясок, гліна і г. д. А каб жыць было ўтульна, трэба шмат працаваць ва ўжо пабудаваным доме. У хаце неабходна прыбіраць, мыць, фарбаваць, клапаціцца аб зручнасці і прыгажосці жылля. Што ўпрыгожвае наша жыллё? Мэбля, покрыўкі, дываны, падушачкі, сурвэткі, абрусы, кніжкі, кветкі, вазоны і букеты. Яшчэ ўпрыгожваюць наша жыллё гліняныя вырабы з саломы, кудзелі, з дрэва, карціны на сценах, фіранкі і занавескі на вокнах.

Але нішто не дапаможа нам жыць утульна, радасна і шчасліва, калі ў доме няма любві адзін да аднаго, спагады, лагоды, шкадавання, калі няма паміж людзьмі пашаны.

У доме, у сваёй хаце мы вучымся жыць у адзінстве, у еднасці, згодзе і любві. Інакш будзе сварка, беспарадак, інакш дом разваліцца. Згода будуе, нязгода руйнуе.

Ад чаго нас хавае жыллё зімою? Ад чаго нас хавае жыллё летам?

Навошта нам патрэбна жыллё?

Дзе чалавек жыў даўным-даўно? У ямах, пячорах або шматпавярховых дамах?

Што робіць нашу кватэру ўтульнай, прыгожай?

Ці патрэбна дапамагаць адзін аднаму ў сям'і?

Калі лягчэй, прыемней жыць чалавеку: калі ў хаце лагода, спагада, ці тады, калі сварка і нязгода?

## ВУЧЫЦЕСЯ ЗБІРАЦЬ ГРЫБЫ

Хто мне намалюе грыб? Малайчына, Зміручок. Малайчына, Ганка. Вашы малюнкі хоць на выставу пасылай. Скажыце, калі ласка, дзе растуць грыбы? Так. У лесе на

дарожках, пад дрэвамі, у траве, на прасецы, на палянцы. Усюды можна знайсці грыбы. Але збіраць іх трэба ўмець. Мая цётка — заядлая грыбніца. Яе завуць цётка Вера. Яна знаходзіць грыбы там, дзе іх ніхто не заўважае. Усё трэба ўмець рабіць добра. На ўсё трэба быць майстрам.

Хто з вас хадзіў у грыбы? Найлепш хадзіць у грыбы з тым, хто добра ведае лес і ўмее збіраць грыбы. А чаму трэба ведаць лес? У лесе лёгка заблудзіцца, а знайсці дарогу потым не заўсёды лёгка. А чаму лепш хадзіць у лес з тым, хто ўмее збіраць грыбы? Ён навучыць вас гэтаму.

Добры грыбнік той, хто беражліва зразае грыбы нажыкам, пакідае карэньчыкі ў зямлі, не разбурае грыбніцу. Тады грыбы зноў вырастуць на гэтым месцы. Прыроду, як і чалавека, трэба берагчы, шанаваць, шкадаваць.

Ёсць шкодныя грыбы, якія нельга есці. Яны маюць у сабе атруту. Той, хто з'есць атрутны грыб, нават сасмажаны ці звараны, атруціцца. І можа нават памерці. Адным з такіх страшных паганых грыбоў з'яўляецца мухамор. Як ён выглядае? Так, чырвоны ў белыя гарошкі, з выгляду вельмі прыгожы. Але не ўсё прыгожае, што на пагляд. Гэта прыказка.

Грыбы добра растуць пасля дождыку. Яны любяць вільгаць. У горадзе пасля дажджу на вуліцах слата, лужыны, таму не ўсе любяць дождж. А ў лесе пасля дажджу грыбы дружна вылазяць з зямлі. Грыбы чысценькія, маладзенькія. Яны чакаюць, калі іх добры грыбнік зрэжа і кіне ў свой кошык, а як будзе есці — пахваліць, скажа: «Ну й смаката!»

У грыбы хадзіць і карысна і прыемна. Вока трэніруецца, ножкі мацнеюць, ходзячы па лесе, грыбы смачна есці.

Грыбы маюць свае назвы: баравік, казляк, апенька, лісічка, махавік, масляк.

А цяпер прачытаем верш «Па грыбы», які напісаў Авяр'ян Дзеружынскі.

У стары сасновы бор
Прыйшоў раніцай Рыгор —
І грыбоў пачаў шукаць...
А вось баравік, таўстун-невялік,
А вось казлякі паселі ў гурткі,
А вось лісічкі ў таўставатых спаднічках,
А вось грузды напіліся вады.

А вось і бабкі ў дзябёлых шапках,
А вось і ваўнянкі пасярод палянкі.

І гаворыць добры бор:
— Назбіраў грыбкоў, Рыгор!

І яшчэ адзін вершык гэтага аўтара.

Клара
Клала
Ў кошык грыб
Гэткі чырванюткі:
Колькі ёсць
Грыбкоў такіх,
Назбіраю хутка!

Ды падбегла
Каця ўміг:
— Ты нашто
Збіраеш іх?! —
Закрычала
На ўвесь бор:
— То ж —
Атрутны мухамор!

Якія вы ведаеце назвы грыбоў? (Лісічкі, сыраежкі, падасінавікі, рыжыкі, махавікі, грузды, ваўнянкі, баравічкі. Шкодныя, дрэнныя грыбы: мухамор, паганка.)

Хто хоча вывучыць вершык пра баравік?

Пад звонкай хвояю іглістай,
Прабіўшы мох, як буравік,
Стаіць у верасе квяцістым
Лясное дзіва — баравік.

Хто хоча вывучыць вершык пра паганку?

Зірнеш: паненка — выхвалянка,
Што апранула новы ўбор,
Ды не бяры: яна — паганка!
Нясе не толькі мухам мор!

А каму яшчэ нясе шкоду паганка?

### АДПАЧЫНАК, СОН, ГУЛЬНЯ

Мы з вамі ведаем, што чалавек павінен працаваць. Без працы няма жыцця. Але нам з вамі трэба ведаць, што чалавек павінен і адпачываць. Усё добра ў меру. «Папрацуй і патанцуй», — кажуць разумныя людзі. Калі мы будзем працаваць без адпачынку, то страцім сілы, будзем стомленыя, нездаровыя. Мы будзем нецікавыя і нудныя. Адпачынак здымае стомленасць (змору), дае бадзёрасць, весялосць. Такі адпачынак, як слуханне музыкі, чытанне, цікавая гульня, робіць нас зноў бадзёрымі і вясёлымі. Нам

цікава, мы цешымся (радуемся) і цешым тых, хто з намі. Нам добра, і тым, хто з намі, таксама добра. Радасць, бадзёрасць даюць нам сілы зноў працаваць.

Ну вось, як вы ўбачыце, што ваша мама цэлы час працуе, замарылася, але ніяк не можа перапыніцца, скажыце ёй: «Матуля, адпачні. Нельга так многа працаваць. Давай пагуляем ці пачытаем. А можа, тэлевізар паглядзім разам, радыё паслухаем ці проста пагутарым...». Ваша мама ўсміхнецца. Ёй будзе прыемна, што ў яе такое спагадлівае дзіцятка. Яна скажа: «Давай разам паспяваем» і пачне:

А ў бары, бары тры дарожанькі.
Гэй, гэй, тры дарожанькі.
Тудою ішлі тры салдацікі,
Гэй, гэй, тры салдацікі.
Што к мамачцы йдзе, песеньку пяе.
Гэй, гэй, песеньку пяе.
Што к татачку йдзе, скрыначку нясе.
Гэй, гэй, скрыначку нясе.
Што к мачысе йдзе, жаласна плача.
Гэй, гэй, жаласна плача.

Вы паспявалі, адпачылі і зноў узяліся за працу.

Перад сном добра паслухаць калыханку. Якую з трох калыханак вы папрасілі б маму праспяваць вам перад сном?

1. Спі, засні, мая дзетка,
Птушкі ўжо заснулі,
Спі, засні, мая дзетка,
Люлі, люлі, люлі.

2. Люлі-люлі-люлі!
Прыляцелі гулі!
Гулі-гулі-галубы!
Селі гулі на дубы.
І спявалі і гукалі —
Сны салодкія склікалі.

3. Спі, сыночак міленькі,
Галубочак сівенькі.
Мой сыночак будзе спаць,
А я буду калыхаць
А-а-а, а-а-а-люлі!
Успомні матулю сваю,
Як цябе люляла,

Як табе не раз уначы
Песеньку спявала.
А-а-а, а-а-а-люлі!

Пра што мы з вамі гутарылі?

Давайце скажам хорам: «Трэба і працаваць і адпачываць».

Якую прыказку ты хацеў бы запомніць?

*Праца не ганьбіць чалавека, а корміць, і поіць, і вучыць.*

*Праца здароўя не адбірае.*

*Перш папрацуй, а тады патанцуй.*

## ЯК ТРЭБА СЯДЗЕЦЬ ЗА СТАЛОМ

За сталом трэба сядзець прыгожа. Не крыўляцца, не шумець, не круціцца. Брыдка, калі нехта есць неахайна. Непрыгожа, калі набірае ежы поўны рот. Трэба есці маленькімі кавалачкамі. Нічога не есці, седзячы над талеркай, таксама непрыгожа. Абавязкова трэба вучыцца карыстацца відэльцам і нажом, лыжачкай і лыжкай. Рукі трэба выціраць сурвэткай, а не аб сукенку ці кашулю. Калі за сталом няма сурвэтак, можаш карыстацца хусцінкай. Пасля таго як пад'ясі, падзякуй таму, хто цябе накарміў, і таму, хто з табою сядзеў за сталом.

Пра што мы яшчэ забыліся сказаць? А вось пра што. Седзячы за сталом сярод іншых людзей, не займай шмат месца, помні аб суседзе. Не піхай яго локцямі, не адгароджвай ад яго талерку левай рукой. Не адсоўвай талерку, як пад'ясі. Няхай талерка стаіць там, дзе яе паставілі.

А цяпер я вам раскажу пра аднаго хлопчыка, якога звалі Міколка і з якім ніхто не хацеў сядзець побач за сталом у час снедання, абеда, вячэры. Вы здагадваецеся, напэўна, чаму? Так, таму што Міколка не ўмеў есці, паводзіў сябе за сталом непрыгожа, некультурна. Набярэ поўны рот кашы, ажно з роту вывальваецца. Шчокі надзьмутыя, ежа іх распірае, пražаваць яе немагчыма. Сядзеў Міколка за сталом бокам, папіхваючы локцем свайго суседа. Ногі выцягваў ва ўсе бакі, а не трымаў роўненька пад сабою. У ежу, якую трэба было есці лыжкай, ён сунуў відэлец. Дзьмухаў на гарачы чай так, быццам вогнішча хацеў распаліць, а мокрыя дровы не гарэлі. Сёрбаў суп гучна, на ўвесь пакой. Барабаніў лыжкай па стале, а часам і па

талерцы. Абрус пад яго талеркай быў заўсёды брудны, у плямах.

Спачатку дзеці ўсё гэта цярпелі, а потым абурыліся і кажуць: «Больш з табою, Міколка, сядзець не будзем. Ідзі прэч ад нашага стала!» Міколка заплакаў. Тады адзін хлопчык, якога звалі Даньчык, сказаў: «Давайце навучым яго есці прыгожа». Як вы думаеце, ці добра зрабіў Даньчык? Ці можна дапамагчы Міколку?

А цяпер прачытаем вершык пра аднаго «забываку».

Бабка ўнука частавала,
Сыр і мёд — усё давала.
Той, наеўшыся прысмакаў,
Не сказаў за гэта «дзякуй».
Ён забыўся, бабчын госць,
Што такое слова ёсць.

А ты не забываешся сказаць «дзякуй» за паслугу ці ласку, табе зробленую?

## ПРА ЧЫСЦІНЮ І ВЕТЛІВАСЦЬ

Чысціня і ветлівасць радуе чалавека. Прыемна глядзець на чалавека, размаўляць з ім, калі ён чыста апрануты. Прыемна быць у хаце, дзе чыстая падлога, чыстая мэбля, чыстыя вокны. Прыемна прыязджаць у горад, калі чыста на вакзале, не насмечана, не наплёвана, не набруджана. Радасна ісці па вуліцы, калі тратуары чыстыя, а людзі ветлівыя, усміхаюцца, не штурхаюць адзін аднаго. А калі ты ім зробіш паслугу, скажуць «дзякую», «шчыра дзякую». А калі хто штурхане цябе выпадкова, скажа «прабачце», «выбачайце, калі ласка». На вялікі жаль, не заўсёды мы чуем такія мілыя словы, як «калі ласка», «дзякую», «прабачце».

Што вы скажаце, калі выпадкова закранеце чалавека, праходзячы па салону ў тралейбусе? Што вы скажаце таму, хто раскажа вам дарогу да патрэбнага месца? А як вы запытаецеся дарогу, калі вам, напрыклад, трэба даехаць да вакзала?

Усё непрыгожае, пашкоджанае, недагледжанае псуе наш настрой. Часам мы едзем у ліфце і бачым падрапаную і абсмаленую кабіну. На сценах будынкаў сустракаюцца накрэмзаныя непрыстойныя словы. Хто ж гэта робіць? На жаль, некаторыя хлопчыкі і дзяўчынкі, а часам і дарослыя. Гэта дрэнныя ўчынкі. Дрэнныя

людзі ў сваім пад'ездзе кідаюць паперкі, шалупінне. Мы з вамі не будзем кідаць смецце ў пад'ездах, на вуліцах, на вакзале, у ліфце. Праўда? Будзем старацца быць культурнымі, шанаваць усё, створанае чалавекам, шанаваць прыроду і чалавека.

Якія словы мы будзем гаварыць, калі спатрэбіцца? Так, так: «Дзякуй. Дзякую. Шчыра дзякую. Вялікі дзякуй. Выбачайце. Прабачце. Даруйце. Калі ласка».

## МАЯ ЛЮБІМАЯ ВОСЕНЬ

Ці любіце вы восень? Я вельмі люблю восень. Восень багатая. Восень шчодрая. Восень прыгожая. Дрэвы стаяць жоўтыя, чырвоныя. Зямля ў лесе, у парках, засыпаная лісцем, падобна на рознакаляровы дыван. Глядзіш, не наглядзішся. А колькі багацця восенню! Яблыкі! Кавуны! Памідоры! Сланечнікі! Бульба! Буракі! Морква! Усё спелае, свежае, сакавітае, толькі што з градкі. На рынку шмат садавіны. Выбірай, што падабаецца.

Людзі шмат працуюць восенню: і дарослыя і дзеці. Збіраюць яблыкі, капаюць бульбу, буракі, моркву... А ў вольны час спяшаюцца ў лес палюбавацца дзівосамі. А дзівосаў там шмат. Радуюць вока багата ўбраныя дрэвы. Грыбы-прыгажуны вабяць сваімі шапачкамі, вітаюцца з грыбнікамі, просяцца да іх у кошык.

Колькі месяцаў трывае восень? Тры: верасень, кастрычнік, лістапад. Давайце падумаем, што значаць назвы месяцаў. Ёсць такая расліна — верас — з дробным лісцем і маленькімі лілова-ружовымі кветкамі. Верас расце нізка, уецца па ўзлессі, цвіце ранняй восенню. Адсюль і назва месяца. У кастрычніку лён труць і сыплюцца з яго рэшткі — кастрыца. У лістападзе лісце падае. Давайце хорам паўторым назвы восеньскіх месяцаў: верасень, кастрычнік, лістапад.

Калі пачынаецца восень, на двары халаднее. Сонца свеціць, ды не грэе. Яно не такое яркае, як летам. Часта дзьме вецер. Часам ідзе дождж. Дзеці пачынаюць вучобу ў школе.

Паслухаем прыказкі пра восень.

*Увосень і верабей сыты.*
*Увосень і грач багач.*
*Восень на рабым (на шэрым) кані ездзіць.*
*Увосень за стол просім.*

Чаму прыказка кажа, што ўвосень і верабей сыты? Чым верабей можа пажывіцца восенню на полі?

Хто такі грач, што ўвосень багач? І чаму гэта птушка ўвосень багатая?

На якім кані ездзіць восень? Чаму яе конь рабы, шэры? Можа таму, што восень дажджлівая?

Чаму ўвосень за стол просім? Ці не таму, што стол багаты і ёсць чым частаваць: шмат садавіны, гародніны?

Паслухаем яшчэ раз прыказкі, выберам з іх тры і вывучым іх.

Прачытаем верш пра познюю восень, які напісала Ніна Галіноўская.

Паляцела лета
З птушкамі на поўдзень.
Ні травы, ні кветак,
Пуста ў агародзе.
Вецер гоніць лісцік,
Скручаны, счарнелы.
Коціцца кудысьці
Ён асірацелы.
Голы сад знямелы
Да сябе не кліча.
Неба пацямнела
І цяпла не зыча.

Сумна ці весела апісана восень? Так, сумна. Але ўсё роўна мы з вамі любім восень. Усе поры года прыгожыя. Усе поры года жаданыя.

## МАЯ ЛЮБІМАЯ ЗІМА

Апішам зіму ўсе разам. Зіма пачынаецца ў снежні. У снежні выпадае снег. Часам яго няма, але месяц усё роўна называецца снежань. Зіма трывае тры месяцы: снежань, студзень, люты. У студзені холадна, сцюдзёна. А трэці месяц зімы называецца люты. У гэтым месяцы таксама холадна, лютуе мароз, часта бываюць завірухі.

Назвы трох зімовых месяцаў — снежань, студзень, люты — падказваюць, што гэта пара года халодная. Але хоць і холадна зімою, мы любім яе. Праўда ж? Мы вельмі любім зіму.

Зімою часта ідзе снег. Якога колеру снег? Белы колер прыгожы, святочны, чароўны. Сняжынкі падаюць і пада-

юць. Яны вельмі прыгожыя. Іх вельмі шмат. І ўсе яны розныя, як і вы, дзеткі. Няма нават дзвюх аднолькавых сняжынак. Зіма — чараўніца. Усё ўбірае белым чыстым покрывам. Зімой усё, як у казцы. Зямля белая. Дрэвы белыя. Дамы белыя. Неба белае. Дарогі белыя! Прыгожа! Цуд!

Паслухайце вершык, які напісала Данута Бічэль-Загнетава. А потым мы яго вывучым.

Белыя нівы,
Белыя далі,
Белыя бабы
Пад вокны пасталі.
Белыя стрэхі
На кожнай хаціне.
Белая елка
У цёплай хусціне.

## ЯШЧЭ КРЫХУ ПРА ЗІМУ

А цяпер пагаворым пра тое, што мы робім зімою, як апранаемся, як гуляем.

Дзеці любяць зіму. Вельмі? Так. Яны бяруць санкі, лыжы і ідуць на горку, на двор. А што яны там робяць? Яны катаюцца з горкі, лепяць снежную бабу або снежнага дзеда. А з чаго робяць снежную бабу?

Зімою мы апранаемся цёпла, каб не прастудзіцца. Надзяваем футру альбо цёплае паліто, цёплую футравую шапку, цёплыя боты або валёнкі, рукавіцы, шалік, цёплыя доўгія штаны. Вось як мы апранаемся. Так, каб люты мароз нас не застудзіў, каб сцюдзёны вецер не прадзьмуў.

Калі мы катаемся на лыжах ці на каньках, то апранаемся цёпла, але лёгка. Інакш нам будзе цяжка рухацца, мы спацеем і прастудзімся.

А цяпер паслухаем прыказкі і прымаўкі пра зіму.

*Зімовы дзянёк, што камароў насок.* (Ён доўгі ці кароткі?)

*Зімою сонца свеціць, ды не грэе.*

*Студзень хаты студзіць — рана гаспадароў будзіць.* (У вясковай хаце печ астывае за ноч, у холадзе не ўлежаць у пасцелі, і людзі ўстаюць рана, каб прапаліць печ.)

*Пытаецца люты, ці добра абуты.* (А што будзе з нагамі, як дрэнна абуты? Памерзнуць. Адмарозяцца пальцы. Чалавек прастудзіцца.)

*Віхры і мяцелі ў лютым наляцелі.*

*Зіма на лета робіць, а лета на зіму.* (Што значыць гэтая прыказка, запытайцеся дома ў мамы, таты, бабулі, а пасля мне скажыце. Добра?)

Паслухайце вершык, прыдумайце загаловак да яго. Напісаў верш Васіль Жуковіч. Каб вы ўсё зразумелі, я вам вытлумачу словы «гурба», «прывід», «ніколечкі», «палазы», потым яшчэ раз прачытаю, а вы адкажыце на пытанні.

Зіма хадою смелаю
да нас прыйшла здаля,
і стала белай белаю
уся вакол зямля.
Такія гурбы выраслі:
як прывіды стаяць.
На двор мы санкі вынеслі —
давай гуртом гуляць.
У саначак бліскучыя,
як струны палазы.
Не страшны нам траскучыя,
тугія маразы.
Мы хутка-хутка з горачкі
на саначках ляцім.
Не холадна ніколечкі —
нам весела усім.

Ці любіце вы катацца на саначках? Ці сапраўды ніколечкі не холадна, калі ляціце на саначках з горкі?

А як лепш, весялей гуляць: аднаму ці гуртом?

А ці ведаеце вы верш «На рэчцы зімой» Якуба Коласа?

Я пачну, а вы кончыце. Добра?

Не сядзіцца ў хаце
Хлопчыку маламу:
Кліча яго рэчка,
Цягнуць санкі з дому...

## МАЯ ЛЮБІМАЯ ВЯСНА

Вось і снег на ўзлессі знік,
Расцвіла пралеска —
Ходзіць месяц сакавік
Па вясновых сцежках.

Вясна пачынаецца ў сакавіку. Яна трывае тры месяцы. Давайце скажам іх хорам: сакавік, красавік, май. Сакавік! Прыгожа гучыць слова. Праўда? У гэтым месяцы ў галінках дрэў паяўляюцца сокі. Красавік! Таксама прыгожае слова. У красавіку ажываюць краскі. Вы, мабыць, не ведаеце, што лясныя і палявыя кветкі называюцца «краскі». Адсюль і назва месяца — красавік. Трэці месяц вясны — май. Яго ў Беларусі яшчэ называюць травень. У маі два святы. Першага мая — Свята працы. Дзевятага Мая мы святкуем Дзень Перамогі.

Вясна — чарадзейка. Усё навокал ажывае, як у казцы. Усё зелянее. Усё прыгажэе. Лес зялёны. Сады зялёныя. Агароды зялёныя. Трава зялёная.

Вясною цёпла і прыгожа. Увесь божы свет здаецца мілейшы, прастарнейшы, лепшы. Птушкі вяртаюцца з выраю. А што такое вырай? Гэта цёплы край, куды птушкі адлятаюць на зіму.

Мы ўсе любім вясну. Давайце хорам скажам: «Мы любім цябе, вясна!»

Я вам прачытаю некалькі радкоў з паэмы Якуба Коласа «Новая зямля». Калі станеце крыху старэйшымі, вы прачытаеце і палюбіце гэты твор так, як я.

Вясна была яшчэ ўпачатку,
Але снягі ўжо раставалі,
І дружна ў полі балбаталі
Раўкі, рачулкі, і ў грамадку
Яны ваду сваю злівалі,
Ад сну гаі, лясы будзілі
І людзям душу весялілі.

**ЯШЧЭ КРЫХУ ПРА ВЯСНУ**

Сонца свеціць ярчэй.
З-пад высокай сасны
Выбег шустры ручэй —
Напамінак вясны.
Я лапатку ўзяла,
Каб правесці равок,
А ён, бы зайчаня,
Па дарожцы скок-скок...

Вось так апісаў вясну паэт Паўлюк Прануза.

Калі сонца свеціць ярчэй? Так, вясною. А вясна пачынаецца з якога месяца? З сакавіка. Сонейка свеціць, снег

растае, цякуць ручайкі. Яны напамінаюць, што прыйшла вясна.

Мы любім вясну. Вясна прыносіць нам цяпло. Вясна прыносіць нам ласкавае сонейка. Вясна прыносіць нам ручайкі, якія скачуць, як зайчаняткі. Вясна прыносіць нам краскі — пралескі. Яны зацвітаюць адразу пасля раставання снегу. Пралескі растуць на ўзлессі.

Вясною мы любім бавіць час на вуліцы. Мы любім гуляць на двары. Мы любім бегаць па дарожках. Мы любім, калі матуля ці выхавацелька вядзе нас па вуліцы і паказвае нам скверы, помнікі, цікавыя будынкі.

Гэтай вясною мы пойдзем да помніка Янку Купалу (Якубу Коласу, Максіму Багдановічу). Мы пакладзём каля помніка хоць адну кветачку ці зялёную галінку і паклонімся паэту, падзякуем за яго вершы. Мы таксама пойдзем і пастаім каля Вечнага агню. Агонь гарыць у памяць аб тых, хто загінуў у вайну.

Вясною мы прыбіраем двор, зграбаем смецце, наводзім парадак. «Вясна на лета працуе», — так кажа прыказка.

Закончым гаворку пра вясну такімі прыказкамі і прымаўкамі:

*Сакавік дрэвам сок пускае.*
*Красавік ваду падбірае, красачкі пушчае.*
*У май — і пад кустом рай.*
*Май дажджлівы — год урадлівы.*
*Вясенні дзень — год корміць.*

## МАЁ ЛЮБІМАЕ ЛЕТА

Паслухаем прыказкі і скажам, пра якую яны пару года. Якія назвы месяцаў вы пачулі? Пра што гэтыя прыказкі гавораць? Пра тое, што летам трэба працаваць ці толькі гуляць?

*Людзі рады лету, а пчолы — квету.*
*Улетку кожны кусцік начаваць пусціць.*
*Летні дзень зіму корміць.*
*Летам прызапасім — зімой знойдзем.*
*Трэба ўлетку назбіраць, каб зімой было што жаваць.*
*Што лета назбірае, то зіма паз'ядае.*
*Што летам народзіцца, то зімой згодзіцца.*
*Ліпень косіць і жне, доўга спаць не дае.*
*Хто ў ліпені на полі пацее, таго ўзімку і печка нагрэе.*

А цяпер выберам тры прыказкі і вывучым іх на памяць.

Лета пачынаецца ў чэрвені. Другі месяц лета — ліпень, а трэці — жнівень. Пра лета шмат чаго нам расказалі прыказкі. Што ж яны нам расказалі? Што людзі любяць лета: «Людзі рады лету, як пчолы — квету». Пчолкі любяць кветкі, а людзі любяць лета.

Нам прыказкі расказалі, што ўлетку цёпла. Нават на двары, пад кусцікам, можна пераначаваць. Удзень сонца такое гарачае, яркае і так награе зямлю і паветра, што ноччу цёпла. Як кажа прыказка? Так: «Кожны кусцік начаваць пусціць».

З прыказак мы ведаем, што летам працы багата. Людзі полюць, паліваюць, жнуць, косяць, бо «Летні дзень зіму корміць». «Як не будуць людзі летам працаваць, дык зімою не будзе чаго есці». «Што лета назбірае, тое зіма паз'ядае».

Летнія дні доўгія. Гэта добра, бо летам даводзіцца шмат працаваць. Калі б дзень быў кароткі, як зімою, дык людзі не паспявалі б вырошчваць і збіраць ураджай.

Сонца летам гарачае. Людзі лёгка апранаюцца. У адзенні пераважаюць светлыя колеры: белы, блакітны, ружовы, жоўты.

Многія людзі летам адпачываюць: едуць з горада ў вёску, на дачу, на курорт. Едуць туды, дзе ёсць вада, лес, дзе чыстае паветра.

Дзеці едуць у лагеры. Там чыстае паветра. Там яны гуляюць, растуць, загараюць на сонейку.

Сонейка свеціць
ад ранку да вечара.
Сонейка грэе
ад ранку да вечара.
Хоча яно, каб шумелі сады,
Каб у садах спелі дзецям плады.

Адгадайце загадку.

Што за такія чатыры пары,
Што за такія чатыры сястры:
Першая — назбірае вады,
Другая — арэ і сее,
Трэцяя — росціць рупліва плады,
Чацвёртая — есці ўмее.

*(Зіма, вясна, лета, восень.)*

## БУЛЬБА

Мы часта чуем слова «бульба». Мы чуем яго ў гутарцы блізкіх людзей. Мы чуем яго па радыё. Мы сустрэнем гэта ў газетах. Мы ведаем песню пра бульбу. Ёсць такі танец «Бульба».

Цяжка сабе ўявіць, як можна жыць без бульбы. Здаўна ў беларуса бульба была любімай ежай. Яна яго ратавала ад голаду ў горшыя часы. Бульбу называюць другім хлебам. Бульба і хлеб — два самыя важныя прадукты.

Свойскія жывёлы ў Беларусі таксама не абыходзяцца без бульбы. Для каровы, свінні бульба — любімы корм.

З бульбы, як кажуць, можна зрабіць 700 розных страў. Гэта вельмі-вельмі многа. Якую вы любіце бульбу? Вараную? Смажаную? У лупінах? А можа, вы любіце дранікі?

Дарэчы, з бульбы можна прыгатаваць і торт. Можа, ваша мама гэтага не ведае, дык скажыце ёй. Добра? Для торта трэба зварыць бульбу ў лупінах, ababраць, пацерці на тарку. З нацёртай бульбай расцерці жаўткі яйка і цукар. Дадаць лімонную цэдру, карыцу, соду, масла ці маргарын, узбітыя да пены бялкі і муку. Замясіць цеста, пакласці ў маленькую круглую форму (каб торт быў высокі), змазаную маслам, і выпякаць у духоўцы. Вось як. Цікава? Што вы запомнілі? Як спячы торт з бульбы?

Пра бульбу пішуць вершы. Вось адзін такі вершык Авяр'яна Дзеружынскага.

З бульбы добрай нашай
Робяць клёцкі, кашу,
Пірагі з грыбамі,
З мясам, буракамі.

Бульбу вараць,
Бульбу смажаць,
Бульба наша — любата.
З беларускай бульбы
Страва — смаката.

## ПРА СОНЦА, МЕСЯЦ, ЗОРКІ

Сонейка ўзыходзіць, з'яўляецца на небе раніцай і свеціць нам днём. Запомнім: ёсць раніца (ранічка, ранак) і дзень. Той бок, дзе сонца ўзыходзіць, называецца ўсход.

Сонейка заходзіць (хаваецца за небакрай) вечарам. І той час, калі ў нас няма сонечнага святла, называецца ноч. Той бок, дзе сонейка заходзіць, называецца захад.

Намалюйце сонейка і скажыце, калі яно ўзыходзіць і калі заходзіць. Летам сонейка заходзіць позна ўвечары. Дзецям пасля заходу сонейка трэба ісці спаць. Лепш раней легчы спаць і раней устаць. Так цябе вучыць мама, Пілiпка?

Паслухайце вершык. Калі ён вам спадабаецца, мы яго вывучым.

**Сонейка-сонца**

Сонейка-сонца,
Залатое донца,
Не хавайся у бары,
а гары,
гары,
гары!
Ну —
хоць трохі пасвяці,
Каб нам спаць не ісці.

Месяц (месячык) на небе бачны ноччу. Месяц бывае розны па форме. Бывае месяц кругленькі, як літара О, як яблык. Тады ноччу відна. Відна, хоць іголкі збірай. Такі месяц называецца паўнік, альбо поўня. Часам месяц па сваёй форме падобны на палову яблыка. Часам ён зусім хаваецца, і яго не відаць. Тады ноч цёмная. Цёмна, хоць на ваўка ўзлезь. У асобныя дні на небе толькі часцінка месяца, падобная на серп. Гэта маладзік, малады месяц.

Дык калі мы бачым месяц на небе, і які ён бывае па сваёй форме?

Адгадайце загадку. «Што гэта за вочы: адно свеціць удзень, а другое ўночы?» *(Сонца, месяц.)*

Напэўна, вы бачылі зоркі на небе. Зорак многа-многа. Яны ад нас далёка-далёка. І таму нам здаецца, што яны маленечкія. Мы можам убачыць зоркі толькі ў цёмную ясную ноч. Днём іх не відаць. Яны з'яўляюцца на небе пасля заходу сонца, як стане цёмна, і зіхцяць быццам маленькія лямпачкі. На самай справе зоркі вялікія. Яны вельмі гарачыя, але іх цяпло да нас не даходзіць. Зоркі ад нас вельмі далёка.

Пра зоркі напісана шмат песень і вершаў. Як вырасцеце, прачытаеце верш Максіма Багдановіча «Зорка

Венера». Няхай вас не здзіўляе, што зоркі маюць свае імёны. Венера — гэта імя багіні прыгажосці. Яшчэ яна называецца Мілавіца. Верш Багдановіча стаў песняй «Зорка Венера». Я вам праспяваю пачатак гэтай песні:

Зорка Венера ўзышла над зямлёю,
Светлыя згадкі з сабой прынясла.
Помніш, калі я спаткаўся з табою,
Зорка Венера ўзышла...

Давайце намалюем сонца, месяц і тры зорачкі рознага памеру: адна зорка знаходзіцца на небе бліжэй да нас, а дзве далёка.

Адгадайце загадкі.
Адзін пастух пасе тысячу авец. *(Месяц.)*
Свечак многа гарыць, а ніводнай не патушыць. *(Зоркі.)*

Паслухайце вершык і мы яго вывучым:

Я да цёткі ездзіла ў сяло.
Там з-за лесу сонейка ўсплыло.
А была ў бабулі у гасцях,
Узнялося сонца там, дзе шлях.
Сонца ў нас — ўсходзіць з-за гары,
Колькі ж сонцаў? Мабыць, тры.

А ты, Кастусь, як думаеш, колькі сонцаў?

## ЧАМУ ПТУШКІ СПЯВАЮЦЬ

Птушкі спяваюць. Спевы — іх гутарка, размова. Птушкі любяць сябраваць, перасвіствацца, слухаць адна адну. Але яны не любяць, калі іншая птушка набліжаецца да іх гнязда, да таго месца, дзе іх птушаняты. Не любяць птушкі, калі чалавек набліжаецца да іх гнёздаў. Яны баяцца за сваіх немаўлятак, як могуць аберагаюць іх.

Птушка спявае, каб прыклікаць іншую птушку і разам віць гняздзечка. Самец-птушка (тата) шукае галінкі і іншы патрэбны матэрыял для гнязда, а птушка-самка (мама) сцеражэ яго, сочыць, каб ніхто чужы не заляцеў у яго. А таго, хто туды трапіць, яна будзе кляваць сваёй дзюбкай.

Людзі заўважылі, што маленькія птушкі спяваюць прыгажэй і мілагучней за вялікіх. Птушкі спяваюць і перакліквающца па-рознаму. Дакладна ніхто з нас не ведае,

пра што яны гавораць, спяваючы. Лепш за ўсё ведаюць пра гэта вучоныя, якія вывучаюць жыццё і звычкі птушак. Яны называюцца арнітолагі, а навука пра птушак называецца — арніталогія. Ці хацеў бы ты, Сяргейка, быць арнітолагам?

Ці чулі вы, як спявае жаваранак? Паслухайце верш пра жаваранка:

Ён у лузе, ён на полі,
Зранку лётае на волі,
Звонка песні распявае,
Імі дзетак ён вітае.

### ПАВЕТРА ЎСЮДЫ ВАКОЛ НАС

Чым мы дыхаем? Так, дыхаем паветрам. Без паветра мы не можам жыць. Без паветра не могуць жыць жывёлы. Без паветра не могуць жыць расліны. Усе мы ўдыхаем паветра і выдыхаем яго. Давайце так і зробім: удыхнём і выдыхнем. Усё жывое патрабуе паветра. Усё, што жыве, дыхае паветрам. Мы дыхаем носам, а расліны лісточкамі. Без паветра і агонь не гарыць. Вось мы запалім свечку, і яна гарыць. А калі мы, напрыклад, накрыем свечку шклянкай, яна згасне. Вы бачылі, як хто-небудзь, калі распальвае печ ці вогнішча, дык дзьме ў агонь? Навошта ён так робіць? Каб было больш паветра, каб лепш гарэў агонь.

Паветра ўсюды вакол нас: і дома, і на вуліцы, і ў зямлі ёсць паветра. Але мы не бачым паветра, толькі адчуваем яго. Мы адчуваем яго, калі бяжым альбо калі сушым валасы фенам, як памыем галаву.

Паветра ёсць усюды. Вось паглядзіце на гэты кубачак. Там пуста. Там няма ні вады, ні соку, ні малака, ні вяршкоў, ні кампоту. Але ж там ёсць паветра. Толькі мы яго не бачым. Цікава, праўда?

А яшчэ трэба ведаць, што мы павінны дыхаць чыстым паветрам. Калі паветра бруднае, дык людзі, жывёлы, расліны хварэюць. Пыл, дым, газы забруджваюць паветра. Расліны, дрэвы, кветкі ачышчаюць паветра.

Пра што мы гутарылі з вамі?

Мы бачым ці адчуваем паветра?

Навошта нам патрэбнае паветра? Ці могуць жыць без паветра людзі, жывёлы, расліны?

Як вы думаеце, чаму кажуць: «Лес — сябар чалавека»? Ці ачышчае ён паветра? А што яго забруджвае?

## БЕЗ ВАДЫ ЧАЛАВЕК НЕ МОЖА ЖЫЦЬ

Ці можам мы з вамі жыць без вады? А ці могуць жыць без вады жывёлы, птушкі? А расліны могуць жыць без вады? Без вады ніхто не можа жыць. Чалавек без вады памрэ ад смагі. Жывёліна таксама загіне ад смагі без вады. Расліна завяне, засохне без вады. Паўторым разам: «Без вады жывая істота жыць не можа».

Мы п'ём ваду, каб не памерці ад смагі. А яшчэ навошта нам вада? Ці любіце вы плюхацца ў вадзе? У ванне? У начоўках? У рэчцы? У возеры? У моры? Яшчэ як любіце! Ажно пішчыце ад асалоды. А навошта мы мыемся, купаемся? Не толькі для прыемнасці, для асалоды, а яшчэ для таго, каб быць чыстым. А чыстым трэба быць, каб быць здаровым.

Вадою мы мыем вопратку, посуд, бялізну. Усё бруднае мыецца вадою.

Мы ўжываем ваду, каб згатаваць суп, чай (гарбату), каву, кашу, бульбу. Многія іншыя стравы гатуем з вадою.

Мы гутарылі пра ваду. Без вады не можа жыць чалавек. Без вады не можа жыць жывёліна. Без вады не можа жыць расліна.

Назавіце, калі ласка, пяць выпадкаў, калі мы карыстаемся вадой.

А цяпер паслухайце прыказкі, і вы яшчэ больш будзеце ведаць пра ваду. Спачатку паслухайце, а потым мы разам і паасобку паўторым усе тры прыказкі.

*Вада камень прабівае.* Вада мае вялікую сілу. Па кроплі капаючы на адно месца, яна нават камень зробіць шчарбатым.

*Дзе вада, там і вярба.* Вярба любіць вадзіцу, часцей за ўсё расце блізка ад вады.

*Дзе вада, там і бяда.* Як гэта разумець? Часам вясной і восенню бываюць паводкі. Вада затапляе палі, вёскі, гарады. Тады прыходзіць да людзей бяда. Або вы адчынілі кран і забыліся яго зачыніць. Вада залье кватэру, папсуе рэчы, мэблю, падлогу. Трэба будзе рабіць рамонт, купляць новыя рэчы, траціць

час, сілы. А яшчэ горш, калі вада зальс чужую кватэру. Ну і бяды тады будзе!

## ПАСАДЗІШ ЗЯРНЯТКА — ВЫРАСЦЕ РАСЛІНА

Кожнае зярнятка, кожная бульбінка, кожная цыбулінка, гарошынка мае ў сабе жыццё. Гэта жыццё спіць. Спіць да пары да часу. Зямля, вада і сонца абуджаюць жыццё, і вырастае расліна.

Гэта ўбачыла сваімі вачыма Аленка, мая суседка. Яна ўзяла гаршчочак і насыпала туды зямлі, якую ўзяла летам з агароду. Тады пасадзіла гарошынку і сказала: «Расці, гарошынка!» Паліла яе вадзіцай і паставіла на падаконнік на сонейка. Кожны дзень дзяўчынка палівала зямельку. Кожны дзень свяціла на гаршчочак сонейка. І хутка паявіліся зялёненькія лісточкі. Аленка вітала іх кожную раніцу, кажучы: «Добры дзянёк, лісточкі! З панядзелачкам вас! З аўторачкам! Я вас вадзічкай напаю. А сонейка вас пагрэе. Расці, гарошынка!»

Так і расла гарошынка. Якая яна вырасла?

Дык што трэба мець і што рабіць, каб вырасла раслінка?

Ці ёсць у вас у хаце вазоны? Ці паліваеш ты іх? Дзе яны стаяць: на сонейку ці ў цянёчку?

Давайце адгадаем дзве загадкі і вывучым іх на памяць. Раскажам дома, няхай усе адгадваюць.

Я зярнятка пасадзіла,
Паліваць яго хадзіла.
А цяпер гляджу ў аконца —
Вырасла ў гародзе сонца! *(Сланечнік.)*

Адзін лье, другі п’е, а трэці паглынае. *(Дождж. Зямля. Расліны.)*

Паслухайце вершык пра дожджык, які поіць вадзічкай расліны, і скажыце, ці спадабаўся ён вам.

Дождж ык,
Дождж ык!
Лі!
Аж па ўсёй зямлі!
Травы ў рост пусці!
Дай падрасці
жыту,
гароху
І хлопчыку Цімоху!!!

Мы кажам: «Дожджык ідзе. Дожджык лье. Дожджык сыпле. Дождж (вымаўляй: дошч) сячэ». Папросім, каб дожджык пайшоў:

Дожджык, ідзі, дожджык, ідзі.
Дожджык, лі, дожджык, лі.
Дожджык, сып, дожджык, сып.
Дожджык сячы, дожджык, сячы.

Цяпер скажам так:

Дожджык ідзе па ўсёй зямлі.
Дожджык лье па ўсёй зямлі.
Дожджык дапамагае расці травам, жыту, гароху.
Дожджык пускае ў рост травы, жыта і гарох.
Як ідзе дожджык, дык падрастае жыта, трава, гарох.

А цяпер вывучым верш. Пасля хто-небудзь расказа нам яго прыгожа, а мы папляскаем у далоні, калі нам спадабаецца.

## ЯКІ ПРЫГОЖЫ РАСЛІННЫ СВЕТ

Раслінай называецца ўсё тое, што расце: жыта, пшаніца, трава, кусты і кусцікі, ягаднік, дзе ягады выспяваюць, кветкі, гародніна.

Раслін багата — цэлы свет. Усе яны нам патрэбныя. Мы з вамі павінны берагчы раслінны свет. Без раслін мы жыць не можам.

Расліны, як людзі і жывёлы, розныя. Ёсць вялікія і малыя, духмяныя і без паху, рознага колеру і формы. Усе расліны прыгожыя па-свойму.

Пра расліны складзена шмат загадак. Але спачатку мы сёе-тое прыгадаем, каб лягчэй было адгадаць загадкі.

Якія мы любім ягады? Чарніцы, суніцы, клубніцы, агрэст, вішні, парэчкі, маліны, ажыны.

Якую мы любім есці гародніну? Так. Моркву, цыбулю, часнок, буракі, капусту, бульбу, пятрушку, кроп, гуркі.

А булкі мы таксама любім? Мы ведаем, што булка пячэцца з мукі. Мука мелецца з зярнятак пшаніцы. Пшаніца — гэта расліна, якая вырастае таксама з зярнятак. Гэтыя зярняткі поіць вадзіца, саграваe сонейка і даглядае чалавек. Зярняткі выспяваюць у каласках.

Вось бачыце, як цікава ўсё ведаць пра расліны.

А цяпер нам лёгка будзе адгадаць загадкі.

Ляжыць груша ў чырвоным кажушку, хто яе ўкусіць, той плакаць мусіць. *(Цыбуля.)*

Баран у хляве, яго рогі на дварэ. *(Часнок.)*

Лата на лаце і шва не знайсці. *(Капуста.)*

Хата пуката, поўна вераб'ёў нагната. *(Гарбуз.)*

Сама панна ў каморы, а яе косы на дварэ. *(Морква.)*

Поўна бочачка круп, а на версе струп. *(Мак.)*

Я на сонейка падобны,
А для ўсіх ласунак добры.
Не тады, калі свячуся,
А як згасну і сагнуся. *(Сланечнік.)*

Сядзіць сабе на лужку
У чырвоным каптурку.
Хто ні пройдзе —
Спыніць крок,
Каб сарваць той каптурок. *(Суніца.)*

### ДРЭВА — ТАКСАМА РАСЛІНА

Дрэва расце, а ўсё, што расце, — расліна. Таму дрэва расліна. Якія мы ведаем дрэвы? Дуб, клён, ліпа, бяроза, хвоя (сасна), елка, каштан. Гэтыя дрэвы растуць у нас, у Беларусі. А на свеце шмат краін. У краінах, якія далёка ад нас, іншая зямля, інакш сонца свеціць, інакшыя дажджы ідуць. Таму і расліны там іншыя, і дрэвы там іншыя. У паўднёвых краінах растуць бананавыя, лімонныя дрэвы, пальмы, эўкаліпты.

А што нам даюць нашы дрэвы, тыя, што растуць у нашых лясах, у нашых пушчах? Дрэвы даюць нам будаўнічы матэрыял. З гэтага матэрыялу будуюць дамы, робяць мэблю. З дрэва робяць паперу, а з паперы шпалеры, якімі мы абклейваем сцены ў пакоі, каб нам было прыемна, утульна. З паперы робяць кнігі, якія мы з вамі так любім чытаць. А што мы чытаем у кнігах? Казкі, апавяданні, вершы. З паперы робяць сшыткі, у якіх мы пішам і малюем. Яшчэ шмат чаго добрага і патрэбнага робяць з дрэва.

Дрэвы даюць нам садавіну: яблыкі, грушы, вішні, слівы. Пад дрэвам у цянёчку можна адпачыць: пасядзець ці паляжаць летам. Дрэвы ачышчаюць паветра. Дрэвы ўпрыгожваюць наша жыццё. А без прыгажосці ці можна жыць?

Адгадайце, калі ласка, загадку: «Усе паны паскідалі жупаны, толькі трое ў жупанах стаяць». *(Сасна, елка, ядловец зімой.)*

## ГАДЗІННІК І ЧАС

Ці патрэбны нам гадзіннік? Навошта ён? Вось у мяне на руцэ ручны гадзіннік. Дома ёсць гадзіннік на сцяне — насценны гадзіннік. Ёсць яшчэ адзін гадзіннік, на століку стаіць. Настольны гадзіннік. Усе гэтыя гадзіннікі паказваюць час. Паказваюць нам, якая цяпер гадзіна.

Калі вам трэба ведаць, якая гадзіна, вы запытаецеся: «Скажыце, калі ласка, колькі цяпер часу?» Альбо: «Якая гадзіна, скажыце, калі ласка?» Я пагляджу на гадзіннік на левай руцэ, стрэлкі пакажуць мне на лічбы, і я вам адкажу: «Роўна гадзіна», «Якраз гадзіна», «Акурат гадзіна». Альбо скажу: «Дзве гадзіны», «Тры гадзіны», «Пяць гадзін», «Дзесяць гадзін».

Запытайцеся ў мяне цяпер: — «Скажыце, калі ласка, колькі часу?» Я вам адкажу: «Дваццаць хвілін на дванаццатую», «Палова дванаццатай», «Без чвэрці дванаццаць».

А што вы мне адкажаце? Так. Вы мне скажаце: «Дзякую вам».

А цяпер вы мне адкажыце: «У які час (у колькі гадзін, а каторай гадзіне) мы з вамі абедаем?» — «Мы абедаем а першай гадзіне (у гадзіну дня)». Давайце паўторым хорам:

Мы ўстаём а сёмай гадзіне.

Мы абедаем а першай гадзіне.

Мы ідзём спаць а дзявятай гадзіне.

Вечарам або раніцай гадзіннік трэба завесці, каб ён не спыніўся, каб не пазніўся. А то, як спозніцца гадзіннік, дык і мы спознімся. Пазніцца нядобра. Пазніцца не ветліва. «Лепш зарана, як запозна». Лепш устаць зарана, як запозна. Лепш зарана прыйсці ў садок. І спаць легчы лепш раней, як пазней. А калі вам, напрыклад, трэба ехаць цягніком, а вы спозніцеся хоць на адну хвіліну, дык што будзе? Так, цягнік пойдзе без вас. Дык якую мы прыказку запомнім? «Лепш зарана, як запозна».

Адгадайце загадкі.

Ідзе круглыя суткі, не стаіць ні мінуткі, а ўсё на адным месцы. *(Гадзіннік.)*

Якое лісце ўдзень па аднаму лістку асыпаецца. *(Каляндар.)*

## РЭЧЫ І МАТЭРЫЯЛЫ

Вакол нас розныя рэчы. Давайце іх назавём. Нам лягчэй называць тое, што мы бачым, тое, што перад намі ці на нас. Вось стол. Крэслы. Крэсельцы. Лямпа. Кубачак. Ваза. Шклянка. Партфель. Кніга. Сшытак. Аловак. Кашуля. Блузка. Спадніца. Світэр. Панчошкі. Чаравікі. Туфлі. Рэмень.

А цяпер давайце падумаем, з чаго рэчы зроблены? Яны зроблены з розных матэрыялаў. Назавём гэтыя матэрыялы: дрэва, шкло, скура, воўна, лён, гліна. З чаго робяцца розныя рэчы? Са шкла. Са скуры. З дрэва. З воўны. З лёну. З бавоўны. З гліны.

Якія рэчы зроблены са шкла? Што робіцца са шкла? (Лямпы, шыбы, вазы, шклянкі, слоікі.)

Якія рэчы зроблены са скуры? Што робіцца са скуры? (Рамні, партфелі, туфлі, чаравікі, пантофлі, раменьчыкі для гадзінніка, дамскія сумкі.)

Якія рэчы зроблены з лёну? Што робіцца з лёну? (Кашуля, ручнік, прасціна, падкоўдранік, абрус, сурвэткі, шторы.)

Якія рэчы зроблены з бавоўны? Што робіцца з бавоўны? (Панчохі, шкарпэткі, блузкі, сукенкі.)

Якія рэчы зроблены з шэрсці (воўны)? Што робіцца з шэрсці (воўны)? (Світэры, цёплыя шкарпэткі, калготкі, шапкі, шалікі.)

Якія рэчы зроблены з гліны? Што робіцца з гліны? (Вазы, кубачкі, жбаны, міскі.)

Шкло выплаўляюць у печах з пяску, соды і вапны. Бавоўну здабываюць з раслін. А дзе людзі бяруць скуру і шэрсць? (Скуру і шэрсць людзям даюць жывёлы.) А дзе здабываюць гліну? (Гліну знаходзяць у зямлі.)

Вось малайцы! Добра мне падказваеце, дапамагаеце.

Цяпер паслухайце вершык.

Го-го-го, гусачок!
Зрабі хлопчыку свісток.
З беласнежнага крыла
Ды з бліскучага пяра.

І зрабіў ён, і падаў,
І сыночак зайграў.

Хто зрабіў хлопчыку свісток?
З чаго зроблены свісток?

Чый сыночак зайграў на свісточку, які быў зроблены з птушынага крыла?

Ці хацеў бы ты пайграць на такім свістку?

Давайце крыху пагутарым, а тады я вам прачытаю яшчэ адзін вершык.

Вы ведаеце, што такое жбан? Так. У жбан можна наліць малака. А яшчэ чаго можна наліць у жбан? (Вады.) А дзе вада бывае? Вада бывае ў калодзежы. А яшчэ дзе бывае вада? (У рэчцы, у моры, у возеры, у крыніцы.) А якая вада ў крыніцы? (Чыстая, халодная.)

Вы ведаеце, што ганчар робіць жбаны, гаршкі. А з чаго ганчар робіць жбаны і гаршкі? Хочаце паслухаць, як адзін хлопчык прасіў ганчара зрабіць яму жбан? Які жбан? Гэта вы даведаецеся з вершыка.

Ганчар Сцяпан,
Зрабі мне жбан!
Каб гудзеў дудой!
Каб паіў вадой,
Чыстай халоднай —
З крынічанькі роднай...

Як завуць ганчара, якога хлопчык прасіў зрабіць яму жбан?

Што хлопчык будзе трымаць у гэтым жбане?

Якую вадзічку? З якой крынічанькі?

А яшчэ хлопчык хацеў, каб яго жбан гудзеў дудой. Смешна, праўда?

Як ты думаеш, ганчар Сцяпан зробіць яму такі жбан ці не?

Як бы вы назвалі гэты вершык (які б загаловак прыдумалі)?

### АДЗЕННЕ І АБУТАК

Мы носім ніжняе (сподняе) адзенне і верхняе. Верхняе адзенне бывае святочнае і будзённае. Святочнае адзенне мы апранаем у святы, а будзённае ў будні. Які сёння дзень — святочны ці будзённы? Я вам задам простае пытанне: навошта мы апранаемся? Так. Каб прыкрыць сваё цела. Каб нам было і прыгажэй, і зручней, і здаравей, і цяплей.

Давайце прыгадаем, як называецца наша сподняе адзенне — бялізна. І дзяўчынкі, і хлопчыкі носяць ка-

шулькі. І дзяўчынкі, і хлопчыкі носяць майкі, футболкі. І дзяўчынкі, і хлопчыкі носяць трусікі. І дзяўчынкі, і хлопчыкі носяць калготкі. На ноч адзяюць начныя кашулі ці піжамы.

Давайце прыгадаем, якое верхняе адзенне мы носім.

Дзяўчынкі носяць сукенкі (сукеначкі), спаднічкі з блузкамі, світэрамі ці маечкамі. Акрамя спаднічкі, надзяюць доўгія штаны (порткі), джынсы ці шорты. Каб аздобіць адзенне, прывязваюць да блузкі ці сукенкі бант, надзяюць белы каўнерык, а ў косы ўплятаюць стужкі і завязваюць у банцікі.

Хлопчыкі носяць доўгія ці кароткія штаны (порткі), кашулю (сарочку) з камізэлькай ці без яе, майкі, світэры. Большыя хлопчыкі завязваюць гальштукі.

У халоднае надвор'е і дзяўчынкі, і хлопчыкі апранаюць паліто, плашч, куртку. У вельмі халоднае надвор'е апранаюцца ў футра. На галаву і дзяўчынкі, і хлопчыкі надзяваюць шапку ці берэт. Дзяўчынкі часам носяць капялюшыкі ці завязваюць хусткі. На шыю завязваюць (надзяваюць) шалік.

Скажыце, калі ласка, дзяўчынкі і хлопчыкі, што мы яшчэ не адзелі, ці лепш сказаць, не абулі? Так. Ногі не абулі. На ногі мы абуваем боты, валёнкі з галёшамі, туфлі, красоўкі, сандалі, басаножкі, пантофлі (хатнія туфлі, тапкі), чаравікі. Калі мы абуваем валёнкі, а калі басаножкі?

Мы ўжо ведаем, што і калі мы апранаем. А цяпер пагутарым пра наша адзенне і абутак. З чаго, з якога матэрыялу шыецца наша адзенне? Падказвайце, калі ласка. (З шэрсці, з лёну, з бавоўны, з нейлону, з шоўку, са скуры.)

Усё, што мы носім, павінна быць чыстае. Ці не так? А хто павінен нам усё чысціць? Ці згадзіцеся вы са мною, калі я скажу: усё, што мы можам, мы павінны рабіць самі? Ці ведаеце вы, што той, хто неахайны, не мыецца, носіць брудную вопратку і абутак, называецца мурза? Давайце скажам разам: «Мы будзем ахайныя».

Мы ўсе апранаемся аднолькава ці па-рознаму? Так. Мы апранаемся па-рознаму. Бо ў нас розныя густы. Мы любім розныя фасоны, розныя колеры.

І яшчэ адно пытанне да дзяўчынак: якую вы хацелі б мець спадніцу? Чырвоную? Блакітную? Ружовую? Квяцістую? Паласатую? У крапінку (у кружочкі, гарох) ці ў клетачку?

А цяпер паслухайце вершык.

**Абнова**

Мне купілі чаравічкі,
Як чырвоныя сунічкі!
Заўтра рана-ўранку
Стану я на ганку,
Па баках пагляджу,
А чаму — не скажу!

Дык чаму дзяўчынка выйшла з самага ранку, стаіць на ганку і глядзіць па баках?

## НАШЫ ІМЁНЫ

Кожнаму дзіцяці, калі яно з'яўляецца на свет, даюць імя. Усе родныя: маці, бацька, дзядулі і бабулі, сёстры і браты прымаюць удзел у выбары імені. Успамінаюць розныя імёны, выбіраюць іх з календароў і кніжак, прыгадваюць імёны сваіх дзядоў і прадзедаў, бабак і прабабак. На Беларусі лічылі, што з імем звязаны лёс чалавека, яго шчасце, сіла, розум. Вось і думалі, як найлепш назваць сваё дзіця: Юрась ці Міхась, Ігнат ці Кандрат, Змітрок ці Рыгор, Яраш ці Ян; Рагнеда ці Міхаліна, Барбара ці Караліна, Адэля ці Марыля, Тацццяна ці Люцына, Кацярына ці Гэля, Алена ці Настуля, Вольга ці Аліна.

А як бы вы назвалі сваю сястрычку? Брацiка?

Дарослых часта завуць інакш, як маленькіх. Вось, напрыклад, маленькі хлопчык Міхаська, Міхасёк. Ён падрастае і яго завуць Міхал, Міхалка. Маленькі — Яначка, Янучок, а старэйшы — Янка, а яшчэ падрасце — Янук, Ян, Іван. Маленькі — Міця, Змітрык, а старэйшы — Зміцер, Змітрок. Маленькая — Каця, а старэйшая — Кацярына. Ганначка, Ганка робіцца Ганнай.

Вельмі часта ў сям'і жаночае ці мужчынскае імя перадавалася з пакалення ў пакаленне. Хлопчыку давалі імя дзядулі, бацькі, а дзяўчынцы імя бабулі ці прабабкі.

А ці ведаеце вы, як завуць вашых тату і маму, бабулю і дзядулю, старэйшых вашых сваякоў? Хто выбраў тваё імя, Ануля? А тваё, Волечка? А тваё, Лявонка?

Даўней усіх дзяцей хрысцілі ў царкве. Там і давалі ім імёны. У кожнага дзіцяці былі хросны (хрышчоны) бацька і хросная (хрышчоная) матка. Яны вазілі дзіця

ў царкву хрысціць. Хрышчоных бацьку і маці дзеці паважалі, клікалі ў госці, адведвалі іх, называлі татам і мамай.

У дзень хрышчэння дзіцяці дома збіраліся сваякі, суседзі і святкавалі хрэсьбіны. Гэта было вясёлае свята са сваімі песнямі і жартамі, са сваімі абрадамі.

На зямлі многа розных народаў і ўсе народы маюць свае імёны. Яны іх любяць, шануюць, не забываюць.

Давайце паслухаем, як яны гучаць. Англійская дзяўчынка: Джэйн, Нэнсі, Эліс, Кэйт. Англійскі хлопчык: Джон, Джэк, Боб, Том. Польскі хлопчык: Яцэк, Збышак, Болек. Польская дзяўчынка: Ханка, Марыся, Люцына. Нямецкі хлопчык: Фрыц, Карл, Фрыдрых. Нямецкая дзяўчынка: Эльза, Марта, Грэтхен. Французскі хлопчык: Андрэ, Жульен, Жак, Жан. Французская дзяўчынка: Франсуаза, Клацільда, Рашэль, Элаіз.

Бачыце, якія розныя ёсць на свеце імёны. Усе яны мілагучныя, прыгожыя. Але для кожнага чалавека сваё імя найпрыгажэйшае.

## СВОЙСКІЯ ЖЫВЁЛЫ

Ёсць жывёлы дзікія і ёсць жывёлы свойскія.

Якія гэта свойскія жывёлы? І навошта мы трымаем гэтых жывёл: коней, кароў, авец, сабак, катоў і г. д. Мы трымаем іх для нашага дабра. Жывёлы нам патрэбныя. Яны нашы сябры.

Мы трымаем дома сабак, катоў, як сваіх любімчыкаў, як сваіх пестункоў. Яны прыносяць нам не толькі карысць, але і задавальненне, добры настрой.

Сяляне трымаюць карову, казу, каб мець малако. Мы з вамі вельмі любім малачко. Так? З малака, як вядома, робяць смятану, кефір, сыр, масла. Курэй, качак, гусей трымаюць для таго, каб мець яйкі. Коні, вярблюды, аслы, мулы перавозяць усялякія грузы.

Усе гэтыя жывёлы: сабакі, каты, козы, каровы, коні, авечкі, свінні вельмі патрэбныя чалавеку. Усіх жывёл трэба даглядаць і любіць.

А цяпер паглядзім, хто з вас самы здагадлівы, хто адкажа на мае пытанні.

Хто з вас назаве хатнія птушкі, якія даюць нам яйкі?

Хто ведае чатыры жывёліны, што даюць нам мяса?

**Хто назаве жывёліну, што працуе на полі разам з гаспадаром (арэ, возіць усялякія грузы)?**

Адгадайце загадкі. Спадзяюся, што вы пазнаеце ўсіх жывёл, пра якіх тут ідзе размова.

Пасярод двара стаіць гара, спераду вілы, ззаду мятла. *(Карова.)*

Хто ўсё стогне, а не хворы. *(Свіння.)*

А вось гэту загадку хто адгадае, той цукерку атрымае:

Што гэта за звер, што мае шэсць ног, дзве галавы, адзін хвост? *(Чалавек на кані.)*

Цяпер вы будзеце адгадваць, хто жыве ў вясковым двары па тым, як гавораць жывёлы. Апавяданне адно, а загадак у ім многа. Калі ласка, адгадвайце.

Першы прачынаецца наш пявун, чырвоны грабянец, чырвоная бародка. Крыламі махае, усіх падымае:

— Кукарэку! Кукарэку! Хопіць ляжаць на баку, недарэкі! Уставайце, сонца сустракайце!

Хто гэта такі?

А яму ў адказ вартаўнік кудлаты пад ганкам, вушы тарчма, хвост абаранкам.

— Гаў, гаў! Я не спаў! Хату вартаваў!

Хто гэта такі?

На лаўцы вусач прачнуўся, соладка пацягнуўся:

— Мяў, мяў! Рана падняў мяне, рана! Якраз прыснілася сажалка з адной смятаны!

Хто гэта такі?

А рагуля галаву падняла, супакойваць пачала:

— Му-у! Я гору твайму памагу! Пачастую малачком, пачакай, калі прыйдзе гаспадыня з вядром!

Хто гэта такая?

Выскачыў з хлява беленькі круглячок, замест носа — пятачок:

— Рох-рох! І я люблю малаком частавацца. А яшчэ люблю ў лужыне паваляцца!

Хто гэта такі?

Не паспеў ён у лужыну кінуцца, як чырванадзюбы шчыпач ляціць:

— Га-га-га! Гэта лужына мая! Прашу не чапаць, а то буду шчыпаць!

Хто гэта такі?

Можа б і да сваркі справа дайшла, ды тут выкаціўся на двор трохколавы веласіпед. А на ім

хлопчык вясёлы. Усім рады, нікога ніколі не крыўдзіць.

Хто такі?

— Гэта я! — кажа Арсенька, кучаравы, загарэлы, дужы вясковы хлопчык.

## ДЗІКІЯ ЗВЯРЫ

Ці ведаеце вы, дзе жывуць ваўкі, мядзведзі, ільвы, тыгры, леапарды, лісы, малпы, зайцы, алені, дзікія козы? Так, так. Усе яны жывуць у лясах, пушчах, джунглях. Гэта дзікія звяры (жывёліны). Чаму яны называюцца дзікія? Яны не свойскія, яны не жывуць побач з чалавекам. Іх усіх, за выключэннем зайчыка, чалавек баіцца. І яны баяцца чалавека.

Усе гэтыя звяры розныя. Розныя і па памерах, і па выглядзе, і па густах, і па звычках, і па сіле. Адны маленькія, бездапаможныя, як, напрыклад, зайчык. Ёсць — вялікія, напрыклад слон. Дужыя, злосныя — мядзведзь, тыгр, леў, воўк. Адны паласатыя — зебра, тыгр. Другія плямістыя — алень, леапард. Ёсць прыгожыя, зграбныя — алень, лісіца, вавёрка. А вожык? Ці прыгожы ён?

Густы звяроў таксама розныя. Адны з іх любяць есці траву, расліны. Другія любяць мяса. Такія жывёлы называюцца драпежныя. Яны палююць на іншых жывёл, часам на чалавека. Але адзін аднаго яны не ядуць. Тыгр не будзе есці тыгра, а воўк ваўка. Дзікія жывёлы баяцца агню. Ад вогнішча яны ўцякаюць. Таму людзі часам ратуюцца ад іх з дапамогай агню.

Адгадайце, калі ласка, загадкі:

Улетку шэранькі, узімку беленькі.
Доўгія вушы мае, хутка ў лес уцякае.

А чаму зайчык мяняе колер свайго футра? Чаму зайчык у лес уцякае? Каго ён баіцца?

Спаць кладзецца, скіне тапак —
І паціху смокча лапу,
А вясна дыхне ледзь-ледзь —
Прачынаецца... *(мядзведзь)*.

А цяпер прачытаем верш пра тое, як пайшла курка да лісічкі ў госці. Што з ёю здарылася? Пабачым. Напісаў гэты верш Станіслаў Шушкевіч.

Запрашала ліска курку
Да сябе у госці:
— Выйдзі, цыпка, за рэчаньку,
За клянovы мосцік.

А я ж цябе пачастую
Грэчкай і пшаніцай,
За гарою з крынічанькі
Напаю вадзіцай.
Падмяла я сцяжыначкі,
Падмяла дарожкі.
Ідзі, курка, ступай смела,
Не паколеш ножкі.
Разаслана на ўзгорачку
Мяккая салома,
Ты ж у мяне заначуеш
Куды лепш, чым дома.

Пайшла курка да лісічкі
За клянovы мосцік.
Засталіся ад курачкі
Кіпцюры ды хвосцік.

Ці шкадуеце вы курачку-небараку?

## ХТО ТАКІЯ ГРЫЗУНЫ

Мышы, пацукі, вавёркі, трусы называюцца грызунамі. Чаму яны так называюцца? Адгадаць лёгка. Таму, што яны грызуць. А што яны грызуць?

Мы ўжо з вамі ведаем, што на свеце ўсё featureнае. Розныя людзі. Розныя расліны. Розныя звяры. А таму мы можам сказаць, што грызуны таксама розныя і густы ў іх розныя. Адны любяць грызці арэшкі, другія морkaўку, а трэція — тое, што трапіцца.

Вавёркі грызуць арэшкі, высушаныя ягады, грыбы. Вы, пэўна, усе бачылі вавёрачак: хто ў лесе, а хто ў парку. Трусы любяць моркву, капусту, буракі. Многія з вас кармілі трусікаў. А можа, у каго з вас дома ёсць трусікі-пестункі?

Пацукі і мышы грызуць усё. Яны грызуць усялякія прадукты, усё, што трапляецца.

А чым грызуны грызуць? У іх ёсць хоць маленькія, але востранькія зубкі. А хто ім дае тое, што яны могуць

згрызці? Якія грызуны самі сабе шукаюць ежу? Хто ж мышку ці пацука будзе карміць? Ніхто, вядома. Як кажа прыказка: «Мышка есці не просіць, сама сабе наносіць».

А цяпер адгадаем загадкі.

Маленькі шарык
Пад лаўкаю шарыць,
Збірае крошкі,
Баіцца кошкі. *(Мыш.)*

З ялінкі на ялінку,
З галінкі на галінку
Скача агеньчык жывы.
Хто гэта? Знаеце вы? *(Вавёрка.)*

Назбірала арэхаў
Пяць мяхоў і паўмеха.
Насушыла грыбоў
Аж дванаццаць карабоў,
Нацягала мышак горку
Працавітая... *(вавёрка).*

Паслухайце тры вершы. Які вам найбольш падабаецца, той і вывучым.

**Мышка-хітруха**

Забраўся каток
Ў далёкі куток,
Схаваўся ў зацішку,
Каб высачыць мышку.
А мышка — хітруха
Навастрыла вуха.
А катка пачула —
Хвосцікам вільнула
І ў той жа міг
У дзірачку — шмыг.

**Хто я?**

Залацістыя арэхі
Прыхавала я ў дупло:
Дождж ліне, нібы з прарэхі, —
Дык каб іх не заліло.
Смела сцюжу сустракаю,
Не палохае мароз,
Бо запас арэхаў маю
І, як коўдру, — цёплы хвост.

### Я хамяк

Мыш не мыш, жыву я ў полі,
Ветрам дыхаю на волі,
За шчакой кішэню маю,
Яе зернем напаўняю.

### ХТО НЕ ХОДЗІЦЬ, А ПОЎЗАЕ

Ёсць на свеце жывёлы, якія не ходзяць, не бегаюць, не плаваюць, не лятаюць, а поўзаюць. Яны называюцца паўзуны.

Мы з вамі ведаем, што такое паўзункі. Так? Хто іх носіць? Маленькія дзеткі, якія яшчэ на ўмеюць хадзіць. Яны ўмеюць толькі поўзаць. Вось і шыюць ім паўзункі. Цікава, праўда?

Паўзункі — гэта адзенне для дзяцей, а паўзуны — гэта жывёлы, якія не ходзяць, а поўзаюць. Яны хоць і вялікія, дарослыя, а поўзаюць. Поўзаюць яны і па зямлі, і па дрэвах. Поўзаюць паволі. Што гэта за жывёлы? Гэта чарвякі, кракадзілы, хамелеоны, чарапахі. Змяя (гадзюка, вуж) таксама поўзае, але яна можа паўзці хутка, так, што не дагнаць.

Паўзуны поўзаюць зусім ціха, бясшумна. Гэта небяспечна для чалавека. На паўзуна, напрыклад на змяю, можна наступіць. І што яна зробіць? Укусіць. А гэта вельмі небяспечна. Чалавек ад укусу змяі можа памерці. А калі змяя і не ўкусіць, дык напалохае, як наступіш на яе. Таму трэба хадзіць па лесе, каля рэчкі асцярожна, быць уважлівым, глядзець сабе пад ногі.

А цяпер паслухаем верш пра чарапаху Паўла Марціновіча.

— Небарака чарапаха,
Што стаілася пад дахам?
Нейкі домік твой нягеглы,
Не з камення і не з цэглы.
Ані белы, ні ружовы,
Ды, здаецца, і не новы.
Кідай гэтую хаціну!
— Родны домік я не кіну!
Хай са мной вандруе хатка,
Як турысцкая палатка.

А ці можа чарапаха, калі б захацела, скінуць і пакінуць свой домік?

Чаму чарапаха называецца ў вершы небаракай?
Адгадаем загадкі.

Адгадайце, носіць хто
Касцяное паліто?
Робяць з яго прадаўцы
Гузікі і грабянцы. *(Чарапаха.)*

Без рук, без ног, а па зямлі паўзе. *(Чарвяк.)*
Сіненькі конік, не паедзеш, не пагладзіш. *(Вуж.)*
Бяжыць, сіпіць. *(Змяя.)*
Хоць малая, ды дужая: з сабой хату носіць. *(Чарапаха.)*

## РЫБЫ

Дзе жывуць рыбы? У вадзе. А дзе вада? У рэчцы, у возеры, у моры, у акіяне. Адны рыбы любяць жыць у халоднай вадзе, а другія рыбы любяць жыць у цёплай вадзе. Адны рыбы любяць жыць у салёнай вадзе, а другія рыбы любяць жыць у прэснай вадзе.

Усе рыбы плаваюць. Але плаваюць яны таксама па-рознаму. Адны рыбы плаваюць каля паверхні вады, а другія — глыбока ў цёмным акіяне. Адны плаваюць павольна, а другія шпарка.

І па форме рыбы розныя. Ёсць рыбы круглыя, як кола, а ёсць рыбы трохвугольныя. Ёсць рыбы пляскатыя, як аладкі. А ёсць рыбы падобныя на вужаку.

Мы любім есці рыбу. Рыба асабліва смачная, засмажаная на алеі. Вы любіце есці смажаную рыбу?

Многія дзеці трымаюць рыбак у акварыуме. «Аква» на лацінскай мове значыць вада. Акварыум — гэта шкляны посуд, наліты вадой і напоўнены рознымі раслінамі — ежай для рыбы. Дзеці самі чысцяць акварыумы, мяняюць ваду, каб яна была свежая, чыстая, каб рыбы ў акварыуме жылі, як у рэчцы ўсё роўна. Дзеці любяць сваіх рыбак. Назіраюць за імі, цешацца з іх.

Якіх рыб вы ведаеце? Як яны называюцца? (Шчупакі, карпы, уюны, акуні, ляшчы.)

Паслухаем верш. Яго напісаў Павел Марціновіч. Верш называецца «Краб».

Краба я злавіў
І храбра
Захацеў

Стаць сябрам
Краба.
Я яму сваю руку
Працягнуў
Як сябруку.
Варухнуўся раптам
Краб
Ды мяне па пальцу
Шкраб:

З гэткім сябрам
Будзе гора.
Кіну краба
Зноў у мора.

Ці спадабаўся вам гэты верш? Пра каго гэты верш? Калі хлопчык (назавём яго Казік) захацеў пасябраваць з крабам: да таго, як злавіў або пасля? Што зрабіў краб, калі Казік працягнуў яму руку, як свайму сябруку? Што Казік зрабіў з крабам пасля таго, як краб укусіў яго за палец? Ці пасябравалі Казік і краб?

Адгадайце загадкі.

Ва ўсіх дзетак адзенне з манетак. *(Рыба.)*
Жывы — чорны, памрэ — чырвоны. *(Рак.)*
Без рук, без ног, без зубоў за цела кусае. *(П'яўка.)*

## МУХІ

Колькі муха мае ног? Пэўна, з вас ніхто не ведае. Муха мае шэсць ног. У яе ёсць два крыльцы. Яна, усе мы ведаем, лятае.

На нагах у мухі ёсць пазуркі (ногцікі). А яшчэ на нагах у мухі — ліпкія падушачкі. Калі муха, шукаючы сабе спажывы, поўзае ўсюды, на падушачках і пазурках яе ножак збіраецца бруд і ўсялякая зараза. Брудам і заразай муха атручвае чалавечую ежу. Сядзе муха на хлеб, і хлеб можа стаць не годным для ежы. Сядзе муха на бульбіну, якую мы хочам з'есці, і бульбіна — заразная, шкодная для здароўя чалавека. Мы з'ядзім такую бульбіну, і ў нас можа забалець жывот. Тады давядзецца лячыцца.

Мухі — нашы ворагі. Яны лятаюць па сметніках і разносяць заразу. Мух трэба знішчаць. Калі ты ўбачыш, што муха хоча сесці на які-небудзь прадукт: хлеб, бульбу, мяса, прагані яе. Калі ў пакоі ці кухні ёсць мухі, ежу трэба

адразу з'есці, калі яна прыгатаваная, чакае нас на стале. Са стала ўсё хуценька прыбраць і схаваць у буфет і халадзільнік.

Пра што я вам расказала? Муха наш сябар ці вораг? Што дрэннае робіць для нас муха? Што яна разносіць? Чым муха збірае бруд? На чым у мухі ёсць ліпкія падушачкі? А колькі ў мухі ножак?

Адгадайце дзве загадкі.

Хто над намі дагары нагамі?

Цэлы дзень лятае, усім назаляе, а ноч настане, тады перастане.

## ПРА ЛІСА

Ліс — вельмі прыгожы звер. Людзі кажуць, што ён адзін з самых прыгожых звяроў, якія жывуць у нашых лясах. У ліса прыгожае рыжае футра. У ліса жывы выразны позірк. У яго пушысты доўгі хвост.

На ліса палюе чалавек — паляўнічы, а ліс палюе на курэй і куранят, на трусоў і трусянят. Ліс таксама палюе на маленькіх жывёлін, такіх, як мышка.

Калі няма чаго большага і лепшага, ліс з'ядае аваднёў, жукоў і іншых насякомых. Часам ліс корміцца і раслінамі, напрыклад ягадамі.

Ліс вельмі хітры. І пра чалавека часам кажуць: ён хітры, як ліс.

Ліс і ежу здабывае сабе хітрасцю. Ціхком выглядвае, высочвае звярка, а тады — скок! І хоп! А як валачэ сваю здабычу ў норку, дык пакідае па дарозе пер'е, па якому можна знайсці яго след. Вось бачыце, хоць ліс і хітры, але чалавек яго хітрыкі добра ведае. Ёсць прыказка: «І хітры ліс у пастку трапляе».

Ліс вельмі добры бацька. Калі нараджаюцца лісяняткі, ён клапоціцца аб лісіцы і дзіцянятах, вартуе іх, прыносіць ім ежу: курачку ці мышку.

Лісяняты нараджаюцца ў сакавіку і красавіку. Гэта якая пара года?

А цяпер давайце вывучым верш пра ліску.

Я ліса, лісіца, ліска,
Вельмі зайчыкаў люблю.
Падбяруся блізка-блізка
І за хвосцік ухаплю.

# ВУЧЫМСЯ ПРЫГОЖА, ВЫРАЗНА ВЫМАЎЛЯЦЬ
## (фанетычныя зарадкі)

Маленькія вершаваныя формы, паэтычныя радкі з вершаў беларускіх паэтаў і фальклорныя паэтычныя творы могуць служыць матэрыялам для вывучэння фанетыкі беларускай мовы. Гэта гатовыя фанетычныя зарадкі. Апрача таго, гэта апоры для ґутаркі, для вывучэння слоў, для развіцця маўлення.

Строфы і вершыкі падбіраліся з такім разлікам, каб яны былі цікавыя і разнастайныя па зместу, вобразныя, даступныя для ўспрымання, мілагучныя. Пытанні да іх дапамогуць распачаць гутарку з дзецьмі.

Пры дапамозе маленькіх вершаваных форм дашкольнікі будуць засвойваць фанетыку беларускай мовы, вучыцца разумець і гаварыць па-беларуску, далучацца да паэзіі, фальклору, развівацца эстэтычна, пазнаваць розныя з'явы жыцця.

Працаваць з вершаванымі формамі можна па-рознаму. Двухрадковыя формы можна проста паўтараць разам з дзецьмі, вытлумачыўшы ім значэнні слоў. Іншыя формы таксама паўтараюцца, вывучаюцца і выкарыстоўваюцца для гутаркі.

Для фанетычнай зарадкі можна выкарыстаць падборку сказаў, аналагічных па структуры, блізкіх па тэматыцы («Мы бачым вачамі. Мы чуем вушамі. Мы ходзім нагамі»), а таксама вершы з паўторамі і працягам дзеяння. Напрыклад:

— Нашто табе каса?
— Сена касіць.
— Нашто табе сена?
— Кароў карміць. І г. д.

Вельмі важна, каб у выхавальніка было добрае вымаўленне, каб яно служыла ўзорам для дзяцей. Таму яму трэба звярнуць увагу на асаблівасці беларускай фанетыкі. Прыгадаем асноўныя нормы беларускага літаратурнага вымаўлення.

Галосныя і ў ненаціскным становішчы вымаўляюцца выразна: *галава, маладзіца, птушанятка, смуткаваць, працавіты.*

Беларусам я радзіўся,
Беларусам буду жыць.

Зычныя ***р***, ***ч*** заўсёды вымаўляюцца цвёрда: *рабіна, вячэра, рэха, чалавек, чыжык, казачны.*

Гром грыміць-страляе,
У дубы цаляе.

Мне купілі чаравічкі,
Як чырвоныя сунічкі.

Гук ***г*** — фрыкатыўны, працяжны: *грошы, гарнітур, грамада.* Толькі ў асобных запазычаных словах гук ***г*** вымаўляецца, як у рускай мове: *гуз, гузік, ганак, гонты, гвалт, нягеглы, швагер.*

Горкай, горкай, горачкай
Ішоў малы Ягорачка.

Гукі ***з***, ***с*** перад мяккімі зычнымі, апрача ***г***, ***к***, вымаўляюцца заўсёды мякка *(сьмех, зьмена, зьехаць, сьвітанак, зьверху, сьпяваць, зь зямлі, бесь цябе, зь дзецьмі, зь імі).*
Але: *схіліцца, скінуць, згінаць, менскі, з кімсьці.*

У гушчары крынічка
Паблісквае, як знічка.
Добра мне адсюль відно,
Што ўжо свеціцца акно.

На пачатку жарабя
Было ростам з вераб'я.

Падоўжаныя зычныя вымаўляюцца выразна, як двайныя: галлё *(гальлё)*, калоссе *(калосьсе)*, насенне *(насеньне)*, *старанна, праменіцца, зацішша, збожжа.*

Пачынаецца ўжо зранння
Тут пчалінае іграннe.

Як агеньчык, мітусіцца
Ў пушчы рыжая лісіца.

Звонкія зычныя на канцы слоў, а таксама ў сярэдзіне слова перад глухімі вымаўляюцца, як адпаведныя глухія: хлеб *(хлеп)*, нож *(нош)*, ледзь *(лець)*, лодка *(лотка)*, лёгка *(лёхка)*, дзядзька *(дзяцька)*, дождж *(дошч)*, з'езд *(зьест).*

Ідзе з лапатай дзядзька з хаты
І разграбае снег заўзята.

Глухія зычныя перад звонкімі вымаўляюцца, як адпаведныя звонкія зычныя: просьба *(прозьба)*, касьба *(казьба)*, малацьба *(маладзьба)*, барацьба *(барадзьба)*.

Эх, час касьбы, вясёлы час!
І я ім цешыўся не раз.

Шыпячыя перад свісцячымі вымаўляюцца, як свісцячыя: на рэчцы *(рэццы)*, у сутычцы *(сутыццы)*, на дошцы *(досцы)*, дачцэ *(даццэ)*.

Дзве цукерачкі ў руцэ —
Гэта сыну і дачцэ.

Свісцячыя перад шыпячымі вымаўляюцца, як свісцячыя: сшытак *(шшытак)*, перавозчык *(песавошчык)*, зжаць *(жжаць)*, расчасаць *(рашчасаць)*.

Без іголкі і без нітак
Сшылі ўсе старонкі ў сшытак.

Спалучэнні ***-шс***, ***-жс*** вымаўляюцца, як падоўжаны мяккі гук ***с*** (***сь***): вучышся *(вучысься)*, апранаешся *(апранаесься)*, сустракаешся *(сустракаесься)*. Калі такія спалучэнні знаходзяцца паміж галосным і зычным, яны вымаўляюцца, як ***с***: латышскі *(латыскі)*, нясвіжскі *(нясвіскі)*, белавежскі *(белавескі)*.

Ах ты, Юрачка,
Што ж не жэнішся,
Прыйдзе зімачка,
Дзе ж падзенешся.

Паклон табе нізкі,
Край гожы, нясвіжскі!

Спалучэнне ***дж*** вымаўляецца, як адзін гук ***дж***, а не два ***д*** і ***ж***: *пасаджэнне, хаджу, гляджу*.

Па дарожцы я хаджу
І на воблачкі гляджу.

● **Паслухайце невялікія вершыкі.** Незнаёмыя словы я вам вытлумачу, а потым вы будзеце паўтараць тэкст за мною. Так мы навучымся прыгожа вымаўляць гукі беларускай мовы.

---

Збірайся, сыночак,
Ў дзіцячы садочак.

Як ты думаеш, хто просіць сыночка збірацца ў садочак?

Вы ляціце, птушкі,
Да нашай дачушкі.

Каго пасылаюць бацькі да сваёй дачушкі?

Васіль, Васіль, Васілёчак,
Невясёлы твой дзянёчак?

У каго невясёлы дзянёчак?

Змрок спусціўся буры,
Ходзіць воўк пануры.

Які змрок? Які воўк?

Пагляджу я на палеткі,
Васілёчкі там, як дзеткі.

Дзе растуць васілёчкі? А што такое палеткі?

Дожджык, сыпані гусцей,
Вымый чысценька гусей.

Гэта жарт? Ці сапраўды дожджык вымые гусей?

Робат хутка ўсё рабіў.
Памагатым добрым быў.

А хто такі робат?

Тут жа побач і барок,
Завару вам чабарок.

А вы пілі калі-небудзь чай, завараны чабарком?

Хмарак шоўкавая грыва
Рассцілаецца гулліва.

Што будзе, калі з'яўляюцца хмары на небе?

Бяжыць сцяжынка, з ёю
І мы бяжым з табою.

Як вы думаеце, хто бяжыць і з кім?

Моцна спалі бусляняты
У цяпле бацькоўскай хаты.

Дзе спалі бусляняты? Якая хата для іх бацькоўская?

Ты, мамуся, не турбуйся,
Мне пасцель рыхтуе бусел.

Як ты думаеш, хто супакойвае мамусю?

---

На будзільнік пагляджу,
Сваю ляльку разбуджу.

А ты, Зося, сваю лялыку будзіш?

---

Каток коўзацца хадзіў,
Сабе лапкі застудзіў.

Куды каток хадзіў і што ён застудзіў?

---

Ля ракі бугай пасецца,
Як ідзе — зямля трасецца.

А чаму яна трасецца? Ці не таму, што бугай вельмі дужы і цяжкі?

---

Спіце, дзеткі, люлі, люлі.
Вераб'і даўно паснулі.

Як ты думаеш, хто просіць дзетак, каб яны паснулі?

---

Паспяшайся ў наш звярынец!
Не чакай, пакуль зачыняць.

Каго можна ўбачыць у звярынцы?

---

Холад зебру не пужае,
Круглы год яна ў піжаме.

У якой гэта яна піжаме? Піжама бывае найчасцей паласатая, так? А зебра якая?

---

Хто адважны ды старанны,
Дык таму блінец румяны.

Хто з вас адважны ды старанны? Каму далі блінец румяны? А які гэта румяны блінец? Можа добра падсмажаны?

---

Хто зялёнымі вачамі
Грозна бліскае начамі?

Гэта каток ці сава? Як ты думаеш?

---

Ішоў бай па сцяне,
Нёс торбу на спіне.

А што гэта за бай? Як ты думаеш? А што ў торбе?

Хлопчык да акна падбег,
Вось дык дзіва — выпаў снег.

Куды падбег хлопчык? Што ён убачыў?

Ішоў казёл мастом,
Ківаючы хвастом.

А куды ішоў казёл, як ты думаеш?

Ведаць Галя ўсё жадае,
Аб усім яна пытае.

Хто ведаць усё жадае?

З неба льецца дождж зялёны,
Зелянеюць вербы й клёны?

Што льецца з неба?

Шэры дожджык сыпле, сыпле,
Ні лісточка ўжо на ліпе.

Колькі лісточкаў на ліпе?

Бела ўсё, дажджоў няма —
Гэта ж к нам прыйшла зіма.

Чаго няма?

Мяў — мяў!
Крэпасць я заняў.

Хто заняў крэпасць?

Не баюся я ваўкоў —
Сцены тоўстыя з бакоў.

А ты ваўкоў баішся?

А ў мяне суседзі —
Белыя мядзведзі.

Якія мядзведзі?

На гары, на гары
Мак таўкуць камары.

Дзе таўкуць мак камары?

У Алёны дзве касы,
Нібы з шоўку паясы.

Колькі кос у Алёны? Якія яны?

---

Спелы жолуд ледзь трымаўся,
Ад галінкі адарваўся.

Ад чаго адарваўся спелы жолуд?

---

Зжата гожае калоссе,
Толькі трошкі засталося.

Што зжата? Якое калоссе?

● **Цяпер паслухаем крыху большыя вершыкі.** Будзем вучыць іх і гутарыць з вамі.

---

Ладачкі, ладкі,
Мы пячэм аладкі.
Пшанічныя, ячныя,
Пульхныя, смачныя.

Пабачым, ці ўсё мы разумеем. Давайце папляскаем у ладкі: «Ладачкі, ладкі». Каб з'есці аладку, трэба яе спячы. А каб спячы, трэба замясіць цеста. Цеста робіцца з пшанічнай або ячменнай мукі (пшаніца і ячмень — расліны, якія растуць на полі). Аладкі з ячменю называюцца ячныя. Аладкі пякуць на скавародцы (на патэльні) на невялікім агні і ядуць з маслам (ці з салам, ці з варэннем, ці са смятанай, ці з малаком, ці з кісялём). Калі аладкі смачныя, мы іх ядзім з задавальненнем.

Цяпер скажам паасобна і разам, дадаўшы яшчэ два радкі.

Ладачкі, ладкі,
Мы пячэм аладкі,
Пшанічныя, ячныя,
Пульхныя, смачныя.

Са смятанкай іх ядзім.
Хочаце — і вам дадзім.

---

Зайграйце, музыкі,
Каб я паскакала,
Купіў бацька чаравікі,
Каб я патаптала.

Хто купіў чаравікі? А хто хоча паскакаць (патанцаваць)? Бабуля? Жанчына? А можа, дзяўчынка?

---

Без музыкі, без дуды
Ходзяць ногі не туды;
Грай жа, дудка мая!
Куды дудка, туды я!

Ці добра танцаваць без музыкі?

---

Кую, кую ножку,
Паеду ў дарожку.
За чатыры мілі,
Па масла, па сыры.

А ці ведаеце вы, што такое «міля»? Чые ножкі падкоўваюць у кузні? Навошта іх падкоўваюць? Пэўна, каб добра было хадзіць? Падковы — гэта абутак каня. Хто падкоўвае каня?

---

А чу-чу, а чу-чу,
Я гарох малачу
На чужым тачку,
На прыгорачку.

Чым можна малаціць гарох? Якой прыладай? Ці чулі вы слова «цэп»? А словы «ток», «тачок»?

---

Раз, два, тры,
Чатыры, пяць,
Хлеб мы
Будзем выпякаць.

А з чаго пякуць хлеб? З якой мукі — жытняй ці пшанічнай?

---

Не хадзі, коцік,
Па хаце,
Не будзі, коцік,
Дзіцяці.

А што робіць дзіця? Ці паслухае ціца коцік і не будзе хадзіць па хаце? А што ён тады будзе рабіць? Можа, таксама будзе спаць?

---

Журавелька даўганогі,
Мабыць, збіўся ён з дарогі.

Сеў на нашыя вароты
І ад пылу чысціць боты.

Які журавель? Каратканогі ці даўганогі? Чаму ён чысціць боты? Чаму яны запыліліся? Мабыць, ён доўга хадзіў сваімі доўгімі нагамі? І што з ім здарылася? Ён заблудзіўся? Так? А што журавелька будзе рабіць пасля таго, як пачысціць свае боты?

---

Назбіраю лісцяў я
У двары,
Што ляцелі з клёніка
Без пары.

Якой парой з дрэў падае лісце?

---

Дзед Мароз, Дзед Мароз
Бабу снежную прынёс,
Баба, баба, снегавуха,
Не хапай мяне за вуха!

Смешны вершык, праўда?

---

На бруку тры вароны
Дзяўблі макароны.
Верабей крычыць на браме,
Што пра ўсё раскажа маме.

Што дзяўблі тры вароны? А дзе яны дзяўблі макароны? Хто на іх крычыць? А дзе сядзіць верабей? Верабей паскардзіцца маме? А ці прыгожа на каго-небудзь скардзіцца, быць даносчыкам?

---

У дачушкі Верачкі
Пальцы, бы цукерачкі.
У дачушкі Ладачкі
Шчочкі, як аладачкі,
Лады мае ладачкі.

Ці хацела б ты, Дануся, каб у цябе былі пальцы, як цукерачкі? Ці хацела б ты, Наталка, мець шчочкі, як аладачкі?

---

А дзядзька, о, ён акуратны!
Работнік дзядзька наш выдатны:
Ва ўсім парадак і лад любіць
І часу дарма ён не губіць.

Ці добра, калі чалавек акуратны? А ці добра, калі чалавек выдатны работнік? Ці добра, калі ўсюды парадак і лад? Добры работнік час беражэ, так? А ты любіш парадак, Толік?

---

Кукавала зязюля
У зялёным лесе,
Гадавала матуля
Дачушку Алесю.

Хто кукаваў у лесе? Хто гадаваў дачушку Алесю? Ці падабаецца табе імя «Алеся»?

---

Воля з Юляю — сястрычкі,
Сёння плачуць у двары.
— Мы згубілі рукавічкі,
Як куляліся з гары.

Хто згубіў рукавічкі? Калі Воля з Юляю згубілі рукавічкі? Дзе яны плачуць? Ці шкадуеш ты Волю і Юлю? Як бы ты супакоіў дзвюх сястрычак, якія плачуць? А я б параіла ім пашукаць рукавічкі. Я б ім сказала: «Дзяўчынкі, пашукайце добранька свае рукавічкі. Вы іх знойдзеце».

---

Ой, як горка!
Ой, як горка!
Ой, як сэрцайка баліць!
Бо ні Юзік, ні Рыгорка
Малака не хочуць піць.

Як вы думаеце, каму горка, каму баліць сэрцайка, што Юзік і Рыгорка не хочуць піць малака? Хто дужы і здаровы: хто п'е малако або той, хто адмаўляецца ад яго?

---

Адна работа за другою
Ідзе — плыве сваёй чаргою
То ў агародзе, то на полі
І не спыняецца ніколі.

Што ніколі не спыняецца? Ці добра, што работа ніколі не спыняецца?

---

Зімовы лес, зімовы лес
У футра белае залез,
Заціх, стаіўся, бы мядзведзь,
Махае лапамі ледзь-ледзь.

Хто гэта залез у белае футра? Хлопчык які ці дзяўчынка? На каго падобны зімовы лес? Лес мае лапы? Я не ведала гэтага. А вы ведалі?

---

Раздолле ў лузе, эх, раздолле!
А колькі смеху і сваволля,
І жартаў, плюскату, штурхання
Над гэтым Нёманам ў купанне!

Дзе было шмат раздолля, смеху, жартаў, плёскату?

---

Дзедка, міленькі дзядуня!
Нашто ты памёр? Нашто?
Хто ж мяне цяпер прыгорне?
Хто мне слоўка скажа? Хто?

Хлопчык Сымонка плача па сваім дзядуні. Як ён плача па ім? Што ён кажа? Нам вельмі шкада Сымонку. А яшчэ каго нам шкада? Дзядуню, так?

---

На гэты дзень і сама хата
Была прыбрана зухавата:
Памыты лавы, стол, падлога.
А каля покуця святога
Дзве сцены клёнамі прыбраны:
Абрусам белым стол заслаты.

Хату заўсёды прыбіраюць, але зухавата, адметна прыбіраюць калі? Вядома, на свята. Што на свята памылі ў хаце? Вы, напэўна, не ведаеце што такое «покуць»? Калі вы мяне папросіце, я вам скажу. А як вы мяне папросіце?

Покуць — гэта месца ў куце хаты насупраць уваxода. Хто ўваходзіць у хату, бачыць у покуці на сцяне прыбітыя абразы. Над абразамі вісіць вышываны ручнік. Людзі, якія вераць у Бога, моляцца перад абразамі. У покуці, на лаве, пад абразамі сядзіць гаспадар.

Ёсць такія святы, калі сцены ўбіраюць галінкамі дрэў. Абрусам у святы засцілаюць стол, за якім ядуць святочны абед ці вячэру. Цікава?

---

Паслухайце тры маленькія вершыкі пра птушак Беларусі. А пасля вывучым апошні вершык і хто-небудзь з вас раскажа яго мне.

1. Ў нашым краі — Беларусі —
   Ёсць буслы, сарокі, гусі,

Качкі, чыбісы, саколкі,
Чаплі, совы, перапёлкі.

2. Ў нашым краі — Беларусі —
Ёсць буслы, сарокі, гусі,
Галкі, крумкачы, вароны,
Галубочкі нахахлёны.

3. Ў нашым краі — Беларусі —
Ёсць буслы, сарокі, гусі,
Ластаўкі і верабейкі,
Чыжыкі і салавейкі.

Якіх птушак вы бачылі? Якіх птушак з тых, што пералічаны ў вершах, можна ўбачыць у горадзе?

---

Паслухаем вершыкі пра з'явы прыроды. Пра снег, завіруху, дождж, гром, навальніцу, вясёлку, хмары, пра гром і аблокі. Вось як цікава! Спачатку паслухаем, усё зразумеем. Потым будзем паўтараць кожны радок, пасля па два радкі, па тры, нарэшце, па чатыры. Будзем паўтараць хорам і паасобку, і зноў хорам. А потым зробім спектакль.

Паслухаем верш, як хмары закрылі сонейка. Яго не відаць. Усё вакол пацямнела. Сталі чорныя абшары. Раптам (ніхто не чакаў) пайшоў хутка-хутка дождж — сакануў (ух!). Кот спалохаўся і пабег стрымгалоў у сенцы — сігануў (жух!). А куры таксама не хацелі мокнуць і бягом кінуліся ў сваю хату (клеці). І дзеці паўцякалі ад дажджу. Ты, Максімка, таксама ўцякаеш ад дажджу бягом у хату?

Сонейка закрылі хмары,
Пацямнелі ўсе абшары,
Раптам дожджык сакануў,
Кот у сенцы сігануў.
Куры кінуліся ў клеці,
Ад дажджу ўцякаюць дзеці.

А цяпер разаб'ёмся на два рады. Адзін рад скажа за мною:

«Сонейка закрылі хмары». Другі рад паўторыць за мною (а першы памаўчыць): «Пацямнелі ўсе абшары». І гэтак далей, да канца. Бачыце, як цікава вы будзеце расказваць адзін аднаму, што адбылося.

---

Зніклі аблокі.
Неба ўсміхаецца.
Дзесьці далёка
Гром адчуваецца.

Чаго ўсміхаецца неба? Мусіць, яно рада, што зніклі хмары, аблокі?

---

Зашумеў над вёскай гром,
Страсянуў усё кругом.
Вось каб мне яго злавіць
Ды у бубен пасадзіць.
Бубен грукаў бы, як гром,
На ўсю вёску:
— Бам! Бум! Бом!

Чаму аўтару гэтага верша хочацца злавіць гром ды ў бубен пасадзіць? Ці падобны гром на грукат бубна? Ці хацеў бы ты, Ігнась, быць барабаншчыкам?

---

Паслухайце два вершыкі пра дождж. Які вы выбераце, той і будзем чытаць хорам.

1. Кроплі светлыя звіняць,
Скачуць па галінках
І павіслі на траве
Срэбнай павуцінкай.

Па страсе і па градзе,
Сцежкамі, дарожкамі
Хмара шэрая паўзе
Дажджавымі ножкамі.

2. Гэй, хутчэй бяжы, Міколка!
Бачыш лесвіца-вясёлка.
Вунь ля гаю нас чакае.
Зіхатлівая якая!

Мы залезем аж на хмару.
Я даўно пабачыць мару,
Спадарожнік як лятае.
Мы яго там прывітаем.

Як вы думаеце, гэты вершык напісаў хлопец ці дзяўчына? А чаму хлопец? Якая вясёлка? Прыгожая? Бліскучая? Зіхатлівая? Чаму аўтару гэтага вершыка хочацца

залезці на хмару? Так, яму хочацца пабачыць, як лятае спадарожнік. А што такое спадарожнік?

---

Цяпер пазнаёмімся з вершыкамі пра снег і завіруху. А спачатку кожны з вас скажа што-небудзь пра снег ці завіруху. Калі ідзе снег? Што такое завіруха? Які бывае снег? Ці любіце вы, як ідзе снег, быць на вуліцы (на дварэ)? Ці прыемна, ці страшна ў завіруху? Дзе лепш быць у завіруху: у хаце ці ў дарозе?

Снег у садзе, ў агародзе.
Снег ідзе, ідзе, ідзе...
Ты не скажаш снегу: годзе!
Ад яго схавацца дзе?

Непаслухмяны снег, праўда?

---

Завіруха шуміць за акном,
Замятае зямлю і мой дом,
Б'е па шыбах, напэўна, злуе,
Што ў пакой не пускаюць яе.

А вы як думаеце, завіруха таму і шуміць?

---

А цяпер вывучым вершы пра ўсялякіх жывёл — пра звяроў, птушачак, мурашак, пра куранят, пра камароў. Мы ўжо з вамі прыгожа вымаўляем усе беларускія гукі. Вершы ў нас загучаць выдатна. Так?

— Гаварун-папугай,
Ты што-небудзь мне збай.
І сказаў папугай:
— Ты што-небудзь мне збай.

Ці добры вучань — папугайчык? Што ён сказаў? А цяпер давайце пагуляем у тэатр. Змітрок будзе хлопчык, а Петрусёк — папугай.

---

Маладыя пеўнікі
Пакуплялі спеўнікі.
На платы яны паселі
І на ўсё сяло запелі.

Вось як цікава было іх слухаць! Праўда? Ці падабаецца табе, Іванка, як спяваюць пеўнікі? Яны і без спеўнікаў спяваюць прыгожа, а са спеўнікамі, мабыць, будуць яшчэ лепей спяваць. А куды яны паселі? Ці бачылі вы плот, якім гародзяць у вёсцы сад, агарод?

---

— Кукарэку, певунок!
Пашый сабе кажушок,
Пашый штонікі з шаўкоў,
З залаценькіх паяскоў,
І пашыў ён і надзеў,
І ў люстэрка паглядзеў.

І што певунок убачыў у люстэрку? Ці ўбачыў ён на сабе штонікі з шаўкоў, з залаценькіх паяскоў? Хто з вас хацеў бы пашыць сабе штонікі з шоўку і золата?

---

Вывучым адзін вершык пра коціка. Гэты коцік — недарэка. Чаму? Вы мне скажаце самі.

Пазіраюць прагна вочы, —
Мышку з'есці коцік хоча.
Лапай ён падрапаў кніжку,
А злавіць не можа мышку.

Дык чаму коцік недарэка?

---

Ну і злыя камары!
Ну і прагныя стварэнні!
Так і ўюцца ўгары,
Так і чэпяцца да Лены.

Да каго чэпяцца камары? І што яны хочуць зрабіць? Як аўтар называе камароў?

---

Яшчэ адзін вершык пра камароў.

Сыплецца дожджык часты,
Хаваюцца камары,
А гусі абулі ласты
І плаваюць, як майстры.

Пра каго яшчэ гэты верш? Хто — смелы, а хто баіцца дожджыку і хаваецца ад яго? Што гусі абулі? Чаму яны абулі ласты? Як гусі плаваюць? Добра ці дрэнна?

---

Цераз плот, цераз плот
Жук ляціць у агарод.
І гудзе, як самалёт,
Ну і жук!
Ну і гук!

Куды ляціць жук? Як ён прыляцеў у агарод? Цераз што ён ляцеў? Як ён гудзе? Гучна ці ціха? Давайце прыдумаем загаловак вершыку. Добра?

---

Парсючок пад'еў
І прыйшоў у хлеў.
Стогне: «Ух-ух-ух,
Я пад'еў за двух».
Але пэўна б мог
З'есці і за трох.

Куды прыйшоў парсючок пасля таго, як пад'еў за двух? Ці добры апетыт у парсючка? А можа, занадта добры? Можа, ён пражэрлівы?

---

Глядзіць бычок мой спадылба,
Бо навязалі да слупа.
Баліць маломү галава,
І стала горкая трава.
Куплю кефіру, малачка,
Падвесялю свайго бычка.

Чаму бычка навязалі да слупа? Пэўна, баяцца, каб ён не ўцёк? Ці добра бычку быць навязаным да слупа? Чаму бычку стала горкая трава? Што хоча зрабіць яго гаспадар, каб развесяліць бычка?

---

Даўганогі землямер
Схапіў жабу за каўнер.
Па траве павалачыў,
У канаве намачыў,
Доўгім носам дзеўбануў,
Уздыхнуў і праглынуў.

Чаму, цікава, бусел уздыхнуў перад тым, як праглынуў жабяня? Як вы думаеце?

---

Хто, сябры, не бачыў поні?
Поні —
Гэта тыя ж коні!
Тая ж грыва,
Той жа хвост,
Толькі вось маленькі рост.

Што ты скажаш маленькаму брату, калі ён спытае цябе, хто такі поні?

---

За авечкай-маткай
Бегае ягнятка,
Матку ў бок штурхае,
Малачка чакае.
— Мэ-э... — авечкі хорам:
Як табе не сорам!..
Пі само вадзіцу
І скубі травіцу.

Хто бегае за авечкай? Чаго ягнятка штурхае сваю маму ў бок? Чаго яно хоча? Хто папракае ягнятка, кажа, што яму сорамна? А за што павінна быць сорамна ягняці? Авечкі хочуць, каб ягнятка само вучылася ўсё рабіць? Так? Ці трэба хлопчыкам і дзяўчынкам рабіць усё самім?

---

Як сады зазелянелі,
Зашумелі раўчукі,
К нам з-за мора прыляцелі
Два вясёлыя шпакі.

Якая пара года пачалася, як зазелянелі сады і зашумелі раўчукі? Куды птушкі ляцяць, калі наступаюць халады? Так. У вырай. Да мора. А што будуць гэтыя два шпакі рабіць у нас, прыляцеўшы з выраю? Ці будуць яны спяваць? А якія яны песні будуць спяваць: вясёлыя ці сумныя?

---

Скача зайка. Вось дык танец!
Нацягнуў на плечы ранец.
Вымыў ножкі, носік, вушы.
Заўтра ў школу зайка рушыць,
І крычаць цяцеркі з горкі:
— Ты вучыся на пяцёркі!

Пра каго вершык? Што зайка нацягнуў на плечы? А што нясе ў ранцы? Куды ён пойдзе з ранцам на плячах? Які наказ яму зрабілі птушачкі цяцеркі? Што яны яму сказалі? А ты хочаш вучыцца на пяцёркі? А ты ведаеш, што, каб вучыцца на пяцёркі, трэба шмат працаваць?

---

Мы любім усе поры года: зіму, вясну, лета, восень. Праўду я кажу? А вершыкі пра зіму, вясну, лета, восень вы любіце? Давайце прачытаем вершы пра ўсе поры года прыгожа-прыгожа. А тыя вершыкі, якія нам найбольш спадабаюцца, мы вывучым на памяць.

Як вясна прыйшла ў гаі,
Разбудзіла ручаі.
І паклікала ізноў
Птушак з выраю дамоў.

Куды прыйшла вясна? Што такое гай? Вясна разбудзіла гаі, і што з імі сталася? Якія яны былі зімою і якія сталі цяпер? Зімою ручаі былі пакрыты лёдам. Так? А цяпер у іх булькае вада. Хто з вас яшчэ раз мне скажа, што сталася з ручаямі вясною? Калі птушкі вылятаюць у вырай? А якія птушкі застаюцца дома, у нас, зімаваць?

---

Уцякай, мароз-дзядуля!
Чуеш ты, стары, ці не?
На пагорках — булі-гулі! —
Песні чуюцца вясне.

Што гэта за «булі-гулі» на пагорках? Можа, гэта растаў снег і бурліць вадзічка ў ручайках? Каго праганяюць так сярдзіта? Якімі словамі яго гоняць? А хто, як вы думаеце, праганяе мароза-дзядулю?

---

Жавароначкі, прыляціце,
Цёпла лецейка прынясіце,
Жавароначкі, прыляціце,
Зямлю-матухну абудзіце,
Дожджыкам напаіце.
Каб травачкі нарасціла,
Каб валікаў накарміла.

Вось які прыгожы верш! А ці ведаеце вы, што гэта і песня? Я вам яе праспяваю. Добра? Раней людзі верылі ў розныя з'явы прыроды, верылі, што як папросяць, напрыклад, у жавароначкаў прынесці вясну, цёплае лета, дык яны і прынясуць яе. Давайце мы паспрабуем паспяваць, можа, і нас жавароначкі паслухаюць. Падпявайце за мною, калі ласка:

Жавароначкі, прыляціце,
Цёпла лецейка прынясіце!

З вясною абуджаецца зямля. Усё пускаецца ў рост пасля таго, як дожджык напоіць зямлю. Так? І перш за ўсё, перш за краскі і дрэвы, зелянее трава. А хто траву есць? Кароўкі, коні, валы-валікі. Дык хто корміць валоў-валікаў? Дзе расце трава? Так, на зямлі. Зямля корміць усіх. Таму яе назвалі ў вершы-песні зямля-матухна. Вас жа мама кор-

міць? Зямля-матухна зімою спіць, вясной абуджаецца, а як напоіцца вадзічкаю, дасць травічку і накорміць коней, кароў, валоў-волікаў. Папрасіце мяне, каб я вам далей прачытала верш. Калі ласка, слухайце.

Жавароначкі прыляціце,
Зямлю-матухну абудзіце,
Дожджыкам напаіце.
Каб травачкі нарасціла,
Каб волікаў накарміла.

А цяпер прачытаем увесь верш хорам, асобна і хорам.

---

Ну ж і волі, волі
У гаі за вёскай!
А цяплынь, цяплынь!
Весела на полі,
Слаўна пад бярозкай,
Хоць ты сядзь спачыць.

Воля — гэта прастор, свабода. Дык чаго шмат у гаі? А дзе гай? За вёскай ці за горадам? Дзе весела? Дзе цяплынь? Дзе прыемна сесці і спачыць (адпачыць)? Ці адпачывалі вы калі-небудзь пад бярозкай летам?

---

З сябрам мы на луг бяжым —
Так дзівосна там!
Мяккі, велічны кілім
Разаслала лета нам.

Мабыць, некаторыя словы ў гэтым вершы вам незразумелыя? Я растлумачу іх. Дзівосна — значыць вельмі прыгожа, цудоўна! Луг — гэта поле, дзе расце трава з рознымі кветкамі. Луг падобны на кілім — тканую посцілку, прыгожую, з узорамі, быццам дыван, толькі танчэйшую. Кілімам засцілаюць канапу, ложак, на ім можна паляжаць, пакачацца. І на лужку таксама можна паляжаць. Дык што нам лета разаслала на лужку? Які кілім?

А цяпер прачытаем верш яшчэ некалькі разоў і вы мне адкажаце на пытанні.

З якім сябрам ты хацеў бы пабегчы на лужок? Як яго імя?

З якім сябрам ты б хацеў паляжаць на лузе на кіліме? Як яго імя?

На лузе летам дзівосна. А дзе яшчэ летам дзівосна?

А ці бываюць дзівосныя кілімы?

А твая бабуля ўмее ткаць дзівосныя кілімы?

А ты, Наталка, хацела б навучыцца ткаць дзівосныя кілімы?

---

Воддаль ззяюць яркія
Аганькі,
За плячыма ў хлопчыка
Ёсць канькі.

Пабяжым на коўзанку,
На каток,
Лёд там гладкі, роўненькі,
Нібы ток.

Што робяць на катку? А што робяць на таку? Дык што роўненькае і гладкае? Каток ці ток? Ці ток і каток? А якія гэта аганькі ззяюць воддаль ад катка? Можа, гэта святло гарыць у хатах у вёсцы?

---

Горка ледзяная
Ззяе, нібы шкло,
Дзеці звонкім смехам
Радуюць сяло.

Вось імчыцца ў санках
Радасны Алесь.
Інеем пушыстым
Ён аброс увесь.

Што ззяе, нібы шкло? Горка ледзяная? Можа, так і скажам? За мною, калі ласка:

Горка ледзяная
Ззяе, нібы шкло.

Хто радуе сяло звонкім смехам? Дзеці? Так і скажам:

Дзеці звонкім смехам
Радуюць сяло.

Хто імчыцца ў санках? Хлопчык? А як яго завуць? А чаму ён быў радасны? Можа, так і скажам? Давайце, калі ласка:

Вось імчыцца ў санках
Радасны Алесь.

Чым ён аброс? Так, інеем. А што такое іней? Зімовым ранкам дрэвы, тэлефонныя драты, бровы, вусы ў людзей

пакрываюцца тонкім снежным покрывам — інеем. Гэта бывае ў моцны мароз. І наш Алесь аброс увесь інеем. Так? Так і скажам. За мною, калі ласка:

Інеем пушыстым
Ён аброс увесь.

А цяпер прачытаем увесь верш. Як мы яго прачытаем? Хорам?

---

Валіць снег, сыпле снег,
Скачуць дзеці, шум і смех...
На камяк кладуць камяк,
І ўжо вырас дзед-дзівак.

Як называецца ў гэтым вершы снежны дзед? Дзед-дзівак? А ён сапраўды цікавы, нязвыклы, дзіўны. А ты, Рыгорка, умееш класці камяк на камяк і ляпіць дзеда-дзівака? А ты, Настулька?

---

Спачатку будзем слухаць маленькія апавяданні, а пасля слухаць і развучваць вершы.

Марылька была маленькая і вельмі любіла працаваць. Яе старэйшая сястрычка Каця выцірала лямпачкі, якія віселі высока, амаль пад столлю, бяліла сцены. Марыльцы хацелася таксама гэта рабіць. І вось яна прыдумала такі вершык:

Не дацягнуся я да столі,
Але падлогу падмяту,
Змагу зрабіць што-кольвек болей,
Вось толькі трошкі падрасту.

А ты, Алінка, ці падмятаеш падлогу ў хаце? А што ты будзеш рабіць, як трохі падрасцеш?

На двары макрэча, ідзе дождж. Дзеці ідуць хто з парасонамі, хто ў плашчыках з капюшонамі, а качкі бягуць купацца. Яны ахвотна гуляюць, калі ідзе дождж, калі на двары макрэча. Яны любяць макрэчу.

На двары макрэча сёння,
Дзецям —
Як без парасона?
А вось качкі...
Зразумела,
Пад дажджом гуляюць
смела.

Ці добра дзецям у дождж без парасона і без капюшона? А качкам?

---

Паслухайце ўважліва, а потым мы вывучым верш. Каб запомніць яго, трэба добра ўсё зразумець. Я вам дапамагу.

У птушаняткі бліскучыя вачаняткі. Птушанятка сядзіць ціхенька. Толькі зіркне (зірк!) і стаіцца. А дзе яно сядзіць? Вядома, на галінцы дрэва. Зірк — і маўчыць, не чырыкае. Ні аднаго гуку не чуваць. Чаму яно не гаворыць? Чаму не спявае? Бо гэта птушанятка нясмелае, сарамлівае.

Зірк! бліскучым вачаняткам —
На галіне птушанятка.
Ды ні гуку не чутно —
Сарамлівае яно.

Чаму птушанятка сядзіць ціхенька на галінцы і толькі бліскае вачаняткамі? Чаму нічога не гаворыць? А дзеці бываюць сарамлівыя?

---

Паслухаем тры калыханкі, выберам адну, якая вам найбольш спадабаецца, вывучым яе. Будзем чытаць калыханку, напяваючы, працягла. А можа, мы з вамі і мелодыю прыдумаем.

1. Гэту калыханку матуля спявала свайму дзіцятку, а сама прала кудзелю. Ёй не было часу. Трэба было прасці, каб потым з нітак выткаць палатно, а з палатна пашыць штончыкі ці кашулю свайму дзіцятку.

Люлі-люлі, люляшу,
Я дзіцятка калышу,
Нітачку звіваю,
Песеньку спяваю.
Што выведу нітку —
Камару на світку,
Астануцца кончыкі
Камару на штончыкі.

Каму матуля пашые світку? А што такое світка? Якая гэта вопратка? Верхняя? Цёплая? Суконная ці льняная? Світка гэта суконная (вытканая вясковай кабетай з сукна) вопратка, паўпаліто. Мы можам убачыць світкі на сцэне, у тэатры, у музеі. А з чаго яна пашые штончыкі камару? Як вы думаеце, матуля сапраўды пашые світку і штончыкі камару ці яна жартуе?

2. Матуля спявае дзіцяці калыханку і просіць, каб яно не лажылася на краёк ложка. Чаму? Праўду кажаце: з краю можна ўпасці. А матуля спявае так:

Баю, баіньку, баю,
Не лажыся на краю.
Не лажыся на краёк,
Прыйдзе шэранькі ваўчок.
Прыйдзе шэранькі ваўчок,
Цябе схопіць за бачок.

Дзе ты, Ігнаська, будзеш лажыцца спаць: на крайку ці пасярэдзінцы ложка?

3. Матуля закалыхвае сваё дзіцятка і гаворыць з каточкам. Просіць, каб ён не хадзіў у садочак, не таптаў там кветачак, а яшчэ просіць, каб каточак не будзіў дзетачак.

Апсік, апсік, каточак.
Не хадзі ты ў садочак,
І не тапчы кветачак,
І не будзі дзетачак.
Няхай кветачкі цвітуць,
Няхай дзетачкі заснуць.
Люлі, люлі, дзеткі, спаць,
А я буду калыхаць.
А-а, а-а, а!

Прачытаем, адгадаем і вывучым.

Хто бязгучна мякка ходзіць,
Хто без рук павейкі зводзіць?
Не відаць яго нідзе,
А на ложак спаць кладзе. *(Сон.)*

---

Гэтыя вершыкі, пэўна, больш спадабаюцца хлопчыкам, як дзяўчынкам. Але вучыць іх мы будзем усе.

Я будую дом з пяску!
Я клічу ўсіх на талаку!
Будзем дружна працаваць,
Дом прасторны будаваць.
Высачэзны — вось такі!
На падмогу, землякі!!!

Ці доўга будзе трымацца дом, збудаваны з пяску? Як лягчэй будаваць дом: аднаму ці талакой? Які лепш мець дом: цесны, маленькі ці прасторны, вялікі, дом, дзе шмат месца, прастору?

Ці ёсць высачэзныя дамы ў вёсцы? Ці многа высачэзных дамоў у Мінску? А як называецца той чалавек, які

будуе дом, розныя іншыя будынкі? Ці хацеў бы ты быць будаўніком, Аркадзік?

---

Арлянём сябе ў сне бачу,
Не знаю спакою...
Хачу быць я, мой ты бацька,
Лётчыкам — героем.

Кім хоча быць гэты хлопчык? На чым лётчык лятае? А дзе лётчык лятае? У паветры? У космасе? А хто яшчэ лятае ў паветры (высока ў небе)? Якой птушкай бачыць сябе хлопчык у сне? А ты кім хочаш быць, Жэнік?

---

«Адгадайце загадку і даведаецеся, кім я хачу быць», — кажа маленькі Паўлючок.

Медзяныя рогі,
Свінцовыя ногі.
На ўвесь твар акуляр,
У вадзе гаспадар.

Кім жа хоча быць Паўлючок? А што вадалаз робіць у вадзе? Як вы думаеце, цікава быць вадалазам?

---

Я на трактары сягоння
Сам араў
За вёскай гоні!
Навучыў мяне мой тата,
Як заводзіць,
Весці трактар.

Сеў за руль я з татам,
Рады,
Уключыў як след
Прылады
Ды націснуў на педаль —
І пайшоў, пайшоў
Удаль!

Ці хацеў бы ты, Міколка, умець весці трактар?

---

Мы любім сваіх вайскоўцаў: шарагоўцаў і афіцэраў. Пад бел-чырвона-белым сцягам хто-небудзь з вас, хлопчыкі, будзе крочыць у ваеннай форме. А цяпер вывучым два вершыкі. Напісаў іх Павел Марціновіч.

1. Ёсць у нас свае жаўнеры:
Шарагоўцы, афіцэры —

Абаронцы Беларусі.
Вамі шчыра ганаруся!

2. Вайскоўцаў стройныя шыхты...
Пакрочыш некалі і ты
Пад бел-чырвона-белым сцягам —
Нашчадкам зменай і працягам!

Хто з вас хацеў бы быць вайскоўцам?

---

Прачытаем хорам, вывучым на памяць, прадэкламуем. Вершыкі розныя, на ўсе густы.

Свет вялікі ... Словы. Словы.
Колькі іх — і не злічыць!
Слова ж «мама» на ўсіх мовах
Толькі мамаю гучыць.

Ці ведаеце вы, што, звяртаючыся да мамы, можна сказаць: матуля, мамачка, матанька, мамуся, мамка?

Ці хочаце паслухаць, як у іншых мовах гучыць слова «мама»? Паслухайце, калі ласка: па-нямецку — муттэр, па-французску — мэр, па-італьянску — мамма, па-польску — матка, мамуся, па-чэшску — матка, па-балгарску — мама, па-яўрэйску — мамэ, па-літоўску — мотына.

---

Па сцяжынцы, цераз поле,
У лясок зайшоў Алесь.
Бачыць — мяч.
— Эх, падфутболю!
А той мяч... у куст пабег.

Дык што гэта за мяч быў на сцяжынцы? Вы ўсе бачылі вожыка? Усе трымалі яго ў руках? Кармілі чым-небудзь? А што вожык любіць есці?

---

Я дарожку даганяю,
А дарожка ўцякае.
Пабягу хутчэй за мосцік
І злаўлю яе за хвосцік.

Як вы думаеце, ці можна злавіць дарожку за хвосцік?

---

Гэй, Дзяніска!
Гэй, Рыгорка!
Клічуць санкі,
Кліча горка.

Каго клічуць санкі? Каго кліча горка? А цябе ці клічуць санкі, горка? Ці хочацца табе, Паўлік, з'ехаць на саначках з горкі? А табе, Ніначка?

---

Скрып, скрып,
Скрып, скрып,
Снег ад холаду ахрып.
У яго, напэўна, грып.

Ці сапраўды снег можа ахрыпнуць ад холаду? Гэта жарт, праўда? Ці любім мы жарты? А чаму мы іх любім?

---

Верабейка ўвесь дрыжыць:
— Як тут жыць? Як пражыць?
Набліжаецца зіма,
Цёплай вопраткі няма.
Чык-чырык! Чык-чырык!
Я ад холаду адвык.

Хто дрыжыць ад холаду? Калі верабейка дрыжыць ад холаду?

---

Яблык — румяны,
Чысты, крамяны:
У расе купаўся,
Сонцам выціраўся.

Які яблык? Чырвоны? А чаму яблык румяны, чысты, крамяны? Вы ўсе любіце есці яблыкі? А збіраць іх?

---

Толькі раз у год дарункі
Дзед Мароз прыносіць нам,
Бабка ж кожны дзень ласункі
Сыпле шустрым галубам.

Колькі раз у год Дзед Мароз прыносіць дзецям дарункі? А бабка (назавём яе Тэкля) колькі раз у год прыносіць галубам ласункі? Хто з вас прыносіць часам ласункі галубам? Якія ты любіш ласункі? Яблыкі? Цукеркі? Мармелад? Шакалад? Халву? Мёд? Моркаўку? Пірожнае? Разынкі?

---

Над палямі сонцаззяе,
Апрануўся ў лісце май,
Ўсё смяецца і спявае,
Гэта май, прыгожы май!

Хто мне падкажа, растлумачыць, як гэта май апрануўся ў лісце? Ці ведаеце вы, што месяц май па-беларуску называюць яшчэ «травень»? Прыгожая назва месяца, праўда?

---

Кветкі ярчэй зацвілі,
Птушкі спяваюць бясконца.
Свята вясны на зямлі,
Свята блакіту і сонца.

Чаму мы ведаем, што надышло «свята вясны на зямлі»?

---

Абвяшчае бор
На паляне збор:
Чорныя чарніцы,
Нібы чараўніцы,
Падаюць у кубкі
Ды фарбуюць губкі.

Што ўжо паспела ў бары? Грыбы ці ягады? Якія ягады? Дзе яны растуць у лесе? А што такое «паляна»? А чаму чарніцы — чараўніцы? Так: самі падаюць у кубкі ды фарбуюць губкі. Хто з вас любіць хадзіць у лес па ягады? Хто з вас любіць збіраць чарніцы-чараўніцы на паляне?

---

Я зусім яшчэ малая,
Але ўсім дапамагаю:
Тату чай падсаладзіць,
Маме — міскі перамыць,
І заўсёды брату Сашу
Памагаю есці кашу.

Якое імя мы дадзім дзяўчынцы — добрай памочніцы? Можа, Ніна? Соня? Галінка? Амілька? Каму Амілька дапамагае есці кашу? Ці цяжкая гэта работа? А што яна дапамагае рабіць маме? А тату? А ты каму дапамагаеш, Аленка? А ты, Рыгорка? А есці кашу, мабыць, любяць усе?

---

Званок у лузе коціцца,
Схапіць званочак хочацца.
То не званочак,
То не званочак,
Трапеча сіні матылёчак.

Сіні матылёк быў у лузе. А дзе яшчэ бывае матылёк? Ці лётае матылёк у полі? У агародзе?

---

Паімчаўся ручаёк
Міма горкі у лясок.
Ручаёк, не бяжы,
Свае ножкі пакажы.

Хто яшчэ бяжыць без ножак? Можа, вецер?

---

Што за стукат і грукат
У бары-гушчары?
То газета друкуецца
На сасновай кары.

А на чым друкуецца газета ў друкарні? У газеце друкуюцца ўсялякія навіны. Той, хто друкуе газеты, называецца друкар. А як называецца той, хто піша артыкулы ў газету? Журналіст. Хто з вас хоча быць журналістам?

---

У ваверкі Веры —
Рамонт кватэры:
Змяніла шпалеры,
Вокны і дзверы.

Як называецца ваверка, у якой быў рамонт кватэры? Што яна змяніла ў кватэры?

---

Сёння ў аленя
Дзень нараджэння.
На імянінах —
Статак ласіны.
Браканьер на паляванне
Выйшаў з стрэльбай на паляну,
А зайцы напалі,
Стрэльбу адабралі.

У каго зайцы адабралі стрэльбу? Чаму? А што робіць браканьер? Добры ці дрэнны чалавек браканьер?

---

Можа, трэба вам букет,
Прыязджайце у Ташкент:
Тут дзяўчынка Марыям
Кветкі паднясе сябрам.

Ці любіш ты, Арцёмка, дарыць каму-небудзь кветкі? А ты, Марылька? А ты, Кастусь?

---

На трыбуне верабей
Слова мае да гасцей:
— Чык-чырык, свет вялік.
Ў добрай згодзе мы жывём,
У лагодзе гнёзды ўём.

Хто на трыбуне мае слова да гасцей? Ён кажа, што птушкі жывуць у згодзе, у лагодзе? Гэта добра ці дрэнна?

---

Ў шчупака метровы рост,
Дзве лапаты — гэта хвост,
Зубы ў пашчы — дзве пілы.
Ён на плотак вельмі злы.

Як вы думаеце, чаго шчупак на плотак злы?

---

Я ведаю, сонца ў сусвеце
Не зможа ніхто патушыць,
Пакуль на зямной планеце
Дзеці будуць дружыць!

Планета — гэта ўвесь свет. Добра, калі дзеці на ўсёй планеце дружаць. Добра, калі амерыканскія дзеці дружаць з беларускімі дзецьмі. Добра, калі дзеці з Францыі прыязджалі да нас у Беларусь. Але не менш важна, каб вы жылі ў згодзе паміж сабою.

---

Раз зайшлі ў дзіцячы сад
Восем жоўтых куранят,
Прывяла іх з вулачкі
Шэранькая курачка.
Трапіла ты, курачка,
Не на тую вулачку:
Тут дзіцячы сад —
Не для куранят.

А для каго дзіцячы сад? Што здарылася з курачкай? Як вы думаеце, яна заблудзілася ці прывяла паказаць дзіцячы сад сваім дзеткам — кураняткам?

---

А ў Максіма, а ў Максіма —
Сёння ранец за плячыма.
Гэта ў школу йдзе Максім:
Ён вялікі ўжо зусім:
Сёння ў школу йдзе Максім:
Свет вялікі — перад ім!

Максім пойдзе ў школу, будзе чытаць кнігі і даведаецца пра тое, што было, што ёсць на свеце. А калі ў вас будзе ранец за плячыма, калі вы пойдзеце ў школу? Праз год? Праз два?

● **Паўтараем хорам** (аналагічныя структуры асобных сказаў, аналагічныя радкі верша).

Мы чуем вушамі.
Мы бачым вачамі.
Мы ходзім нагамі.
Мы працуем рукамі.
Мы працуем рукамі і галавой.

Мы глядзім і бачым вачамі.
Мы слухаем і чуем вушамі.
Мы ходзім і бегаем нагамі.
Мы бяром і працуем рукамі.

Мы любім працаваць.
Мы любім танцаваць.
Мы любім гуляць з цацкамі.
Мы любім дэкламаваць вершы.
Мы любім слухаць казкі.
Мы любім спяваць песні.
Мы любім спяваць беларускія песні.

Мы мыемся вадой.
Мы мыемся вадой і мылам.
Мы выціраемся ручніком.
Мы прычэсваемся грабянцом.
Мы ядзім лыжкай.
Мы ядзім лыжкай, відэльцам і нажыкам.
Мы пішам алоўкам.
Мы пішам алоўкам ці ручкай.

Мы гатуем страву ў кухні.
Мы абедаем у кухні (у сталовай).
Мы спім у спальні.

Мы сядзім на крэсле.
Мы сядзім на канапе.
Мы сядзім на ложку.
Мы сядзім на лаўцы.
Мы сядзім у парку на лаўцы.

Мы працуем у цырульні.
Мы працуем у пякарні.
Мы працуем у лазні.
Мы працуем у краме.
Мы працуем у міліцыі.
Мы працуем у майстэрні.
Мы працуем у агародзе.
Мы працуем у полі.

Мы гуляем у прасторным пакоі.
Мы гуляем у прыгожым двары.
Мы гуляем у новым парку.
Мы гуляем на ўзбярэжжы ракі.
Мы гуляем на паляне ў лесе.

Тыдзень мае сем дзён.
Месяц мае чатыры тыдні.
Год мае дванаццаць месяцаў.
Суткі маюць дваццаць чатыры гадзіны.

Мінск, Гомель, Магілёў — гарады Беларусі.
Полацк, Гродна, Брэст — гарады Беларусі.
Навагрудак, Баранавічы, Бабруйск — гарады Беларусі.

Нёман, Прыпяць, Дзвіна — рэкі Беларусі.
Дняпро, Сож, Бярэзіна — рэкі Беларусі.
Шчара, Вілія, Случ — рэкі Беларусі.
Нарач, Свіцязь, Князь-возера — азёры Беларусі.

Завяжы (надзень) хустку на галаву.
Завяжы (надзень) шалік на шыю.
Надзень шапку (капялюш) на галаву.
Прычапі бант да блузкі.
Прышпілі брошку да сукенкі.
Зашпілі гузікі ў курткі.
Абуй туфлі на высокім абцасе.
Апрані зімовае паліто.

Мы адзяваем (надзяваем) кашулю.
Мы адзяваем (надзяваем) сукенку.
Мы адзяваем (надзяваем) спадніцу.
Мы адзяваем (надзяваем) джынсы (порткі, штаны).
Мы адзяваем (надзяваем) гарнітур.

Мы адзяваем (надзяваем) світэр.
Мы адзяваем (надзяваем) камізэльку.

Апрані (надзень, адзень) паліто.
Апрані (надзень, адзень) куртку.
Апрані (надзень, адзень) плашч.
Апрані (надзень, адзень) кажушок.

Францыск Скарына — беларускі першадрукар.

Францішак Багушэвіч — славуты беларускі паэт.

Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч — выдатны беларускі драматург.

Кастусь Каліноўскі — змагар за незалежнасць Беларусі.

Якуб Колас — народны паэт Беларусі.

Янка Купала — выдатны паэт Беларусі.

● **Пачнём з кароценькага сказа, а кончым доўгім сказам.**

Булкі не растуць на дрэвах.

Усе ведаюць, што булкі не растуць на дрэвах.

Усе, нават маленькія, ведаюць, што булкі не растуць на дрэвах.

Яблыкі круглыя.

Яблыкі круглыя, спелыя.

Яблыкі круглыя, спелыя, сакавітыя.

Яблыкі круглыя, спелыя, сакавітыя, смачныя.

Яблыкі круглыя, спелыя, сакавітыя і вельмі смачныя.

● **Вывучым цікавы верш пра казла.** Спачатку вы будзеце паўтараць за мною кожны радок. А пасля таго, як мы вытлумачым усе незразумелыя словы, я буду пытацца, а вы адказваць за казла.

**Ішоў казёл мастом**

Ішоў казёл мастом,
Ківаючы хвастом.
— Куды ідзеш, казёл?
— На кірмаш пайду.
— Чаго на кірмаш?
— Касу купляць.
— Нашто табе каса?
— Сена касіць.

— Нашто табе сена?
— Кароў карміць.
— Нашто табе каровы?
— Малако даіць.
— Нашто тое малако?
— Пастушкоў паіць.
— Нашто тыя пастушкі?
— Свінак пасвіць.
— Нашто тыя свінкі?
— Горы капаць.
— А што ў тых гарах?
— Дубовая бочка.
— А што ў той бочцы?
— Жалезная ступа.
— А што ў той ступе?
— Медзяная міса.
— А што ў той місе?
— Залатая лыжка.
— А што ў той лыжцы?
— Макавае зерне.
— А дзе тое зерне?
— Пеўнік скляваў.
— А дзе той пеўнік?
— За мора паляцеў.
— А дзе тое мора?
— Кветкамі зарасло.
— А дзе тыя кветкі?
— У вянкі сплялі.
— А дзе тыя вянкі?
— З вадою сплылі.

## ФІЗКУЛЬТХВІЛІНКІ

Назва раздзела гаворыць сама за сябе. Часу фізкультхвілінкі займаюць мала, а карысці ад іх многа. Апрача таго, што ў час фізкультхвілінак дзеці расслабляюцца, адпачываюць ад напружанай працы, рухаюцца, яны вучаць вершы, запамінаюць фразы, словы. Добра падабраны, эмацыянальна насычаны літаратурны матэрыял спрыяе засваенню лексікі, граматычных катэгорый, асаблівасцей вымаўлення. Педагог пры неабходнасці сам можа падбіраць вершы, лічылкі і творча выкарыстоўваць іх у фізкультхвілінках. Пакажам на прыкладзе, як праводзіць з дзецьмі фізкультхвілінкі.

● Фізкультура дае нам здароўе. А наша здароўе — наша багацце. Так? Раней людзі больш рухаліся, больш хадзілі, шмат працавалі фізічна. А цяпер мы, дарослыя, шмат сядзім, мала ходзім, ездзім на аўтобусе, тралейбусе, метро. Мала хто займаецца спортам. А мы з вамі будзем прызвычайвацца да фізкультуры, палюбім яе так, каб без яе не маглі жыць. Нам у гэтым дапамогуць фізкультхвілінкі. На нашых фізкультхвілінках будуць гучаць вершы, песенькі.

Вывучым адну з іх, а тады пагуляем.

Мы пасадзім грушку
Усе, усе.
Няхай наша грушка
Расце, расце.
Вырасці ты, грушка,
Вось такой вышыні,
Распусціся, грушка,
Вось такой шырыні.

А цяпер давайце выберам «грушку». Нам дапаможа лічылка:

Плыў па моры чамадан,
У чамадане быў дыван,
На дыване плаваў слон.
Хто не верыць — выйдзі вон!

Той, хто «выйшаў вон», і будзе «грушкай». «Грушка» стане ў сярэдзіне кола. А вы ўсе, дзеткі, будзеце ісці ў карагодзе вакол «грушкі», спяваць песеньку, якую мы вывучылі, рухамі паказваць тое, пра што гаворыцца ў ёй. Добра? А заўтра мы вывучым працяг гэтай гульні-песні.

● Прыгадаем учарашнюю гульню-песню «Грушку» і вывучым працяг.

Расці, расці, грушка,
Ды у добры час.
Патанцуй, Марылька,
Паскачы для нас.
А ўжо наша груша
Распусцілася.
А наша Марылька
Затужылася.

Зноў выберам «грушку». Нам дапаможа новая лічылка:

Бег сабака
Цераз мост.
Чатыры лапы,
Пяты хвост.

Хто «хвост», той будзе «грушкай», «Марыльку» выберам без лічылкі. А цяпер патанцуем і паспяваем: «Расці, расці, грушка...» Скажыце, калі ласка, а як быць з нашай «Марылькай», якая зажурылася? Пашкадуем яе, усміхнемся ёй, і яна ўсміхнецца нам. Так?

Прыгадаем два куплеты песні «Мы пасадзім грушку» і вывучым яшчэ адзін:

А мы тую грушку
Весяліць будзем,
І з нашай Марылькай
Скакаць будзем.

Так мы і зробім: «грушку» запросім выйсці з сярэдзіны кола і паставім яе побач з Марылькай, а самі паскачам і праспяваем ад пачатку да канца «Мы пасадзім грушку».

● Вывучым вершык пра заіньку, а тады пагуляем.

Заінька бялюсенькі,
Заінька шарусенькі!
Праскачы у дзірачку
Ды не пабі спіначку.

А праз якую дзірачку зайчык у нас будзе скакаць? Возьмемся за рукі, зробім кола, паміж нашых рук і будуць дзірачкі. Мы не будзем пускаць зайчыка праскочыць у дзірачку ва ўвесь рост. Няхай ён нагнецца, а мы яго папярэдзім, каб ён не пабіў спіначку: трэба заўсёды быць асцярожным. Вучым верш далей:

Заінька, павярніся,
Шэранькі, павярніся!
Тупні ножкай, паскачы
Ды ў далоні запляшчы!

Вось так і мы будзем рабіць, а зайку выберам лічылкай.

Кацілася торба
З вялікага горба.

А ў той торбе
Хлеб, паляніца.
З кім ты хочаш
Падзяліцца?

---

Прапануем вершы, найбольш прыдатныя для фізкульт-хвілінак.

### ЗАЙКА ШЭРЫ

1. На палянцы зайка шэры
2. То налева —
3. Гоп, гоп, гоп.
4. То направа —
5. Гоп, гоп, гоп.
6. А за ім услед цяцера
7. Крыльцам левым —
8. Лоп, лоп, лоп.
9. Крыльцам правым —
10. Лоп, лоп, лоп...
11. Гэтак шчыра, па парадку
12. Пачынаюць фіззарадку.

1—2. Дзеці крочаць на месцы. 3. Паварочваюцца ў левы бок і падскокваюць на месцы тры разы. 4. Паварочваюцца направа. 5. Падскокваюць на месцы тры разы. 6—7. Крочаць на месцы. 8. Махаюць левай рукой тры разы. 9. Крочаць на месцы. 10. Махаюць правай рукой тры разы. 11—12. Нахіляюцца то ў левы, то ў правы бок.

### МЯЧ

1. Б'юць яго рукамі,
2. Б'юць яго нагамі.
3. Ён не скардзіцца, не плача,
4. Моўчкі лётае і скача.

1. Дзеці паказваюць, як яны б'юць рукамі мяч. 2. Паказваюць, як б'юць нагамі мяч. 3—4. Скачуць на дзвюх нагах, быццам мячыкі.

### ДОЖДЖ

1. Хмарка ў небе праплывае,
2. Самалёт над ёй гудзе.
3. Дожджык поле палівае,
4. Залацісты дождж ідзе.

1. Дзеці паднімаюць рукі ўгару і калышуць імі то ўправа, то ўлева. 2. Трымаюць сагнутыя рукі перад грудзямі і «заводзяць рухавік» самалёта.

3. Прысядаюць і стукаюць пальцамі па падлозе, быццам ідзе дождж. 4. Выцягваюць рукі ўперад і трасуць кісцямі, быццам ідзе дождж.

### САМАЗВАЛ

1. Самазвал заўсёды ў рэйсе:
2. Сёння тут, а заўтра там.
3. Па пасёлку, па гравейцы
4. Сам вязе, згружае сам.

1. Дзеці крочаць на месцы, рукамі «трымаюцца за руль» і ўяўляюць сабе, што вядуць машыну. 2. Выцягваюць правую руку ў правы бок на слова «тут», выцягваюць левую руку ў левы бок на слова «там». 3. Крочаць на месцы, «трымаюцца за руль», «вядуць машыну». 4. На словы «згружае сам» — рукі ўперад, глыбокі наклон уперад.

### РАНІЦА

1. Рана ўстаўшы,
2. мы спачатку
3. дружна робім
4. фіззарадку...
5. Раз!
6. І я зусім не сплю,
7. фіззарадку сам раблю.
8. Два!
9. Умывацца я іду
10. і спяваю на хаду.
11. Рана ўстаўшы,
12. мы спачатку
13. дружна робім
14. фіззарадку.

1—4. Дзеці прысядаюць, рукі выцягваюць уперад. 5. Робяць адзін падскок. 6—7. Нахіляюцца то ў правы, то ў левы бок. 8. Робяць два падскокі. 9—10. Паварочваюць тулава то ўправа, то ўлева. 11—14. Крочаць на месцы, размахваюць рукамі.

### ЛЬЕЦЦА, БУЛЬКАЕ ВАДЗІЦА

1. Пачынаем дзень спачатку
2. Фізкультурнаю зарадкай.
3. Эх, як весела бруіцца,
4. Льецца, булькае вадзіца.
5. Возьмем шчоткі — зубы тром
6. Беласнежным парашком.

7. З мылам мы пад кранам мыем
8. Рукі, вушы, твар і шыю.
9. Чыста мыцца — наша ўмова.
10. Той, хто чысты, — той здаровы.

1—2. Рукі знаходзяцца ўздоўж тулава. Правая рука ўбок, потым левая ўбок. Правая рука ўгору, левая ўгору. Правая ўбок, левая ўбок. Правая ўніз, левая ўніз. 3—4. Рукі выцягнуты ўперад. Кісці рукі мякка ідуць то ў правы бок, то ў левы бок. 5—6. Дзеці «чысцяць» зубы «шчоткай» то правай рукой, то левай. 7—8. Мыюць рукі, вушы, твар, шыю. 9—10. Правая рука паднята ўгору, зацiснута ў кулак, левая ўнізе. Два рыўкі назад адначасова правай і левай рукой. Потым памяняць рукі: левую падняць угору, правую апусціць.

## КОЗЫТКА

1. Белая, белая козачка,
2. Бегла берагам козытка.
3. Рожкі — казытунчыкі.
4. Ножкі — тапатунчыкі,
5. Хвосцік-недаросцік — замятунчык.

1—2. Дзеці бегаюць у розных кірунках. 3—6. Паказваюць, якія ў козачкі рожкі, бадаюцца. 4. Тупаюць нагамі. 5. Круцяць «хвосцікамі» ў бакі.

## ЗАЙЧЫК ВУШКІ НАТАПЫРЫЎ

1. Раз, два, тры, чатыры —
2. Зайчык вушкі натапырыў.
3. Ідзе з лесу воўк, воўк,
4. І зубамі шчоўк, шчоўк.
5. Мы схаваліся ў кусты:
6. Зайка, я, і ты, і ты.
7. Ты ж, ваўчына, пачакай,
8. Як схаваемся — шукай!

1. Дзеці крочаць на месцы, высока падымаючы ногі. 2. Крочаць на месцы і паказваюць, якія вушкі бываюць у зайцоў. 3—4. Ідуць воўчай паходкай, а на словы «шчоўк, шчоўк» раскрываюць і закрываюць рот, быццам шчоўкаюць зубамі. 5—6. Прысядаюць на кукішкі і лічаць, паказваючы рукой на кожнага. 7—8. Седзячы на кукішках, пагражаюць пальчыкам. На слова «шукай» нахіляюць галаву на рукі.

## ДОЖДЖЫК ЛЬЕЦЦА

1. Дожджык льецца,
2. Ў рукі не даецца.
3. Льецца прама,
4. Льецца ўскос
5. І на шчочкі і на нос.

1—2. Падняўшы рукі ўгору, дзеці трасуць кісцямі. 3. Трасуць рукамі, апускаюць іх уніз. 4. Трасуць рукамі і апускаюць іх па дыяганалі, зверху ўніз. 5. Трасуць рукамі і дакранаюцца да шчок, потым да носа.

### ПАВЕСІМ РУЧНІК

1. «Стукай-грукай, малаток!» —
2. Напявае Петрусёк.
3. Ён забіў у сцяну цвік
4. І павесіў свой ручнік.

1—3. Дзеці забіваюць цвік то правай, то левай рукой. 4. Дзвюма рукамі вешаюць на цвік ручнік.

### БУДЗЕМ КОСМАС ШТУРМАВАЦЬ

1. Раз, два, тры,
2. Мы — найлепшыя сябры.
3. Тры, чатыры, пяць,
4. Будзем космас штурмаваць.
5. Шэсць, сем, восем, дзевяць, дзесяць,
6. Паляцім на Марс і Месяц!

1—2. Дзеці трымаюць кулачкі на плячах, выпростваюць рукі, сагнутыя ў лакцях, у бакі, пальцы выцягнутыя. Зноў згінаюць рукі і пальцы да плеч. 3—4. Правую руку падымаюць угору, пальцы сашчэпленыя ў кулачок, левая рука апушчана, пальцы ў кулачку. А затым мяняюць рукі: правую — уніз, левую — угору, левую — уніз, правую — угору. Гэтак робяць да новай каманды. 5—6. Рукі выцягнуты ў бакі. Дзеці хістаюцца то ў правы, то ў левы бок, а потым бегаюць па пакоі. Па сігналу ўсе спыняюцца.

## СЛУХАЕМ ВЕРШЫ І ГУТАРЫМ

Для гутаркі патрэбна нейкая сітуацыя, апора. У нашым выпадку штуршком для разважання служаць вершы. Вершы гэтага раздзела ахопліваюць шырокі спектр жыццёвых праблем, што дае магчымасць весці гутарку на розныя тэмы.

Метады работы — розныя, выбіраюцца з улікам асобы выхавальніка, узроўнем ведаў дзяцей. Атмасфера гутаркі — заўсёды прыязная, сяброўская.

Аўтары даволі падрабязна спыняюцца на кожным вершы. Але гэта не павінна скоўваць педагога, перашкаджаць яму шукаць свой шлях, свой падыход да работы над вершам. Падрабязная распрацоўка, на наш погляд, будзе нейкім чынам дапамагаць педагогу лепш авалодаць беларускай мовай.

Пытанні да вершаў не для апытвання і праверкі ведаў дзяцей. Амаль кожнае пытанне мае падказку і служыць для таго, каб увесці дзіця ў гутарку, вучыць яго лагічна і асацыятыўна думаць, звязваць адну жыццёвую з'яву з другой, параўноўваць рэчы.

Пры гутарцы-навучанні інфармацыя не асядае ў памяці мёртвым грузам, а развівае розум і душу дзіцяці.

Карысна памятаць, што гутарка атрымаецца толькі тады, калі педагог удзельнічае ў ёй як субяседнік, калі ён шчыра, на роўных, выказвае свае меркаванні, калі дзіця — яго партнёр у агульнай справе навучання і выхавання. Педагог — цікавы субяседнік тады, калі ён здзіўляецца разам з дзецьмі, разам з імі захапляецца, абураецца, цешыцца, калі ён па-даросламу выказвае свае думкі, але не разбурае казачнасці, таямнічасці, загадкавасці атмасферы.

---

ЯГОРАЧКА

(з народнага)

Горкай, горкай, горачкай
Ішоў малы Ягорачка,
Ваўкоў не баяўся,
Страхаў не пужаўся.
Пратаптаў Ягорачка
Сцежачку да горачкі.
Выразаў Ягорачка
Дудачку-свісцёлачку.
І свістаў ён птушачкай,
Птушачкай-пяюшачкай.
Горкай, горкай, горачкай
Ішоў наш Ягорачка.

● Хто ішоў горачкай? Быў Ягорачка малы ці вялікі? «Ваўкоў не баяўся, страхаў не пужаўся», — вось які быў Ягорачка. Смелы, адважны хлопчык. А табе, Алінка, якія хлопчыкі падабаюцца: адважныя ці баязлівыя?

Ягорка часта хадзіў на горачку, нават сцежачку туды пратаптаў. А чаго ён туды хадзіў, Іванка?

Дзе ён выразаў дудачку-свісцёлачку? З чаго ён яе выразаў? Чым ён яе выразаў? Мабыць, ножычкам (сцізорыкам)? Як Ягорачка свістаў? Як ты думаеш, Сымонка, ён прыгожа свістаў? Ён свістаў, як птушачка-пяюшачка. Так? А птушачка прыгожа спявае? Як ты думаеш, Змітручок, хто Ягорку навучыў свістаць? Можа, тата? Дзядуля? Можа,

сусед? Сваяк? А можа, ён сам навучыўся? Ёсць жа такія здольныя ад прыроды музыкі, што самі вучацца іграць на дудцы, на скрыпцы. Як ты думаеш, Мар'янка, ці весялей жыць з песняй, з музыкай?

Давайце вывучым некалькі прыказак пра музыку і песню.

*З песняй дружыць — не тужыць.*

*З песняй і работа спорыцца.*

*Без скрыпачкі, без дуды ходзяць ногі не туды.*

### МІКОЛКА І МАША

У Міколкі сястрычка малая,
Яна яму жыць замінае.
То заплача яна не ў пару,
То разбурыць з пясочку гару,
То сандалікі ў Машы зняліся.
Ды без Машы таксама не мёд.
Цішыня — і ніякіх прыгод. *Г. Каржанеўская*

● Хто замінае (перашкаджае) Міколку жыць? Яго сястрычка меншая за яго ці большая?

Міколку падабаецца, калі яго маленькая сястрычка плача?

Міколку падабаецца, калі сястрычка разбурае з пясочку гару (горку)?

Міколку падабаецца, калі яму даводзіцца абуваць Машу?

А табе, Максімка, замінала б маленькая сястрычка ці не?

Мне здаецца, што з маленькай сястрычкай брацікў цікава, ёсць занятак, праца, прыгоды. А табе як здаецца, Уладзік?

З маленькімі многа клопату, турбот, гэта праўда. А з вамі дома маме і тату многа турбот, Ніначка? А нам, выхавальнікам, нянечкам, з вамі многа турбот, Алесік? І бацькам, і нам нялёгка з вамі, але нам радасна, што вы вырасцеце і будзеце добрыя, разумныя, працавітыя. «Горка часам праца, ды хлеб ад яе салодкі», — так кажа беларуская прыказка.

● Вось яшчэ адзін верш, які называецца «Хачу сястрычку». Яго напісала таксама Галіна Каржанеўская. Параўнайце гэтыя два вершы. Чым яны падобныя?

— Патрабуецца рамонт, —
Раніцой сказала мама. —
Столь запылена даўно,
На сцяне — зірніце — пляма...
Сын пытае:
— А калі
Гэта ў нас рамонт рабілі?
— Мы парадак навялі,
А пасля цябе «купілі», —
Тата сынку адказаў
(Ён, вядома, жартаваў).
— Рамантуйце, — скеміў сын,—
Вы хутчэй кватэру нашу.
Ўсё адзін я ды адзін...
Я хачу сястрычку Машу!

● Мы прачытаем з вамі верш пра бабку-чараўніцу. Яна любіла красу, любіла ўсё прыгожае, сама стварала красу і чаравала ёю іншых. Вось якая была бабка!

БАБКА-ЧАРАЎНІЦА

На абрусах і сурвэтах
Палымнеюць руж букеты,
Тут і пеўні, тут і гусі...
Вышывала іх бабуся.
— Чараўніца наша бабка!
Аж здзіўляецца Агатка.
Возьме ў рукі палатно —
Ажывае ўраз яно. *Л. Шырын*

Што мы засцілаем абрусам? Дзе мы кладзём сурвэткі? Навошта мы засцілаем абрусам стол? Навошта мы кладзём сурвэткі на стол, столік, палічкі?

Хто вышываў абрус і сурвэтку? Ці прыгожа бабуся вышывае? Ці не таму яе называюць бабуся-чараўніца? Што ж яна вышыла на абрусе?

Чалавек спакон вякоў любіў красу. Чалавек спакон вякоў стараўся ўсё рабіць вакол сябе прыгожым. Ён і хату будаваў прыгожую, і агародчык рабіў каля хаты з прыгожымі кветкамі, і вопратку шыў для сябе дзівосную. Прыгадаем беларускі нацыянальны строй з прыгожымі ўзорамі, вышыўкай! А ты, Вераніка, любіш усё прыгожае? А стараешся, каб вакол цябе было прыгожа, чыста?

● Мы ўсе з вамі любім працаваць: мыць, прыбіраць, клеіць, шыць, маляваць, паліваць кветкі. Дзяўчынка Таня таксама любіць працаваць.

ТАНЯ-ПРАЦАЎНІЦА

Таня кветкі пасадзіла,
Палівала іх, расціла,
Берагла ад навальніцы,
Ад цялушкі-шаляніцы.
Паліваць прыйшла сягоння —
Усміхаецца півоня.
Прыйдуць з працы тата, мама —
Заўсміхаюцца таксама. *М. Пазнякоў*

Скажыце, ці праўду я кажу пра Таню: «Таня кветкі пасадзіла і забылася пра іх, не палівала, не берагла ад навальніцы, ад цялушкі-шаляніцы»?

Скажыце, ці праўду я кажу пра Таніну маму: «Таніна мама прыйдзе з працы дамоў і бачыць, што кветкі-півоні завялі, іх ніхто не паліваў. Сумна маме ад гэтага»? А цяпер адкажыце, калі ласка: ваша мама рада, калі вы працуеце старанна? Паслухайце такія прыказкі:

*Чалавек без працы, што птушка без крылаў.*
*Дружная праца — крыніца багацця.*

Чаму нас вучаць гэтыя прыказкі?

● Ці верыце вы, што заяц бывае храбры? А вось верш, які называецца «Храбры заяц». Зараз з гэтым храбрым зайцам мы пазнаёмімся.

Жыў-быў заяц, выхваляўся:
— Я ніколі не баяўся
І нікога не баюся,
Захачу — з ваўком паб'юся.
Выхваляўся ён без меры.
Ў храбрасць зайца сталі верыць.
Ўсе яго абходзяць бокам...
Раптам ён сустрэўся з воўкам.
І... пусціўся без аглядкі,
Замільгалі толькі пяткі...
У мяне знаёмы Вова,
Ён храбрэц, але... на словах. *І. Вярыла*

Ну як, ці храбры быў гэты заяц?

А чаму ён выхваляўся? Можа, таму, што яму не хацелася быць палахлівым, баязлівым? А можа, ён не ведаў, што непрыгожа выхваляцца?

Давайце вывучым тры прыказкі. Дзве з іх пра тое, што заяц баязлівы, а адна пра тое, што ёсць людзі, якія выхваляюцца, а працаваць не любяць.

*Зайцу і жабін крок страшны.*

*Як кот шкадлівы, як заяц баязлівы.*

*І шыла, і мыла, і прала, і ткала — і ўсё языком.*

● Паслухаем і вывучым на памяць, а вечарам раскажам гэты верш маме з татам. Добра? (Згода? Дамовіліся?)

Заіграй мне, дударочку.
Заіграй мне, дударочку,
А я патанцую,
Курка яйка мне знясе,
Табе падарую.
Заіграй мне, дударочку,
Як сам разумееш,
Зайграй, шызы галубочку,
Тое, што умееш.

Хто такі дударочак? На чым ён іграе? А што дударочак іграе? Песні? Танцы? Якую музыку? А дзяўчынка, якая просіць яго зайграць, хоча танцаваць ці спяваць? Можа мы прыдумаем імя нашай танцорачцы? Алеська? Добра. Які танец хоча станцаваць Алеська? Лявоніху? Крыжачок? Полечку? Ці ведаем мы гэта з вершыка? Які танец дударык зайграе, такі дзяўчынка і станцуе. Так?

А як яна яго просіць? Ласкава, ветліва, сардэчна? Як яна яго называе? «Зайграй, шызы галубочак, тое, што умееш». «Шызы галубочак». Які цёплы, ласкавы зварот!

А што Алеська хоча яму падараваць за тое, што ён зайграе? Мне Алеська вельмі спадабалася, а вам? Чаму яна вам спадабалася? (Яна вясёлая, ласкавая, ветлівая, шчодрая.)

А што як яе намаляваць? Цікава, хто якую намалюе Алеську? Самы прыгожы малюнак мы павесім на сцяне. Хай усе ёю палюбуюцца некалькі дзён. Добра?

● Я вам прачытаю цудоўны вершык, але перад гэтым хачу вытлумачыць незразумелыя вам словы. Слухайце! Ёсць ягады чорныя. Яны растуць у лесе і называюцца

чарніцы. А ёсць у лесе ягады чырвоныя, з крапінкамі, смачныя, духмяныя. Яны называюцца суніцы. Паўторым гэтае слова хорам. На небе ёсць зоркі, якія загараюцца і знікаюць. Яны называюцца znічкі. Паўторым гэтае слова хорам.

СУНІЧКА

Сунічка пашыла спаднічку
Пад колер чырвонай зары.
Нібыта маленькая знічка
Гарыць на паляне ў бары.

Дзяўчынка паставіла кошык,
З сунічкі не зводзіць вачэй.
Дзяўчынка падумала трошкі:
— Хай спее на сонцы яшчэ. *В. Вярба*

Якога колеру ў сунічкі спаднічка? Дзе выспела ягадка? Чаму дзяўчынка не зводзіла вачэй з сунічкі? Мусіць, сунічка вельмі спадабалася дзяўчынцы? Ці шкада было дзяўчынцы пакінуць сунічку? А чаму яна яе пакінула? Можа, сунічка была яшчэ недаспелая? А можа там, дзе расла сунічка, было так хараша, што ў дзяўчынкі не хапіла сілы сарваць ягадку?

ПІЛА

З братам Янкам
Да сняданку
Мы пілуем дровы
Ўранку.

Хоць не ела,
Не піла —
Весела пяе
Піла.

Ну, а што ж яна
Пяе?
Лепш паслухаем
Яе:

— Хто пілуе
Др-ровы,
Будзе той
Здар-ровы.

Гэта спр-рава,
Бр-ратка, —
Добр-рая
Зар-радка. *П. Марціновіч*

● Як называецца верш? А што мы робім пілою? Хто пілуе дровы са сваім братам? А калі хлопчык з братам Янкам пілуюць дровы: уранку, у поўдзень ці ўвечары?

Піла працуе і пяе песеньку. Цікава, праўда? А якую яна песеньку пяе? Яшчэ раз прачытаем яе.

Дык што трэба рабіць, каб быць здаровым? Так, пілаваць дровы, працаваць. Добрая праца — гэта добрая зарадка. Вы таксама так думаеце?

А цяпер да вас такое пытанне: дзе Янка пілуе дровы са сваім братам: у горадзе ці ў вёсцы? А чаму вы думаеце, што ў вёсцы? Вы маеце рацыю: гэтыя хлопчыкі жывуць у вёсцы, бо ў горадзе рэдка паляць у печы дровамі.

Хто з вас хоча вывучыць некалькі прыказак пра працу?

*Праца і сіла горы звернуць.* (Я буду старацца быць працавітай і дужай, тады зраблю ўсё тое, што захачу. А вы?)

*Каб смачна пад'есці і прыгожа хадзіць, трэба многа рабіць.* (Вы хочаце смачна есці? Вы хочаце прыгожа хадзіць — быць прыгожа апранутымі? Дык што для гэтага трэба?)

*Хто працуе, той не сумуе.* (Што ты, Петрык, зробіш, як табе стане сумна?)

*Рана ўстанеш — болей зробіш.* (Ці добра рана ўставаць?)

*Дзве работы за раз не зробіш.* (А колькі трэба рабіць работ за адзін раз?)

## МЛЫН

Многа клопату мы мелі, —
Млын паставілі на мелі,
Але ён зусім не меле,
Бо зрабіць яго не ўмелі.
Брат сказаў: «Каля ракі ты
Назразай яшчэ ракіты».
Каб сплялі з ракіты кола,
Загадаў нам брат Мікола.
Млын, пастаўлены на мелі,
Нам з пяску мукі намеле. *С. Грахоўскі*

● Млын будуюць на рацэ, каб, падаючы, вада круціла кола. А дзе хлопчыкі пабудавалі свой млын? Навошта людзям млын? Што ён робіць? Навошта брат сказаўназразаць ракіты (галінак дрэва)? Ці моцнае будзе кола з ракіты? Ці можна ў сапраўдным млыне зрабіць кола з ракіты? А чаго намеле гэты млын? А як называецца той, хто меле муку ў млыне? Млынар? Так.

● Мне прыгадаўся верш пра шэрага заіньку, якому млынарчыкі пабілі пальчыкі. Ці расказаць яго вам? Папрасіце ў мяне, і я вам раскажу.

ЗАІНЬКА ШЭРАНЬКІ

— Заінька шэранькі, дзе бываў?
— У млыне, у млыне.
— Што там бачыў?
— Мех мукі, мех мукі.
— Чаму ж не ўзяў?
— Хацеў я, хацеў я,
Ды млынар не даў.
Набеглі, набеглі млынарчыкі,
Пабілі, пабілі мне пальчыкі.
Набеглі, набеглі падмельнікі,
Пабілі, пабілі мне плечыкі.

Вось як было. Ці шкада вам заіньку? Хто яму пабіў пальчыкі? Хто яму пабіў плечыкі? Зайчыка шкада, але ж ён хацеў узяць чужую муку. Дык, можа, не варта яго шкадаваць? Няхай бы ён лепш папрасіў. Як вы думаеце? Ёсць такая прыказка: «Не бяры чужога, не бойся нікога». Давайце мы скажам гэту прыказку хорам. Добра?

● Мы прачытаем вершык пра пчолку. Яна працавітая, праўда? Ёй спатрэбіўся фартушок. Ваша мама, калі працуе на кухні ці ў агародзе, надзявае фартушок? Як вы думаеце, з якога лісціка пчолка пашыла сабе белы фартушок? Так, з бярозавага. А чым яна шыла? Дзе яна ўзяла іголку, у якога звярка папрасіла? Так, так, у вожыка. А дзе пчолка ўзяла нітак? Хто тчэ кросенцы ў полі, на лузе, у агародзе? Так, так, павучок. У павучка ніткі шаўковыя, тоненькія, беленькія. Ён называецца шаўкапрад.

ПЧОЛКА

Паляцела пчолка на лужок,
Ой, патрэбен пчолцы фартушок.
Белы ці зялёны, які лепш?
Скінь, бярозка, лісцік ты найперш.
Ды няма іголкі — нечым шыць,
Давялось у вожыка папрасіць.
Тут патрэбны ніткі акурат.
Адматаў ёй нітак шаўкапрад.
Пахне медуніцамі лужок,
Шые пчолка, шые фартушок. *А. Пысін*

У цябе ёсць фартушок? А ў мамы тваёй? Каму б ты пашыла фартушок, каб навучылася шыць? Хто з вас умее пашыць фартушок сваёй лялькі? А навошта надзяваць фартушок?

● Давайце паслухаем верш, прыдумаем яму загаловак. Але спачатку прыгадаем, у якім месяцы жнуць жыта?

Сонца грэе, колас спее,
Пошум жытні ў летнім спеве.
Каласіста спелай ніве
Нізка кланяецца жнівень.
Цешыць поле залатое.
Дзякуй, роднае, за тое,
Што ўрадзіла гэтак шчодра, —
З хлебам жыць на свеце добра. *Я. Пушча*

Так, верш можна назваць «Жнівень». Жыта ў жніўні каласістае. Вецер яго калыша, спявае. Яно кланяецца зямлі, шуміць, а чалавек радуецца, цешыцца, гледзячы на ніву, на поле, дзе расце жыта. А чаму чалавек цешыцца?

● Давайце прыгадаем назвы месяцаў. Зробім гэта хорам. Хто-небудзь з вас спачатку падкажа нам першы месяц года. Так, студзень. Хорам уголас, але без крыку скажам: «Студзень». Далей: «Люты, сакавік, красавік, май, чэрвень, ліпень, жнівень, верасень, кастрычнік, лістапад, снежань».

А цяпер паслухайце верш пра вясновы месяц. Затым мы вывучым па два апошнія радкі кожнага слупка і будзем гаварыць іх хорам пасля таго, як я прачытаю два першыя радкі.

## КРАСАВІК

Красавік ішоў сялом,
Грэў прасторы ласкаю.
Як махнуў ён рукавом —
Вылецелі ластаўкі.

Беражком ступаў сухім,
Па ярах караскаўся.
Рукавом махнуў другім —
Луг смяецца краскамі.

Закасаўшы рукавы,
Неба ўзняў вясёлкамі.
Рады пушчы, паплавы
Месяцу вясёламу. *Р. Барадулін*

Якому месяцу рады пушчы і паплавы? А што такое пушча? Што такое паплавы? Пушча — гэта вялікі, стары, густы лес. Вы ўсе чулі пра Белавежскую пушчу, у якой жывуць вядомыя на ўвесь свет зубры. Поплаў — гэта сухі луг, дзе расце трава, дзе пасецца жывёла.

Што красавік прынёс з сабой? Цяпло? Сонейка? Красавік грэў прасторы ласкаю. Што гэта значыць? Так, палям, лясам, вясковай вуліцы — усім прасторам было цёпла, прыемна. Цікавы месяц красавік: рукавом махнуў — і ластаўкі вылецелі. Ці хацеў бы ты мець такі рукаў, Ягорка?

Красавік ішоў па вёсцы, ішоў па беражку ракі, караскаўся па ямах, ярах. Дзе яму было ісці лягчэй: па вясковай дарожцы ці па далінах, узгорках, ярах?

А што з'явілася на лужках пасля таго, як красавік махнуў другім рукавом? Краскі? Як ты, Сымонка, думаеш, ці прыгожыя былі тыя краскі? А што на небе з'явілася ў красавіку? Ці бачыў ты вясёлку, Петрык? Якога яна колеру?

● Пазнаёмімся яшчэ з адным месяцам. Называецца ён лістапад. Калі гэты месяц бывае? Летам? Зімою? Правільна, восенню. Паслухаем, вытлумачым усе словы, пагутарым. Я вам прачытаю цэлы верш, потым па асобных слупках, а потым зноў цалкам, каб вы адчулі яго настрой, яго красу.

## ЛІСТАПАД

Пэўна сонца знемаглося,
Адпачыць пайшло за хмары,
І паўзе павольна восень
Па іржышчы і папары.

І ад холаду рабіна
Чырванее, нізка гнецца.
Паляцелі гусі клінам,
Каб у выраі пагрэцца.

Сыплюць лісцікі бярозы,
Стала ветрана і суха.
Недалёка ўжо марозы
І снягі і завіруха. *С. Шушкевіч*

Сонца доўга свяціла, цэлае лета. Яно замарылася, знемаглося, у яго ўжо няма моцы, сілы. Што яно зрабіла? Куды пайшло адпачыць? Восень паўзе паволі па іржышчы, папары. Іржышча — гэта поле, дзе засталіся рэшткі сцяблоў ад зжатага збожжа. А папар — гэта незасеянае поле. Як паўзе восень па іржышчы і папары?

Калі холадна, нашы насы чырванеюць, а мы курчымся, гнёмся. А якое дрэва чырванее і гнецца ад холаду? Робіцца холадна, птушкі ляцяць у цёплы край, у вырай, каб там пагрэцца. Яны ляцяць клінам. Што гэта такое? Можа, хто-небудзь намалюе гэты клін птушачак?

На двары стала ветрана, бярозы сыплюць свае лісцікі. А куды яны іх сыплюць? Адляцяць птушачкі, паасыпаюцца лісцікі з дрэў і надыдуць маразы, снягі. А што яшчэ? Завіруха?

Скажыце, калі ласка, ці зразумела з верша, што лістапад — гэта канец, а не пачатак восені?

● Мы з вамі прачытаем верш, які называецца «Дом». Гэты дом збудавалі не людзі, а самыя працавітыя ў свеце насякомыя. Яны называюцца... Як яны называюцца? Так, мурашы. Прачытаем, пагутарым, пагуляем у тэатр. У нас будзе сем акцёраў.

1. Паміж сосен пад кустом
   Небывалы ўзняўся дом.
2. Сто ўваходаў, сто дзвярэй
   Для дарослых і дзяцей.

3. Сто паверхаў, сто падлог,
Каля дома тупат ног.
4. Ад зары і да зары
Тут працуюць жыхары.
5. Гэй з дарогі,
Дайце шлях,
Дуб нясу я на плячах.
6. Хто з калодай,
З бервяном —
Тупацяць мурашкі ў дом.
7. А ў пялёнках у цішы
Спяць малыя мурашы. *А. Пысін*

Дзе ўзняўся небывалы, дзіўны, непадобны на чалавечы дом? Для каго зрабілі сто дзвярэй? Ці гэта зашмат: сто дзвярэй, сто паверхаў, сто падлог? Як вы думаеце? Ці многа спатрэбіцца будаўнікоў, каб зрабіць сто паверхаў, сто падлог? Ці доўга трэба працаваць будучым жыхарам гэтага дома? Яны працуюць ад зары да зары, ад ранку да вечара. Як вы думаеце, ці зморацца яны, працуючы ад зары да зары?

Мурашы нясуць на сваіх плечыках галінкі, лісточкі, каменьчыкі, а ім здаецца, што яны нясуць дубы, калоды, бярвёны. Чаму? Так, бо яны самі маленькія, ножкі, якімі яны тупаюць, маленькія. Плечы ў іх маленькія.

А што робяць дзеці, маленькія мурашы? Каб яны моцна спалі, давайце праспяваем ім вось гэту калыханку. А мелодыю самі прыдумаем.

Ой бычок, мой бысенька,
Залатая лысінка,
Бадлівыя рогі,
Тупучыя ногі,
Ты паціхеньку хадзі,
Мурашыкаў не будзі.

● Хто з вас калі-небудзь чуў, каб пеўнік ахрып, каб у пеўня ды быў грып? Ніхто? А вось быў такі пеўнік. Як вы думаеце, чаму ён ахрып? Можа, ён вельмі моцна спяваў, надарваў голас? Можа, ён на холадзе доўга быў? Можа, ён марожанага накляваўся ў халодны дзень?

ХРЫПАТЫ ПЕЎНІК

Захварэў пявун, ахрып,
Пэўна, ў пеўня страшны грып.

Маці — курыцу-квахтуху —
Не любіў, крыклівы, слухаць.
Ён хадзіў па садзе босы,
Абтрасаў на траўцы росы,
Пасля гульняў, прапацеўшы,
Ён крычаў, на плоце сеўшы.
Па халодных лазіў лужах,
Вось таму і занядужаў.
Мо ангіна, можа грып?
Захварэў пявун, ахрып. *С. Шушкевіч*

Вам шкада пеўніка? Мне таксама яго шкада. Малеча, яшчэ шмат чаго не разумее. А цяпер, як вы думаеце, ён будзе больш паслухмяны? Больш асцярожны? Хварэць жа дрэнна? Праўда? І голас у хрыпатага непрыемны. Як хрыпаты пеўнік гаворыць цяпер? Як ён спявае, кукарэкае? Давайце пакажам. Як бы мы з вамі яго лячылі? Чым бы мы яго напаілі? А шыйку яго чым бы абвязалі? Ці паклалі б яго ў ложачак? А калі б ён папрасіў нас расказаць яму казачку, то якую б мы расказалі? Я б яму расказала казачку «Піліпка-сынок», а ты, Андрэйка? А ты, Насцечка? А ты, Арсенька? А потым я б заспявала калыханку:

Люлі, люлі, люлі,
Дзеткі ўсе паснулі.
Не спіць толькі Коця,
Ходзіць па балоце.
Спі, пявун мой, мой маленькі,
Пявуночак даражэнькі.

А вы якую б калыханку заспявалі хрыпатаму пеўніку, каб ён хутчэй заснуў і папраўіўся?

● Я вам прачытаю верш-загадку «Сталёвы бусел».

Прыляцеў аднекуль, мусіць,
На будоўлю гэты бусел —
Велізарны дужы птах —
І будуе новы гмах,
Завіхаецца ад ранку.
Скончыць ён сваю буслянку
І аддасць яе вясёлым
І шчаслівым навасёлам. *П. Марціновіч*

Вы здагадаліся, што гэта за «сталёвы бусел»? Ці падобны пад'ёмны кран на сталёвага бусла? А чаму ён сталёвы?

З чаго робяць пад'ёмны кран? Кран сам працуе ці ім кіруе чалавек? А што пад'ёмны кран падымае на будаўнічай пляцоўцы? Цэглу, пясок, цэментныя пліты.

Для каго велізарны дужы птах будуе новы гмах? Ці завіхаецца наш сталёвы бусел хутчэй зрабіць новы гмах? А чаму бусел завіхаецца скончыць работу? Тыя, хто пасе-ляцца ў новым доме, называюцца навасёлы. Дык ці рады будуць навасёлы, калі сталёвы бусел аддасць ім сваю буслянку?

Давайце вывучым гэты верш і прачытаем яго дома. Няхай вашы бацькі растлумачаць вам, адкуль прыляцеў на будоўлю сталёвы бусел, а вы мне заўтра скажаце. Добра?

● Адкажам на пытанні і паслухаем верш пра маму. Потым раздзелімся на тры групы і кожная група па чарзе хорам за мною будзе чытаць свой слупок. Цікава, якая група найлепш прачытае? А цяпер слухайце пытанні.

Ці любіш ты, Піліпка, як мама чытае табе цікавую кніжку?

Ці любіш ты кніжкі пра бурага мядзведзя, Аленка?

Ці любіш ты, Антось, як мама чытае табе кніжку пра вавёрку, пра зайку?

Ці смажыць твая мама аладкі? Ці любіш ты есці аладкі, Міхась?

Ці загадвае табе мама загадкі, Алеся? А ты ці загадваеш загадкі маме, Кастусь?

З кім ты, Юрасік, ходзіш у садок: з мамай ці з татам?

Ці спявае твая мама табе песні? Якія песні яна табе спявае: беларускія ці расійскія? Калі мама спявае табе песні? А ты ёй спяваеш песні, якія мы вучым у садку?

Ці падабаюцца вам такія радкі: «Маміна ўсмешка як сонейка свеціць, за ўсіх мая мама лепшая ў свеце»? Давай-це іх прачытаем усе разам. Добра?

А цяпер паслухайце верш.

### МАЯ МАМА

Мне мама чытае цікавую кніжку
Пра шэрага воўка і бурага мішку,
Пра дзятла, вавёрку і зайку касога,
Што ноччу ад страху забег у бярлогу.

Мы з мамаю раніцай смажым аладкі,
Разгадваем з мамаю разам загадкі.

Мне мама купіла і ляльку і мячык,
Мы з мамаю ходзім у садзік дзіцячы.

Добра мне з мамай заўсёды бывае,
Мама мне вечарам песні спявае.
Маміна ўсмешка, як сонейка свеціць,
За ўсіх мая мама лепшая ў свеце. *А. Русак*

● Скажыце, калі ласка, хто з вас збірае маркі? Цікава збіраць маркі, праўда? Маркі нам шмат пра што гавораць. Кожная марка — гэта цуд. Мы разглядваем маркі і бачым розныя гарады, выдатных людзей, цікавых звяроў і яшчэ шмат чаго цікавага. А як называецца альбом, дзе знаходзяцца маркі? Так. Клясер.

Зараз мы прачытаем вершык, які называецца «Маркі». Напісаў яго Павел Марціновіч.

Адусюль,
Нібыта хмаркі,
Заляцелі ў клясер
Маркі.

І цяпер,
Як захачу, —
Цэлы свет я
Аблячу!

Якім чынам збіральнік марак (калекцыянер марак) можа абляцець цэлы свет? Так. Вы маеце рацыю. Ён дастане клясер, гляне на адну марку і ўбачыць на ёй амерыканскія небаскробы. Гляне на другую і ўбачыць афрыканскага вярблюда, гляне на трэцюю і ўбачыць белавежскага зубра. Вось як цікава! Ці шмат у збіральніка марак? Так, шмат. Ці розныя яны? Так, розныя, бо яны заляцелі адусюль, з розных частак свету.

Скажыце, калі ласка, а што яшчэ дзеці збіраюць? Паштоўкі? Кнігі? Алоўкі? Гузікі? Калі я была малая, то ведаеце, што збірала? Цукерачныя абгорткі. Некаторыя дзеці смяяліся з мяне, але настаўніца сказала: «Збірай, галубка, гэта цікава і карысна». Той, хто збірае калекцыю, развівае ў сабе фантазію, імкнецца больш ведаць. Усе калекцыянеры — цікавыя людзі.

● Прачытаем верш-загадку. Будзем чытаць і гутарыць. А потым адгадаем загадку.

## СЕМЯ

На далонь маю
Малое легла семя ільняное.
Як пясчынка ўсё адно.
Ды сапраўдны скарб яно.
Бо схавана ў ім — ці чулі?
Абрусы, чапцы, кашулі,
Трапяткія фартушкі,
Як вясёлкі — ручнікі.
Толькі хто б мне мог сказаць,
Як жа іх адтуль дастаць? *К. Цвірка*

Як на далонь паэта легла семя льну? Ці можа семя само легчы? Пэўна, ён сам яго паклаў на далонь. Як вы думаеце? Хто з вас бачыў ільняное семя? Яно вялікае ці маленькае, як пясчынка? Хоць ільняное семя маленькае, крыху большае за пясчынку, але вельмі каштоўнае, сапраўдны скарб. А чаму?

У ім схаваны абрусы, кашулі, фартушкі, ручнікі і чапцы (гэта такія шапачкі). Вось як цікава, праўда? А як гэта яны ўсе ў маленечкім семені схаваны? Як іх адтуль дастаць? Хто ведае?

Семя сеюць у зямлю. Так? І што з ім робіцца? Семя ўзыходзіць і расце. А лён расце сам ці яго трэба даглядаць? А як яго трэба даглядаць? Угнойваць — карміць, палоць — пустазелле вырываць. З лёну робяць ніткі, з нітак палатно, а з палатна робяць абрусы. А што робяць з абрусамі? Дзе іх сцелюць? Навошта іх сцелюць на стол?

З лёну робяць кашулі. А хто іх носіць? З лёну робяць трапяткія фартушкі. Яны лёгенькія, тоненькія, прыгожанькія. А хто іх носіць? А навошта іх носяць? З лёну робяць, як вясёлкі, ручнікі. А чаму яны, як вясёлкі? Мабыць, яны вышыты рознакаляровымі ніткамі? Так?

Ну дык, як дастаць з маленечкага семені — ільнянога зярняткі ўсе гэтыя патрэбныя нам рэчы? Хто іх дастае? Як чалавек іх дастае? Сваёй працай? Так?

*Праца і сіла горы звернуць.*

*Вось на свеце як бывае: хто працуе, той і мае.*

Гэта кажуць прыказкі, якія вас вучаць быць працавітымі, дужымі, здаровымі.

## ФІГУРЫСТКА

Усміхаецца Мар'янка —
Ёй канькі купіла мамка.
Татка па лядку вадзіў
І катацца навучыў.
Не адзін ужо дзянёк
Яна ходзіць на каток.
Вельмі хочацца Мар'янцы
Разам з брацікам катацца.
Марыць быць такой яна,
Як Ірына Радніна. *М. Пазнякоў*

● Чаму Мар'янка ўсміхаецца? Чым яна задаволена? Хто яе навучыў катацца на лядку? А вы ўсе ўмееце катацца на каньках? Ці часта вы падаеце на лядку? А ці плачаш ты, Кастусёк, як упадзеш?

З кім Мар'янцы хочацца катацца? Як ты думаеш, брацік катаецца лепш, чым Мар'янка? Аб чым Мар'янка марыць? А хто такая Ірына Радніна? Ці можна здагадацца пра гэта з вершыка? Ірына Радніна — вядомая фігурыстка. А якія яшчэ віды спорту вы ведаеце? Так, вы ведаеце шмат відаў спорту. А што такое веславанне? Ці ведаеце вы?

● Праслухайце вершык і скажыце, хто скінуў Марынцы грушу.

## ГРУШЫ

У садок зайшла Марынка,
Бачыць грушы на галінках:
Жоўтыя, празрыстыя,
Спелыя, іскрыстыя.
Як жа грушу паспытаць?
Ды Марынцы не дастаць.
Вецер шаснуў па галінцы —
Скінуў грушу ён Марынцы. *В. Матэвушаў*

Ці спадабаўся вам вершык? Як ён называецца? Якія грушы ўбачыла Марынка? Маленькія? Зялёныя? Няспелыя? А якія? Можа мы разам уголас апішам грушы? Жоўтыя, празрыстыя, спелыя, іскрыстыя.

Як ты, Іванка, думаеш, смачныя былі грушы? Калі б мы ўбачылі такія празрыстыя іскрыстыя грушы і нам захацелася б іх паспытаць, то што б мы зрабілі? А чаму

Марынка не магла сарваць спелую іскрыстую грушу? Ой гэты вецер! Малайчына ён! Шаснуў па галінцы, і што сталася з грушай?

Адгадайце загадкі, калі ласка. Хто адгадае, грушку (яблык) атрымае. «Віса вісіць, хода ходзіць, хто ідзе — цап-царап». (Груша або яблык.)

МНЕ Б РАКЕТУ...

Я ізноў пазнюся ў школу!
Эх, няма ракеты, шкода!
Бо тралейбусныя колы
Ледзве-ледзь паўзуць да школы.
Эх, няма ракеты шпаркай!
Я даўно б сядзеў за партай! *П. Марціновіч*

● Хто шкадуе, што няма ракеты шпаркай: хлопчык ці дзяўчынка? Як ты думаеш, Віктар? Мне здаецца, што гэты хлопчык марыць быць лётчыкам ці касманаўтам. Але ён ім наўрад ці будзе. Чаму я так думаю? Як вам здаецца? Ці трэба касманаўту быць дысцыплінаваным? А гэты хлопчык сябруе з дысцыплінай? Ці можна ў школу пазніцца?

Якіх вы касманаўтаў ведаеце? Хто быў першым у свеце касманаўтам? А колькі касманаўтаў з Беларусі? Вы ведаеце іх прозвішчы?

Хто з вас папросіць мяне яшчэ раз прачытаць вершык?

Хлопчык, як бачыце, у школу позніцца не першы раз. А што нам пра гэта гаворыць? Хлопчыку здаецца, што тралейбус ледзь-ледзь паўзе. Ці гэта сапраўды так? Мне здаецца, што тралейбусныя колы хутка рухаюцца. А вы як лічыце?

Хоць хлопчык і позніцца ў школу, ён мне падабаецца. Ён цікавы хлопчык. У яго багатая фантазія. А што такое фантазія? Давайце мы з вамі даверымся фантазіі. Уявім, што ў нас ёсць самалёт. Куды б мы паляцелі? У якую краіну? Што б мы хацелі ўбачыць? Каго б мы хацелі сустрэць? Ці вярнуліся б мы назад?

Кім ты хочаш быць, Максімка? Таксама касманаўтам? Мой сусед, Піліпка, хоча быць маляром. Ён кажа, што калі б было шмат маляроў, дык усе дамы, хаты былі б прыгожыя. А ён любіць прыгажосць. Вось паслухайце верш «Маляры». Напісала яго Галіна Каржанеўская.

Гэтак спрытна беляць столь.
Я сваім вачам не веру:
Стала белаю, як соль,
Як мука і як папера.

Буду ведаць:
Маляры —
Незвычайныя майстры.

Вы таксама так думаеце?

● Паслухаем вершык пра Марыльку. Я ўпэўнена, што гэта дзяўчынка вам спадабаецца. Вы ўважліва паслухайце і потым скажаце, што вам у ёй спадабалася.

МАРЫЛЬЧЫНЫ РУЧКІ

1. У Марылькі — бабулька старая,
У бабулькі — унучка малая.
Устае бабулька на золку:
— Спі, мой цвецік, мая вясёлка,
Покуль я згатую сняданне...
2. А дзяўчынка ціхенька устане,
Прыбярэ свой ложак, пакой.
Да ўсяго дакранецца рукой.
Мыюць посуд, бялізну, анучкі
Залатыя Марыльчыны ручкі.
Чысцінёй і гасцінным святлом
Ззяе бабчын і ўнуччын дом.
3. Рада бабка: старанныя ручкі
У яе маленькай унучкі. *С. Пацёмкін*

Я задаволена вашымі адказамі. Марылька вам падабаецца. І мне яна вельмі падабаецца. Я люблю працавітых людзей. Не люблю гультаёў.

А цяпер яшчэ раз прачытаем верш па частачках, каб зразумець кожны радочак, каб палюбавацца прыгажосцю нашай мовы. Пачытаем, спынімся, паўторым і далей будзем чытаць. Добра?

Марыльчына бабулька ўстае на золку. Гэта вельмі рана. Нашы бабулькі і матулькі часта ўстаюць вельмі рана: на світанку, на світанні, на золку, раненька-рана. А чаму яны ўстаюць на золку?

Ці будзіць бабулька сваю ўнучку, як толькі ўстане? А чаму яна яе не будзіць? Так, так. Яна яе шкадуе, любіць,

хоча, каб Марылька даўжэй паспала, каб здаровая была. Як бабулька называе сваю ўнучку? Ці прыгожыя, ці ласкавыя гэта словы: «мой цвецік», «мая вясёлка»?

Бабулька гатуе снеданне сваёй унучцы і думае, што тая спіць. А як на самай справе? А чаму Марылька ціхенька ўстае? Чаму яна хоча дапамагчы сваёй бабульцы? Ці не таму, што ўнучка любіць і шкадуе бабулю, што тая старэнькая, нядужая? Давайце хорам скажам: «Старым і нядужым трэба заўсёды дапамагаць!»

Што Марылька робіць ранепька? А ты, Волечка, умееш засцілаць ложак? А ты, Сцяпанка, умееш мыць посуд? А ты, Кацярынка, любіш мыць усялякія анучкі?

А чые ручкі робяць усё, каб лягчэй было любімай бабульцы? Так. Марыльчыны залатыя ручкі мыюць посуд, бялізну, анучкі. Якія рукі мы называем «залатыя рукі»?

Калі наш дом ззяе чысцінёй? Калі ўсё ў ім памыта, так? А што мы мыем у доме? Падлогу, вокны, дзверы, стол, крэслы, выціраем пыл. А калі ў доме чыста, тады ў ім робіцца светла, тады дом ззяе, тады хочацца запрасіць у яго гасцей. Так? Давайце хорам скажам: «Чысцінёй і гасцінным святлом ззяе бабчын і ўнуччын дом».

Як вы думаеце, ці шчаслівая Марыльчына бабуля? А чаму яна шчаслівая? Таму, што яе любіць, шануе, шкадуе яе ўнучка. Таму, што яе ўнучка працавітая, старанная.

Нам усім захацелася быць такімі, як Марылька. Праўда?

● Слухайце ўважліва і адкажыце, хто вінаваты, што не падмецена хата.

ЛЯНІВАЯ МЯТЛА

Буракі палоць у полі
Трэба ранепька ісці.
Загадала маці Толю:
— Чыста ў хаце падмяці!
Толя ўзяў мятлу і кінуў:
— Слухай, добрая мятла,
Я пабегаю з гадзіну,
Ты — каб хату падмяла.
Дзень цалюткі хлопец гойсаў:
Ён на пасецы пабыў,
Шчупакоў ганяў на плёсе,
Матылёў сабе лавіў.

Сонца села за пагоркам,
Дагарэў гарачы дзень.
Вось і маці адвячоркам
З поля дальняга ідзе.
Непадмеценая хата,
Бо у Толі — многа спраў.
— Ты, мятла, тут вінавата:
Я мясці табе казаў. *А. Пысін*

Ну як? Хто вінаваты? Калі з поля прыйшла маці? Апоўдні ці адвячоркам? Ці дастаткова было часу ў Толі, каб падмесці хату? Як вы думаеце, ці прыемна было Толінай маме ўвайсці ў брудную, непадмеценую хату? На каго Толя зваліў віну, каго вінаваціў? А можа, Толя і сапраўды думаў, што мятла сама падмяце хату?

А што Толя рабіў цэлы дзень? Дзе ён пабываў за дзень? Так, на пасецы, дзе пчолы ў вуллях жывуць, у лузе, напэўна, дзе лавіў матылёў.

Толя сказаў мятле, што пабегае з гадзіну, а прабегаў цэлы дзень. Як ты думаеш, калі б ён праз гадзіну вярнуўся дамоў, можа б паспеў падмесці хату? Ці памятаеце вы прыказку: «Спярша папрацуй, а тады патанцуй?» Калі б Толя ведаў гэту прыказку, як бы ён зрабіў?

Давайце вывучым пяць прыказак.

*Нічога само не робіцца.*
*Арэх не раскусіш — зерне не з'ясі.*
*Трэба нахіліцца, каб з ручая напіцца.*
*Пячоныя галубы не прыляцяць самі да губы.*
*Добра рабі, добра і будзе.*

● Паслухайце верш.

### ЯБЛЫНЬКА

1. Без прасторы, без святла
Я ў лясной глушы расла.
Кволай тоненькай сцяблінкай
У тым лесе я была.
Там мяне з бакоў сабою
Заглушалі вербы, хвоі.
Там я згінула б зусім,
Стала б пруцікам сухім,
Ды якраз мяне прыкмеціў
Сярод лесу хлопчык Пеця.

2. Ён праз дзень прыйшоў з лапатай
І мяне — у срэбры рос —
Ад лясных цяністых шатаў
У садок свой перанёс.
Пад адкрытым вольным небам
Пасадзіў мяне як трэба,
Мне галінкі распраміў
І вадой з вядра паліў.
Кожны дзень сачыў за мною
Ён зімою і вясною.
Ён карміў мяне, паіў,
Ну а потым — прышчапіў.

3. На вачах расла я, рада,
Тут пад Пецевым прыглядам.
Час прыйшоў, і ад цяпла
Я ў дзень майскі расцвіла.
Ну а летам на галлі,
Што звісае да зямлі,
Наспяліла столькі вабных
Крутабокіх буйных яблык!
Гэта ж, Пеця-гаспадар,
За дагляд —
Табе мой дар! *К. Цвірка*

А цяпер мы прачытаем верш па частках і пагутарым пасля кожнай з іх. Добра?

1. Дзе расла яблынька: у агародзе ці ў густым лесе? Ці добра было там яблыньцы? А чаму нядобра, кепска? Ці прасторна ёй было ў лясной глушы? Ці даходзіла да яблынькі сонца, святло? Якая тады была яблынька? Тоненькая? Кволая? Слабенькая?

Што здарылася б з яблынькай, калі б яе не прыкмеціў сярод вербаў і хвояў хлопчык Пеця? Ці выжыла б там яна? Ці засохла б там, зрабілася б сухенькай сцяблінкай, сухенькім пруцікам? Пеця выратаваў яблыньку. Так? Ці добра ён зрабіў? Я дык адразу палюбіла гэтага хлопчыка. А вы?

2. Хлопчык Пеця ўбачыў у лясным гушчары слабенькую, тоненькую яблыньку, пашкадаваў яе. Што ён зрабіў праз дзень? Куды перанёс яблыньку раніцай, калі яшчэ раса была на дрэвах? Ці не забыўся Пеця паліць яблыньку вадой? А ў чым Пеця прынёс ваду? Ці часта Пеця паіў яблыньку ў сваім садочку?

А што хлопчык зрабіў потым? Ён яе прышчапіў. Мабыць, яго тата ці дзядуля навучыў, што дзікую яблыньку, якая расце ў полі ці ў лесе, трэба прышчапіць. Я буду рада, калі хто-небудзь з вас запытаецца ў свайго таты ці дзядулі, як робіцца прышчэпка дрэва, нам раскажа заўтра.

3. Яблынька расла, радавалася, цешылася сваім жыццём. Што здарылася ў адзін майскі дзень? Ці бываюць на яблыні плады ў той год, калі дрэва не цвіце?

Ці багата было яблык на яблыні летам? А што нам пра гэта гаворыць? Чаму, калі на дрэве багата яблык, дык галінкі звісаюць да зямлі? Якіх яблык наспяліла яблынька? Прыгожых, вялікіх, вабных, буйных?

Ці рад быў Пеця падарункам яблыні? Яна ж яму іх наспяліла ў дар (у падарунак).

Ці добры гаспадар Пеця? Ці працавіты, спагадлівы, клапатлівы ён? Мне здаецца, што з такога хлопчыка вырасце добры чалавек, добры муж для жонкі, добры тата. А вам як здаецца?

● Я буду чытаць вершык, а вы мне падкажыце, калі ласка, тры словы, а то яны неразборліва напісаны.

Вось вам, дзеці, верш зімовы,
Падкажыце ў вершы словы:
Зімой даліны і сцяжынкі
Пакрылі белыя...

Як шэры воўк, завыла глуха
У полі злая...
Сядзяць без ежы ў сцюжу птушкі.
Сябры, зрабіце ім...

Так. Дзякую вам. Вы здагадаліся. Усе тры словы мне падказалі правільна: сняжынкі, завіруха, кармушкі.

Дзеці з дапамогай таты зрабілі кармушкі. А што яшчэ трэба зрабіць, каб дапамагчы птушачкам у холад? Пустыя кармушкі іх не накормяць, праўда?

Якія людзі дапамагаюць іншым людзям, звярам, птушкам? Добрыя ці нягодныя? Сардэчныя ці злосныя? Шчырыя ці хлуслівыя? Ці хочаце вы ведаць пяць прыказак пра дабрыню?

*У добрага чалавека заўсёды многа добрых людзей.* (Як ты добры, дык і да цябе людзі добрыя.)

*Шчыраму і Бог дапамагае.* (Тым людзям, што ўсё робяць ад сэрца, шчыра, лягчэй жыць на свеце.)

*Шчыраму сэрцу і чужая болька колка.* (Таму, у каго добрае шчырае сэрца, шкада ўсіх, каму дрэнна.)

*Добры чалавек і жывёлу шкадуе.*

*Добры чалавек і сабакі дражніць не будзе.*

Вось бачыце: прыказкі вучаць нас розуму, дабрыні, даюць параду — быць добрымі з усімі.

● Паслухаем, зразумеем, вывучым і праспяваем урывак з верша Канстанцыі Буйло:

Люблю наш край, старонку гэту,
Дзе я радзілася, расла,
Дзе першы раз спазнала шчасце,
Слязу нядолі праліла.

Мы ўсе любім тое месца, край, старонку, дзе радзіліся, расцём, жывём. Так і скажам хорам і паасобку: «Люблю наш край, старонку гэту».

Шчасце. Якое прыгожае слова! Што яно значыць? Вось мы з вамі сядзім у прыгожым пакоі. Я вас люблю, вы мяне любіце. Мы з вамі душэўна размаўляем. Нам добра, утульна. Гэта і ёсць шчасце. Вось вы дома. І тата, і мама, і ўсе родныя — здаровыя, ласкавыя, добрыя. Рады адзін аднаго бачыць, дапамагчы адзін аднаму, пашкадаваць таго, каму блага. Вось гэта і шчасце. Шчасце трэба спазнаць, даведацца, якое яно. Так і скажам: «Дзе першы раз спазнала шчасце» (маецца на ўвазе край, дзе радзілася і расла).

Сляза нядолі. Доля бывае добрая і благая. А нядоля — гэта благая, кепская доля. Чалавеку блага, і ён плача.

А цяпер прагаворым хорам і паасобку ўвесь верш. А потым праспяваем.

Ці спадабалася вам гэта песня? Ці добра мы яе праспявалі? Заўтра мы гэту песню яшчэ раз праспяваем.

## МЫ АДКАЗВАЕМ НА ПЫТАННІ

Пытанне — гэта адзін з элементаў гутарковай мовы. Каб авалодаць ёю, трэба ўмець задаваць пытанні і адказваць, рэагаваць на іх. Пры вывучэнні мовы без пытанняў не абысціся. Яны даюць штуршок для гутаркі, канцэнтруюць увагу таго, хто слухае і адказвае, даюць выхавальніку магчымасць весці мэтанакіраваную гутарку.

Пытанне вынікае з любога навучальнага матэрыялу: верша, казкі, прыказкі і інш. Можна задаваць пытанні і

безадносна да тэмы гутаркі. Часам нават гэта неабходна, бо аднатэмная гутарка надакучае дзецям, аслабляе іх цікавасць. Свежае пытанне ажыўляе ўвагу. Пры ўмелай фармулёўцы («Мне вельмі цікава ведаць...», «Хто б мог мне дапамагчы даведацца...», «А ці ведаеце вы...», «Давайце ўсе разам падумаем, як лепш адказаць на такое пытанне...») пытанне прагучыць загадкава і выкліча ў дзіцяці ахвоту падумаць, паразважаць.

Прыдумаць пытанне не заўсёды лёгка, шмат лягчэй яго выбраць з прапанаваных у кнізе.

Аўтары падаюць пытанні ў шасці групах. Першая група пытанняў «Адкажы пра сябе» — самая канкрэтная. Дзецям, калі яны ведаюць мову, лёгка на іх адказваць. Па сваёй канструкцыі пытанні такія, што пры адказе патрабуецца толькі дадаць адно-два словы, памяняць крыху парадак слоў. Улічваючы тое, што дзеці не ведаюць мовы альбо кепска яе ведаюць, можна прапанаваць ім даваць поўны адказ на пытанне.

Пытанні гэтай групы можна выкарыстаць для парнай работы. Педагог задае пытанне групе і адказвае ўслых, а потым тое ж пытанне задаюць адзін аднаму дзеці, якія сядзяць па парах.

У другую групу ўвайшлі інфармацыйныя пытанні («Хачу ўсё ведаць»), па свайму зместу і форме больш складаныя. Яны павінны даць дзіцяці пэўныя веды, інфармацыю. Адказы на іх часта патрабуюць карэкцыі з боку педагога, яго дапамогі, умення ў даступнай форме вытлумачыць тыя ці іншыя рэчы, з'явы прыроды.

Трэцяя група — «Дыскусійныя пытанні» («Хачу ўмець слухаць і гаварыць») — вучыць дзіця быць цікавым субяседнікам. Педагогу трэба актыўна падтрымліваць размову, даваць дадатковыя, дапаможныя пытанні, падказкі, словам, быць добрым субяседнікам.

Пытанні чацвёртай групы («Тэматычныя пытанні») паглыбляюць веды на пэўную тэму, вучаць паслядоўна, лагічна думаць. Адна думка выклікае другую. У размову ўключаюцца ўсе дзеці. Размова ідзе па «ланцужку», патрабуе ад дзіцяці канцэнтрацыі ўвагі.

Пятая група — «Апорныя пытанні». Гэта пытанні, якія вынікаюць з прачытанага ці падслуханага эпізоду — апоры. Апоры развіваюць фантазію дзіцяці і педагога, закранаюць эмоцыі, якія ў сваю чаргу абуджаюць думку, мысліцельныя здольнасці. Апоры — выдатная аснова гутаркі.

Шостая група пытанняў — «Розныя». Па зместу сюды ўваходзяць пытанні ўсіх папярэдніх груп, але па форме, па сваёй канструкцыі некаторыя з іх адрозніваюцца ад папярэдніх.

### АДКАЖЫ ПРА СЯБЕ

Як цябе завуць?
Як тваё прозвішча?
Як завуць тваю маму (бабулю, сястрычку, выхавальніцу)?
Як завуць твайго тату (дзядулю, брацiка)?
Ты ходзіш у школу (у садок)?
Ты любіш цырк (тэатр, кветкі, птушак)?
Ты любіш плаваць (бегаць па дарожцы, ляпіць снежную бабу, слухаць казкі, маляваць дрэвы, мыць посуд, працаваць у агародзе, складваць цацкі, наводзіць парадак у сваім пакоі, дапамагаць сваёй маме ў працы, рана ўставаць, хадзіць у дзіцячы сад)?
Ты ўмееш чытаць (пісаць, маляваць звяркоў, надзяваць паліто, зашпільваць гузікі, абуваць боцікі, прычэсвацца грабянцом, спяваць сваёй лялькы калыханку)?

Ваш дом драўляны ці цагляны (высокі ці нізкі, на першым ці на другім паверсе)?
Ваша сям'я вялікая ці малая?
Ваша кватэра светлая ці цёмная?
Твая мама высокая ці нізкая?
Твая бабуля маладая ці старая?
Твая мама спявае табе калыханкі ці не?
Твой тата гуляе ў футбол ці не?
Твой тата спявае песні ці не?
Твой брацік гуляе з табою ці не?
Твая сястрычка дапамагае матулі ці не?

Ты рада, калі цябе хваліць мама?
Ты рада, калі табе купяць новую цацку?
Ты цешышся, калі бачыш свайго дзядулю?
Ты радуешся, калі да цябе прыходзяць сябры?
Ты любіш, калі тата бярэ з сабой цябе гуляць?
Ты задаволены, калі зробіш нешта сам?
Ты мыеш рукі перад ядой?
Ты любіш спяваць?

Ты можаш намаляваць жабу?
Ты робіш ранішнюю зарадку?
Ты любіш хадзіць у тэатр?
Ты ўмееш ездзіць на веласіпедзе?
Ты ведаеш, дзе жыве слон?
Ты ведаеш, як завуць бацькоў твайго сябра?
Ты можаш скакаць на адной назе?
Ты крыўдзіш слабейшых?
Ты быў на моры?
Ты лятаў на самалёце?
Ты бачыў кенгуру?
Ты вялікі ці маленькі?
Ты ўмееш плаваць?
Ты ведаеш, дзе знаходзіцца хлебны магазін?
Ты любіш салодкае ці кіслае?
Ты любіш мёд? Чаму?
Ты баішся пераходзіць вуліцу? Чаму?
Ты быў у лялечным тэатры?
Ты можаш намаляваць зорачку?
Ты любіш піць каву ці чай?
Ты хлопчык ці дзяўчынка?
Ты любіш спяваць ці скакаць?
Ты дома гаворыш па-беларуску ці па-расійску?
Ты ўстаеш рана ці позна?
Ты кладзешся спаць рана ці позна?
Ты жывеш у Беларусі ці ў Расіі?
Ты жывеш у горадзе ці ў вёсцы?

Ты ходзіш у садок пешшу ці ездзіш якім-небудзь транспартам?

Ты ходзіш у садок сам (сама) ці цябе прыводзіць хто-небудзь?

У вашай вёсцы шмат садоў?
У вашай вёсцы шмат дзяцей?
У вашым садзе ёсць грушы?
У вашым агародзе растуць лімоны?
У вашым горадзе ёсць цэрквы і касцёлы?
У вашай хатняй бібліятэцы ёсць беларускія кнігі?
У вашым доме ёсць беларускія часопісы?
Твая мама дазваляе табе бегаць басанож ці не?
Твой тата чытае газеты ці не?

Ці падабаецца табе, як ідзе дождж (падае снег, свеціць сонейка)?

Ці радуешся ты, як бачыш вясёлку? Ці любіш ты глядзець на хмары?

Ці ёсць у цябе любімая казка?

Ці ёсць у цябе лялька (цацка-машына, звярок-пестунок)?

Ці ёсць у вас дома тэлефон?

Ці любіш ты ездзіць у вёску?

Які твой адрас (нумар вашага дома, вашай кватэры, вашага тэлефона, адрас твайго садка)?

Які колер табе лепш падабаецца?

Якія ты любіш гульні?

Якія кветкі ты ведаеш?

Якое надвор'е ты любіш? Сонечнае? Пахмурнае? Дажджлівае?

Якое свята ты любіш? Новы Год? Купалле? Вялікдзень? Каляды?

Ты ўмееш катацца на веласіпедзе (засцілаць свой ложак, шыць лялькам сукенкі, мыць посуд, скакаць на адной назе, гатаваць вячэру, лятаць)?

Ты ўмееш гаварыць на замежнай мове? Па-англійску? Па-французску?

Колькі табе гадоў? Колькі гадоў тваёй маме (тату)?

Колькі пальцаў на адной руцэ?

Колькі ў цябе машын (кніжак)?

Колькі ў цябе сястрычак (братоў, бабуль)?

Колькі ў цябе рук (ног, вачэй)?

Колькі беларускіх вершыкаў ты ведаеш?

Колькі раз ты паваліўся ў гэту зіму?

Ці хацеў бы ты быць вучоным (футбалістам, клоунам, касманаўтам, паэтам, пісьменнікам, прэзідэнтам)?

Ці хацеў бы ты ведаць шмат казак (бачыць мора, акіян)?

Ці хацела б ты быць актрысай (балерынай, спявачкай, настаўніцай)?

Ці часта ты плачаш?

Ці шмат ты гуляеш на свежым паветры?

Ці доўга ты спіш у нядзельку?

Ці добра ты ўмееш расказваць вершыкі?

Што ты робіш раніцай (вечарам)?

Што ты любіш рабіць у нядзелю?

Што ты бачыў (бачыла) па дарозе ў садок?
Што ты рабіў (рабіла) учора вечарам?

Якога колеру твая кашуля (сукенка, спаднічка, твае вочкі, твае валасы, тваё паліто)?

Каму ты любіш расказваць вершы?
Каму ты хацеў бы (хацела б) зрабіць падарунак? Які?
Каму ты купіш цукерак, як заробіш грошай?
Каму ты гаворыш «дабранач», калі ідзеш спаць?
Каму ты кажаш «добры дзень» («дзень добры»), як устаеш рана?

З кім ты ідзеш у садок (з садка)?
З кім ты ходзіш на прагулку?
З кім ты глядзіш тэлевізар (размаўляеш па тэлефоне, гуляеш дома, гуляеш у садку)?
З якой дзяўчынкай (хлопчыкам) ты любіш гуляць у садку?

Твой брат жанаты ці нежанаты? (чытае табе казкі ці не)?
Твая сястра спявае табе калыханку?
Твае сябры часта прыходзяць да цябе ў госці?

Калі ты быў у кіно апошні раз?
Калі твая мама ідзе спаць?
Калі твой тата адпачывае?

Навошта мы купляем адзенне (прадукты)?
Навошта людзям жыллё (школы, дзіцячыя садкі, тэатры)?
Навошта людзі мыюцца (прыгожа апранаюцца, падстрыгаюцца, мыюць посуд, садзяць дрэвы, гадуюць свіней, будуюць хаты)?

Хто працуе ў бібліятэцы (вучыць дзяцей у школе, лечыць людзей, будуе дамы)?
Дзе працуе твая мама?
Дзе працуе твой тата?
Дзе жыве твая бабуля? У вёсцы ці ў горадзе?
Дзе вучыцца твой брат? У школе? Ва універсітэце? У акадэміі? У тэхнікуме?

## ХАЧУ ЎСЁ ВЕДАЦЬ

Як называецца наша рэспубліка?
Які горад сталіца Беларусі?
Якія дрэвы растуць у Беларусі?
Якія звяры самыя вялікія і дужыя?
Якія дрэвы даюць нам садавіну?
Якія беларускія прыказкі і прымаўкі ты ведаеш?
Якія гульні любяць хлопчыкі (дзяўчынкі)?
Якія жывёлы жывуць у лесе?
Якія жывёлы даюць нам мяса (малако)?
Якія насякомыя збіраюць для нас мёд?
Якія птушкі даюць нам яйкі?
Якія жывёлы даюць нам воўну (шэрсць)?
Якія дрэвы растуць у лесе, а якія ў садзе?
Якіх птушак ты ведаеш?
Якой формы бываюць рыбы?
Якога колеру мышка?
Які месяц самы прыгожы? Чаму?
Які першы дзень тыдня?
Якога колеру суніца?
Як называюць таго, хто будуе дом?
Якія заводы ёсць у Мінску?
Якія гарады (рэкі, азёры) у Беларусі ты ведаеш?
Якога колеру вясёлка?
Якія жывёлы любяць есці траву?
Які звер — цар звяроў?
Якая мэбля стаіць у кухні?
Які сёння дзень?
Як называюць дзіця каровы?
Якога колеру лімон?
Які першы месяц года?
Якія птушкі зімуюць у нас?
Якія летнія месяцы ты ведаеш?
Якога колеру бурак?
Як называюць таго, хто косіць?
Як называюць таго, хто пячэ хлеб?
Якога колеру бываюць парсючкі?
Якога звярка можна навучыць гаварыць?
Якая жывёліна цягне плуг, воз, сані?
Якія жывёлы жывуць у садзе (агародзе)?
Як называецца жанчына, якая жне?
Які хітры звер дапамагае паляўнічаму?
Як называецца той чалавек, які хлусіць?

Як вырастае бульба?
Які транспарт плавае па моры?
Якія гарады Беларусі самыя буйныя?

Дзе жывуць беларусы (украінцы, палякі, англічане)?
Дзе жывуць дзікія звяры (птушкі)?
Дзе растуць чарніцы (яблыні)?
Дзе мы купляем хлеб?
Дзе мы купляем таблеткі?
Дзе мы купляем білеты ў кіно, тэатр?
Дзе выступае клоун?
Дзе жыве леў?
Дзе плаваюць караблі?
Дзе лятаюць самалёты?
Дзе расце капуста, морква, буракі?
Дзе растуць кветкі?
Дзе робяць машыны?
Дзе шыюць нам вопратку?
Дзе робяць цукеркі?
Дзе плаваюць рыбы?
Дзе можна ўзяць пачытаць кнігу?
Дзе растуць грыбы?
Дзе расце жыта?
Дзе жыве зубр? У якой беларускай пушчы?
Дзе спяць птушкі?
Дзе мы купляем цацкі?
Дзе ў Мінску знаходзіцца плошча Перамогі? На якім праспекце?
Дзе жыве белы мядзведзь?
Дзе паказваюць кіно?
Дзе жыве дэльфін?
Дзе растуць слівы? У парку ці ў садзе?
Дзе жыве слон? У моры? У лесе? У пустыні?
Дзе жыве вярблюд?
Дзе жыве кракадзіл?

Ці могуць ваўкі і авечкі сябраваць? Чаму не?
Ці могуць людзі жыць без паветра?
Ці могуць пальмы расці ў Беларусі?
Ці ўсе жывёлы ядуць адно і тое ж?
Ці ўсе жывёлы маюць хвост?
Ці ўсе людзі аднолькавыя?

Што забруджвае паветра?
Што ачышчае паветра?
Што трэба, каб расла расліна?
Што трэба, каб жыў чалавек?
Што робіць лекар (доктар)?
Што робіць настаўнік (дырыжор, кампазітар, архітэктар)?
Што робіць ганчар (пекар, цясляр, кравец, шавец, муляр, гарбар)?
Што робяць з воўны (з дрэва, з паперы, са скуры, са шкла)?
Што вышэй: дрэва ці куст?
Што цяжэй: камень ці пух?
Што нам дапамагае быць дужымі і здаровымі?
Што мы апранаем зімою (восенню, летам, вясною)?
Што такое мір? Што такое вайна?
Што трэба мець, каб спячы бліны?
Што нам дае сонейка?
Што больш: малаток ці цвік?
Што мы абуваем на ногі?
Што цвіце блакітнымі кветкамі: мак ці лён?
Што круглае: мяч ці кубік?
Што робяць на кроснах?
Што расце на дубе?
Што робяць на трактары?
Што робяць на дудцы? На скрыпцы? На гармоніку? На цымбалах?
Што растае: снег ці пясок?
Што трэба зрабіць, каб праветрыць пакой?
Што трэба мець, каб пабудаваць дом?
Што можна збіраць у лесе?
Што робіць каваль?

Чаму мы палiваем расліны?
Чаму мы спім? Чаму мы ядзім? Чаму мы працуем?
Чаму зоркі такія маленькія? Яны блізка ці далёка ад нас?
Чаму мама і тата ходзяць на працу?
Чаму мы павінны чысціць зубы?
Чаму мы павінны даглядаць за рыбкамі ў акварыуме?

У якой жывёліны пушысты хвост?
У каго ёсць рожкі?
У каго многа ножак?

У якой птушкі доўгая дзюба?
У якой птушкі доўгія і чырвоныя ногі?
У каго большы хвост: у зайчыка ці ў ліскі?
У каго ёсць вочкі: у мышкі ці ў кошкі?

Хто ловіць мышэй?
Хто ўмее лятаць? Птушка? А яшчэ хто?
Хто хутчэй бегае: заяц ці чарапаха?
Хто лётае: пчала ці вусень?
Хто жыве ў вуллі: чмель ці пчала?

Калі цёпла: зімой ці летам?
Калі цяплей: вясной ці летам?
Калі птушкі прылятаюць з выраю: восенню ці вясной?
Калі часцей ідзе дождж? Восенню ці летам?
Калі мы кладзёмся спаць: вечарам ці раніцай?
Калі цвітуць сады? Вясною ці летам?
Калі мыем мы рукі? Чым мыем мы рукі? А чым іх выціраем?
Калі мы запальваем (уключаем) святло? Навошта мы запальваем святло?
Калі мы абуваем гумавыя боты?
Калі дзеці купаюцца ў рэчцы?
Калі лепш есці марожанае: летам ці зімою?
Калі мы просім прабачэння? Калі кажам: «Прабачце», «Выбачайце», «Даруйце»?
Калі мы можам убачыць на небе зоркі і месяц?
Калі ападае лісце з дрэў?
Калі надвор'е пахмурнае? Калі свеціць сонца ці калі сонца схаваецца за хмары?
Калі бывае на двары горача?
Калі спіць мядзведзь?

Ці растуць пальмы ў Беларусі? А дзе яны растуць?
Ці ёсць у Беларусі буслы, сарокі, перапёлкі?
Ці можам мы бачыць паветра?
Ці ўсе жывёлы баяцца чалавека?
Ці ўсе жывёлы могуць жыць побач з чалавекам?
Ці можа размаўляць папугай?
Ці можа кветка расці без кораня?
Ці можа рыба жыць без вады?
Ці можа ісці снег летам?
Ці сябруюць кот з сабакам?

Ці спяваюць птушкі зімой?

Ці трэба жывёліне жыллё (сховішча)?

Ці жывуць у Беларусі вярблюды? А дзе яны жывуць?

Ці ёсць крылы ў рыбкі?

Ці ёсць вочкі ў стракозы?

Ці спявае салавей?

Ці ўсе звяры могуць плаваць? (Усе.)

Ці ўсе птушкі могуць лятаць? (Не.)

Ці можа чалавек пражыць без агню? Без вады? Без паветра?

Ці спяць ваўкі?

Ці цвіце дрэва?

Ці ёсць у Мінску помнікі вядомым пісьменнікам? Каму?

Ці можна ўбачыць сонца ноччу?

Ці можа сабака лятаць?

## ДЫСКУСІЙНЫЯ ПЫТАННІ

Падзелімся думкамі. Пагутарым, як дарослыя. Навучымся слухаць субяседніка, гаварыць з ім.

Ці добра быць здаровым? Чаму?

Ці добра мець сяброў, якія старэйшыя за цябе? Чаму?

Ці добра пазычыць што-небудзь і не аддаць?

Ці добра быць эгаістычным, думаць толькі пра сябе?

Ці добра ведаць шмат казак, вершаў, прыказак? Чаму?

Ці трэба дапамагаць дарослым? Чаму?

Ці прыемна табе, калі ты каго-небудзь пакрыўдзіў?

Ці прыемна, як дождж капае на галаву?

Ці трэба сябраваць з кніжкамі? Што гэта значыць «сябраваць з кніжкай»?

Ці трэба паважаць працу дарослых? Чаму?

Ці трэба дапамагаць слабым? Чаму?

Ці трэба хлопчыкам заступацца за дзяўчынак?

Чаму трэба працаваць (дапамагаць бацькам)?

Калі гавораць: «Хлеб-соль»? Каму? Чаму? Замест «хлеб-соль» як яшчэ можна сказаць?

Як ты папросіш лустачку хлеба?

Што ты скажаш, калі табе дапамогуць у чым-небудзь? Чаму трэба дзякаваць?

Як ты папросіш, каб табе дапамаглі?

Каго мы называем сябрам?

Калі твой сябар параіць табе зрабіць нешта дрэннае, ці паслухаеш ты яго?

Калі мы просім прабачэння? Як мы гэта робім? А чаму трэба прасіць прабачэння?

Чаму нельга крыўдзіць дзяўчынку? Бабульку? Маму? Таварыша? А каго можна крыўдзіць? (Нікога нельга крыўдзіць.)

Чаму трэба быць здаровым? Што трэба рабіць, каб быць здаровым?

Чаму ставяць помнікі? Каму ставяць помнікі? Якія помнікі ты ведаеш у Мінску?

Чаму трэба мець сяброў?

Чаму нельга кідаць смецце на вуліцы, у лесе, у парку? А дзе трэба кідаць тое, што табе непатрэбна?

Чаму нельга хадзіць па газонах?

Чаму нельга ламаць дрэвы?

Чаму трэба старэйшым уступаць месца? Каму лягчэй стаяць: малому ці старому?

Якія бываюць хлопчыкі і дзяўчынкі? Якія табе падабаюцца? Сціплыя? Смелыя? Добрыя? Скупыя? Далікатныя? Ветлівыя? Вясёлыя?

Якое слова табе больш падабаецца: «дай» ці «на»? Чаму?

Як ты паводзіш сябе, калі сварацца ці б'юцца твае сябры?

Што табе больш падабаецца: быць і гуляць разам са сваёй мамай, татам? Быць і гуляць разам са сваімі сябрамі, такімі ж хлопчыкамі і дзяўчынкамі, як ты сам? Гуляць сам з сабою? Глядзець мульцікі па тэлевізару? Чаму?

Ці прыемна твайму тату, калі ты пакрыўдзіш маму, бабулю?

Калі ты ўбачыш, што большы хлопчык крыўдзіць (б'е, піхае, адбірае цацку) меншую дзяўчынку, што ты зробіш?

Каго мы павінны слухацца? Ці заўсёды дарослых трэба слухацца? А калі дарослы дрэнны чалавек? Калі ён вучыць рабіць нешта кепскае?

Чаму дзеці любяць цырк (тэатр)?

За што мы любім тату і маму, бабулю і дзядулю?

Што нам дае сонца? Ці толькі цяпло?

Што лягчэй: зламаць ці зрабіць?

Каму трэба дапамагаць? Калі і чаму?

Чаму прыемна глядзець на чалавека, калі ён усміхаецца?

Твая мама шчаслівая, калі ты плачаш, ці тады, калі ты ўсміхаешся? Чаму?

Чаму трэба, каб у хаце было чыста і ўтульна? Чаму трэба, каб дзіцячыя цацкі ляжалі ў парадачку?

У дзіцяці няма грошай купіць маме (тату, бабулі, дзядулю) падарунак. Які падарунак дзіця можа зрабіць ім?

Як вы думаеце, які падарунак больш прыемна атрымаць: куплены ці зроблены рукамі?

Дзе бяруць людзі грошы? Навошта патрэбна праца? Ці можа чалавек жыць без працы?

Як ты паступіш у наступных сітуацыях?

1. Ты хочаш пагуляць з мамай, але яна піша ліст да бабулі. Што ты будзеш рабіць: а) прымусіш яе кінуць пісаць і пайсці з табой зараз жа гуляць; б) пачакаеш, пакуль яна напіша ліст, а тады папросіш яе пагуляць з табою?

2. Незнаёмая дзяўчынка нясе ў сумачцы бульбу. Раптам дзяўчынка ўпала, і бульба рассыпалася. Дзяўчынка заплакала. Што ты зробіш: а) дапаможаш ёй сабраць бульбу; б) супакоіш яе, каб яна не плакала, і параіш сабраць бульбу; в) пасмяешся з яе: «Эх ты, няўмека-недарэка!»?

Што ты больш любіш: лес з ягадамі, грыбамі, дрэвамі ці бібліятэку, у якой багата самых розных кніг з казкамі, малюнкамі?

## ТЭМАТЫЧНЫЯ ПЫТАННІ

Дзе расце бульба?

Што робяць з бульбы?

Ці ведаеш ты беларускую песню «Бульба»?

У чым можна зварыць бульбу?

Што трэба мець, каб на агародзе накапаць бульбы? Рыдлёўку? Вядзёрка? Ці іншыя якія прылады?

Што трэба мець, каб засмажыць бульбу?

Якой формы бульба?

Якога колеру бульба?

Якую страву з бульбы ты любіш?

Чым славіцца Беларусь: мандарынамі, кукурузай, бананамі ці бульбай?

Дзе расце жыта?
Хто сее жыта?
Чым жыта жнуць?
З чаго пякуць хлеб?
Як называецца той, хто пячэ хлеб у пякарні?
Дзе можна ўзяць бохан хлеба?
Як ты папросіш у магазіне прадаць табе бохан хлеба?
Ці ведаеш ты, колькі каштуе бохан хлеба?

Колькі месяцаў у годзе?
Які першы месяц года?
У студзені цёпла ці сцюдзёна (холадна)?
Колькі пораў года?
Якую пару года ты больш любіш?
Летам холадна ці цёпла?
Калі ідуць дажджы?
Калі растае снег?
Калі ападае лісце з дрэў?
Калі паяўляюцца першыя кветкі? У якім месяцы?

Дзе чалавек можа паабедаць?

А калі няма часу прыгатаваць абед дома, дзе можна паабедаць?

Дзе чалавек можа паабедаць, калі ён знаходзіцца ў другім горадзе?

Хто працуе ў сталовых?
Хто працуе ў кафэ, рэстаранах?
Ці трэба плаціць за абед дома?
Ці трэба плаціць грошы за абед у сталовай?
Якую страву гатуюць на абед?
Што трэба казаць за абед?

Хто лечыць людзей?
Калі мы звяртаемся за дапамогай да доктара?
Што робіць урач (доктар), калі чалавек захварэў?
Калі мы мераем тэмпературу?
Калі мы п'ём таблеткі і лекі?
Дзе лечаць хворых людзей? Дома? А яшчэ дзе?
Што трэба рабіць, каб быць здаровым?
Чаму трэба быць здаровым?

Як трэба апранацца ў халоднае надвор'е, каб не захварэць?

Ці ходзіш ты ў садок, калі захварэеш?
Што трэба рабіць, каб паправіцца ад хваробы?

Што такое прырода? Зямля? Дрэвы? Кветкі? Мора? Рэчкі? Азёры? Горы?

Што ж мы маем на ўвазе, калі кажам: трэба берагчы прыроду?

Што расце на зямлі?

Ці любім мы прыроду?

Ці патрэбна, каб прырода была здаровая? Прыгожая?

Навошта нам здаровая прырода? (Каб нам, людзям, добра было жыць.)

Што трэба рабіць, каб сябраваць з прыродай?

Як мы, маленькія, можам сябраваць з прыродай? Што мы павінны рабіць для гэтага?

Ці чулі вы слова «экалогія»?

Што трэба мець, каб звязаць світэр? (Трэба ўмець вязаць, мець ніткі, пруткі, ведаць памер, каму вяжацца світэр.)

Ці хацела б ты ўмець вязаць?

Што б ты сабе звязала, каб умела вязаць?

Якога колеру ніткі ты б выбрала?

Хто б быў задаволены, каб ты сама сабе звязала прыгожы світэр?

А каму ты хацела б перш за ўсё звязаць світэр? Маме, тату, бубулі, сястрычцы, брацiку ці сабе?

Калі ты ўстаеш у нядзельку?

Цябе будзяць ці ты сам устаеш? Хто цябе будзіць?

Ці ахвотна ты ўстаеш, калі цябе будзяць?

Што ты любіш есці на сняданак у нядзельку?

Хто мые посуд пасля сняданка?

Ці дапамагаеш ты маме гатаваць сняданак, сабіраць на стол, мыць посуд?

Ці паліваеш вазоны? Ці выціраеш пыл? Што ты робіш пасля сняданка ў нядзельку?

Ці гуляеш ты са сваімі цацкамі ў нядзельку?

Ці ходзіш на шпацыр (на прагулку) у нядзельку? З кім ты ходзіш?

Ці гуляеш з дзецьмі ў сваім двары?

Ці глядзіш мульцікі па тэлевізару?

Ці слухаеш вечаровую казку?

Ці ахвотна ідзеш спаць вечарам?

Ці чакаеш панядзелка, каб хутчэй пайсці ў садок?

Кім ты хочаш быць?
Ці ведаеш ты назвы прафесій?
Як называецца той, хто арэ трактарам поле?
Як называецца той, хто піша вершы?
Як называецца той, хто піша прозу, казкі?
Як называецца той, хто малюе карціны?
Як называецца той, хто будуе дамы?
Як называецца той, хто пячэ хлеб?
Як называецца той, хто апрацоўвае зямлю?

## АПОРНЫЯ ПЫТАННІ

Паслухайце і адкажыце на пытанні.

Ехаў козлік па шашы,
Вёз смятанку ў гладышы.
Просіць козліка каток:
— Дай смятанкі хоць глыток,
— Мне не шкода, коцік,
Падстаўляй свой роцік.
Кот смятанку ўсю злізаў,
Нават дзякуй не сказаў.

Што катку (коціку) трэба было зрабіць пасля таго, як ён злізаў смятанку?

Каток (коцік) папрасіў глыток, а злізаў усю козлікаву смятанку. Ці добра ён зрабіў? Яму трэба было пакінуць і козліку крыху смятанкі, так?

А дзе каток спаткаў (сустрэў) козліка?

А ў чым козлік вёз смятанку?

А як каток папрасіў даць яму смятанкі? («Дай смятанкі хоць глыток».)

А што козлік адказаў на просьбу? («Мне не шкода, коцік, падстаўляй свой роцік».)

---

Дарога да дзіцячага садка ішла цераз парк. Увосень дзеці разам з выхавальнікамі прынеслі сюды саджанцы дрэў: ліпы, клёніка, бярозы, елак і пасадзілі іх. Прыходзяць у парк адпачываць людзі, дыхаюць свежым паветрам і дзякуюць дзецям і выхавальнікам за добрую справу.

Дзе праходзіла дарога?
Што зрабілі дзеці разам з выхавальнікамі?
Якія дрэвы яны пасадзілі?
Навошта дзеці пасадзілі дрэвы?
Хто прыходзіць у парк?
Каму людзі дзякуюць за адпачынак?
Ці прыемна, калі нам дзякуюць?

---

Пакажыце, што вы дагадлівыя. Праслухаўшы маленькі вершычак, адкажыце на два пытанні.

Стануць мае дзіцянятқі,
Стануць мае бусляняткі
Хутка на даўгія ногі,
Каб шукаць свае дарогі.

Хто гаворыць са сваімі дзецьмі-бусляняткамі?
Чаму буслік кажа «стануць на даўгія ногі»?

---

Спіце, дзеткі, люлі-люлі,
Вераб'і даўно паснулі.

Назвамі якіх другіх птушак вы можаце замяніць слова «вераб'і»? (Ластаўкі, снегіры, жураўы.)

---

Прайшло лета. Часцей ідуць дажджы. На дрэвах з'явіліся жоўтыя і чырвоныя лісточкі. Кацярынка ўстала рана. Яна хутка сабралася і разам з матуляй выйшла на вуліцу. Там яе чакалі сяброўкі. Усе разам яны пабеглі ў дзіцячы садок. Па дарозе сабралі букет з лісточкаў. Будзе цудоўны падарунак выхавальніцы.

Якая пара года прыйшла?
Што стала з лісточкамі на дрэвах?
Што зрабілі з лісточкамі Кацярынка і яе сяброўкі?
Ці добра зрабілі дзяўчынкі? Ці ўзрадуецца выхавальніца?
Ці прыемна рабіць іншым радасць?

---

Восенню сабралі з палёў багаты ўраджай агародніны: агуркі, моркву, цыбулю, фасолю, рэдзьку, памідоры, салату. Вясковыя хлопчыкі і дзяўчынкі дапамаглі сваім бацькам у працы.

Хто дапамагаў татам і мамам збіраць ураджай агародніны?
Ці цешыліся таты і мамы са сваіх маленькіх памочнікаў?
А вы ці дапамаглі б сваім бацькам?

---

Хлопчык убачыў, як плача дзяўчынка. Падбег да яе і запытаўся, што здарылася, чаму яна плача. Пашкадаваў яе, узяў за ручку і павёў да яе мамы.

Чаму хлопчык падбег да дзяўчынкі?
Як дапамог хлопчык дзяўчынцы?
Які ён, хлопчык? Злосны? Нягодны? Кепскі? Сардэчны? Добры? Уважлівы? Ветлівы? Спагадлівы?
Ці хацелі б вы сябраваць з такім хлопчыкам? Чаму?

---

Аленка часта хадзіла ў лес па ягады. Сёлета на іх быў вельмі добры ўраджай. Аленка знайшла ў лесе палянку, на якой было вельмі многа суніц. Калі яна пачала іх збіраць, то раптам убачыла вожыка. Вожык ласаваўся сунічкамі. Дзяўчынка з замілаваннем глядзела на вожыка, не праганяла яго. Чакала, пакуль ён наесца сунічак.

Што дзяўчына збірала ў лесе?

Каго Аленка ўбачыла на сунічнай палянцы? Што рабіў там вожык?

Ці добра зрабіла Аленка, што не прагнала вожыка?

Ці добрая Аленка? Ці жаласлівая яна?

Ёй прыемна было глядзець, як вожык ласаваўся сунічкамі?

А ты, Сцяпанка, любіш сунічкі?

---

Прачытаўшы, я задам адно пытанне. Паслухайце і адкажыце на гэта пытанне.

У вёсцы жыве старэнькая жанчына. Яна жыве адна. Але ў яе ёсць кароўка, гусь, куры. Суседнія дзяўчынкі ёй дапамагаюць. Яна ім вельмі ўдзячная. Бабуля напісала ліст на радыё і папрасіла, каб для дзяўчынак Анюты, Ірынкі і Наташы перадалі прыгожую беларускую народную песню. «Дзяўчынкі мне дапамагаюць, — пісала бабуля, — то дроў прынясуць, то вадзіцы з калодзежа, то падлогу памыюць. Прыбягуць і ўсё пытаюцца: «Бабуля Тадора, што вам яшчэ зрабіць?» Дзякуй ім і дзякуй іхнім бацькам, выхавальніцам і настаўнікам».

Чаму бабуля Тадора падзякавала бацькам, выхавальніцам і настаўнікам?

---

Англійскі хлопчык Джон гуляў з мячыкам. Гуляючы, ён разбіў суседняе акно. Суседзі паскардзіліся бацькам хлопчыка. Джонаў бацька сказаў: «Не хвалюйцеся, Джон заробіць грошай (вокны вымые каму-небудзь, ці падлогу памые, ці траву на газонах падстрыжэ) і заплаціць вам.

Ці правільна зрабіў Джонаў тата? Чаму? А можа было б лепш, каб бацька сам заплаціў за разбітае акно? Як вы думаеце?

---

Што вы запомніце з таго, аб чым я раскажу вам?

1. Калі да цябе звяртаюцца, трэба глядзець не ўніз, а на таго, хто гаворыць. Нельга маўчаць, калі да цябе звяртаюцца. Трэба адказваць, як умееш, што ведаеш. Калі чаго не ведаеш, трэба пытацца. Пытацца не сорамна. Каб шмат ведаць, трэба ўважліва слухаць, што гавораць, глядзець на тое, што паказваюць, і пытацца, чаго не ведаеш. «Хто пытае, той не блудзіць».

2. Трэба абавязкова ўступаць старэйшаму месца, прапускаць яго першага ў дзверы, вітацца са старэйшым. Гэта робіцца ў знак пашаны да старэйшага. А чаму яго трэба шанаваць, паважаць? Бо кожны чалавек робіць нешта добрае ў сваім жыцці. Кожны чалавек сутыкаецца з

цяжкасцямі ў жыцці, траціць сілы, працуе на вас, маленькіх. Я мяркую, што калі вы будзеце ехаць у аўтобусе, трамваі ці тралейбусе, вы ўступіце месца старэнькай бабулі ці дзядулю. Так?

Ці дагадаецеся, хто на партрэце?

«Глядзіць Ігнась на партрэт і кажа: «У мяне няма ні сёстраў ні братоў, але ж чалавек на партрэце сын майго бацькі».

Ці адгадаеце, з якой мэблі дзяўчынка выцерла пыл?

Я вам падкажу вось так: «Зоська выцерла пыл з таго, на чым могуць сесці некалькі асоб, на чым можна спаць, ляжаць». (Канапа.)

«Зоська выцерла пыл з таго, у чым стаяць ці ляжаць кнігі». (Кніжная шафа.)

«Зоська выцерла пыл з таго, у чым захоўваюць посуд, некаторыя прадукты». (Буфет.)

Хто найлепш адкажа на цікавыя пытанні? На іх не так лёгка адказаць. А хто адкажа, той атрымае яблык.

1. Чаму птушка спявае? (Бо ёй весела, бо яна шчаслівая, бо яна ўмее спяваць. Хоча павесяліць сваіх дзетак. Кліча іншых птушачак.)

2. Чаму леў рыкае? (Бо ён галодны.)

3. Чаму дзеці так любяць слова «чаму?» і заўсёды пытаюць: «Чаму трава зялёная? Чаму птушкі спяваюць?» і г. д. (Бо хочуць усё ведаць.)

Паслухайце і адкажыце на маё пытанне: «Чаму мама не дазволіла Толіку пайсці на рэчку?»

— Мама, я пайду на рэчку. Добра?
— Няможна, сынок.
— Чаму?
— Рэчка глыбокая. Там можна ўтапіцца.
— Я ўмею плаваць.
— Заўтра мы пойдзем з табою разам. І разам будзем плаваць.

Адгадай, чаму маленькую Кацярынку не хочуць браць у школу.

Дзяўчынкі і хлопчыкі ходзяць у школу. (Так? Куды яны ходзяць?) У школе яны чытаюць і пішуць. (Што яны робяць у школе?) У школе — настаўнікі і настаўніцы, школьнікі і школьніцы. (Ты будзеш школьнікам ці школьніцай? А ты хочаш быць настаўнікам ці настаўніцай?) Настаўнікі і настаўніцы вучаць школьнікаў і школьніц. Дзецям вельмі цікава вучыцца. Яны хочуць усё ведаць.

Яны вучацца ахвотна і з цікавасцю. (Як яны вучацца?) Маленькая Кацярынка хоча таксама хадзіць у школу. Але яе не бяруць. Чаму? (Бо яна яшчэ маленькая.)

А цяпер адкажыце поўным сказам. Я падкажу: «Кацярынку не бяруць... (у школу), бо яна яшчэ маленькая. Як падрасце, тады... (і яна пойдзе ў школу)».

---

Хто з вас самы ўважлівы? Я прачытаю маленькае апавяданне і ў канцы задам адно пытанне. Хто будзе ўважлівы, той адкажа.

Сабаку звалі Пляма. Сабака быў прыгожы, вялікі. Поўсць у яго была белая, а на самай спінцы была вялікая чорная пляма. Сабака быў дужы. Па вачах яго было відаць, што ён вельмі разумны. Гэта быў, мабыць, самы дужы і самы разумны з усіх сабак, якіх я ведаў.

Чаму сабаку звалі Пляма?

---

А цяпер пабачым, хто з вас дагадлівы. Гэта пакажа адказ на адно пытанне, якое я задам пасля маленькага апавядання.

Мама кажа сыну:

— Не сёрбай так, а то ў наступным пакоі пачуюць, што ты ясі боршч. Не гавары, калі ў цябе ежа ў роце. Не глытай неператжаваную ежу. Не кладзі локці на стол, як ясі. Не забудзь сказаць дзякуй за любую ласку.

Усё хлопчык зрабіў, а пра адно забыўся і — папярхнуўся.

Пра якое правіла ён забыўся?

## РОЗНЫЯ ПЫТАННІ

Каму я кіну хусцінку, завязаную вузялком, той хуценька адказвае. Калі не зможа, дае фант. Пасля таго як назбіраем шмат фанцікаў, будзем іх разыгрываць.

Дзе расце яблык? (На дрэве, на яблыні.)

Што мы робім з мячыкам? (Гуляем, падкідаем, ловім.)

Што робіць кот? (Ловіць мышэй, гуляе з дзецьмі, спіць, п'е малачко, варкоча.)

Які бывае сабака? (Злосны, ласкавы, куслівы, ціхі.)

З чым любіць гуляць дзяўчынка? (З мячыкам, лялькай, цацкамі.)

Хто можа насіць капялюш? (Хлопчык, дзяўчынка, жанчына, мужчына, лялька.)

З чым любіць гуляць хлопчык? (З машынай, самалётам, з ружжом.)

З чаго робяць джэм? (З яблык, сліў, вішняў, персікаў, з розных фруктаў.)

Каго мы любім? (Маму, тату, брата, сястру, сябра і г. д.)

Што мы любім? (Малако, каву, мяса, масла, цукеркі, яблыкі і г. д.)

Дзе гуляюць дзеці? (У дзіцячым садку, у пакоі, у парку, у лесе, на рэчцы, у альтанцы.)

Што робяць алоўкам? (Пішуць, малююць.)

Якога колеру бываюць ружы? (Ружовага, чырвонага, жоўтага.)

На чым людзі ездзяць на працу? (На трамваі, на тралейбусе, на аўтобусе, на метро, на веласіпедзе, на мапедзе.)

Дзе жывуць дзікія звяры? (У лесе, у пушчы, у джунглях, у заалагічным парку.)

На якім паверсе ты жывеш?
У якой жывёліны пушысты хвост?
Чым мы ядзім суп?
Чым можна пісаць?
Малако, каб піць. А навошта соль?
Кім ты хочаш быць, як вырасцеш?
Колькі ў цябе пальчыкаў на адной руцэ?

А цяпер мы падзелімся на дзве групы. Тая, што будзе лепш, цікавей адказваць, выйграе і атрымае прыз. Які? Не скажу. Пасля ўбачыце.

Чаму нельга есці зімой марожанае?
Каго мы можам убачыць на вуліцы?
Што мы можам убачыць на вуліцы?
Чаму птушка лятае?
Яблык салодкі ці салёны?
Ты вялікі ці маленькі?
Што саладзей: кавун ці проса?
Дзе спяць птушкі?
Што мы надзяём на галаву?
Якая зараз пара года?

Дзяўчынка, якая купляе, называецца пакупніца. А хлопчык?

Ці любіш ты піць каву?

Што мы робім, калі захочам есці?
Што мы робім відэльцам?
На якое святло мы пераходзім вуліцу?
Што мы робім каляровымі алоўкамі?
Што любіць есці мядзведзь?
Ці ўмееш ты намаляваць бусла?
Якія дрэвы даюць нам фрукты?
Калі мы бачым сонца?
Чым мыюць рукі?
Якога смаку цукар?
Як завуць тваю выхавальніцу?
Хто табе чытае казкі?
З чаго робяць падлогу?
Дзе твая мама цяпер, у гэты час?
Чым мы чысцім зубы?
На якой рацэ стаіць Мінск?
Навошта мы апранаемся?
Колькі табе гадкоў?
Што трэба зрабіць, калі звоніць тэлефон?
Калі мы абедаем?
На што падобны хмаркі?
Ці добра, калі цябе крыўдзяць?
Хто прывёў цябе ў садок сёння?
Якое сёння надвор'е?
Хто дае малако?
Куды ты хадзіў учора вечарам?
Ці размаўляе вецер?
А марскія хвалі размаўляюць ці не?
Колькі лапак у катка?
На якой вуліцы ты жывеш?
Якая мэбля стаіць у зале?
Хто цябе апранае, калі ты ўстаеш?
Што больш: адзін ці тры?
На чым мы сядзім?
Ці быў ты на моры? А на возеры? На рэчцы?
Ці бачыў ты ўсход сонца? А заход сонца?
Ці часта ўсміхаецца твая мама? А тата?
Ці ёсць у цябе любімая казка? Якая?
Колькі хвастоў у сабакі? А лапак?
Табе падабаецца, калі табе дораць падарункі?
Ці ёсць лісце на дрэвах зімой?
Ці можна есці боб?
Ці можаш ты назваць тры рэчы, зробленыя з дрэва?
Які танец ты ўмееш танцаваць?

Чым мыюць падлогу?
Ці салодкая халва?
Навошта нам насоўка?
Што трэба, каб у хаце было ўтульна?
Чаму мы зімой цёпла апранаемся?
Ці поўзае жук?
Ці можаш ты назваць тры рэчы, зробленыя са скуры?
Якое свята ты любіш?
Што мы робім ручніком?
Чаму мы робім фізкультуру?
Хто хутчэй бегае: заяц ці чарапаха?
Колькі крылаў мае птушка?
Як мы вітаемся? Як мы развітваемся?
Чым сякуць дровы?
Што белае?
Што круглае?
Што квадратнае?
Як завуць твайго самага лепшага сябра (тваю самую лепшую сяброўку)?
Чаму кладуць кветкі да Вечнага агню?
Калі табе весела?
Дзе растуць каштаны?
Чым забіваюць цвікі ў сцяну?
Што трэба, каб зварыць суп з капусты?
Калі мы снедаем?
Чым мы пілуем дровы?
На што падобны кавун?
Што ты бачыш перад сабой праз акно?
Што ты ўмееш ляпіць з пластыліну?
Як раней называўся наш Мінск?
Дзе ты хацеў бы жыць: у горадзе ці ў вёсцы?
Што робяць на Дзяды? Каго людзі памінаюць?

## ЗАБАЎЛЯНКІ

У гэты раздзел уваходзяць скорагаворкі, пацешкі, заклічкі, лічылкі. Па форме яны яскравыя, дасціпныя, забаўныя. Усе яны падабаюцца дзецям, лёгка завучваюцца на памяць. І важна тое, што яны не асядаюць у памяці мёртвым грузам, а ўжываюцца актыўна ў гульнях, забавах.

Задача педагога не толькі развіваць душу і розум дзіцяці, а і вучыць яго беларускай мове, вучыць лексіцы, граматыцы і фанетыцы. Кожны моўны матэрыял трэба

старацца выкарыстоўваць у трох гэтых аспектах. Галоўны аспект, які трэба мець на ўвазе пры вывучэнні скорагаворак, пацешак, заклічак і лічылак, — гэта фанетыка (гэта не значыць, што іншыя аспекты могуць быць занядбаны). Возьмем для прыкладу скорагаворку:

Пайшоў шпак на шпацыроўку,
Знайшоў хустку кашміроўку.
А шпачыха завязала
І нічога не сказала.

Педагог прачытаў (а лепш сказаў) скорагаворку, растлумачыў словы: «шпацыроўка», «кашміроўка»; задаў пытанні: хто пайшоў на шпацыроўку? Што шпак (шпачок) знайшоў? Хто завязаў хустку-кашміроўку? Што сказала шпачыха? А што трэба было сказаць?

Цяпер, калі дзеці разумеюць змест і засвоілі словы, можна развучваць скорагаворку з дзецьмі. Спачатку радок за радком паўтараюцца павольна, выразна, а потым усё хутчэй і хутчэй, пакуль не дасягаецца патрэбны тэмп. У адзін прыём — не самы лепшы спосаб вывучыць твор на памяць. Пажадана да яго вяртацца на наступным занятку.

Прыёмы работы могуць быць розныя. Метад падказваецца формай і зместам моўнага твора. Гутарыць з дзецьмі можна не толькі пра дзеянні, апісаныя ў творы, але і пра побыт, звычаі. Напрыклад:

● Сёння мы з вамі пазнаёмімся з цікавай пацешкай. Калі бабуля ці матуля забаўляецца з дзіцяткам, калі яна разам з ім пляскае ў ладкі, казыча яму пяткі, гушкае ў калысцы, яна цешыць дзіцятка вось такім вершыкам:

1. Гушкі, гушкі, гушкі,
Прыляцелі птушкі,
Селі на варотах
У чырвоных ботах.

2. Сталі сакатаці.
Чаго птушкам даці?
Прынясу ім жыта,
Будуць птушкі сыты.

3. Дам яшчэ гароху,
Хай ядуць патроху.

Ды пасыплю грэчкі,
Хай нясуць яечкі.

А чаму птушкі абулі чырвоныя боты? А чаго яны засакаталі? Пакажам, як яны засакаталі. Ці пад'елі птушачкі? Бабуля расказвала гэты вершык сваім дзеткам, а мы давайце пагушкаем свае лялькі і раскажам ім тое самае. У нас будзе тры групы. Кожная група вывучыць чатыры радкі. Цікава, хто найлепш раскажа?

● Пагуляем у лічылкі. Развучым лічылку і палічымся. Хто выходзіць з гульні, той расказвае вершык альбо прыказку, скорагаворку, іншую лічылку, загадку альбо песню паспявае, на адной назе паскача.

Раз, два, тры, чатыры, пяць,
Воўк з лісой пайшлі гуляць,
Следам вожык тупаціць.
Мы пайшлі...
Табе лічыць.

● Паслухаем вершык, у якім людзі заклікалі да сябе дождж. Мы з вамі ведаем, навошта чалавеку трэба дождж. Навошта? Вось і заклічка дапаможа нам сказаць, навошта людзям быў патрэбны дождж, чаму яны яго заклікалі.

Ідзі, ідзі дожджыку,
Звару табе боршчыку.
Пастаўлю пад лаўкаю,
Накрыю халяўкаю.
Пастаўлю пад сенцамі,
Накрыю паленцамі,
Пастаўлю пад елкаю,
Накрыю талеркаю.
Талерка не здымецца,
Дожджык не сунімецца.
Дожджыку нам трэба,
Каб было больш хлеба.

Дык навошта людзі заклікалі дожджык?

## СКОРАГАВОРКІ

**● Прыдумаем адно пытанне да кожнай скорагаворкі.**

На рэчцы Лука
Злавіў рака ў рукаў.

Ехаў Пракоп з Пракопіхай
І з малым пракапяняткам.

---

Прытупіў пілу Піліп
Пілаваў паленне з ліп.

---

Рама рана ружавее,
Рама рада — сонца грэе.

---

Чорны-чорны грак прысніў:
Ноччу драч драча дражніў.

---

Цераз тын, цераз плот
Жук ляціць у агарод
І гудзе, як самалёт.
Ну і гук!
Ну і жук!

---

Чаравічкі ў нашай Славы
Адзін левы, другі правы.
Справа — левы,
Злева — правы,
Скажы, Слава,
У чым справа?
Тут маёй няма віны:
Паспрачаліся яны.

● Прачытаем, адкажам на пытанні і вывучым.

Пайшоў шпак на шашу,
Знайшоў шапку малышу.
Цудоўная шапка,
Дзякуй табе, татка.

Куды пайшоў шпак? Што шпак знайшоў на шашы? Якую шапку ён знайшоў? Каму ён аддаў гэту шапку? І што сказаў малыш? Ці добра ён зрабіў? За ўсялякую ласку, за ўсё добрае трэба дзякаваць. Так ці не?

---

Камарыкі мак таўкуць —
З той мукі бліны спякуць.
І смаўжоў на мосце
Паклічуць у госці.

Хто спячэ бліны? Каго ў госці паклічуць камарыкі? Чым камарыкі будуць частаваць смаўжоў. А дзе жывуць

смаўжы? З чаго людзі пякуць бліны, скажыце, калі ласка. Як называецца наша пацешка?

---

Страказе каза казала:
— Я ў пучок лазу вязала,
Павязу лазу казлу,
Каб не лазіў у лазу.

Хто з кім вядзе тут гутарку? Хто вязаў лазу ў пучок? Дзе лаза расце? Што людзі з лазы робяць? Каму каза павязе лазу? Ці бачылі вы казу? А ці бачылі вы казла? Дзе вы бачылі казла? На малюнку? А ці бачылі вы страказу? Можа мы намалюем казу, казла і страказу?

---

Скача чапля па балоце.
Чачотачка — у чароце,
А чубаты чачот
Топча, топча агарод.

Хто топча агарод: чачот ці чапля? Ці добра робіць чубаты чачот?

---

Спрытна кроп
Палоў Пракоп.
Лёг пад плотам
І захроп.

Хто палоў кроп? Як Пракоп палоў кроп? Ці замарыўся ён? А чаму ты думаеш, што ён замарыўся? Чаму ён лёг пад плотам адпачыць? Ці хутка ён заснуў? А адкуль ты ведаеш, што хутка?

---

Лілечка лялечку Алачку
Любіць, яе забаўляе.
Лілечка лялечку Алачку
У люльцы люляе.

Як завуць лялечку? Як завуць дзяўчынку, якая люляе лялечку? Дзе Лілечка люляе лялечку Алачку? Што ты спяваеш, калі люляеш сваю лялечку? Як завуць тваю ляльку? Хто даў імя тваёй ляльцы? Ці любяць хлопчыкі гуляць з лялькамі?

## ПАЦЕШКІ

● **Паслухайце, адкажыце на пытанні і вывучыце на памяць.** Будзеце расказваць пацешкі сваім лялькам, маленькім брацікам і сястрычкам! Добра?

### Ладкі ладком, піражкі з мядком

Ладкі ладком,
Піражкі з мядком,
Кашка з алеем,
Есці не ўмеем.

Хто з вас еў піражкі з мядком? А з чым ядуць алей? А хто гэта не ўмее есці? Пэўна, надта маленькія дзеткі? Вы ж усе ўмееце есці? Так? Як называецца пацешка, якую мы з вамі вывучылі?

---

### Кую, кую ножку

Кую, кую ножку,
Паеду ў дарожку,
Дарожка крывая,
Кабылка сляпая.
Еду, еду, еду,
Ніяк не даеду.
Прыпрагу сароку,
Паеду далёка,
У новай кашулі,
Да майго дзядулі.

Скажыце, калі ласка, навошта кабылку (коніка) падкоўваюць? Якой дарожкай лягчэй ехаць: простай (прамой) ці крывой? Як вы думаеце, ці дапаможа сарока кабылцы давесці ўнучка да яго дзядулі? Як называецца пацешка, якую мы вывучылі?

---

### Ішоў бай па сцяне

Ішоў бай па сцяне,
Нёс торбу на спіне.
Што ў торбе, то мне,
Што ў карыце, то Мікіце.

Як ты думаеш, што лепш мець: тое, што ў торбе, ці тое, што ў карыце? Як называецца пацешка, якую мы з вамі вывучылі?

---

### Ідзе каза рагатая

Ідзе каза рагатая,
Ідзе каза, ідзе,

Барадой трасе,
Малачко нясе.
Малачка хто не п'е —
Таго — бу! Забаду!
На рогі пасаджу.

Як вы думаеце, чаму каза хоча, каб дзеці пілі малако? Каза хоча, каб вы ўсе падраслі. А хто яшчэ хоча, каб вы падраслі? Давайце іх усіх пералічым. Я буду пальцы згінаць: раз, два...

---

**Козачка-свавольніца**

За дзяўчынкай гоніцца
Козачка-свавольніца,
Рожкамі кальнула,
Хвосцікам махнула,
Гайсанула цераз плот
У зялёны агарод.
Пэўна, ёй, кудлатай,
Хочацца салаты?
Пэўна, ёй да густу
Морква і капуста?

А вы, як думаеце, ці хочацца козачцы морквы і салаты? Козачка называецца свавольніцай. Яна любіць волю, любіць бегаць, жартаваць, гойсаць цераз плот. Ці падабаецца табе, Юрась, козачка-свавольніца? За кім гэта кудлатая козачка гоніцца: за хлопчыкам ці за дзяўчынкай? Чаму яе назвалі кудлатай? Козачцы-свавольніцы даспадобы, да густу морква і салата. А вам даспадобы морква і салата?

---

**Чы-чы, чы-чы, верабей...**

Чы-чы, чы-чы, верабей,
Не клюй маіх канапель.
Бо я табе, вераб'ю,
Кіем ножку пераб'ю.
Верабейка палятаў,
Канапелек не чапаў.
Пачаў лавіць мошачку,
Звіхнуў сабе ножачку.
Я на тую ножку
пашыю панчошку.

Верабейка хацеў пакляваць канапелькі, але ён іх не зачапіў. Так? А чаму верабейка не зачапіў канапель? Ці паслухмяны верабейка? А што верабейка пачаў лавіць? А навошта ён лавіў мошачак? І што здарылася з верабейкам? Што ён звіхнуў сабе? Хто яму паможа? Ці палягчэе верабейку ў панчошцы? Ці дапаможа панчошка звіхнутай ножцы?

---

**Сарока-варона**

Сарока-варона
На прыпечку сядзела,
Дзеткам кашку варыла,
Па лыжцы дзяліла.
Гэтаму дала,
Гэтаму дала,
Гэтаму дала,
Гэтаму дала,
А гэтаму не дала.
Гэты пальчык —
Вялікі гультайчык.
Круп не драў,
Цеста не мясіў,
Вады не насіў.
Лыжкі на паліцы,
Кашка ў камяніцы.
Шуг! Шуг! Шуг!
Паляцелі —
На галоўку селі.

Хто варыў дзеткам кашу? Дзе сарока-варона сядзела, калі варыла дзеткам кашу? Колькі яна давала кашкі кожнаму дзіцятку? (Пакажам на пальчыках, кожнаму пальчыку — адну лыжачку кашы.) Чаму яна не дала кашкі аднаму дзіцятку? Чаго не рабіў пальчык-гультайчык? Ён крупы драў? Ён цеста мясіў? Ён ваду насіў? Сарока-варона не любіць гультаёў? Яна неўзлюбіла пальчыка-гультайчыка. Так? А мы з вамі ці любім гультаёў?

● **Паслухаем пацешкі, вытлумачым усё, што вам незразумела, вывучым іх і пагуляем у тэатр.**

**Ладу, ладу, ладкі**

— Ладу, ладу, ладкі,
Дзе былі?

— У бабкі.
— А што елі?
— Кашку.
— А што пілі?
— Бражку.
Бабулька казала,
Як нас частавала:
— Прыходзьце часцей,
Пачастую смачней:
Дам вам сыраквашкі,
Бярозавай кашкі.

А што гэта за бярозавая кашка? Хто з вас хоча, каб бабуля дала яму бярозавай кашкі? Бабулька пажартавала, сказаўшы, што яна дасць бярозавай кашкі. Ці не так?

---

— Мышка, мышка, дзе была?
— Была ў пана караля.
— Што рабіла?
— Лыжкі мыла.
— А што далі?
— Кусок сала.
— Дзе паклала?
— Пад лаўкаю.
— Чым накрыла?
— Халяўкаю.
— Дзе падзела?
— Котка з'ела.

Як котка здагадалася, што пад лаўкаю накрытае халяўкаю ляжыць сала? Котка ўбачыла сала ці пачула яго пах? А чым котка зняла халяўку з сала? Лапкаю ці пысаю? Котка любіць сала, я люблю сала, а ты, Антось? Давайце прыдумаем загаловак гэтай пацешцы. Добра? («Хітрая котка», «Мышцы далі кусок (кавалак) сала», «Не кладзі сала пад лаўкаю», «Мышка, мышка, дзе была?»)

---

Кукарэку-певунок,
Залаценькі чубок,
Пад паветачку пайшоў,
Курку-рабку там знайшоў.
Пачаў курку пытаць,
Ці ўмее чытаць.

— Не чытаю, не пішу,
Толькі яйкі нясу.
Штодзень дзецям нашу
Аж па цэламу кашу.
Птушкам — пачастунак!
Дачушцы — падарунак!
Сынкам — пацешка!
— А нам?
— А вам — усмешка!
Насіцеся — хваліцеся,
З усімі дзяліцеся!

Як вы думаеце, хто гэта гаворыць так прыгожа, хто дае птушкам пачастунак, дачушцы падарунак, сынкам пацешку, а нам усім з вамі ўсмешку? Ці паэт, які напісаў гэту пацешку? Ці добрая фея? Ці нечая мама?

Як вы думаеце, што самае лепшае: пачастунак, падарунак, пацешка ці ўсмешка? Чым можна частаваць чалавека? (Які можа быць пачастунак?) Што можна падарыць чалавеку? (Які можа быць падарунак?) Мы ведаем з вамі шмат пацешак. Так? Хто нам прыгадае адну пацешку?

А калі мы ўсміхаемся? Ці рада ваша мама, калі ўбачыць вашу ўсмешку? Ці рада я, як вы падорыце мне сваю ўсмешку? Ці часта мы ўсміхаемся? Ці прыемна бачыць усмешку на тварыку ў каго-небудзь? Давайце ўсе ўсміхнёмся, падзелімся сваімі ўсмешкамі.

---

— Смоўжык, смоўжык,
Дзе твае рожкі?
— Рыбка ўкрала.
— А дзе тая рыбка?
— Паплыла з вадой.
— А дзе тая вада?
— Да хмаркі паляцела.
— А дзе тая хмарка?
— Дожджык забраў.
— А дзе той дожджык?
— Л'е над табой.
— А я дожджыку
Не спужаюся.
Скокну ў рэчку
Дый схаваюся.

А што такое смоўж? А ты дзе схавасшся, як будзе дождждык? Што нас ад дожджыка хавае? Парасон? Плашчы з капюшонам? Дах над галавой?

---

— Ластаўка, куды?
— На млынок,
Намялю там жыта
І спяку блінок.
Дзетак-малалетак
Накармлю.
— Добра летам, добра летам,
Лета я люблю.

Дзеткам-малалеткам мала гадкоў, яны пражылі мала вёснаў і летаў. І вы дзеткі-малалеткі. Так? Ластаўцы добра летам, а нам з вамі ці добра летам? Каго ластаўка будзе карміць блінком? З чаго пякуць бліны? А дзе бяруць муку?

---

— Кацюты, кацюты,
Ладушкі-ладкі.
— Дзе былі?
— У бабкі.
— Што рабілі?
— Муку малолі.
— Дзе падзелі?
— Мышкі з'елі.
— Куды панянслі?
— Сюды, сюды, сюды.

Як называюцца тут коцікі? Цікава, праўда? Кацюты намалолі мукі і хто ж яе з'еў? Што яшчэ мышкі любяць есці?

## ЗАКЛІЧКІ

● Павучымся прыклікаць дождж, вясну, зіму. Для гэтага мы вывучым заклічкі. У заклічках мы спаткаем шмат цікавых слоў. Вывучым і словы і заклічкі. Навучымся адказваць на пытанні.

---

Дожджык, дожджык, сыпані,
Спёку з поля прагані!
Я пад ліпкай пасяджу,
На лісточкі пагляджу.

Як вы думаеце, калі спёка на полі, ці лёгка тады працаваць? А пад ліпкай сядзець і на лісточкі глядзець, калі дождЖык сыпане, лёгка ці цяжка?

---

Дожджык, дожджык — грыбасей,
Ты для нас грыбы пасей!
Дожджык, дожджык — рыбачок,
Злаві рыбку на кручок.

Вось як цікава называюць дождж! Дожджык — грыбасей. Ён сее грыбы? Так? Вы ведаеце, што пасля дожджыку больш грыбоў у лесе? Грыбы любяць дождж? А ты, Віталік?

---

Ідзі, ідзі, дожджыку,
Звару табе боршчыку.
Пастаўлю пад елкаю,
Накрыю талеркаю,
Сама пакаштую,
Цябе пачастую.

Ці любіш ты частаваць сваіх сяброў? Чым цябе частуе бабуля, калі ты прыходзіш да яе ў госці?

---

Вясновыя вочкі,
Ідзі, зіма, прочкі.
Вясна ідзе полем
З кветкамі ў прыполе.

Зіму праганяюць, а вясну заклікаюць. Як праганяюць зіму? Вясна ідзе полем.

Што ж яна нясе ў прыполе? Я вельмі люблю кветкі (краскі). А вы?

---

Я пасею канапельку
У мяккую зямельку.
— Расці, расці, канапелька,
І не густа, і не рэдка.
— Коранем глыбока,
Сцяблінай высока.

Хто скажа, чаму добра, калі расце канапелька (іншая расліна) не густа і не рэдка? А што такое сцябліна? Корань у зямлі, а сцябліна дзе? Хочаце, я вам намалюю канапелькі і пакажу сцябліну?

---

Сонейка-сонца,
Залатое донца,
Не хавайся у бары,
А гары, гары!
Ну —
Хоць трошкі пасвяці,
Каб нам спаць не ісці.

Як вы думаеце, хто просіць сонейка, каб яно не заходзіла, а хоць трошкі пасвяціла? Дарослыя ці дзеці, дзеткі-малалеткі? Я вельмі люблю, як сонейка свеціць, а ты, Барысок?

---

У вырай ляцяць жураўлі
Далёка ад роднай зямлі.
Я з птушак не зводжу вачэй:
— Дамоў прылятайце хутчэй!

Куды ляцяць птушкі? А ў выраі цёпла? Як вы думаеце, хто глядзіць і не зводзіць вачэй з птушачак? А птушкі зноў вернуцца ў родны край?

---

Снегіры, сінічкі,
Наце вам пшанічкі,
Крупак, крошак хлеба!
Вам жа мала трэба!
Ешце, любыя сябры!
Не хавайцеся ў бары,
А жывіце ў двары
Да вясенняе пары.
Вось для вас кармушкі,
Птушкі-шчабятушкі,
Нашы весялушкі!

Ці ўсе вы хочаце вывучыць гэту цудоўную заклічку? Каго частуе добры чалавек крупкамі пшанічкі і крошкамі хлеба? Птушкам трэба больш корму, чым чалавеку, ці менш? Што зрабіў добры чалавек для птушак у сваім двары? Ці добра будзе птушкам у двары гэтага добрага чалавека? Як гэты добры чалавек называе птушачак?

## ЛІЧЫЛКІ

У хусцінцы —
Тры гасцінцы:
Табе, братка, —
Шакаладка,
Табе, дружок, —
Піражок,
А сястрычцы —
Тваражок,
Табе, свінка,
Хусцінка:
Ты умыйся,
Ты утрыся,
А ты спаць
Пакладзіся.

---

Юлія,
Юлія,
Юліна,
Зайшла
к Юрку на хвіліну.
Юрка
Рыбкі
Налавіў,
Юшкі смачнай
Наварыў.
Юшкай
Частаваў
Юлінку,
Вельмі вабную
Дзяўчынку.
Юлька
Юшку
Каштавала,
Дзякуй
Юрачку казала.

Юрачку было прыемна, калі Юлька сказала яму дзякуй? А ты заўсёды кажаш дзякуй?

---

Раз, два, тры, чатыры,
Кошку грамаце вучылі:
Не чытаць, не пісаць,
А за мышкамі скакаць.

Якой грамаце вучылі кошку? Чытаць? Пісаць? А якая ў кошак грамата? Мышэй лавіць?

---

Каціласся торба
З вялікага горба.
А ў той торбе
Хлеб, паляніца.
З кім ты хочаш
Падзяліцца?

Ці ўсе ведаюць, што такое паляніца? Торба? З кім ты хацеў бы падзяліцца, калі б меў два яблыкі, Андрэйка? А ці даў бы мне кавалак паляніцы, калі б яна ў цябе была?

---

Сарока — варона
На дубе сядзела,
Баяр лічыла:
Каліна, маліна,
Суніца, чарніца,
Вяз.
Хто будзе жмурыцца,
Той будзе князь.

А што такое «вяз»? Якія ягады ты любіш: суніцы ці чарніцы? Ці ўсялякія: клубніцы, парэчкі, агрэст, суніцы, маліны?

---

Ляцела, ляцела,
Лічыць умела:
Адзін — каркацік,
Другі — вуркацік,
Трэці — кудахцік,
А хто пазяхае,
Той уцякае.

Альбо (той будзе жмурыць).

Каркацік — той, хто каркае. Хто гэта? Вуркацік — той, хто вуркае. Хто гэта? Кудахцік — той, хто кудахтае. Хто гэта? Дык хто яны ўсе трое?

Што ты лепш любіш: лічыць у гульні ці жмурыць?

---

Раз, два — булава,
Тры, чатыры — прычапілі,
Пяць, шэсць — кашу есць,
Сем, восем — сена косім,
Дзевяць, дзесяць — свеціць месяц.

Што лягчэй рабіць: кашу есці ці сена касіць?

---

Заяц, заяц,
Дзе ты быў?
Ці не ў лесе?
Што рабіў?
Лыка драў.
Куды клаў?
Пад калоду.
Выйдзі вон з карагоду.

А што такое карагод? Лыка? Што з яго можна зрабіць?

---

Каля нашага двара
На гары стаіць гара.
А на той гары дубок.

На дубочку жалудок.
І яшчэ арэхаў пяць,
А што далей — не відаць.

Дзе растуць жалуды? Дзе растуць арэхі? Ці любіш ты арэхі, Аркадзік? А ты, Ганначка?

---

Ішла зязюля міма сеці,
А за ёю яе дзеці.
Ку-ку, ку-ку,
Скажы казку
Свайму ўнуку.

Ці часта мы чуем зязюлю? А ці ўсе вы чулі, як кукуе зязюля?

---

Бег зай па бару,
Абіраў лебяду,
Рваў, клаў у пучок,
Выбірайся, ваўчок.

А чаму выбіраюць лебяду з агарода? Якое яшчэ пустазелле расце на градах?

---

Раз, два, тры, чатыры,
Мяне літарам вучылі.
Не чытаць, не пісаць,
Толькі ў класікі іграць!

А ты літары ўжо ведаеш, Ірынка? А ў класікі хто з вас умее іграць?

---

Раз, два, скок! — Вось мой крок.
Раз, два, тры, чатыры, пяць. —
Я іду шукаць.
Хто перада мною стаіць,
У таго пальчык баліць.

Што мы робім, калі ў нас пальчык баліць? Хто нас лечыць? Хто нас шкадуе? Хто нам спачувае?

---

Раз, два, тры, чатыры, пяць,
Выйшаў месяц пагуляць.
А за месяцам луна,
Аставайся ты адна.

Як па-беларуску скажам рускае слова «луна»? А ёсць яшчэ адно значэнне слова «месяц». Што яно значыць?

---

Ля Яўгена села Лена.
Ля Генадзя села Ядзя.
Каля Зосі — два Антосі.
Каля Надзі — два Аркадзі.
Каля Янкі — тры Святланкі.
Каля Сашы — тры Наташы.
Колькі тут дзяўчат усіх?
Колькі хлопчыкаў ля іх?
Хочаш ведаць — не сядзі,
Сам цяпер лічыць ідзі.

Мне вельмі падабаецца гэта лічылка. Каму з вас яна спадабалася? Дык колькі тут хлопчыкаў? Як іх завуць? А колькі дзяўчат? Як іх завуць? Якія імёны вам найбольш падабаюцца ў гэтай лічылцы? Мне падабаюцца імёны Ядзя і Янка. А вам?

## УЗБАГАЦІМ СВАЮ МОВУ
### (моўныя практыкаванні)

У гэты раздзел уваходзяць моўныя практыкаванні сітуацыйна-камунікатыўнага характару. Мэта практыкаванняў — засваенне дзецьмі граматычных структур беларускай мовы ў працэсе гутаркі, камунікацыі, развіццё ўменне разумець і размаўляць па-беларуску.

Практыкаванні складзены так, што ўтвараюць канкрэтную аснову для размовы дарослага і дзіцяці, для рэакцыі выхаванца на рэпліку педагога. Падказка педагога дае магчымасць дзіцяці знайсці патрэбнае для рэакцыі слова. Пераклад з беларускай на рускую мову пры падказцы непажаданы. Да перакладу трэба звяртацца толькі ў выпадку, калі дзеці не зразумелі фразу педагога.

Кожнае асобнае практыкаванне мае сваю задачу — навучыць той ці іншай граматычнай структуры, азнаёміць з тым ці іншым моўным элементам, лексічнай адзінкай. Усе гэтыя задачы падпарадкоўваюцца агульнай мэце — навучыць дзіця гутарковай мове і стварыць магчымасць пазнаваць навакольны свет.

Кожнае практыкаванне — гэта прыклад жыццёвай сітуацыі.

Узор дае магчымасць выконваць практыкаванні без памылак, з карэкцыяй. Працуючы з практыкаваннямі, педагог мае магчымасць ажыццяўляць індывідуальны падыход да дзяцей. Адно дзіця ўмее беспамылкова паўтараць фразу, а іншае адказаць, зрабіць выснову, абагульніць. Вось педагог і ўводзіць выхаванца ў гутарку на тым этапе работы з практыкаваннем, на якім дзіця найлепш можа сябе выявіць. Каб дзеці не трацілі настрою, не адчувалі няёмкасці ад таго, што яны не ведаюць, што і як сказаць, пажадана, каб педагог часцей дапамагаў ім падказкай.

Атмасфера ў працы з практыкаваннямі павінна быць прыемная, радасная, жывая. Выхавальнік часам можа нават наўмысна стварыць атмасферу зацікаўленасці, настроіць дзяцей так, быццам гаворка пойдзе пра нешта выключна цікавае. У гэтым педагогу дапаможа артыстызм.

● **Вы ўсе любіце рабіць тое, што і я. Так і скажыце.**

Узор. *Я люблю слухаць казкі. А ты, Зоська? — І я люблю слухаць казкі.*

Я люблю слухаць беларускую калыханку.
Я люблю спяваць, танцаваць.
Я люблю мыць посуд.
Я люблю выціраць пыл.
Я люблю адгадваць загадкі.
Я люблю працаваць у агародзе.
Я люблю мыць падлогу.
Я люблю хадзіць з татам у лес.

● **У нас з вамі падобныя бабулі. Дык вось, што я скажу пра сваю бабулю, тое вы скажаце пра сваю.**

Узор. *Мая бабуля добрая. (А твая бабуля, Паўлік?) — І мая бабуля добрая.*

Мая бабуля працавітая.
Мая бабуля любіць пячы пірагі.
Мая бабуля ведае многа казак.
Мая бабуля ўмее вязаць.
Мая бабуля жыве ў Мінску.
Мая бабуля рана ўстае.
Мая бабуля купляе мне цукеркі.

● **Вы тое самае зробіце, што і я. Так і скажыце.**

Узор. *Я хутка пайду дамоў. А ты, Яначка? — Я таксама хутка пайду дамоў.*

Вечарам я буду слухаць калыханку.
Летам я паеду ў вёску.
Я павіншую сваякоў з Новым годам.
Я павіншую свайго сябра з днём нараджэння.

● **Паслухайце і паўтарыце. Гаварыце па падказцы.**

Узор. *Гэтая лялька прыгожая. (Тая лялька.) — Тая лялька прыгажэйшая. (Вунь тая лялька.) — Вунь тая лялька найпрыгажэйшая.*

Мая ручка доўгая. (Яе ручка. Яго ручка.)
Сашын капялюш новы. (Алёшын капялюш. Юзікаў капялюш.)
Мой аловак кароткі. (Пецін аловак. Віцікаў аловак.)
Ніна сукенка цёплая. (Наташына. Алёніна.)

● **Паслухайце і паўтарыце.**
Раніцай у нас снеданне.
У полудзень у нас абед.
Увечары ў нас вячэра.

● **А цяпер вы мяне папраўляйце. Я памылілася, не так сказала.**

Узор. *Зранку ў нас вячэра. — Зранку ў нас снеданне. Вы памыліліся.*

У полудзень у нас снеданне.
Увечары ў нас абед.
У полудзень у нас вячэра.

● **Цяпер я скажу ўсё правільна. Вы пацвердзіце, што я кажу праўду.**

Узор. *Раніцай мы снедаем. — Раніцай мы снедаем. Вы праўду кажаце.*

У полудзень мы абедаем.
Вечарам мы вячэраем.

● **Запытай у іншых пра тое самае.**

Узор. *Я ўмею чытаць. — А ты ўмееш чытаць, Ігнась?*

Я ўмею мыць свае шкарпэткі.
Я ўмею мыць свае хусцінкі.
Я ўмею смажыць яечню.
Я ўмею заварваць чай (гарбату).
Я ўмею расказваць казкі.

● **Давайце адкажам, дзе што знаходзіцца. Я вам буду падказваць.**

Узор. *Дзе яйка? (На сподачку.) — Яйка на сподачку.*

Дзе рыба? (У халадзільніку.)
Дзе соль? (У сальніцы.)
Дзе цукар? (У цукарніцы.)
Дзе слоік? (На паліцы.)
Дзе карабок запалак? (У прыскрынку.)
Дзе шклянка? (На стале.)
Дзе падушка? (На ложку.)
Дзе партфель? (На падлозе.)
Дзе коцік? (На дыванчыку.)
Дзе лялька? (На канапе.)

● **А цяпер вы пытайцеся самі, дзе што (хто) знаходзіцца ў гэтым пакоі, без маёй падказкі.**

Узор. *Дзе сядзіць Сцяпанка? Дзе ляжыць самалёцік?*

● **Я пачну гаварыць слова, а вы канчайце. Пакажыце, што вы ведаеце назвы колераў.**

Узор. *Чыр... — Чырвоны.*

Блак..., руж..., жоў..., чор..., карыч..., ліло..., аранж..., шэр..., бе..., зял..., сі... .

● **Што вы скажаце, калі не зможаце зрабіць тое, што я ў вас прашу?**

Узор. *Дай мне, калі ласка, пяць алоўкаў. — Прабачце, але ў мяне іх няма. Я не магу гэтага зрабіць.*

Дай мне кветачку (булачку, цукерачку, шклянку соку, кубачак кавы).
Падскоч да столі, дастань лямпачку.
Пагавары са мною па-польску.
Пагавары са мною па-татарску.
Пагавары са мною па-яўрэйску.

● **Запытай і адкажы.**

Узор. *Я ўмею чытаць па-англійску. — А ты, Толя, умееш чытаць па-англійску? — Не, я не ўмею чытаць па-англійску.*

Я ўмею пісаць вершы.
Я ўмею шыць паліто.
Я ўмею цыраваць шкарпэткі.

● **Рэчы, пра якія мы будзем гаварыць, — розныя. Так мы і скажам.**

Узор. *Гэты дом нізкі. (Высокі.) — А той дом высокі.*

Гэты каўнерык чысты. (Брудны.)
Гэта іголка вострая. (Тупая.)
Гэтая стужка блакітная. (Ружовая.)

● **Я вас папрашу што-небудзь зрабіць, і вы мне з прыемнасцю гэта зробіце.**

Узор. *Палі, калі ласка, вазоны, Гэлька. — Я з прыемнасцю палью вазоны.*

Збегай у прадуктовы магазін, Валерык.
Праветры пакой, Ірынка.
Складзі, калі ласка, цацкі, Кастусёк.
Прынясі вядзёрка вадзічкі, Святлана.
Уключы, калі ласка, радыё, Алесь.

● **Прыгадаем назвы адзення:** касцюмчык, гарнітур, штаны, пінжак, сукенка, гальштук, капялюш, чаравікі, панчохі, куртка, паліто, шалік. Паўторым іх разам уголас. А цяпер апішам дзяўчынку. Яе завуць Ганулька. Яна сабралася ісці з мамай у парк. Скажам, як яна апранута. Я вам буду ціхенька падказваць.

Узор. *На галаве ў яе ка... (капялюш). — На галаве ў яе капялюш.*

На шыі ў яе ша... (шалік).
Яна апранула новую су... (сукенку) і па... (паліто).
На нагах у яе ча... (чаравічкі) і цёплыя пан... (панчохі).

● **А цяпер вы мне дапаможаце сказаць, што тата купіў Андрэйку. Ён пойдзе ў школу.**

У з о р. *Тата купіў Андрэйку гарнітур. (Шапку.) — Тата купіў Андрэйку гарнітур і шапку.*

Тата купіў Андрэйку чаравікі. (Шкарпэткі.)
Тата купіў Андрэйку паліто. (Шалік.)

● **Дазвольце мне рабіць тое, што я прашу.**

У з о р. *Я хачу з'есці цукерку. — Калі ласка, з'еш (з'ешце) цукерку.*

Я хачу з'есці марожанае.
Я хачу пакатацца на веласіпедзе.
Я хачу схадзіць на плошчу Незалежнасці.

● **Не дазваляйце мне зрабіць тое, што я буду прасіць.**

У з о р. *Можна мне выйсці? — Не, нельга табе (вам) выйсці.*

Можна мне з'есці лыжку мёду?
Можна мне заспяваць цяпер песню?
Можна мне пагушкацца на арэлях?

● **Колькі будзе разам?**

1. Два хлопчыкі палолі градкі ў агародчыку. Прыйшлі яшчэ два хлопчыкі і кажуць.

— Можна, мы вам дапаможам?

— Будзем вельмі рады.

І хлопчыкі разам пачалі працаваць. Колькі іх было цяпер?

2. Дзяўчынка гуляе са сваёй лялькай, спявае ёй калыханку. Раптам прыбег коцік. Сеў і сядзіць, слухае. Колькі іх цяпер усіх?

3. На дзень нараджэння дзядуля падарыў Толіку кніжку. На Новы год падарыў яму дзве кніжкі, а на Вялікдзень прынёс яшчэ дзве кніжкі. Колькі ў Толіка кніжак?

● **Скажыце, калі ласка, які бывае хлопчык.**

У з о р. *Гэты хлопчык уважлівы. (Няўважлівы, рассеяны.) — А той хлопчык няўважлівы, рассеяны.*

Гэты хлопчык смелы. (Нясмелы, палахлівы.)
Гэты хлопчык працавіты. (Гультаяваты.)
Гэты хлопчык дужы. (Нядужы, слабы, кволы.)

● **Скажыце, калі ласка, якая бывае дзяўчынка.**

Узор. *Гэта дзяўчынка зграбненькая. (Нязграбная.) — А тая дзяўчынка нязграбная.*

Гэта дзяўчынка чысценькая. (Брудная.)
Гэта дзяўчынка акуратненькая. (Неахайная.)
Гэта дзяўчынка добрая. (Злосная.)
Гэта дзяўчынка лагодная. (Упартая.)
Гэта дзяўчынка працавітая. (Гультаяватая.)

● **Пакажыце свае рукі, калі ласка. Давайце падумаем, якія могуць быць рукі?** Так, чыстыя, брудныя, мяккія, шурпатыя. Я вам скажу, што рукі робяць, а вы падкажаце мне, якія яны.

Узор. *Рукі мыюць мылам і вадзічкай. (Чыстыя.) — Рукі чыстыя.*

Рукі не памытыя яшчэ. Яны палолі градкі. (Брудныя.)
Рукі шмат працуюць у зямлі, на холадзе. (Цвёрдыя, спрацаваныя, мазолістыя, парэпаныя, шурпатыя.)
Рукі неспрацаваныя, часта мажуцца крэмам. (Мяккія.)

● **Як я памылюся, вы мяне паправіце. Добра?**

Узор. *Настаўнік лечыць хворых. — Не. Настаўнік вучыць дзяцей. (Доктар.) Доктар лечыць хворых.*

Цырульнік шые сукенкі. (Кравец.)
Будаўнік вядзе тралейбус. (Шафёр.)
Кравец рамантуе абутак. (Шавец.)
Лётчык пячэ хлеб. (Пекар.)
Шавец піша кнігі. (Пісьменнік.)

● Уявім сабе, што на стале ваза. У ёй яблыкі, цукеркі, апельсіны. Лена — гаспадыня. Вы ў яе будзеце прасіць што-небудзь, а яна вас будзе частаваць. Спачатку навучымся, як трэба прасіць: «Дай мне, калі ласка, адну цукерку», «Ці можна мне ўзяць адну цукерку?», «Ці можна мне пачаставацца?» **А цяпер будзем прасіць і адказваць на просьбу.**

Узор. *Ці можна мне ўзяць адну цукерку? — Калі ласка. Вазьмі. Вось яна. З прыемнасцю цябе пачастую. — Вельмі дзякую. (Вялікі дзякуй. Шчыра дзякую.)*

● **Цяпер мы адзін аднаму раскажам вершыкі.**

Узор. *Раскажы мне, калі ласка, які-небудзь вершык. — З прыемнасцю. Слухай, калі ласка, верш «Павучок» Ларысы Геніюш.*

● **Папраўце, калі ласка, маю памылку і скажыце так, як трэба.**

Узор. *Лялька жывая. — Не. Вы няпраўду кажаце. Лялька нежывая.*

Стол зялёны.
Дрэва чырвонае.
Конь — гэта птушка.
Верабейка — хатняя жывёліна.
Трусік — кусаецца.

● **Пакажыце, што вы ведаеце шмат імён дзяўчынак і хлопчыкаў. Я скажу што-небудзь пра аднаго з дзетак, а вы тое самае пра іншага хлопчыка ці дзяўчынку.**

Узор. *Міхась смелы. — Жэня таксама смелы.*

Андрэйка ветлівы.
Кастусь палахлівы.
Алеся разумная.
Змітрок добры.
Кацярына вясёлая.
Міколка задзірысты.

● **Скажыце тое самае пра сябе.**

Узор. *Наталка любіць малако. — І я люблю малако.*

Алінка вельмі добра малюе.
Волечка вельмі любіць слухаць казкі.
Настачка любіць хадзіць у садок.

● **Раскажыце пра сваю маму ці свайго тату тое, пра што я скажу.**

Узор. *Мая мама працуе ў школе. А твая? — А мая мама працуе на фабрыцы.*

Маю маму завуць Ірына.
Маёй маме трыццаць гадоў.
Майго тату завуць Піліп.
Мая мама пячэ смачныя бульбянікі.

● **Паслухайце і скажыце, хто гутарыць з мамай: хлопчык ці дзяўчынка.**

— Мама, ці можна мне з'есці піражнае?

— Не, дачушка. Ты сёння ўжо адно з'ела. Піражных шмат есці нельга.

Чаму вы ўпэўнены, што гэта пытае дзяўчынка?

● **Паглядзіце на стол і запомніце, што тут ляжыць,** пасля адвярніцеся і скажыце мне, хто што запомніў. Гаварыць мне будзеце ціхенька. Я запішу, колькі рэчаў вы запомнілі. Хто запомніць больш за другіх, выйграе і атрымае цукерку. (На стале ляжаць рэчы рознага колеру, памеру, формы: ручка, гумка, паштоўка, фарбы, каляровыя алоўкі, цацкі — лялька, самалёт, мячык, карабок, пеўнік і інш.)

А цяпер зноў паглядзім на ўсё тое, што ляжыць, і скажам, які той ці іншы прадмет.

Узор. *Ручка (квадратная ці круглая). — Ручка круглая.*

Карабок (гладзенькі ці шурпаты).
Самалёцік (бліскучы ці цьмяны).
Лялька (прыгожая ці брыдкая).
Паштоўка (танная ці дарагая).
Гумка (мяккая ці цвёрдая).

● **Пагуляем у ланцужок** і пакажам, што мы ведаем шмат слоў. Я скажу адно слова, а вы па чарзе будзеце паўтараць сказанае і дадаваць да яго новае слова. Пяць слоў скажам, а тады зноў пачнём. Хто не саб'ецца і запомніць усе словы, атрымае арэшак.

Узор. *Талерка.* — Талерка, лялька. — Талерка, лялька, птушка. — Талерка, лялька, птушка, кот. — Талерка, лялька, птушка, кот, трактар.

● **Каб умець гаварыць, трэба правільна задаваць пытанні** (пытанні дзеці паўтараюць адзін за адным па чарзе).

Узор 1. *Запытайся ў суседа, ці любіць ён чытаць казкі.— Ці любіш ты чытаць казкі?*

Ці рана ён устае?
Ці дапамагае ён сваёй маме?
Ці ўмее ён катацца на каньках?
Ці ўмее зашпільваць гузікі?
Ці ўмее засцілаць ложак?
Ці ёсць у яго цікавыя цацкі?

Узор 2. *Запытайся ў свайго суседа, колькі яму гадоў. — Колькі табе гадоў?*

Колькі пальцаў на руцэ, на назе?
Колькі дзён у тыдні?
Колькі тыдняў у месяцы?
Колькі месяцаў у годзе?

Узор 3. *Запытайся ў свайго суседа, чаму ён ходзіць у садок. — Чаму ты ходзіш у садок?*

Чаму птушкі лятаюць?
Чаму рыбы плаваюць?
Чаму нельга шумець на вуліцы?
А цяпер я запытаюся ў вас пра тое самае, а вы мне адкажаце.

● **Паказвайце на тое, што вы бачыце перад сабою** (акно, падлога, столь, сцены, крэсла, дыван, вазон). Пытайцеся і адказвайце.

Узор. *Што гэта такое? — Гэта канапа.*

● **Вас цікавіць,** нашто (навошта) патрэбны дзверы, вокны, столь, падлога, цацкі, дах, сабачая будка, парасон і г. д. Пытайцеся.

Узор. *Нашто патрэбны вокны?*

● **Вас цікавіць,** нашто (навошта) патрэбны стол, канапа і г. д., і вы ўмееце адказаць. Хто найлепш адкажа, той атрымае яблык.

Узор. *Нашто патрэбны дзверы? — Дзверы патрэбны, каб выходзіць з хаты і ўваходзіць у хату.*

Нашто (навошта) патрэбны стол?
Нашто патрэбна канапа?
Нашто патрэбны цацкі?
Нашто патрэбны дах?
Нашто патрэбна сабачая будка?

● **Прыгадаем, якія мы ведаем запытальныя словы.** Дапамажыце мне: хто, што, каму, калі, куды, каго, колькі, як, які, якая, чаму, чаго, адкуль, чый, дзе, нашто. А цяпер назавіце адно з гэтых слоў, а я вам задам пытанне з ім.

Узор 1. *Куды. — Куды вядзе гэта сцяжынка?*

Мяняйце апошняе слова ў маім пытанні.

Узор 2. *Калі людзі жнуць? — Калі людзі капаюць бульбу?*

Каго мы шануем? (Любім.)
Як завецца сталіца Украіны? (Расіі.)
Чаму мы любім свой край? (Вёску.)
Чаго ты тут стаіш? (Сядзіш.)
Адкуль ты прыйшоў? (Прыехаў.)

● **Выканаем загады і апішам наш учынак, наша дзеянне.**

Узор. *Калі ласка, падыдзі сюды і вазьмі цукерку са стала. — З прыемнасцю падыду і вазьму цукерку са стала. — Што зрабіў Коля? — Коля падышоў да вас і ўзяў цукерку са стала.*

Падыдзі сюды і вазьмі стужку са стала, Віктар.
Падыдзі сюды і вазьмі аловак са стала, Зіна.
Падыдзі сюды і вазьмі гумку са стала, Люба.
Паскачы на аднойназе, Цімошак.

● **Я запытаюся, падкажу адным словам, а вы скажаце цэлым сказам.**

Узор. *Які звер найвышэй скача? (Кенгуру.) — Кенгуру найвышэй скача.*

Які звер найдалей плавае? (Белы мядзведзь.)
Які звер найразумнейшы? (Дэльфін.)
Які звер найдужэйшы? (Мядзведзь.)
Які звер найхітрэйшы? (Ліс.)

● **Скажы хлопчыку, каб ён так не рабіў.**

Узор. *Хлопчык кідае паперкі на вуліцы. — Не кідай паперкі на вуліцы (нельга кідаць паперкі на вуліцы).*

Хлопчык плюе на падлогу.
Хлопчык крыўдзіць дзяўчынку.
Хлопчык здзекуецца з ката.
Хлопчык адбірае ў дзяўчынкі цацку.
Хлопчык крычыць на сваю маму.
Хлопчык гаворыць брыдкія словы.

**● Я вам скажу, што робяць добрыя дзеці, а вы паабяцайце рабіць тое ж самае.**

Узор. *Добрыя дзеці пераходзяць вуліцу асцярожна. — Я буду пераходзіць вуліцу асцярожна.*

Добрыя дзеці ніколі не ломяць дрэўцаў.
Добрыя дзеці не ходзяць па газонах.
Добрыя дзеці выціраюць носік не рукавом, а хусцінкай.
Добрыя дзеці кажуць «Дзякую».
Добрыя дзеці дапамагаюць слабейшым.
Добрыя дзеці ветліва вітаюцца.
Добрыя дзеці ветліва развітваюцца.

**● Скажам, што мама прасіла зрабіць сваю дачку.**

Узор. *Не пазніся ў школу. — Мама прасіла сваю дачку, каб яна не пазнілася ў школу.*

Будзь паслухмянай у садку.
Не саромейся задаваць пытанні.
Прыбірай цацкі.
Навядзі парадак у пакоі.

**● Паспрабуем з вамі разам апісаць снег.**

Узор 1. *Снег белы, як малако. (Як палатно.) — Снег белы, як палатно. (Як воблака.) — Снег белы, як воблака.*

Узор 2. *Снег мяккі, як пух. (Як вата.) — Снег мяккі, як вата. (Булка.) — Снег мяккі, як булка. (Воўна.) — Снег мяккі, як воўна.*

Узор 3. *Снег халодны, як лёд. (Марожанае.) — Снег халодны, як марожанае.*

Яшчэ раз скажам, які снег. Белы. Мяккі. Халодны. А цяпер паўторым хорам за мною: «Снег белы, як палатно, мяккі, як пух, халодны, як лёд».

**● Скажам, што нам таксама ўсё гэта цікава рабіць.**

Узор. *Мне цікава карміць зімою птушак. — Мне таксама цікава карміць зімою птушак.*

Мне цікава глядзець мульцікі.
Мне цікава гуляць у снежкі.
Мне цікава вучыць вершы.
Мне цікава збіраць грыбы.
Мне цікава вучыць беларускую мову.

● **Адгадайце, ці праўду я кажу. Як трэба сказаць?**

У павука дзве нагі. (Шэсць.)
У пустой шклянцы нічога няма. (Ёсць паветра.)
Кнігі робяць са скуры. (З паперы.)
Паперу робяць са шкла. (З дрэва.)
Жартаваць і весяліцца непрыгожа і шкодна для здароўя.
Сон шкодны для здароўя.
Мы ходзім да доктара, калі зусім здаровыя.
Сыр робяць з мёду.
Кіеў — гэта беларускі горад, сталіца Беларусі.
Мінск — гэта англійскі горад, сталіца Англіі.

● **Дамовімся так: мне прыемна нешта рабіць, а вам гэта вельмі прыемна. Так і скажам.**

Узор. *Мне прыемна атрымаць падарунак. — Мне вельмі прыемна атрымаць падарунак.*

Мне смачна піць малачко.
Мне цікава слухаць калыханку.
Мне весела хадзіць у цырк.
Мне карысна працаваць на свежым паветры.
Мне радасна плюхацца ў ванне.

● **Вы мне адкажаце, што лепш, а што горш?**

Узор. *Што лепш: быць здаровым ці хворым? — Быць здаровым лепш.*

Быць гультаяватым ці працавітым.
Рабіць усё добра ці дрэнна.
Умець самому апранацца ці чакаць, каб апранулі.
Мець цацкі ці не мець нічога.
Мець сябра ці не мець.

● **Спачатку паслухайце, што любяць рабіць іншыя, а потым скажыце, што вы любіце рабіць.**

Узор. *Толя любіць бегаць. — А я люблю гуляць з лялькай.*

Ніна любіць маляваць.
Жэня любіць гуляць з мячыкам.
Люба любіць шыць лялькам сукенкі.
Алёша любіць слухаць музыку.
Валерык любіць дапамагаць тату ў полі.

● **Прыгадаем словы з процілеглым значэннем.**

Высокі — нізкі, працавіты — гультаяваты, руплівы — нядбайны, вясёлы — сумны, чысты — брудны, добры — кепскі (дрэнны), прыгожы — брыдкі, роўны — крывы, просты — крывы, халодны — гарачы (цёплы), востры — тупы, хуткі — павольны.

А цяпер з маёй падказкай заканчвайце сказ, які я пачну гаварыць.

Узор. *Надзейка не вельмі высокая, яна — ніз... — Яна нізкая.*

Святланіны валасы не чорныя, яны свет... .

Німіны вочы не светла-блакітныя, яны цёмн...-блакітныя.

Зінуліна сукенка не брудная, яна чыс... .

Сценка не простая, яна кры... .

Ножык не тупы, ён вос... .

Дзіцячы тварык не брыдкі, ён пры... .

Вежа не нізкая, яна вы... .

● **Запытаем і адкажам, чыя гэта вопратка.**

Узор. *Татаў гарнітур новы. (Дзядулеў.) — Дзядулеў гарнітур таксама новы.*

Маміна спадніца вузкая. (Бабуліна.)

Змітруковы штаны чыстыя. (Алёшавы.)

Сяргейкава паліто кароценькае. (Вольчына.)

● **Адкажыце, калі ласка, на мае пытанні.**

Узор. *Што вы робіце, як выхавацелька скажа вам «устаньце»? — Мы ўстаём.*

Што вы робіце, як выхавацелька скажа «слухайце ўважліва»?

Што вы робіце, як выхавацелька скажа «адгадайце загадку»?

Што вы робіце, як выхавацелька скажа «сядайце ціхенька»?

● **Паслухайце і адкажыце, калі ласка, які Дзіма.**

Узор. *Настаўнік кажа: «Дзіма, раскажы вершык». — І Дзіма расказвае вершык. Дзіма паслухмяны хлопчык.*

Настаўнік кажа: «Дзіма, намалюй, калі ласка, зіму».

Настаўнік кажа: «Дзіма, гавары, калі ласка, гучней».

А вы заўсёды робіце тое, што вам кажа выхавацелька? Вы паслухмяныя дзеці, так? На каго вы падобныя? Хто яшчэ паслухмяны?

● **Паглядзіце і адкажыце поўным сказам.**

Узор. *Кніжкі, якія я трымаю, старыя ці новыя? — Кніжкі, якія вы трымаеце, новыя.*

Мячыкі, якія вы бачыце, круглыя ці квадратныя?

Алоўкі, якія я трымаю, чырвоныя ці зялёныя?

● **Адкажыце на пытанні пасля таго, як мы крыху пагутарым.**

1. У мяне дома ёсць стол, крэслы, ложак, шафа і канапа. А што ёсць у цябе дома?
2. Сын маіх суседзяў ходзіць у садок са сваім татам. Тата бярэ яго за ручку і вядзе да самага садка. А ты з кім ходзіш у садок?
3. У мяне ёсць пляменнічак. Яму пяць гадоў. Ён любіць працаваць са сваім старэйшым брацікам у агародзе. А ці працуеш ты ў агародзе? А з кім ты працуеш?
4. Мой унучак падараваў мне прыгожы малюнак, які сам намаляваў. А ты што падаруеш сваёй бабулі 8 Сакавіка?

● **Запытай у суседа.** Я буду падказваць. Хто не зможа запытацца ці адказаць, той дае фант, а потым мы яму загадаем, як выкупіць фант.

Узор. *Чытаць. — Ці ўмееш ты чытаць? — Не, не ўмею чытаць. Ён не ўмее чытаць.*

Пісаць, бегаць, спяваць, маляваць, плаваць, гаварыць па-англійску, гаварыць па-польску, танцаваць «Лявоніху», спяваць калыханку.

● **Пагуляем.** Для гэтай гульні нам трэба высветліць, якая бывае школа. Давайце хорам паўторым такія словы: вялікая, светлая, новая, высокая, шматпавярховая.

Цяпер я кажу «школа» і паказваю вам малюнак. Хто скажа найбольш слоў, каб апісаць яе, той выйграе цукерку.

Узор. *Школа. — Школа высокая. Школа светлая. Школа новая. Школа шматпавярховая. Школа музычная. Школа мастацкая. Школа беларуская. Школа патрэбная.*

Кветка. (Духмяная, цудоўная, палявая, вясновая, яскравая, свежая, завялая, восеньская, ружовая, пышная, прыгожая.)

Аловак. (Мяккі, цвёрды, каляровы, чорны, завостраны, незавостраны, кароткі, доўгі, прыгожы, гладкі, роўны, блакітны, круглы, хімічны.)

Сабака. (Куслівы, рахманы, ласкавы, злосны, ліслівы, галодны, сыты, маленькі, вялікі, рыжы, пушысты, паляўнічы, хатні, дваровы.)

Кніга. (Каштоўная, з малюнкамі, любімая, дарагая, беларуская, старажытная, старая, новая, з цвёрдымі вокладкамі, тоўстая.)

● **Адкажам на пытанне «дзе?».**

1. У нас ёсць прыгожая карціна. Намаляваў яе мастак. Дзе мы яе павесім? На сцяне? Над сталом? Над канапай? Над ложкам? У куточку? Пасярэдзіне сцяны? Унізе? Зверху?

2. У нас ёсць новы вазон. Ён зялёны, пушысты, з чырвонымі кветкамі. Называецца «аганёк». Аганёк расце ў прасторнай, белага колеру, глінянай вазонніцы. Дзе мы яго паставім? На падаконніку? На стале? На маленькім століку? На паліцы?

3. Мы купілі крэсла. Мяккае, утульнае, светлае. Цудоўнае! Дзе мы яго размесцім? На падлозе? Пасярэдзіне пакоя? У кутку? Каля сцяны? Каля стала? Каля канапы?

4. Наш Іванка зрабіў сваімі рукамі дзве табурэткі. Цяпер лета. Мы любім адпачываць на дачы. Дзе мы паставім табурэткі? У агародчыку? У панадворку? Каля хаты? Каля дрэваў? У садочку? У цянёчку? Каля ганка? Каля парога?

А цяпер прыгадаем, дзе мы павесілі карціну? Дзе мы паставілі вазон? Дзе мы размясцілі крэсла? Дзе мы паставілі дзве табурэткі? Хто памятае?

● **Давайце пагаворым пра тое, дзе што робяць. Я буду падказваць.**

Узор. *Іванка сядзіць на канапе. А Міхась? (На падлозе.) — А Міхась сядзіць на падлозе.*

Ігнась сядзіць на лаўцы. А Юрась? (На табурэтцы.)
Андрэйка гуляе ў парку. А Ганка? (На панадворку.)
Зоська збірае краскі на лузе. А Кацярынка? (Каля рэчкі.)

● **Спачатку я ў вас запытаюся пра вашага сябра, а пасля нехта з вас раскажа пра яго сам без падказкі.**

Хто твой сябра?
Як яго завуць? Як яго імя і прозвішча?
Дзе ён жыве?
Ці ёсць у яго сястрычка, брацік?
Ці дапамагае ён маме, тату?
Ці наведвае ён бабулю, дзядулю?
Ці палівае вазоны? (Кветкі ў агародзе летам.)
Ці трымае свае рэчы ў парадку?
Ці ёсць у яго сабачка? А каток ці іншы пестунок?
Ці любіш ты з ім гуляць?
Ці часта ты яго бачыш? Ці часта з ім бываеш разам?
А цяпер раскажы пра свайго сябра, Антось.

● **Я вам скажу, што рабіў і якім быў учора коцік Жэўжык, а вы скажаце, што сабачка Шарык рабіў тое самае.**

Узор. *Учора коцік Жэўжык быў вясёлы. — І сабака Шарык быў вясёлы.*

Учора коцік Жэўжык ганяўся за кураняткамі.
Учора коцік Жэўжык перапалохаў качанятак.
Учора коцік Жэўжык з'еў бабуліну катлетку.

● **Слухайце і адкажыце.**

Узор. *Ніна наведала сваю бабулю летам. — Каго Ніна наведала? — Сваю бабулю.*

Алінка падарыла букет палявых кветак сваёй настаўніцы. Што падарыла Алінка сваёй настаўніцы?
Увечары Антось вярнуўся з лесу дахаты. Калі Антось вярнуўся дахаты? Прыйшла каза на двор. Хто прыйшоў на двор?
Надзеў дзед бабін кафтан і хустку. Што надзеў дзед?

● **Скажыце, ці праўду я кажу. Папраўце мяне альбо згадзіцеся са мною.**

Узор. *Матылёк прыгожая птушачка. — Не, вы кажаце няпраўду. Гэта не так. Матылёк — прыгожае насякомае.*

Нам трэба паветра, каб зварыць ежу. (Вада.)
Надвор'е заўсёды аднолькавае. (Зменлівае.)
Аўтамабільныя шыны робяць з каменю. (З гумы.)
Мы жывём на небе.
Сонца ўзыходзіць на захадзе.
Сонца нам дае цемнату і холад.
Насякомае мае дзве нагі. (Шэсць.)
Мы атрымліваем мяса з раслін.
Шыпшына не мае калючак.
Лісты на дрэвах блакітнага і ліловага колеру.
Мы бачым паветра вакол нас.
Вярблюды жывуць у нашых беларускіх лясах.
Дзверы і вокны робяць са скуры.
Вельмі прыгожа смаркацца і пляваць на падлогу ў хаце.
Скажыце: так ці не.
Сабакі ўмеюць гаварыць па-чалавечаму.
Ружы і шыпшына маюць калючкі.
У дажджлівы дзень паветра вільготнае.
Большасць дрэў мае лісце.
Пчолы жывуць у норках.
Птушкі, малпы і хамелеоны жывуць на дрэвах.
Жаба можа з'есці зайца.

● **Дапамажыце мне сказаць, якога колеру вопратка ў Піліпкі.**

Узор. *У хлопчыка Піліпкі ўсё блакітнае. (Кашуля.) — Піліпкава кашуля блакітная.*

Паліто, штаны, гарнітур, шалік, камізэлька, шкарпэткі, гальштук.
Ці прыгожа, калі ўся вопратка аднаго колеру?

● **Давайце навучымся, як хутка папрасіць дазволу што-небудзь зрабіць.**

Узор. *Ты спазніўся і не ведаеш, ці можна табе зайсці ў пакой. — Ці можна мне зайсці ў пакой?*

Ты не ведаеш, ці можна табе ўзяць са стала аловак.
Ты не ведаеш, ці можна табе выйсці з залы.
Ты не ведаеш, ці можна табе ўключыць тэлевізар.
Ты не ведаеш, ці можна табе наведаць хворага сябра.

● **Нам цікава ведаць, што будзе рабіць хто-небудзь з дзяцей там, куды сабраўся пайсці або паехаць. Будзем задаваць пытанні.**

Узор. *Адась паедзе ў вёску. — А што ён будзе рабіць у вёсцы?*

Юрась пойдзе ў школу.
Змітрок паедзе ў Маскву.
Аленка збіраецца пайсці ў лес.
Казік збіраецца схадзіць у мястэчка.

● **Скажыце, што вы будзеце дапамагаць тым, хто дапамагае вам.**

Узор. *Мама дапамагае нам. — А мы будзем дапамагаць ёй.*

Тата дапамагае нам.
Дзядуля дапамагае нам.
Бабуля дапамагае нам.
Нашы сёстры дапамагаюць нам.
Я дапамагаю вам.

● **Я вам прачытаю, якія бываюць хлопчыкі і дзяўчынкі, а вы мне скажаце, якія падабаюцца вам.** Слухайце: добрыя, сардэчныя, ветлівыя, чысценькія, прыгожанькія, вясёлыя, плаксівыя, мурзатыя, паслухмяныя, задзірыстыя, цікаўныя, смелыя, палахлівыя, скупыя, шчодрыя, памяркоўныя, жаласлівыя, жорсткія, злосныя, сярдзітыя.

Узор. *Якія табе падабаюцца дзяўчаты? Чысценькія ці мурзаценькія? — Мне падабаюцца чысценькія дзяўчынкі.*

Якія табе падабаюцца хлопчыкі? Задзірыстыя ці памяркоўныя?
Якія табе падабаюцца дзяўчынкі? Жаласлівыя ці злосныя?
Якія табе падабаюцца хлопчыкі? Смелыя ці палахлівыя?

● **Давайце скажам, што — вялікае, а што — маленькае, хто — вялікі, а хто — маленькі.**
Горад — вялікі, а мястэчка — маленькае.
Дом — вялікі, а хатка — маленькая.
Сабака — вялікі, а шчаня (шчанё) — маленькае.
Кніга — вялікая, а кніжачка — маленькая.

Юра — вялікі, а Юрась — маленькі.
Міхал — вялікі, а Міхаська — маленькі.
Алена — вялікая, а Аленка — маленькая.

● **Каму мы можам напісаць ліст, паштоўку, віншаванне, тэлеграму?** (Бабулі (бабульцы), тату (татку, бацьку), матулі (маме, маці), брату (брацiку), сябру (сяброўцы), настаўніку (настаўніцы), суседу.)

А што трэба мець, каб напісаць ліст? (Паперу (аркуш паперы), ручку (аловак), канверт, адрас.)

А што трэба зрабіць з пісьмом, каб яно дайшло да адрасата? (Кінуць у паштовую скрынку.)

● **Паслухайце, а тады скажыце, што мама сказала сваёй дачушцы.**

Узор. *Дачушка, перад тым як ісці ў госці, надзень новую сукенку. — Мама сказала дачушцы, каб яна надзела новую сукенку. Яна ідзе ў госці.*

Дачушка, перад тым як ісці ў госці, вымый чыста рукі.

Дачушка, перад тым як ісці ў госці, акуратна прычашыся.

● **Паслухайце і адкажыце мне, што тата сказаў свайму сынку.**

Узор. *Перад тым як сесці за стол, памый рукі. — Тата сказаў свайму сынку, каб ён памыў рукі, перад тым як сесці за стол.*

Перад тым як пойдзеш спаць, пачысці зубы.
Перад тым як пойдзеш спаць, схадзі ў прыбіральню.
Перад тым як ісці спаць, скажы «дабранач».

● **Спачатку я вас запытаюся, а потым мы хорам скажам, што нам трэба рабіць.**
Ці павінны мы слухацца старэйшых?
Ці павінны мы дапамагаць слабейшым?
Ці павінны мы вучыцца рабіць усё самі?

● **Хачу праверыць, ці ўважліва вы мяне слухаеце.**
Калі вы правільна адкажаце на маё пытанне, дык я ўбачу, што вы ўмееце слухаць. Пытанне: «Хто любіць гуляць з сабакам, а хто з коцікам?» А цяпер слухайце.

Алесь часта бегае са сваім Мурзікам навыперадкі. Мурзік заўсёды пераганяе свайго сябра. Анютка носіць свайго Вусачыка на руках, гладзіць яго, размаўляе з ім, спявае яму песні.

● **Кожны абʼявіць, што ён герой якой-небудзь казкі і скажа што-небудзь пра сябе.** А ўсе астатнія будуць задаваць пытанні гэтаму герою ці гераіні.

Узор. *Я Чырвоная Шапачка. Я наведала сваю бабульку, якая жыве ў лесе. — А цябе воўк не з'еў? — А дзе твая чырвоная шапачка?*

● **Што пішуць на паштоўцы?** Каму і калі пасылаюць паштоўкі? (Пішуць віншаванні блізкім людзям, якіх любяць, шануюць, паважаюць. Паштоўкі пішуць на дзень нараджэння, на святы.)

Давайце напішам некалькі віншаванняў разам. А спярша я вам пачытаю маё ўласнае: «Дарагая мая бабуля! Віншую цябе з днём нараджэння! Зычу (жадаю) табе моцнага здароўя і шмат гадоў жыцця. Будзь здаровенькая і такая ж добрая, як заўсёды. Так, як і раней, расказвай мне казкі і вершыкі, чытай цікавыя кнігі і, як раней, пячы мне смачныя булкі і пернікі. Твая ўнучка».

А цяпер скажыце, каму вы хочаце напісаць віншаванне. Вы будзеце дыктаваць, а я запісваць на паштоўкі. Пасля вы іх падорыце сваім блізкім.

## ДЫЯЛОГІ

Дыялогі дапамогуць вывучаць фразы, звароты, словы, уласныя беларускія імёны, актыўна асвойваць гутарковую мову. Яны паслужаць адпраўным пунктам для вядзення з дзецьмі размовы.

Прыведзеныя дыялогі па форме кароткія, лёгка ўспрымаюцца на слых. Іх можна паўтараць, чытаць хорам і ў асобах. А можна проста праслухаць і пагутарыць на тэму дыялога альбо адказаць на пытанні па яго зместу. Калі дзеці няблага валодаюць беларускай мовай, можна зрабіць з дыялога маленькае апавяданне. Некаторыя дыялогі можна інсцэніраваць. Дзецям будзе радасць, што яны артысты, а педагогу — радасць бачыць вынік сваёй працы.

---

— Мама, панюхай, як пахнуць півоні.

— Півоні, Габрусёк, наогул пахнуць прыемна, а сёння асабліва. Мабыць, дождж будзе. Народная прыкмета кажа, што кветкі моцна пахнуць перад дажджом.

— Адкуль ты ўсё ведаеш, мама?

А як вы думаеце, адкуль мама ўсё ведае? Ці бачылі вы кветкі півоні? Якога яны колеру? Дзе яны растуць?

---

— Прывітанне, Юрась!

— Дзень добры, дзядзька Антось!

— Як гадуешся?

— Дзякуй. Добра. Іду марожанае купляць.

— Ты б лепш лусту хлеба з'еў з талеркай капусты.

— А я і хлеб з капустай з'ем, і марожанае.

— Малайчына!

Як завуць хлопчыка? А як дзядзьку? Куды ідзе хлопчык? Чаму ён задаволены? А ты, Стасік, ці любіш марожанае?

---

— Прабачце. Я не хацела вас папіхнуць.

— Нічога. Нічога, дзяўчынка. Ты не вінаватая. У трамваі цесна.

— Вы выходзіце на наступным прыпынку?

— Не. Праходзь, калі ласка. Я адступлю крыху ўбок.

Хто папрасіў прабачэння ў трамваі: хлопчык ці дзяўчынка? Чаму яна папіхнула пасажыра ў трамваі? Ці добра зрабіў пасажыр, адступіўшы крыху ўбок? Ці добра робяць тыя пасажыры, якія стаяць як укапаныя і не паварушацца, калі людзі праходзяць у трамваі?

---

Спачатку я вам задам пытанне, потым прачытаю два дыялогі. Тады вы мне адкажаце на пытанне: «Хто з дзяўчынак дапаможа цёці, а хто не?»

1.

— Волечка, дапамажы мне пакарміць свінку.

— Прабачце, я не магу. У мяне баліць рука.

— Шкада.

2.

— Ніначка, дапамажы мне пасадзіць кветкі.

— З прыемнасцю. Я люблю займацца кветкамі. Мне падабаецца і садзіць іх, і палоць, і ў букеты рваць.

— Ну і добра.

---

— Янка, хопіць чытаць. Адкладзі кніжку і сходзі пагуляй у тэніс.

— Можна, я крышку яшчэ пачытаю? Вельмі цікавая кніжка.

— Нельга чытаць цэлы час.

А чаму, як вы думаеце? Ці трэба даваць адпачынак вачам?

---

Паслухайце і адкажыце: «Які хлопчык: добры, сардэчны ці абыякавы?»

Хлопчык: Чаго ты плачаш, дзяўчынка?

Дзяўчынка: Я запэцкала рукі.

Хлопчык: Гэта дробязь. Не плач! Я дапамагу табе памыць рукі. Добра?

---

Чаму дзяўчынка хоча, каб хутчэй было заўтра?

— Мама, пашый мне кухонны фартух.

— Добра, дачушка. А дапамагаць мне на кухні будзеш?

— Буду. Абавязкова буду. Будзем разам пячы бліны і смажыць бульбу.

— Заўтра і пачнём разам шыць табе фартух.

— Хутчэй бы «заўтра» было!

---

— Што, хлопчык, шукаеш нечага? Можа, я змагу табе дапамагчы?

— Я шукаю дом № 5.

— А вось ён там, блізенька, на рагу гэтай вуліцы.

— Вельмі дзякую.

— Няма за што.

Ці ветлівы хлопчык?

---

— Што ты такі сумны, Аркадзік?

— У мяне захварэла мама.

— Я табе спачуваю.

— Дзякую вам.

— А ты не сумуй. Мама паправіцца. Ты ж даглядай, дапамагай адолець хваробу.

— Буду старацца.

А як можна дапамагчы хвораму чалавеку?

---

Сёння Антось разбіў суседу акно.

— Гэта жахліва! І што цяпер будзе?

— Ён сказаў, што ніколі гэтага не зробіць, што будзе больш асцярожны і ўважлівы.

— Гэта добра, што ён так сказаў.

Што лягчэй: сказаць ці зрабіць?

---

— Мама, дай мне, калі ласка, малака. Я люблю піць каву з малаком.

— Малако на стале ў слоіку. Можаш узяць і пернікі. Яны на паліцы ў шафіку.

— Я не прывык браць сам.

— Ты вялікі. Трэба ўмець усё рабіць самому.

А ты любіш рабіць усё сам? Што ты ўмееш рабіць самастойна?

---

— Непрыемна сёння на вуліцы.

— Чаго ж ты хочаш? Як увосень.

— Летась і ўвосень было цёпла і суха.

— А я дык люблю, калі дождж ідзе. Некалі мы гаварылі: «Дожджык, дожджык, секані, я паеду на кані...»

— Не, не трэба больш дажджу.

— Затое пасля дажджу сонейка асабліва прыемнае. Адгадай загадку: «Свеціць і грэе, весяліць і ззяе, усю зямлю ажыўляе».

— Сонца!

А навошта патрэбны дождж?

---

— Паўлінка, табе падарунак!

— О! Я вельмі люблю падарункі.

— Развязаць пакуначак?

— Калі ласка! Вельмі ж цікава.

— Так, заўсёды трэба паглядзець падарунак, парадавацца яму. Таму, хто купіў яго, будзе прыемна, што падарунак падабаецца.

— Лялька! Гэта будзе мая самая прыгожая лялька. Найпрыгажэйшая! Я назаву яе Лёдзяй. Добра?

— Ой! Забыўся павіншаваць цябе з днём нараджэння! Жадаю табе ўсяго самага лепшага!

Як ты думаеш, у Паўлінкі адна лялька ці некалькі?

---

— Навошта ты лыжку ліжаш, Сцяпанка?

— Хачу яшчэ кашы.

— Лыжка кашы не дасць. Папрасі дабаўкі. А лыжку лізаць непрыгожа.

— Дайце, калі ласка, яшчэ кашы.

---

— Бабуля, Бронік дражніцца. Кажа, што я таўстунпаўзун.

— А ты яму скажы: «Не абражай словамі. Рана загоіцца, а злое слова — ніколі».

---

— Дзядуля, зірні, які гурочак!
— Табе захацелася яго сарваць?
— Угу. Я яго з'ем.
— Не млеў, не пацеў, а рот разявіў.
— Што-што?
— Першы гурочак будзе матулі тваёй. Яна садзіла, палола, палівала.

---

— Чаго ты плачаш, Петрусёк?
— Я палец парэзаў, кроў ідзе.
— Не плач. Пакуль жаніцца — загаіцца.

---

— Мама, я запрасіў у госці новага сябра.
— А як яго завуць?
— Вітась.
— Вітась? Яго можна зваць Вітка, Вітусь, Вітук, Віт, Вітам, Вітаўт.
— Як цікава! Як у мяне будзе сын, я назаву яго Вітаўт.
— А калі прыйдзе твой Вітась?
— У нядзельку.
— Добра. Толькі памятай: новых сяброў набывай, але і старых не забывай.

---

— Бабуля, сёння нам чыталі верш доўгі і цікавы, толькі я яго не зразумела.
— Як не разумееш, мая галубачка, трэба пытацца. Не саромейся пытацца. Болей спытаеш, болей пазнаеш.
— Як дзядуля кажа, вучыцца — заўсёды згадзіцца.

---

— Мама, якая ў цябе прыгожая сукенка!
— Сынок, калі табе падабаецца нейкая вопратка, абнова на кім-небудзь, ты скажы: як табе або вам пасуе гэта адзенне.
— А чаму?
— Бо тады ты хваліш тых, хто носіць гэта адзенне, і яму прыемна.
— Мама, гэта сукенка так табе пасуе! Так да твару.
— Дзякую, сынку.

---

— Што ты чытаеш, Алінка?
— Беларускія народныя казкі.
— Калі ты навучылася чытаць?
— Летась.
— А калі ты навучыш мяне чытаць?
— Як ты крыху падрасцеш.

---

Мама: Ужо дзевяць гадзін вечара, а ты яшчэ не вячэраў. Тата прыйдзе, што ён табе скажа?
Сын: Вячэру! Хутчэй вячэраць!
Мама: Слава богу, хоць тату ты слухаеш.

---

— Прывітанне! Ой! Я спазнілася на пяць хвілін. Прашу прабачэння.
— Нічога. Нічога. Бывае. Але лепш не пазніцца. Хто позна ходзіць, той сам сабе шкодзіць.
— Пара ісці на вакзал. Купім білеты і паедзем у лес. На вакзале нас ужо чакае цётка Зіна і дзядзька Эдзік.

---

— Чый гэта шалік?
— Колін.
— Чаму ён на падлозе?
— Бо Коля — раскідаха!
— Скажы, няхай ён падніме і больш не раскідвае сваіх рэчаў.
— Добра.

---

— Што робіць Ігнась?
— Майструе.
— Што ён майструе?
— Не ведаю. Мабыць, табурэтку. Ён майстра на ўсе рукі. За што ні возьмецца, тое і зробіць.

---

Паслухаем і раскажам, пра што гаворыцца ў дыялогах, хто субяседнікі, хто пытаецца, хто адказвае.

### ЯК ДАЕХАЦЬ ДА ПАШТАМТА?

— Скажыце, калі ласка, як даехаць да галоўнага паштамта?
— Сядайце на аўтобус вось на гэтым прыпынку. Ён тут адзін.
— І далёка ехаць?
— Два прыпынкі.
— Дзякую вам.

---

## ВОСЬ І ПАЗНАЁМІЛІСЯ!

— Мяне завуць Караліна, прозвішча маё Спорык. А цябе?

— Мяне завуць Паўлінка. А прозвішча маё Шостак.

— Вельмі прыемна. Вось мы і пазнаёміліся, Паўлінка. Якое прыгожае імя! Як крыху падрасцеш, пойдзеш у тэатр Янкі Купалы і паглядзіш п'есу, якая так і называецца: «Паўлінка».

— Цікава. Гэта маленькая дзяўчынка?

— Не. Гэта дарослая дзяўчына. Вельмі вясёлая, дасціпная, разумная і прыгожая.

— Я б таксама хацела быць дасціпнай, разумнай і прыгожай.

— А вясёлай?

— Мама кажа, што я заўсёды вясёлая, як сонейка.

---

## СУСТРЭЧА.

— Добры дзень, цётка Наталля!

— Добры дзень, Верачка!

— Вы нешта да нас не прыходзіце.

— Абавязкова прыйду. Мяне не было ў Мінску. Я ездзіла да сына ў Гародню. Ёсць такі горад у нас на Беларусі. Цяпер яго называюць Гродна, але даўней ён называўся Гародня.

— Як цікава! Гародня.

— Верачка, я чую ты ўжо добранька гаворыш па-беларуску.

— Нас вучаць у садку. Галіна Сяргееўна кажа, што ўсе, хто жывуць на Беларусі, павінны ведаць беларускую мову.

— Гэта так. Ты ж беларуска?

— Ага, я беларуска. Тата мой кажа: «Цяпер ты сапраўдная беларуска. І вершаў беларускіх шмат ведаеш, і прыказак, і загадак».

— Малайчына, Верачка!

— Калі ласка, адгадайце загадку:

Я на сонейка падобны,
А для ўсіх
Ласунак добры.
Не тады, калі свячуся,
А як згасну і сагнуся. *(Сланечнік.)*

---

## СОНЕЙКА.

— Што? Дапамагчы табе?

— Калі ласка, пазваніце, я не дастаю да званка.

— Гэта твае суседзі па кватэры?

— Не. Тут жыве старэнькая адзінокая бабуля Марта. Я ёй прынёс свежую булачку.

— Малайчына ты!

— Я ёй буду чытаць казку, а яна будзе есці булачку. Яна вельмі рада, як я да яе прыходжу. Кажа, мая радасць прыйшла! Маё сонейка!

---

## БУДЗЕМ ДОБРЫМІ.

— Таццяна Дзянісаўна, што такое «дом дзіцяці»?

— Гэта такі дом, дзе жывуць асірацелыя дзеці — дзеці, у якіх няма таты і мамы. Або тыя, у якіх тата і мама — п'яніцы, гультаі, благія людзі, якія не хочуць даглядаць сваіх дзяцей.

— А хто даглядае такіх хлопчыкаў і дзяўчынак?

— Добрыя людзі. А вы, як будзеце крыху старэйшыя, калі захочаце, дапаможаце такім дзецям. Пойдзеце да іх у госці, зробіце для іх падарункі, пагуляеце з імі.

— Я ім занясу ўсе свае цацкі, з якімі я гуляў і якія вельмі люблю.

— Малайчына, Алесь!

---

## ТЭЛЕФОННАЯ РАЗМОВА.

— Прывітанне, Марылька!

— Добры дзень, Міхась!

— Хутка мы развітаемся: пойдзем у школу.

— Табе сумна?

— І сумна і цікава.

— А цяпер, можа, пойдзем пагуляем у вашым двары?

— Згода!

---

Спачатку паслухаем размову, падвучым фразы, а пасля разыграем спектакль.

## У ДОКТАРА.

— Добры дзень.

— Добры дзень, дзяўчынка.

— У мяне моцна баліць зуб. Але ж я не ведаю які. Вось у гэтым баку.

— Зараз праверу твае зубкі. Сядай у крэсла і разяў раток. Вось ён, той зуб! Нічым я не дапамагу яму. Давядзецца яго вырваць.

— Ой! Я баюся.

— Не бойся. Нічога страшнага тут няма. Як трэба, дык трэба.

— Рвіце, калі ласка. Буду цярпець.

— Не хвалюйся. Ціхенька сядзі. Глядзі, вось твой зуб!

— Вельмі дзякую вам.

А цяпер пагутарым. Дзяўчынка падзякавала доктару, які дапамог ёй, зрабіў дабро. А ты, Васілёк, заўсёды дзякуеш, калі табе нехта робіць ласку? Ці спадабалася вам дзяўчынка? Чаму? Ці смелая яна? Ці цярплівая? Ці ветлівая? Хто з вас хоча быць доктарам?

---

ПРАЧНІСЯ, ТАЦЯНКА!

— Прачніся, Тацянка! Пара ўставаць.

— Ой! Як хочацца спаць! Яшчэ крышачку пасплю, мамачка!

— Не, не. Уставай! Уставай, соня! А то спознішся ў садок. Ужо сёмая гадзіна. Хто рана ўстае, таму бог дае.

— А што ён мне дасць?

Каго называюць «соня»?

---

ХТО ПЫТАЕ, ТОЙ НЕ БЛУДЗІЦЬ.

— Чаго ты, дзяўчынка, плачаш?

— Я заблудзілася і не магу зайсці дамоў.

— А дзе ты жывеш?

— На вуліцы Мележа.

— Гэта ж побач. За рогам. Толькі асцярожненька ідзі. Вунь відаць рог вуліцы.

— Там, дзе машына стаіць?

— Пачакай. Я лепш цябе давяду.

— Вялікі вам дзякуй.

— Запомні дзве прыказкі: «Язык да Кіева давядзе», «Хто пытае, той не блудзіць».

Чаму цёця сказала дзяўчынцы «толькі асцярожненька ідзі»?

## ЯКІЯ БУДУЦЬ АДГАДКІ НА ГЭТЫЯ ЗАГАДКІ?

Загадкі вызначаюцца мудрасцю, трапнасцю выразаў, афарыстычнасцю. Яны лёгка запамінаюцца, развіваюць

фантазію, кемлівасць, дасціпнасць у дзяцей. Нярэдка загадкі маюць высокамастацкую паэтычную форму і таму дапамагаюць уводзіць дзяцей у свет паэзіі, мастацтва. Апрача таго, у народных загадках, як і ў іншых фальклорных формах творчасці, адлюстраваны жыццёвы вопыт беларускага народа. Загадка знаёміць з мінулым і сучасным людзей, дапамагае дзецям пазнаваць свет.

Загадка — гэта тое ж пытанне, якім мы звычайна карыстаемся на занятках, толькі больш складанае, метафарычнае. Яно прымушае дзіця думаць, распазнаваць прадметы па сходнасці ці рознасці, абагульняць з'явы, асацыіраваць.

Загадкі неабходна чытаць таямнічым «загадкавым» тонам, абавязкова выразна, а часам і некалькі разоў, каб усе дзеці добра зразумелі змест і здолелі адгадаць. Гэта прынясе ім радасць, задаволенасць сабою, створыць добры настрой.

Пажадана, перад тым як загадаць загадку, вытлумачыць незразумелыя словы, некаторыя вобразы, з'явы, карацей кажучы, далікатна падказаць адгадку.

Загадкі адымаюць мала часу. Іх можна загадваць на кожных занятках, выкарыстоўваць у гульнях. Пасля таго як дзеці адгадаюць загадку, яе можна паўтарыць хорам і вывучыць на памяць. Затым прапанаваць дзецям загадаць гэту загадку дома. Можна адвесці некалькі хвілін на занятках для таго, каб дзеці самі загадвалі загадкі, або адзін дзень у тыдні зрабіць днём загадак і адгадак.

Праілюструем на прыкладзе методыку работы з загадкай.

● Спачатку я вытлумачу вам некаторыя словы, задам пытанні, а тады загадаю загадку.

*Колкі.* Гэта галінка колкая, коле мне рукі.

*Анікольki.* Я анікольki (зусім, ні крышачкі) не баюся сабак.

*Спялю.* Я купіла памідоры. Яны не зусім спелыя. Я пакладу іх на сонца і паспялю. Яны паспеюць.

*Дол.* Яблыкі падаюць з яблыні на дол, на зямлю.

Ці ведаеце вы, з чаго пякуць хлеб? А з чаго робяць муку? А з чаго вымалочваюць зярняткі? А цяпер слухайце загадку:

Хоць вусаты, хоць я колкі,
Ды не злосны анікольki.

Лета ўсё адным заняты —
Кожны дзень спялю зярняты.
Не асыплюся на дол —
Хлебам я прыйду на стол. *(Колас.)*

Яшчэ раз праслухаем загадку і адгадаем яе.

● Адгадайце загадку: «Блакітная дзяружка ўвесь свет пакрыла».

Дзяружка — гэта тканая посцілка, якой пакрываюць ложак, канапу. Скажам хорам слова «дзяружка», а тады я паўтару загадку і вы яе адгадаеце.

А якая адгадка будзе на гэту загадку: «Глянь праз акно, відаць сіняе палатно»? Так, гэта таксама неба. А цяпер паслухайце абедзве загадкі і выберыце прыгажэйшую. Мы вывучым яе, а дома вы загадаеце яе маме ці тату. Цікава, ці адгадаюць яны? Заўтра мне скажаце.

● Зірніце на акно. Навошта яно нам? Каб было светла ў пакоі. Праз акно нам сонейка свеціць. А навошта нам дзверы? Праз іх мы ўваходзім у хату, у пакой, у калідор, на кухню і выходзім. А цяпер слухайце загадку: «Цэлы дзень толькі заняты, што прыводзяць то з хаты, то ў хату. *(Дзверы.)*

● Сёння нам загадваюць загадкі Алесь і Аленка. (Папярэдне неабходна развучыць некалькі загадак з хлопчыкам і дзяўчынкай.)

— Па цвічку тук-ток
Б'е жалезны... *(малаток)*.

— Не клубок і не гарлачык,
Хоць і кругленькі наш... *(мячык)*.

Прапануем разнастайныя загадкі, якія мы класіфікавалі наступным чынам: «Тэматычныя загадкі» (пра чалавека, прыроду, жывёл, гаспадарку, сямейны быт), «Загадкі-пытанні», «Загадкі-рыфмаванкі», «Загадкі загадваюць дзеці» (гэтыя загадкі выхавальнік дапамагае вывучаць асобным выхаванцам, каб яны загадалі іх на занятках).

Загадкі падбіраліся са зборніка «Загадкі» (Мн.: Навука і тэхніка, 1972), з кнігі Янкі Саламевіча «Беларускія загадкі», з кнігі У. Мацвеенкі «Зайкі-загадайкі» і з часопіса «Вясёлка».

## ТЭМАТЫЧНЫЯ ЗАГАДКІ

Зранку ходзіць на чатырох нагах, удзень — на дзвюх, а ўвечары — на трох. *(Чалавек у розным узросце.)*

У адным клубочку ды сем дзірачак. *(Галава.)*

Поўны хлявец белых авец, а між тых авец баранец. *(Зубы і язык.)*

Адзін гаворыць, двое глядзяць, двое слухаюць. *(Язык, вочы, вушы.)*

Між двух свяціл я пасярэдзіне адзін. *(Нос.)*

Пяць братоў у адну ноч радзіліся, а ростам не роўныя. *(Пальцы.)*

Ні рук, ні ног не мае, а яблыкі страсае. *(Вецер.)*

З неба крупы падаюць. *(Град.)*

Вечарам нараджаецца, ноч жыве, а раніцай памірае. *(Раса.)*

Хоць зубоў не мае, а балюча кусае. *(Мароз.)*

З неба ўпаў — усю зямлю, як абрусам, заслаў. *(Снег.)*

Са страхі морква вісіць, да зямлі не дастае, паху не мае, зімой вырастае. *(Лядзяш.)*

Як гукнецца, так і адзавецца. *(Рэха.)*

Стаіць дом на дванаццаць вакон, пад тымі вокнамі па чатыры паны, а ў тых паноў па сем вянкоў. *(Год, месяц, тыдні, дні.)*

Шэрае сукно лезе ў акно. *(Світанак.)*

Устаў белы бык, у акно пальчык тык. *(Дзень.)*

Прыйшла чорна маці, усіх паклала спаці. *(Ноч.)*

На паляне сіняй пасецца конік сівы. *(Ноч і месяц.)*

У сінім мяшочку шмат белых парасят. *(Неба і зоркі.)*

Усіх нас корміць, сама есці не просіць. *(Зямля.)*

Без ног бяжыць. *(Вада.)*

Тры таварышы: адзін кажа — пабяжым, другі кажа — паляжым, трэці кажа — паківаемся. *(Вада, камень, трава.)*

Два браты глядзяць у ваду, а ніколі не сыходзяцца. *(Берагі рэчкі.)*

Стукае, грукае і нідзе яго не відаць. *(Гром.)*

Хоць ён побач ідзе, а рукамі не возьмеш. *(Цень.)*

На вадзе родзіцца, а вады баіцца. *(Лёд.)*

Рук многа, а нага адна. *(Дрэва.)*

Паверх лесу агонь гарыць. *(Рабіна.)*

Вісіць — зялёны, ляціць — жоўты, ляжыць — чорны. *(Ліст.)*

Ніхто не палохае, а яны ўсё дрыжаць. *(Лісты асіны.)*

У маленькім гаршчочку смачная каша, ды зачэрпнуць цяжка. *(Арэх.)*

Сядзіць паненка, на ёй чырвоная сукенка, хто ідзе — ёй паклоніцца. *(Суніца.)*

Паміж гор сядзіць Рыгор, капелюшом накрыты. *(Грыб.)*

Сядзіць урода пасярод агарода, хто да яе кранецца, усякі спыніцца. *(Крапіва.)*

На градцы — доўгі і зялёны, а ў бочцы — жоўты і салёны. *(Гурок.)*

Круглы хлявец поўны белых авец. *(Гарбуз.)*

І сваё дзіця не забыла, і чужых малаком напаіла. *(Карова.)*

Не згубіла, а ўсё шукае, не хворая, а ўсё крэхча. *(Свіння.)*

Не прадзе, не тчэ, а людзей апранае. *(Авечка.)*

У адным доме сотні жыхароў, а сям'я адна. *(Вулей.)*

Стаіць бочачка, ні дна, ні вочачка. *(Яйка.)*

Не сякера, а шуміць, не пілот, а ляціць, не змяя, а жаліць. *(Пчала.)*

У нашай нявесты рубашак больш як дзвесце, а вецер павее — і цела відно. (Курыца.)

Не кароль, а ў кароне, не гусар, а пры шпорах, гадзінніка не мае, а час знае. *(Певень.)*

Улетку шэранькі, узімку беленькі, доўгія вушы мае, хутка ў лес уцякае. *(Заяц.)*

Хоць малы ён, часам з кулак, але ў рукі не возьмеш ніяк. *(Вожык.)*

Не рыба, а плывец, не конь, а ходзіць, не піла, а рэжа. *(Бабёр.)*

Без страху, без гора, пралятае рэкі і мора. *(Птушка.)*

Крылле ёсць, ды не лятае, ног няма, а не дагоніш. *(Рыба.)*

Жывы — чорны, памрэ — чырвоны. *(Рак.)*

З-за куста шыпуля, за нагу цапуля. *(Змяя.)*

Без станка, без рук, а кросны тчэ. *(Павук.)*

Доўгі насок, тонкі галасок, хто яго заб'е, той сваю кроў пральe. *(Камар.)*

Чоран, ды не воран, рагаты, ды не бык, шэсць ног без капыт, ляціць — вые, сядзе — зямлю рые. *(Жук.)*

Сем тысяч майстроў зрабілі хату без акон і без вуглоў. *(Мурашкі, мурашнік.)*

Зубастыя, а не кусаюцца. *(Граблі.)*

Маленькі, гарбенькі ўсё поле праскача, дамоў прыбяжыць — цэлы год праляжыць. *(Серп.)*

Кругленькі, маленькі, а за хвост не падымеш. *(Клубок.)*

Два кальцы, два канцы, а пасярэдзіне цвік. *(Нажніцы.)*

Сівенькая, маленькая, а ўвесь свет абшывае. *(Іголка.)*

Не шкадуюць мяне, мнуць, у печ гарачую кладуць, а як вынуць, дык нажом будуць рэзаць. *(Хлеб.)*

Не разыначка я — мяне ж усе смокчуць; не дзяўчыначка я — мяне ж усе цалуюць. *(Лыжка.)*

Два браты, адзін на аднаго глядзяць, а разам не сыдуцца. *(Падлога і столь.)*

Вышэй за ўсіх стаіць, навакол глядзіць, у белай кашулі і люльку курыць. *(Комін.)*

Каля носа ўецца, а ў рукі ўзяць не даецца. *(Дым.)*

Побач стаяць, на вуліцу глядзяць, а сябе ніколі не бачаць. *(Вокны.)*

Пад адной крышай чатыры браты стаяць. *(Стол.)*

Мае чатыры нагі, ды не ходзіць, мае пер'е, ды не паляціць, мае душу, ды не заўсёды. *(Ложак.)*

Бярвёны абчэша, палена расколе, сама не імкнецца, як іншы да славы, стаіць сабе ціха ў куточку за лавай. *(Сякера.)*

І са звонам, і са спевам угрызаецца ў дрэва, раз — наперад, раз — назад, зубы ззяюць і апілкі ўніз ляцяць. *(Піла.)*

Зверху голы, знізу лахматы, цяплом багаты. *(Кажух.)*

Як вазьму цябе ў руку, трапна б'еш ты па цвіку. *(Малаток.)*

Удзень, як абруч, уначы, як вуж, хто адгадае, той будзе мой муж. *(Папружка.)*

Між пяці бочак залаты вяночак. *(Пярсцёнак.)*

Вярхом сядаю, на каго не знаю, знаёмага ўбачу, адразу саскочу. *(Шапка.)*

Два браты ўцякаюць, а два даганяюць, але ж ні пярэднія не могуць уцячы, ні заднія дагнаць. *(Колы.)*

Бягуць два панічы, задраўшы лычы. *(Сані.)*

Еду, еду — ні дарогі, ні следу. *(Лодка.)*

Імчыць конь, вочы — агонь, сто вазоў прэ, народ вязе. *(Цягнік.)*

Ідзе то ў гару, то ў даліну, то лесам, то полем, а сама не паварушыцца. *(Дарога.)*

Ноччу маўчыць, удзень гамоніць, маці другая — дзяцей навучае. *(Школа.)*

Не куст, а з лісточкамі, не рубашка, а сшыта, не чалавек, а расказвае. *(Кніга.)*

Без крылаў, а ляціць, без языка, а гаворыць. *(Пісьмо.)*

Ляжыць палена, а ў сярэдзіне сэрца. *(Аловак.)*

Крылаў не маю, а хутка лятаю, сам мяне выпусціш, ды потым не зловіш. *(Слова.)*

З выгляду — мячык на восі стаячай, а сіла такая — усю зямлю трымае. *(Глобус.)*

У лесе сцята, у краме ўзята, на руках плача. *(Скрыпка.)*

Увесь свой век ходзіць, а з месца не сходзіць. *(Гадзіннік.)*

Яго б'юць, а ён не плача. *(Мяч.)*

Языка не мае, а гаворыць і спявае. *(Радыё.)*

На страсе жораў стаіць, у хаце на стале скрыпка стаіць, у пакоі святло патушана, а ўвесь свет відаць. *(Тэлевізар.)*

Бяжыць па вадзе, а на кані не дагоніш. *(Цеплаход.)*

Маленькая, залаценькая, высока вісіць, у зямлю глядзіць. *(Электрычная лямпачка.)*

Ляцеў, гудзеў, спусціўся і сеў. *(Самалёт.)*

## ЗАГАДКІ — ПЫТАННІ

Што сіне не сінячы? *(Неба.)*

Што бела не белячы? *(Снег.)*

Што чорна не чэрнячы? *(Воран, сажа.)*

Чаго на свеце багацей няма? *(Зямля.)*

Хто ляціць без крылаў? *(Вецер.)*

Што без вады плавае? *(Воблака.)*

На чым знаку не наложыш? *(На агні і вадзе.)*

Што чалавеку самае мілае? *(Сон.)*

Без чаго чалавек жыць не можа? *(Без сну.)*

Што хутчэй за ўсё на свеце? *(Думка.)*

Хто гаворыць на ўсіх мовах. *(Язык.)*

Што без слёз плача? *(Скрыпка.)*

Што на свеце ўсім трэба. *(Назва, імя.)*

Што ў хаце, ды не бачна? *(Цяпло.)*

Чаго не абнясеш вакол хаты? *(Вады ў рэшаце.)*

Якога дрэва больш у лесе? *(Круглага.)*

Што робіць дворнік, калі ў яго на галаве сядзіць верабей? *(Спіць.)*

Чаму карова кладзецца? *(Бо садзіцца не ўмее.)*

Пад які куст заяц садзіцца, калі дождж ідзе? *(Пад мокры.)*

Ці можа страус назваць сябе птушкай? *(Не, бо гаварыць не ўмее.)*

Дзе гарады без людзей, а рэкі без вады? *(На глобусе, на карце.)*

Дзе мароз улетку водзіцца? *(У халадзільніку.)*

### ЗАГАДКІ-РЫФМАВАНКІ

У траве, як аганькі, ружавеюць вугалькі.
Іх вадою не зальеш, рук і ног не апячэш.
Дзень і ноч гараць, палаюць,
Смак яны мядовы маюць. *(Суніцы.)*

Чырвонае цельца, каменнае сэрца,
Вінная на смак, а завецца як? *(Вішня.)*

На тоненькай ножцы
Стаіць,
Сонейкам на неба
Глядзіць. *(Сланечнік.)*

Ён у самы санцапёк
Падстаўляе сонцу бок.
Колерам зеленаваты,
У цяльняшцы паласатай. *(Кавун.)*

Летам я — рагатая,
Восенню хвастатая.
Хоць і горкая зусім,
Ды патрэбная ўсім. *(Цыбуля.)*

Стаіць аднаногі ў зялёным халаце,
а добра прыгледзішся — латы на лаце. *(Качан капусты.)*

Вырасла ў гародзе сонца!
Сядзіць сабе на мурку
У чырвоным каптурку.
Хто не пройдзе —
Спыніць крок,
Каб сарваць той каптурок. *(Суніца.)*

Каля плота расце,
Як даткнешся — апячэ. *(Крапіва.)*

Рос, вырас,
З куста вылез,

Па кустах пакаціўся,
На зубах раскусіўся. *(Арэх.)*

Маленькая паненачка
Схавалася ў цянёк.
Чырвоная сукеначка,
а беленькі пянёк. *(Маліна.)*

У лужку-лужочку
выраслі сястрычкі:
Залатое вочка,
белыя раснічкі. *(Рамонкі.)*

Стаяць каля сценкі Юлькі,
На іх белыя кашулькі.
Сэрцы іх залатыя,
Адгадайце, хто такія? *(Рамонкі.)*

Ніколі шапкі не здымае,
Бо ні адной рукі не мае. *(Грыб.)*

Урадзіўся ён высокі,
Шаўкавісты, сінявокі.
Апранае нас здавён...
Здагадайцеся, хто ён? *(Лён.)*

Ля дарогі — шарык белы,
Вецер дзьме, а шарык цэлы.
А як дзьмухнуць хлапчукі —
Пух ляціць ва ўсе бакі. *(Дзьмухавец.)*

Цвіту ўсё лета я,
Жыву звычайна ў жыце.
Нашу хлапечае імя.
Як зваць мяне, скажыце? *(Васілёк.)*

Адна я ў лесе з белаю карой.
Багата сокам веснавой парой. *(Бяроза.)*

Я зацвітаю кожным летам
не пышным —
ледзь прыкметным цветам.
Але як толькі зацвіту,
дык пчолы чуюць за вярсту. *(Ліпа.)*

Я засцілаю дол ігліцай.
Спрадвеку слаўлюся жывіцай. *(Сасна.)*

І ў сто гадоў я малады.
Маё насенне — жалуды. *(Дуб.)*

Стаіць у лесе дрэўца,
пад ветрам лёгка гнецца,
а гронкі ягадак гараць,
і снегіры да іх ляцяць...
Хто здагадаецца,
як дрэўца называецца? *(Рабіна.)*

Заўсёды, летам і зімой,
мае іголачкі са мной.
Галінак у мяне багата.
Я сустракаю з вамі свята. *(Елка.)*

З людзьмі сяброўе,
Хату вартуе,
Жыве пад ганкам,
Хвост абаранкам. *(Сабака.)*

З грывай, а не конь,
з рагамі, а не бык,
з барадой, а не казёл.
Гучна-гучна зароў
Цар пушчанскіх звяроў. *(Зубр.)*

Гальчастыя рогі,
хуткія ногі,
колер поўсці — залаты.
Хто я, ці ведаеш ты? *(Алень.)*

У ваду нырае смела,
хатку ён будуе ўмела,
Пад вадой і на вадзе
будаўніцтва ён вядзе. *(Бабёр.)*

Ён прысмакаў з'еў нямала,
а калі харчоў не стала,
лапу смокчучы, заснуў,
ледзьве не праспаў вясну. *(Мядзведзь.)*

У рыжай разбойніцы
хвост, як мятла.
Ад кары ўцякла —
сляды замяла. *(Ліса.)*

З ялінкі на ялінку,
з галінкі на галінку
скача агеньчык жывы...
Хто гэта? Знаеце вы? *(Вавёрка.)*

Мышак ловіць, ды не коцік ён,
І лісты носіць, ды не паштальён.
Каб лісе не трапіць на зубок,
У калючы скруціцца клубок. *(Вожык.)*

Маленькі шарык пад лаўкай шарыць,
Збірае крошкі, баіцца кошкі. *(Мышка.)*

Адгадайце, хто такі
На нагах гусіных
Сярод быстрае ракі
Збудаваў плаціну. *(Бабёр.)*

Маленькія лапкі,
На лапках царапкі,
Ціхенька ступае,
Мышак выглядае. *(Кот.)*

Ідзе паважнаю хадою,
Нясе бліны пад барадою. *(Певень.)*

Ён па лесе скок ды скок,
Косіць вокам з боку ўбок.
У дупле вавёрка — шчоўк!
А яму здаецца — воўк. *(Заяц.)*

У стаўку купаўся,
Ды сухім застаўся.
І пайшоў, гарласты,
У чырвоных ластах. *(Гусак.)*

Цэлы дзень лятаю,
Усім дакучаю.
А ноч настане,
Тады адпачываю. *(Муха.)*

Да яліны, да сасны
Доктар прыляцеў лясны.
Палячыў сасну, яліну
І высокі бор пакінуў,
Паляцеў у той лясок,
Дзе бярозавы піў сок. *(Дзяцел.)*

Хапаткія ў мяне крылы,
Хвосцік востры, нібы вілы,
З гліны я гняздо ляплю,
Мошак на ляту лаўлю. *(Ластаўка.)*

У чырвоных ботах,
Ходзіць па балоце,
Захаваўшы лапкі,
Спрытна ловіць жабкі. *(Бусел.)*

Што за беленькая мушка
Апусцілася на вушка.
Ледзь чутно паказытала,
Штосьці вушку пашаптала
І праз міг яе не стала. *(Сняжынка.)*

То ціхмяны, то ўзвіваецца,
Не сабака, а пужаецца.
Паказвае языкі.
Адгадайце, хто такі? *(Агонь.)*

Месца ёсць у той каталцы
Хмарам, сонейку, вясёлцы.
Там аблокі, зоркі, месяц...
Хто яна, што столькі месціць? *(Неба.)*

З ёй спаткаешся тады,
Як захочацца вады,
І цалуеш ты яе
Кожны раз, як піць дае. *(Шклянка.)*

Напіўся, наеўся,
На агонь усеўся,
Кашу зварыў
І нас накарміў. *(Гаршчок.)*

Вузкі, быццам веташок,
Ён травы нажне мяшок,

А калісьці ў полі дбайна
Жыта жаў замест камбайна. *(Серп.)*

Конь сталёвы, аўса не просіць,
А арэ і косіць. *(Трактар.)*

Ходзіць полем з краю ў край,
Рэжа чорны каравай. *(Трактар.)*

Што гэта за машына,
Што разам і жне і малоціць.
А ідзе —
ажно зямлю калоціць. *(Камбайн.)*

Жалезны конь, у жываце агонь,
Есці не просіць, а жне і косіць.
Па полю ўлетку паўзе,
Траву хутка грызе. *(Касілка.)*

Не крот, а капае,
Лап не мае,
А сеянае з зямлі
Выкідае. *(Бульбакапалка.)*

Гусь па вуліцы ідзе,
Дзюбай вуліцу грызе. *(Экскаватар.)*

Гудзе, як пчала, ляціць, як страла,
Крыламі не махае, хто адгадае? *(Самалёт.)*

Плыве ў прасторы,
Ды не ў моры,
Караблём завецца,
А ля зорак уецца. *(Касмічны карабель.)*

Па тканаму мору жалезны карабель плыве,
Мора пад ім шуміць, услед высыхае.
Сам жа карабель тады кранецца,
Як да сцяны прыпрэцца. *(Электрычны прас.)*

Яна на яго злосна бурчэла,
Кідала яго і вярцела.
Яно ж пасля гэтага
Памаладзела. *(Пральная машына.)*

Мае колы — ды не паравоз,
Мае стужку, але не матрос.
Музыкай частуе ён,
А завуць... *(Магнітафон.)*

Я не чарапаха — робат,
Але працаваць люблю,
Я не слон, але ў свой хобат
З дывана ўвесь пыл лаўлю. *(Пыласос.)*

Праз палі, масты, лясы
Ляцяць словы-галасы.
Дзякуючы правадам
Кажуць тут, а чуюць там. *(Тэлефон.)*

Пілавінне рассяваю
І ў час працы я спяваю.
Лес заўжды мяне чакае,
Адгадай, хто я такая? *(Піла.)*

Коўдру, крупы, бохан хлеба —
Я ўмяшчаю ўсё, што трэба.
А сам еду на спіне.
Хто я, ведаеш, ці не? *(Рукзак.)*

Б'е яго спартсмен ракеткай,
Ён не крыўдзіцца за гэта.
І ніколі ён не плача:
Ні калі ляжыць ці скача. *(Тэнісны мяч.)*

### ЗАГАДКІ ЗАГАДВАЮЦЬ ДЗЕЦІ

Вісіць сіта не рукамі звіта. *(Павуцінне.)*
Ляціць — вурчыць. *(Жук.)*
Пад соснамі, пад елкамі ляжыць клубок з іголкамі. *(Вожык.)*
Паўзун паўзе, іголкі вязе. *(Вожык.)*
Летам — шэранькі, зімой — беленькі. *(Заяц.)*
Летам апранаецца, зімой распранаецца. *(Дрэва.)*
Не агонь, а пячэцца. *(Крапіва.)*
Ляціць, а не птушка, вые, а не звер. *(Вецер.)*
Хто гуляе ўсюды на свеце? *(Вецер.)*
Шчыплюць траўку каля рэчкі
У цёплых кажушках... *(авечкі)*.

Цёплым сонейкам сагрэта,
Прайшло радаснае... *(лета).*
Хто зірнуў так рана ў аконца? *(Сонца.)*
Хто нас поіць празрыстай вадзіцай? *(Крыніца.)*
Хто стаіць у зялёных іголках? *(Елка.)*

## МЫ ЎМЕЕМ ДЭКЛАМАВАЦЬ ВЕРШЫ

Найчасцей мы развучваем з дзецьмі вершы з нагоды якога-небудзь свята. Але лепш прывіваць дзіцяці патрэбнасць вучыць вершы на памяць для прыемнасці, проста таму, што твор падабаецца, што яго хочацца расказаць дома бабулі, маме, брацiку.

Не заўсёды ёсць магчымасць вывучыць верш на занятках. Можна, улічваючы асаблівасці характару дзіцяці, яго здольнасці, прапанаваць яму развучыць верш дома з дапамогай бацькоў. На пачатку ці ў канцы заняткаў знайсці час на дэкламацыю («Нам вельмі хочацца паслухаць вершы. Хто хоча сёння прадэкламаваць нам верш?»). Можна арганізаваць конкурс і прысуджаць прыз лепшаму дэкламатару дня. Добра, калі і выхавальнік будзе прымаць удзел у гэтым конкурсе. Лепшым дэкламатарам можна прапанаваць выступіць на ранішніку.

Мы прапануем вершы на розныя тэмы, рознай складанасці і рознага аб'ёму, улічваючы густы, мажлівасці і здольнасці дзяцей. Безумоўна, мы імкнуліся адабраць вершы, цікавыя па зместу, з дынамічнымі падзеямі, з выразнымі дыялогамі. Такія вершы лягчэй запамінаюцца і лепш успрымаюцца слухачамі.

Працуючы над вершам, трэба вучыць дзіця даносіць да слухача сэнс верша, выдзяляць голасам важнае ад другараднага. Верш пажадана разбіць на асобныя эпізоды, у якіх ёсць закончаныя думкі і дзеянні. Пасля кожнага такога эпізоду трэба рабіць невялікую паўзу. Пры дэкламацыі важнае значэнне мае вымаўленне, дыкцыя. Неприемна слухаць таго, хто дрэнна, невыразна вымаўляе словы.

Калі дзіця добра зразумее верш, уявіць яго падзеі, усвядоміць, навошта гэты верш напісаны, дык і голас у яго загучыць шчыра, з'явіцца патрэбны тэмп, жывая інтанацыя. Педагогу абавязкова трэба стварыць атмасферу ўрачыстасці пры праслухванні дэкламацыі. Трэба, каб дэкламатар адчуваў, што яго ўважліва, з цікавасцю слухаюць.

У жыцці дзяцей асобнае месца займаюць святы. Дзеці іх любяць, з захапленнем рыхтуюцца да іх. Вершы — самы зручны літаратурны матэрыял для падрыхтоўкі да свята. Педагогу варта памятаць, што кожнае дзіця хоча ўдзельнічаць у канцэрце. Таму, пры магчымасці, пажадана ўключаць як мага больш дзяцей у дэкламацыю. Для гэтага можна падрыхтаваць харавое прачытанне некаторых радкоў верша, дэкламацыю верша па асобах і інш.

● Вывучым верш пра самлелую, санлівую козачку. Чаму яна такая, вы даведаецеся з верша.

КОЗАЧКА

— Каза-козка
Белая,
Што ты,
Як самлелая,
Нейкая
Панылая,
Нейкая санлівая?
— Як быць
Не самлелаю?
Нічога
Не ела я,
Таму і панылая,
Таму і санлівая.
— Не бядуй,
Бялянaчка,
Паднясу я
Травачкі,
А яшчэ вадзіцы
З блізкае крыніцы.
— Бэ-бэ, —
Кажа козачка, —
Ліць не буду
Слёзачкі.
Буду я
Рухаваю,
Радаснай
І жваваю.

*Авяр'ян Дзеружынскі*

● Вывучым прыгожы вершык пра адну лясную птушку. Якую? Я вам не скажу. Вы самі мне скажаце. Слухайце ўважліва.

Я на елку палячу, —
Ўсе галінкі палячу:
Дзюба ў мяне доўгая,
Буду стукаць доўга я.

Тут суніцы ўсе паспелі,
Іх дразды скляваць паспелі.
Я спалохаў іх як след,
Іх прапаў адразу след. *Сяргей Грахоўскі*

● Ёсць такія птушкі, якія не толькі ўмеюць на цымбалах іграць і спяваць, але і коціка шэранькага супакоіць, падбадзёрыць. Вывучым пра іх вершык.

НА ЦЫМБАЛАХ ГУСІ ГРАЮЦЬ

На цымбалах гусі граюць.
Певень з курачкай спяваюць:
— Ку-ка-рэ-ку, ко-ко-ко,
Ой, разліў кот малако.

Ку-ка-рэ-ку, куд-кудах,
Коцік шэранькі ў слязах.
Ко-ко-ко, не румзай, Цішка,
Бо смяяцца будзе мышка. *Ул. Скарынкін*

● Вывучым верш пра Янку, які катаецца на санках у марозны сонечны дзень.

СОНЦА СВЕЦІЦЬ

Сонца свеціць
    там над намі,
Снег іскрыцца
    пад нагамі,
Мароз ціснe,
    далучае.
А наш Янка
    і не дбае:
З гор на саначках
    нясецца, —
Гарацць вочкі,
    сэрца б'ецца. *Зоська Верас*

● Ці чулі вы вясёлы вершык пра дзяцей, якія любяць хадзіць да бабкі ў госці. Бабка ім абяцала бярозавай кашкі. Дзеткі, мабыць, не ведаюць, што гэта за кашка. А ці ведаеце вы? Паслухаем і вывучым верш «Бабіны госці».

Ладачкі-ладкі,
Дзе былі? — У бабкі.
    Што пілі вы? — Малако.
    А што елі? — Ко-ко-ко.
Доўга ж вы сядзелі,
Доўга пілі-елі.

А мы не сядзелі —
Цэлы дзень дурэлі.
Мы і заўтра пойдзем
Да бабулі нашай —
Абяцала бабка
Бярозавай кашы. *Васіль Вітка*

● Вывучым верш пра авадня, ад якога ляцяць наўскач у кусты коні, каровы і нават быкі. А чаму яны ад яго ўцякаюць?

АВАДЗЕНЬ

Хоць малы я, хоць малы —
Трошкі большы ад пчалы, —
Ды, ледзь мой пачуе зык,
Уцякае з поля бык.
Конь, хоць я і не сілач,
Ад мяне ляціць наўскач.
Крута ўскінуўшы хвасты,
Ад мяне ў кусты, ў кусты —
Па іржышчы стрымгалоў
Уцякае гурт кароў.
Злосны я ў спякотны дзень,
Хто ж такі я?
Авадзень! *Кастусь Цвірка*

● Хлопчык-хітрун Міколка так любіў клубніцы, што аднойчы парваў зялёныя. Бабулі ж сваёй сказаў, што іх паклявалі куры: хацеў яе абхітрыць. А бабуля яму загадала прынесці дубчык. Навошта ёй дубчык? Прачытаем і вывучым верш «Пра клубніцы і пра дубчык».

Наш Міколка не ляніцца
Выбраць спелыя клубніцы.
А аднойчы не стрываў —
І зялёныя парваў.
Бабка вочы праглядзела —
Ні зялёнай і ні спелай.
Хлопчык хітрай быў натуры:
Паклявалі, кажа, куры.
Бабка праўду паважала
І таму суровай стала.
Ты, унучак, не хлусі!
Ты мне дубчык прынясі! *Галіна Каржанеўская*

● Сняжынка стала слязінкай. Вам цікава, як і калі гэта здарылася?

### СНЯЖЫНКА

Упала сняжынка
На шчочку Ірынкі —
Адразу ж растала,
Слязінкаю стала.
Смяецца Ірынка,
Плача сняжынка. *Алена Філімонава-Кобец*

● Мяцеліца замяла сцежкі і ўзлескі. Не прабрацца. Гурбы снегу. Хто ж дапаможа адкінуць снег ад хаты? Можа, дзеці?

### МЯЦЕЛІЦА

Дзьмухнула завіруха,
Закружыла снегам-пухам,
Загула мяцеліца,
Аж вачам не верыцца.
Замяла канаўкі, сцежкі,
І лагчыны, і узмежкі.
Не відаць зусім нічога.
І згубілася дарога.
Свішча ветрык між галінак,
Ліпнуць веткі ад сняжынак.
Гурбы снегу. Не прабрацца...
Вось дзе будзе дзецям праца.
— Гэй, за шуфлі і лапаты,
Снег адкідаем ад хаты! *Станіслаў Шушкевіч*

● Вывучым жартоўны верш пра неахайнага хлопчыка Міколку. Ён быў такі мурзаты, што нават галубы ад яго ўцякалі. А маці і сёстры ніяк не маглі адмыць яго. Тады яны вырашылі павесці Міколку ў хімчыстку.

Наш Мікола не чысцёха,
А зусім наадварот:
У чарніле ўся кашуля,
Рукі, вушы, нос і рот.
І Міколу абыходзяць,
Быццам хлопец камінар,
Нават галубы ўцякаюць,
Калі выйдзе на бульвар.

Мые маці, мыюць сёстры,
Змылі мыла кілаграм;
Працавалі ўсе да поту,
Ды не стала меней плям.

Церлі дзеркачом з пясочкам,
Ажно лужы паплылі.
Не маглі зрабіць нічога
І ў хімчыстку павялі. *Аляксей Пысін*

● Мама заўважыла, што нехта паздымаў вяршкі ў гладышках і панадкусваў піражкі. Яна дапытваецца ў мышкі, у ката, у пеўніка. Усе шчыра адмаўляюцца. А Янка маўчыць... Чаму ж ён маўчыць?

ХТО ВІНАВАТЫ?

Запытала мама ў мышкі:
— Хто тут лазіў у гладышкі,
Паздымаў усе вяршкі,
Панадкусваў піражкі?
Мышка маме адказала:
— Я смятаны не лізала,
Можа, нехта з'еў другі
І вяршкі і пірагі.
Пацягнуўся шэры кот:
— Я не браў смятаны ў рот,
Нават скажуць столь і сцены,
Што зрабіўся я сумленны.
— Ку-ка-рэ-ку! —
Тут дарэчы
Певень выскачыў з-пад печы:
— Вам хлусіць і я не стану,
Кот даўно не еў смятану.
А тым часам вострыць вуха
Каля той гладышкі муха.
Мышка скача, мышка рада:
— Гэта ж муха вінавата.

Не гаворыць толькі Янка,
Дзе падзелася смятанка. *Сяргей Грахоўскі*

● Па лесе тэпаў вожык з кошыкам пячэння. Раптам ён пачуў зязюлю. А чым закончылася яго сустрэча з хітрухай-птушкай, мы даведаемся з верша, які потым вывучым.

## ХІТРАЯ ЗЯЗЮЛЯ

Вы не бачылі,
Не чулі
Той хітрухі,
Той зязюлі,
Што варожыць:
— Ку-ку-ку,
На бярозе,
На суку?
Па сцяжынцы
Тэпаў вожык,
Нёс пячэння
Поўны кошык.
Сеў спачыць ён
У цяньку.
Тут зязюля ўраз:
— Ку-ку!
Толькі год
Накукавала.
Сумны вожык:
— Ах, як мала!
А зязюля кажа:
— Вожык,
Падары ты мне
Свой кошык.
За паслугу
За такую
Сто гадоў я
Накукую. *Павел Марціновіч*

● Мы любім свой край, сваю зямлю: вербы, бярозы, раку, крыніцы, сцежкі і пралескі. Мы любім птушак, якія ляцяць на зіму ў вырай, а пасля зноў прылятаюць дамоў — не забываюць свой край.

## МОЙ КРАЙ

Ад ветру гнуцца вербалозы,
Бяжыць дарога напрасткі.
Мой край — бялюткія бярозы
Абапал сіняе ракі.
Высока ў небе вырай кружыць:
Ляціць за сіні небакрай.
Не забывай ніколі, дружа,
Сваю зямлю, свой родны край.
Мой край — лугі і пералескі,
Крыніцы звон і шум лясны,
Мой край — блакітныя пралескі
На сцежках ранняе вясны. *Вера Вярба*

● Мы вывучым верш «Босыя цукеркі». Што ж гэта за цукеркі? Хлопчык бывае босы. Дзяўчынка босая. Бабуля босая. А тут — цукеркі босыя. Ці елі вы цукеркі-падушачкі? Ці смачныя яны? А цяпер вы даведаецеся, ці спадабаліся яны адной унучцы-капрызулі, і дапаможаце мне адказаць, чаму дзяўчынка назвала цукерку-падушачку босай.

### БОСЫЯ ЦУКЕРКІ

Здалёк
Прыехала бабуля,
Па Мінску пахадзіла.
Яна для ўнучкі-капрызулі
«Падушачак» купіла.
А ўнучка
Пазірае скоса:
— Я не хачу
Цукерак босых. *Рыгор Барадулін*

● Верш, які мы вывучым, называецца «Скакалка». Вы ўбачыце, што гэта скакалка не такая, якую вы ўсе ведаеце. Гэта скакалка скача сама, без дзяцей. Скача над палянамі, лясамі. Во якая скакалка. Напісаў верш паэт Рыгор Барадулін.

### СКАКАЛКА

А на золку
За бугром
Праз вясёлку
Скача гром.
Скача,
Скача
Без аглядкі,
Толькі над палянкамі
Бліскаюць вясёла пяткі
*Зыркімі маланкамі.*
Раз-два-тры,
Раз-два-тры —
Усміхаецца.
Раз-два,
Тры-чатыры —
Светла ўсёй нябеснай шыры...
Раз-два,
Тры-чатыры,
Пяць —
Гром пайшоў
*За мора спаць.*

● Вывучым верш пра двух шчырых сяброў, якія разам хадзілі ў школу. Добра вучыліся, заўсёды і ўсюды былі ветлівыя. Іх так выхавалі ў дзіцячым садочку. І вы будзеце добрымі вучнямі, калі пойдзеце ў школу, як гэтыя сябры.

### КАЧАНЯ І КАЦЯНЯ

А качаня і кацяня
Паміж сабою, як радня.
Усюды разам, удваіх,
Не разальеш вадою іх.

Выдатнікам настаўнік рад.
А хто іх выхаваў?
Дзетсад.

У клас увойдуць, знімуць
шапкі,
Пасядуць і — угору лапкі,
Бо качанятка і каток
Заўсёды ведаюць урок. *Васіль Вітка*

● Мы ўсе любім курак. Яны прыгожанькія, ходзяць па падворку і квохчуць: «Ко-ко-ко, я знясу табе яйко». Мы з вамі вывучым верш «Куркі». Куркі ў гэтым вершы паслухмяныя, разумныя. Яны абяцаюць не адыходзіцца далёка і просяць насыпаць ім... А чаго, вы мне скажаце самі, праслухаўшы верш.

— Куркі!
Куркі!
— Ко-ка?
Ко-ка?
— Не хадзіце
Ў лес далёка.
Бо жыве
У лесе ліс.
Шмат ён курачак загрыз.

А загінуць куркі ўсе,
Хто яечкі нам знясе?
Кажуць куркі:
— Ко-ка!
— Ко-ка!
Не адыдземся далёка,
Калі ўранку
На падворку
Круп насыплеце
Нам горку. *Артур Вольскі*

● Вывучым верш пра здарэнне ў лесе, пра тое, як упаў і пабіўся Мішка, а зайка заляцеў аж на яліну і ледзь не паламаў косці. І ўвесь гэты клопат нашы сябры займелі праз арэлі. Ды якія арэлі! Арэлі, якія нехта павесіў не ў двары, а ў цёмным, густым лесе.

АРЭЛІ

У лясным кутку віселі
Паміж соснамі — арэлі.
Хто ж, цікава, іх павесіў
Не ў двары, а ў цёмным лесе?
Вось ідзе мядзведзь аднекуль:
— Што за дзіва! Я адвеку
У бары жыву. Арэляў
Мы ніколі ў ім не мелі.

Сеў на дошчачку мядзведзь,
Хоць на ёй змясціўся ледзь.
Гайдануўся крышку
І... упаў наш Мішка.
Забурчаў: «Каб вы згарэлі...
Горшыя за пчол — арэлі».
Заяц бег па нейкіх справах.
Прыпыніўся ён: «Цікава!
Эх, як узлячу!» Гай-да!
Здарылася з ім бяда.
Заляцеў — аж на яліну!
Учапіўся за галіну.
Ледзь не паламаў ён косці.
Трапіў... да савы у госці.
У дупле тае яліны
Быў якраз кажух савіны.
Вочы вырачыла тая:
Вось дык заяц! Ён — лятае!
Што ж табе патрэбна тут?
Плача зайка: «Парашут!»
Колькі клопату займелі
Тут, у лесе, праз арэлі.
Хто ж, цікава, іх павесіў
Не ў двары — у цёмным лесе? *Павел Марціновіч*

● Ці ёсць у вас сябар? А ці ведаеце вы, якім павінен ён быць? Паслухайце верш «Сябры», які напісаў Мар'ян Дукса, і вы пазнаёміцеся з двума хлопчыкамі. Яны так сябруюць, што іх вадой не разліць. Яны ўсё заўжды дзеляць папалам. І вось прыйшла чарга падзяліць сабаку.

Сябруюць —
ніколі не скажуць «не дам».
Усё яны дзеляць
заўжды папалам:
суніцы, чарніцы,
банан, вінаград,
пячэнне, халву,
апельсін, шакалад.
Адзін будзе грэцкі арэх,
як на грэх, —
пароўну падзеляць
і грэцкі арэх!

Сябры яны —
проста вадой не разліць.
І сталі нарэшце
сабаку дзяліць.
А як ты падзеліш,
Калі ён адзін, —
яго ж не разрэжаш,
нібы апельсін.
Рашылі:
пабудзе ў адным будане,
а потым, праз дзень,
у другі зазірне.
Вось так падзялілі
сабаку сябры,
І той не крыўдуе —
мяняе двары.
І будзе ён бегаць
вось так і далей —
прыемна сябрам,
і яму весялей.

● Вывучым прыгожы верш пра нашу Радзіму Беларусь. Верш называецца «Белая Русь». Што такое Белая Русь, хоча ведаць такая ж маленькая дзяўчынка, як і вы. І мама ёй растлумачвае.

Шчочку да вуснаў туліць,
каб таямніцу спытаць:
— Белая Русь, матуля,
гэта дзяўчынка?
Так?
Як называецца дзіўна...
Ты пра яе раскажы.
— Белая Русь — Радзіма.
Перад табой ляжыць.
Крыкні — яна адгукнецца
звонам гарачых кос.
Кропля з ліста сарвецца,
ускалыхнецца плёс.
Даль захлынецца громам —
Белая Русь запяе.
І азарыцца Нёман —
чыстае вока яе. *Данута Бічэль-Загнетава*

*Вершы, дэкламацыю якіх можна падрыхтаваць да розных свят*

### *Вершы да навагодняга свята*

СНЯЖЫНКІ

Выйшла з хаты ранкам Зіна,
А сняжынак! А сняжынак!..
Не злічыць і не сабраць,
Быццам зоркі зіхацяць.
І падумала дзяўчынка,
Усміхнуўшыся сняжынкам:
— Гэта ноччу Дзед Мароз
З неба зорачак натрос. *Іван Вярыга*

● Гэты верш пра дзяўчынку і сняжынкі. А як звалі гэту дзяўчынку? Калі яна ўбачыла сняжынкі каля хаты? Сняжынкі былі падобныя на зоркі. Так? А чым яны былі падобныя на зоркі? Іх было шмат на зямлі, як зорак на небе. Яны зіхацелі быццам зоркі. Ці так я кажу?

А цяпер я вам прачытаю ўвесь верш яшчэ раз і вы мне скажаце, што Зіна падумала, усміхнуўшыся сняжынкам. Можа, мы адразу і вывучым на памяць словы, якія сказала сама сабе дзяўчынка Зіна:

— Гэта ноччу Дзед Мароз
З неба зорачак натрос.

Смешна яна падумала, праўда? Быццам неба — гэта яблыня ці груша, якую можна трэсці.

Калі мы гэты вершык будзем дэкламаваць? Так, на Новы год. А як вы думаеце, гэты вершык спадабаецца вашым родным: маме, тату, брацікам, сястрычкам? А бабульцы і дзядулю?

● Ці хочаце вы, каб я прачытала прыгожы верш? Яго напісала Данута Бічэль-Загнетава. І імя ў яе прыгожае, і прозвішча нязвыклае, і вершы ў яе цікавыя. Адзін з іх называецца «Елка-бароўка». Елка расце ў лесе, у бары. А калі яе ссякуць, упрыгожаць і пачнуць танцаваць вакол, дык яна называецца ўжо ёлка. Елка-бароўка расла ў бары. Яна спалохалася шэрага воўка і ўцякла ў цёплую хату. Там яе ўбралі ў цацкі і шары, запалілі свечкі, на верхавінку прымацавалі зорку. Вакол ёлкі танцавалі дзеці, спявалі,

смяяліся, весяліліся. А потым? Што было потым? Дзед Мароз развязаў свой мех, пачаў абдорваць смачнымі цукеркамі ўсіх дзяцей. Вось колькі радасці прынесла елка-бароўка!

А цяпер папрасіце, каб я прачытала верш «Елка-бароўка».

Елачка-бароўка
У хатку да цяпла
Ад шэрага воўка
З бору уцякла.
Мы ёй падарылі
Цацкі і шары.
Зоркай азарылі —
Гары, гары!

А над нашай ёлкай —
Яркая вясёлка.
А пад нашай ёлкай —
Вёрткая вавёрка.
А навокал ёлкі —
Танцы і смех.
Развяжы, дзядуля,
З цукеркамі мех!

А цяпер давайце вывучым гэты верш. Цікава, хто яго хутчэй вывучыць: вы ці я?

Заўтра мы яго давучым. Будзем паўтараць час ад часу, а на Новы год будзем дэкламаваць яго і дома, і ў садку. Згода?

● Ці хочацца вам пазнаёміцца з дзіўным-дзіўным Дзедам Марозам? Ну, вядома, хочацца. Пра гэтага дзіўнага Дзеда Мароза напісаў Павел Марціновіч. Я вам прачытаю спачатку ўвесь верш цалкам, а пасля па частках. Пасля кожнай часткі мы пагутарым, а тады яшчэ і яшчэ раз будзем чытаць. Я скажу адзін радок, а вы — наступны. А потым, праз нейкі час, калі мы вывучым верш, то зробім спектакль. У нас будуць тры дзеючыя асобы: аўтар, Дзед Мароз і хлопчык Алег.

ДЗІЎНЫ, ДЗІЎНЫ ДЗЕД МАРОЗ!

Надышоў зімовы вечар...
Дык чаму ж не спіць малеча?
Свецяць вокны, ззяюць ёлкі
І ў Алеся, і ў Міколкі,
І ў Марыны, і ў Аксаны,
І ў Валерыка таксама.
Пэўна, гэта нездарма?
Можа, скажаш ты, зіма?
А зіма ў адказ смяецца!
Хутка ж Новы год пачнецца!
Сёння ўночы, сёння ўночы
Ён па ўсёй Зямлі пракрочыць!

І ў Алега ёлка ззяе.
Падарункаў ён чакае.
Нешта доўга сёння тата
Не вяртаецца дахаты.
Толькі раптам: «Стук-стук-стук!»
Да дзвярэй бяжыць хлапчук.

Што такое! Вер ці не —
Да Алега, як у сне,
Завітаў сам Дзед Мароз.
Валасамі ён зарос.
У руцэ трымае мех.
Кажа ён: — Здароў, Алег!
Я прынёс табе дарункі —
Клюшку, кніжку, пачастункі.
Хоць вусаты, барадаты,
Ды падобны дзед на тату!
І такі ж высокі рост...
Дзіўны, дзіўны Дзед Мароз!

— Адкажы мне, дзіўны дзед,
Адрас мой дастаў ты дзе?
— Адрас? — цётка Завіруха
Прагудзела мне на вуха!
— Хто ж табе шапнуў на вушка,
Што даўно хачу я клюшку?
— Хто? Вядома, дзядзька Сон,
Добра ведаў гэта ён!
— Ну, а колькі табе год,
Дзед Мароз? — Ды мо семсот!
— А чаму ў цябе тады
Голас гэткі малады?
— На паветры, на паветры
Я гуляю разам з ветрам.
А як стану на канькі —
Мне зайздросцяць юнакі!
— Дзіўны, дзіўны, дзіўны дзед,
Што ж ясі ты на абед?
— Ледзяшы, ледзяшы дужа мне па душы:
Ды яшчэ сняжынкі, ажно цякуць слінкі!
— Дзіўна! Як жа ты, раз так,
Не прастудзішся ніяк?
Засмяяўся Дзед Мароз:
— Дужа ты, сынок, падрос!

Ці любіце вы Новы год? Ці чакаеце Новага года? А чаму вы яго любіце? Чаму дзеці ўвечары пад Новы год не хочуць ісці спаць? Як у гэтым вершы называюцца дзеці? Малеча? Так?

У якіх хлопчыкаў і дзяўчынак свецяць вокны, ззяюць ёлкі? Можа, мы хорам паўторым? «І ў Алеся, і ў Міколкі...» А хто адказаў нам, чаму малеча не спіць у гэты вечар? Можа, мы зноў хорам скажам: «Сёння ўночы, сёння ўночы...»

Якога хлопчыка выбраў аўтар, каб расказаць нам пра яго? Як яго імя? Алег не спіць, у хаце ззяе ёлка. Хлопчык чакае. А чаго ён чакае? Хто яму прынясе падарункі? Хто доўга не вяртаецца дахаты? Што раптам пачуў хлопчык? Ці падбег Алег да дзвярэй, калі ён пачуў «стук-стук-стук»? І каго ж Алег убачыў? Хто ж да яго завітаў? Ці здзівіўся Алег? Ці ўзрадаваўся? А ты, Аркадзік, ці ўзрадаваўся б, калі б убачыў Дзеда Мароза ў сваёй хаце?

Як выглядаў Дзед Мароз? «Валасамі ён «зарос», так? Што гэта значыць, як вы думаеце? Ён быў з вусамі, барадою, з доўгімі валасамі. Так? А што Дзед Мароз трымаў у руцэ? Маленькую торбачку ці вялікі мех? І што ён сказаў? Можа, мы вывучым яго словы? «Я прынёс табе дарункі — клюшку, кніжку, пачастункі?» А як ты думаеш, Наталка, што найбольш узрадавала Алега: клюшка, кніжка ці пачастункі (цукеркі, арэшкі, шакалад, апельсіны)?

На каго быў падобны Дзед Мароз? Што Дзед Мароз адказаў, калі хлопчык запытаўся, дзе ён дастаў яго адрас? Можа, мы прачытаем гэтыя словы? «Адрас? Цётка Завіруха прагудзела мне на вуха». Мне вельмі спадабаўся адказ Дзеда Мароза, а вам? А хто Дзеду Марозу шапнуў на вушка, што Алег даўно хацеў клюшку?

Алег запытаўся, колькі Дзеду Марозу гадоў, і што той адказаў хлопчыку? Семсот гадоў. Гэта многа ці мала? А што Дзед Мароз адказаў, калі Алег запытаўся, чаму яго голас такі малады? Хто гуляе на паветры, з ветрам, той малады і здаровы. Так? Дык што Дзед Мароз так і сказаў?

А ад чаго ў Дзеда Мароза цякуць слінкі, што яму падабаецца есці? Ледзяшы і сняжынкі нельга есці. Мы гэта ведаем? А ці ведаў гэта Алег? І што ён сказаў? Ці паверыў Алег, што Дзед Мароз есць ледзяшы і сняжынкі?

Ну дык хто ж гэта быў Дзед Мароз? Ці пазнаў яго Алег?

### *Вершы да свята жанчын*

МАМІНА СВЯТА

Заўтра — свята веснавое —
Восьмага сакавіка.
Што падорыць маме Зоя,
Клапатлівая дачка?
Мама зранку на заводзе,
мама любіць працаваць,
а дачушка ў садзік ходзіць,
добра ўмее маляваць.
Што падорыць маме Зоя,
не пытайцеся — сакрэт.
Заўтра, заўтра раніцою
мама ўбачыць свой партрэт. *Васіль Жуковіч*

● Калі бывае свята жанчын: вясною ці зімою? Маміна дачушка клапатлівая, праўда? Яна клапоціцца пра маму. Што яна хоча зрабіць для яе? Дачушка вялікая ці маленькая? Яна ходзіць у садзік ці ў школу? Што яна ўмее добра рабіць? Што яна маме намалюе? А ці будзе мама задаволена, атрымаўшы ад сваёй дачушкі падарунак? Што мама ёй скажа?

СА СВЯТАМ!

У пакоі сёння рана
Па-святочнаму прыбрана:
На стале абрус ружовы
І дыван пад ложкам новы.
Торт румяны на падносе;
А на торце лічба восем.
Выразаю я старанна
Астры, макі і цюльпаны.
Прыйдзе мама на абед —
Падарую ёй букет. *Ніна Галіноўская*

● Як прыбраны пакой восьмага сакавіка; па-святочнаму ці па-будзённаму? Які на стале абрус? Які дыван ляжыць каля ложка? Чаму на торце напісана лічба восем? Што падарue дзяўчынка маме, калі тая прыйдзе на абед? З якіх кветак дачушка збярэ букет маме? Ці ўсцешыцца мама? А чым яна ўсцешыцца? Ці любіць дачушка сваю маму? А ты стараешся зрабіць сваёй маме нешта прыемнае?

А як вы павіншуеце выхавальніцу, маму свайго сябра? Што вы скажаце? (Са святам вас! З жаночым святам! Са святам жанчын!)

● Да свята нашых мам мы вывучым вершык «Сакавік». Яго напісаў Артур Вольскі.

Сонейка вясновае
Глянула з-за хмар,
Лічбаю чырвонаю
Ззяе каляндар.

Я ўжо знаю літары
І чытаю сам.
Сёння свята слаўнае —
Свята нашых мам.

Сонейка вясновае,
Не хавайся ў цень,
Каб асветлен радасцю
Быў святочны дзень!

● Паслухаем, адкажам на пытанні, вывучым на памяць.

Я ласкай сагрэты, пяшчотай тваёю.
Ты — яснае сонца, што рана ўстае.
І робяць усё для мяне з любоўю
Родныя рукі, мама, твае.
Віншую са святам цябе, дарагая!
З табою шчаслівы заўсёды я.
Моцна і шчыра цябе абдымаю,
Добрая, мілая мама мая! *Уладзімір Лісун*

Хто віншуе маму: хлопчык ці дзяўчынка? Як хлопчык называе сваю маму? «Ты — яснае сонца», дарагая, добрая, мілая. Хлопчык любіць маму. Так? Як ён абдымае сваю добрую мілую маму? Ці будзе шчаслівая мама хлопчыка, пачуўшы яго віншаванне? А твая мама ўсцешыцца, калі ты, Кастусёк, павіншуеш яе гэтым вершам? Хто прыдумае самы лепшы загаловак да гэтага верша?

● А цяпер мы пазнаёмімся з вершам, які называецца «Бабулі». Напісаў яго Авяр'ян Дзеружынскі. Вы, напэўна, ведаеце, што 8 Сакавіка — свята не толькі нашых матуль. Гэта свята і нашых бабуль таксама.

Прачытаем верш, пагутарым, вывучым яго і пагуляем у тэатр. У нас будуць тры артысты — два ўнукі і аўтар. Назавём першага ўнука Сцяпанка, а другога — Міколка.

(Сцяпанка) — Бабкі лепшае няма,
Як мая, у цэлым свеце.
Не крычыць яна дарма,
Ласкаю прывеціць.
Звяжа цёплыя пальчаткі
Мне на Новы год,
А калі спячэ аладкі —
Скачуць самі ў рот!

(Міколка) — А мая бабуля казкі
Любіць
Баіць-гаварыць,
Цэлы вечар
Будзеш слухаць,
Сон не здолее зморыць:
То ў дрымучы бор
Заглянеш,
Дзе жыве
Стары мядзведзь,
То ваўчыху напаткаеш —
Уцячэш ледзь-ледзь...
Безліч казак бабка знае,
Іх заўжды ахвотна бае.

(Аўтар) — І таму шануюць дзеці
Сваіх бабак нездарма,
Бо для іх
Нікога ў свеце
Ласкавейшага няма.

Чаму Сцяпанка лічыць, што лепшай, як у яго, бабулі няма ў цэлым свеце? Таму, што ён яе любіць. Таму, што яна на яго дарма не крычыць. Таму, што яна прыветлівая, ласкавая, пяшчотная. А за што яшчэ Сцяпанка любіць сваю бабулю? Якія яна ўмее вязаць пальчаткі свайму ўнучку? А што яшчэ яго бабуля ўмее рабіць? Давайце разам паўторым гэтыя радкі пра пальчаткі і аладкі: «Звяжа цёплыя пальчаткі...»

А што мы скажам пра Міколкаву бабулю? Што Міколкава бабуля ўмее і любіць рабіць? Ці шмат яна ведае казак? Ці ахвотна яна іх бае? Пра якіх звяроў яна бае? Ці хацеў

бы ты, Пілiпка, спаткацца з Міколкавай бабуляй? Як бы ты папрасіў яе, каб яна расказала табе казку пра дрымучы бор? Ці ўсе мы любім і шануем сваіх бабуль?

***Вершы пра розныя поры года***

● Прачытаем і вывучым невялікі верш пра восень, пра адлёт жураўлёў у вырай.

ЖУРАЎЛІ

Жураўлі па-над лясочкам
Роўненькім ляцяць шнурочкам;
Мама кажа мне, што гэта
Адлятае ад нас лета.

І цяпер мне зразумела,
Чаго дождж ідзе дзень цэлы —
Гэта лета, не іначай,
Па дзяньках вясёлых плача. *Іван Шуцько*

● Паслухайце верш «Усё зіма заснежыла». Калі ён вам спадабаецца, мы яго вывучым. У гэтым вершы ёсць такія цікавыя словы, як *брама, штыкеты, посцілка, шалёная, заснежыла*. Ці ведаеце вы іх?

Белымі сняжынкамі
Ўся дарожка ўсеяна.
Была ў полі рэчанька,
Ды не стала. Дзе *яна*?

Была ў полі елачка,
Пышная, зялёная,
А яе мяцеліца
Замяла шалёная.

Азярцо празрыстае
За сялом свяцілася.
Посцілка бялюткая
На яго звалілася.

Тут зіма заснежыла
Брамы і штыкеты,
Кожны куст і дрэва
Ў белае адзеты. *Станіслаў Шушкевіч*

● Паслухаем і вывучым верш пра зіму, якая так разгулялася, што супынку ёй няма. Намяла цэлыя горы белага снегу. Хто з вас вывучыць гэты верш найхутчэй і найлепш раскажа?

ЗІМА

Разгулялася зіма,
Што супынку ёй няма.
Дзе быў двор голы,
Намяла горы.

Хлапчукі парашылі
Узысці на вяршыні.
Горы расступіліся —
Дзеці ў снег зваліліся. *Данута Бічэль-Загнетава*

● Прачытаем верш «Ажылі прамені». Яго напісаў Паўлюк Прануза. А што такое прамені? Калі яны ажываюць? Восенню? Вясною? Летам? Зімою? Прыгадаем з вамі словы: бляск, капяжы, поўдзень, чутна. Калі вы не ведаеце іх, я вам падкажу, вытлумачу, а потым мы вывучым гэты верш.

Замець не гуляе,
І мароз аслаб.
Раніцаю чутна:
Кап... Кап... Кап...

З крышталёвым бляскам
Звоняць капяжы.
Верабейка скача:
— Жыў!.. Жыў!.. Жыў!..

Прыляцелі з поўдня
Спеўныя шпакі.
Зазвінелі ў небе
Жаўранкаў званкі.

На паляне ціхай
У густым бары
Ажылі пралескі —
Весніх дзён сябры.

● Паслухайце верш, які напісаў Якуб Колас, наш вядомы паэт. Скажыце, якую пару года ён так любоўна

апісвае. Калі бывае шмат прастору, волі? Калі можна бегаць басанож па дарожках за вёскай, у лесе, у гаі? Калі стаіць цяплынь? Калі хочацца спачыць пад бярозкай? Калі пчолкі і матылькі лятаюць, мільгацяць вакол? Калі на дарожках жоўценькі пясочак і яго хочацца ўзяць у прыпол, гэта значыць насыпаць на край фартушка ці спаднічкі? Так, усё гэта бывае летам.

Верш, які мы вывучым, так і называецца «Летам».

Ну ж і волі, волі
У гаі за вёскай!
А цяплынь, цяплынь!
Весела на полі,
Слаўна пад бярозкай,
Хоць ты сядзь спачынь.

Пчолкі, матылёчкі,
Як сняжынкі тыя,
Мільгацяць вакол.
Жоўтыя пясочкі —
Крупкі залатыя,
Хоць бяры ў прыпол.

● Паслухайце, як прыгожа апісвае лета Ніна Галіноўская. Калі вам спадабаецца яе верш, мы вывучым яго разам.

ЛЕТА

У сукенцы каляровай,
У хусцінцы васільковай
Ходзіць лета па палях,
Па расквечаных лугах.

Звоніць песняй жаўруковай
Кожны дзень званчэйшай, новай.
Дбайна сонечнае лета
Спеліць ягады для дзетак.

Любіць з імі забаўляцца.
Загараць, спяваць, купацца.
Дораць дзеці лету ўсмешкі,
Гульні, песні і пацешкі.
А расчуленае лета
Дорыць ім букеты кветак.

### *Вершы, якія ўхваляюць працу*

УЛАДЗЯ-МАЙСТРЫХА

Уладзя-майстрыха
Цацкі ўмее рабіць.
Бусла з пластыліну зляпіць,
Улітку, вугра, улюбёнага ў мора.
Чырвоныя яблыкі і памідоры.
А мышку зрабіла, дык Васька-каток
Угледзеў, схапіў — узяў у раток.
Уладзя смяялася, кот хваляваўся,
Пакінуў «здабычу»
І ў кут свой падаўся. *Аўяр'ян Дзеружынскі*

● Пра каго мы прачыталі верш? Пра дзяўчынку Уладзю-майстрыху. А яшчэ пра каго? Так, пра Ваську-катка. Што мы даведаліся пра Уладзю? Што яна ўмее ляпіць з пластыліну. Ці добрую яна зляпіла мышку? Чаму яе каток схапіў у раток? А што рабіла Уладзя-майстрыха, убачыўшы, як каток схапіў у раток мышку, якую яна зляпіла? А каток, мабыць, засаромеўся, што ён ашукаўся, не пазнаў, што мышка несапраўдная? Ну а цяпер пачнём вучыць верш на памяць.

● Паслухаем, а затым вывучым на памяць верш пра маміны рукі. Яны вас кормяць, апранаюць, абнімаюць. Яны вам радасць прыносяць. А для мам найбольшая радасць, калі іх дзеці — добрыя, шчаслівыя, прыгожыя, калі яны расцвітаюць кветкамі.

Слава маміным рукам,
Што работу любяць
І прыносяць сонца нам,
Ласкаю галубяць.

Слава маміным рукам!
Хай на ўсёй планеце
Кветкамі для мілых мам
Расцвітаюць дзеці. *Міхась Пазнякоў*

● Прачытаем верш пра Олю — малайчынку, працавітую дзяўчынку. Пагутарым, а потым пагуляем у тэатр. У нас будзе многа артыстаў, аж дванаццаць. Вам усім спадабаецца Оля, я так мяркую, і ўсім захочацца пра яе расказаць.

## ОЛІНЫ ГРАДКІ

1. Паглядзіце — наша Оля
Агарод так шчыра поле!

2. Гэта дзед на дачы ёй
Удзяліў участак свой.
Градкі роўныя малая
Там сама зрабіла ў маі.
Іх засеяла насеннем —
Хай расце на заглядзенне!

3. Оля градкі даглядала,
Іх палола, палівала.
І цяпер — зірні — парадак
У яе на кожнай з градак.

4. Там — раўнюткімі радкамі —
Боб, пятрушка з буракамі.
Там усё расце, буяе,
Хутка моцы набірае.

5. Вунь ужо праткнулі
Стрэлы вострыя цыбулі.

6. Паказала лісце блізка
Ля цыбулі і радыска.

7. Спрытна лезе ўжо на колік
Пакручастая фасоля.

8. Распусціўшы гожа хвосцік,
Кліча ўсіх і морква ў госці.

9. Раздуваюць кабачкі
Белаватыя бачкі...

10. Хто ні йдзе, ля агарода
Прыпыняецца заўсёды:

11. — І чые такія градкі,
Дзе расце ўсё без аглядкі?

12. — Гэта ж Олечка малая
Агародніца такая!
Гэта ўсё яна стараецца,
Каля градак завіхаецца.
Наша Оля — малайчынка:
Працавітая дзяўчынка! *Кастусь Цвірка*

● Вы бачылі плецены кошык? А навошта нам кошык? Хлопчык Алёша навучыў плесці кошык сваіх малодшых братоў. Яны ўтраіх пайшлі ў лес і там сплялі прыгожыя, зграбныя кошыкі. Як вы думаеце, што яны ў тых кошыках прынеслі з лесу? Вось мы прачытаем верш, з чаго і як плятуць кошык, а потым вывучым верш на памяць.

АЛЁШАЎ КОШЫК

— Для таго каб сплесці кошык,
Перш за ўсё патрэбен ножык.
Лепш складанчык вы бярыце
І на камні навастрыце.
Пасля гэтага, нарэшце,
Тонкае лазы нарэжце,
Два абручыкі вазьміце.
Што яшчэ? Устаўце рэбры,
А цяпер і плесці трэба, —
Навучае так Алёша
Двух братоў сваіх малодшых.
Кошыкі браты сплялі,
Утраіх у лес пайшлі.
Адвячоркам хлопцы з лесу
Ягад кошыкі прынеслі.
Самы поўны, самы большы —
У Алёшы. *Аляксей Пысін*

## ПРЫКАЗКІ

Прыказкі — неацэнны моўны скарб нацыі. Беларускі народ мае багатую моўную культуру, і гэта яе багацце, самабытнасць асабліва ярка выяўляюцца ў прыказках і прымаўках, якія адлюстроўваюць не толькі гісторыю, звычаі, быт, але і характар, душу народа. Вельмі важна зберагчы наш моўны скарб, захаваць і перадаць яго нашчадкам.

Абавязак выхавальніка — пазнаёміць дзяцей з прыказкамі і прымаўкамі. У яго для гэтага шмат магчымасцей.

Мудрыя па сэнсу, сціплыя, вобразныя, высокамастацкія па форме прыказкі і прымаўкі глыбока западаюць у душу дзіцяці. Яны лёгка запамінаюцца, упрыгожваюць мову таго, хто імі карыстаецца. І, самае важнае, як усё прыгожае, прыказкі выхоўваюць эстэтычнае пачуццё мо-

вы, любоў да яе. Апрача таго, прыказкі і прымаўкі вучаць дзіця вобразна думаць.

Аўтары выкарыстоўвалі прыказкі ва ўсіх раздзелах кнігі. У гэтым раздзеле прыказкі размеркаваны па тэмах для больш зручнага карыстання. Прапануем наступную методыку выкарыстання прыказак у выхаваўчай працы з дзецьмі.

### Дыялогі з прыказкамі ці прымаўкамі

● Я вам прачытаю кароткую размову, а вы скажаце, якую прыказку вы пачулі ў гэтай размове.

— Бабуля, навошта ты аддала маю ляльку Галінцы?
— У цябе пяць лялек, а ў Галінкі адна. І я памятаю, ты казала, што з гэтай лялькай больш не будзеш гуляць.
— А цяпер я хачу з ёю гуляць.
— Ай-яй-яй, як непрыгожа! Не шкадуй, унучка. *Дай, божа, даваць, а не прасіць.*

---

— Ты што гэта робіш з катом, Яська?
— Гуляю.
— Ты яго мучыш, тузаеш. Каб з табою так гулялі, ці добра было б табе?
— Нядобра.
— Ну дык вось: *не рабі другому, што не люба самому.*

---

— Мама, пашый маёй ляльцы сукеначку.
— Сама, дзяўчынка, паспрабуй.
— Я не ўмею.
— *Не святыя гаршкі лепяць.* Пастарайся і зробіш.

---

— Тата, давай пагуляем з табою ў шашкі.
— Я, сынку, заняты. Трэба кончыць працу.
— А мне сумна.
— Знайдзі сабе занятак. Памый свае насоўкі, шкарпэткі. *Хто працуе, той не сумуе.*

---

— Бабулька, ты казала, што мы пойдзем гуляць.
— Пойдзем, унучка, але скажы, ці памыла ты ўжо посуд?
— Я потым памыю.
— Не. *Адклад не ідзе ў лад.* Памый чысценька посуд, а тады і пойдзем.

---

— Мама, хутчэй канчай прасаваць, пойдзем у грыбы, а то сцямнее.

— *Спяшыць — людзей насмяшыць. Не глядзі, каб скора, а глядзі, каб добра.* Яшчэ паспеем і грыбоў назбіраць.

---

— Сёння ў нас у хаце *ні мукі пылінкі, ні солі драбінкі.*

— Я зараз, матуля, збегаю ў краму і ўсё, што трэба, куплю.

---

— Пад'еў, сынку? Цяпер ідзі травы нарві і свіней накармі.

— Я то *ўсё з'еў і зубоў не пагрэў.*

— Няўжо не пад'еў? Дык я зараз дам табе дабаўкі.

---

— Добры дзень вам! Як гадуецеся?

— А нічога. *Жывём, хлеб жуём!* А ты ці здаровы?

— *Я здаровы, як рыжок баровы.*

---

— Ты, хлопча, пачакай. Я разбагацею і тады куплю табе гармонік і скрыпку.

— Дзядзька Піліп, вы ж не любіце працаваць. *Тады вы будзеце багаты, калі парсюк будзе рагаты.*

---

— Ты пад'еў, Васілёк?

— Дзякую, з'еў кашу — пацеху нашу. І запіў малаком.

— Бачу, бачу. *Як наеўся і напіўся, дык і добранькі зрабіўся.* А цяпер бярыся за працу.

---

— Пара, Алінка, пара абедаць. Мый рукі і сядай за стол.

— Мама, *абед не заяц, у лес не ўцячэ.*

---

— Бабуля, мне цёмна. Запалі святло, а то есці нязручна.

— Хопіць святла. *Міма рота лыжку не носяць.*

---

— Хутчэй, хутчэй, бабуля, а то спознімся.

— Не спяшы. Добранька апраніся. Завяжы шалік. Зашпілі гузікі.

*«Не завязаўшы аборы, не спяшы да Тадоры»,* — гаварыла мая мама.

● Якую прыказку вы б хацелі запомніць і расказаць сваёй маме, тату, дзядулю, бабулі?

*Лепш сто сяброў, як сто рублёў.*
*Не зыч ліха другому, каб не давялося самому.*
*З кім пазнаешся, такім і станешся.*

*У суседстве жыць — адзін аднаму служыць.*
*У дзіравым вядры не носяць вады.*

● Цікава, якая прыказка вам найбольш спадабаецца.

*Прыйдзе тая нядзеля, што і ў мяне будзе вяселле.*
*Сем разоў адмер, адзін раз адрэж.*
*Хто вінен, аддаць павінен.*
*Дзякуй, як дасі, а калі не дасі, то й сам не прасі.*

● Паслухайце прыказкі аднолькавыя па значэнню. Што яны значаць, пра што нам кажуць? Цікава жыць на свеце, але складана. Бывае вельмі цяжка. Якая з прыказак найбольш падабаецца вам?

*Жыць — не мех шыць.*
*Век пражыць — не кашулю пашыць.*
*Жыццё пражыць — не лапці сплесці.*
*Век звекаваць — не пальцам паківаць.*
*Век пражыць — не мора пераплыць.*

● Цікава ведаць, ці падобныя вось гэтыя прыказкі? Чаму яны нас вучаць? Ці добра, калі чалавек шмат гаворыць?

*Пяць разоў падумай, адзін скажы.*
*Менш гавары, больш пачуеш.*
*Трымай язык на прывязі*
*Гавары, што ведаеш, але ведай, што гаворыш.*

● Ці падобныя вось гэтыя прыказкі? Што яны значаць? Як чалавеку лягчэй жыць: аднаму ці разам з іншымі людзьмі? Як лягчэй рабіць? Аднаму ці ў калектыве, сям'ёй, гуртам, талакой?

*Адзін у полі не воін.*
*Адзін дуб у полі, то не лес.*
*Адна пчала мёду не наносіць.*
*Адна галавешка не гарыць, а толькі тлее.*

● Прыказкаю можна ахарактарызаваць чалавека, сказаць, які ён: добры ці дрэнны, гультаяваты ці працавіты, няўмека ці майстра, марудны ці жвавы. Прыказка паказвае якасці чалавека.

Вось паслухайце і скажыце, пра якога чалавека гэтыя прыказкі: пра гультаяватага ці працавітага?

*На яду мастак, а да работы сяк-так.*
*Есць за вала, робіць за камара.*
*Як зачэпіцца за пень, дык і прастаіць цэлы дзень.*
*Многа робіць языком, ды мала рукамі.*
*Ён і муху з носа не згоніць.*

● Падумайце, калі ласка, а гэтыя прыказкі пра якога чалавека: пра недарэку, няўдаліцу, ці пра спрытнага, стараннага работніка.

*Ласы ля гатовага вогнішча рукі пагрэць.*
*Зрабіць і сам зробіць, толькі перарабляць просіць.*
*За сто работ бярэцца, а ні адна не ўдаецца.*

● Пра каго ідзе гаворка ў гэтых прыказках: пра маруду ці жвавага спрытнага чалавека?

*Пакуль адзін бок абстрыжэ, дык другі абрасце.*
*Як ляжа спаць, дык забудзецца ўстаць.*
*Пашлі дурнога, за ім другога.*

● Ці добры чалавек, які разважае такім чынам?

*Абы сабе добра, а там хоць трава не расці.*
*Па маёй смерці, няхай тут хоць ваююць чэрці.*
*Што тваё, то й маё, а што з майго, то табе не да таго.*
*Ён любіць толькі самога сябе і то толькі адзін раз у год.*

● Скажыце, калі ласка, ці падабаецца вам упарты чалавек, пра якога складзены вось гэтыя прыказкі.

*Яго не ўпросіш ні просьбаю ні грозьбаю.*
*Горды ды ўпарты — нікуды не варты.*

● Ці хацелі б вы быць такім чалавекам, пра якога гавораць вось гэтыя прыказкі?

*Малады верабей, ды спрытны.*
*Нікому вады не замуціць.*
*Такі вёрткі, што ў ступе таўкачом не пападзеш.*
*Як кот шкадлівы, а як заяц баязлівы.*
*У яго і ўзімку лёду не дастаць.*
*Фарсун, што тычкай носа не дастаць.*

● Ці добра так рабіць? Якія людзі так робяць? Неспагадлівыя? Незычлівыя? Несумленныя?

*Сваё хваліць, а чужое пад плот валіць.*
*Выхваляўся пустак, ды не зрабіў ніяк.*
*Ласы на чужыя каўбасы.*

● Вытлумачыць гэтыя прыказкі нам дапамогуць пытанні.

*Агарод любіць гарбатую бабу.*

Чаму? Што гэта за баба гарбатая? Як мы працуем на агародзе: стоячы ці сагнуўшыся? Хто найбольш працуе на градах — поле, матыкуе, садзіць: мужчына ці жанчына?

*Садок летам, што кажух зімою.*

Ці любім мы садок летам? Што мы робім летам у садку? Чаму мы любім садок летам? Ці любім мы кажух зімою? Чаму мы любім кажух зімою?

*Хто есці хоча, той мусіць быць у поце.*

Што трэба рабіць, каб было што апранаць, есці? Працаваць. Як працаваць? Старанна? Рупліва? Многа? А калі чалавек працуе вельмі старанна, калі завіхаецца за работай, дык і потам абліваецца.

*Паспрачаліся за мех, а ў мяху смех.*

Ці можа быць у мяшку смех? А што было ў мяшку? Нічога. Дык за што яны спрачаліся? За вартае што-небудзь ці за дробязь, глупства? А цяпер скажыце, калі мы ў размове можам сказаць гэту прыказку.

● Паслухаем і пагутарым. Перш чым я скажу вам прыказку, трошкі пагутарым.

Чалавеку вельмі патрэбны прыяцель, блізкая, родная душа, той, хто б цешыўся з ім разам у радасці і спачуваў у бядзе. А як заслужыць такія адносіны да сябе? Сваёй дружбай, дабрынёй, спачуваннем. Ёсць такая прыказка: *«Прыяцеля за грошы не купіш»*.

Для гутаркі можна выкарыстаць такія прыказкі.

*Работа і корміць і поіць.*
*Хто працуе, той не сумуе.*
*Дай кароўцы бурачка, дасць кароўка малачка.*
*Дарагая тая хатка, дзе радзіла цябе матка.*
*Як ты да людзей, так і людзі да цябе.*
*Ласкавае слова, што веснавы дзень.*
*Які дубок, такі клінок, які бацька, такі сынок.*
*Хто пытае, той шмат знае.*
*Ад ляноты чакай бядоты.*
*Сам сябе не хвалі, няхай людзі пахваляць.*

● Знайдзі адказы на гэтыя пытанні.

Ці закрыеш дурную галаву шапкаю? ***(Дурную галаву шапкаю не закрыеш.)***

Што страшней згубіць: розум, здароўе ці грошы? ***(Грошы згубіў — нічога не згубіў, здароўе згубіў — палавіну згубіў, розум згубіў — усё згубіў.)***

Ці бывае вялікі дуб з малым карэннем? ***(Вялікага дуба з малым карэннем не бывае.)***

Што лепш, павага ці знявага? ***(Лепш павага, як знявага.)***

● Гэтыя пытанні нам дапамогуць скласці прыказкі і прымаўкі. Давайце паспрабуем адказаць на іх разам. Гэта так цікава!

Ці заснеш, не заплюшчыўшы вочы?

Ці трэба адкладваць на заўтра тое, што можна зрабіць сёння?

Ці дружыць агонь з вадою?

Ці можа быць ад малой іскры вялікі пажар?

Ці бачыць сава ўначы?

Ці бывае ягада без кветак?

Што лягчэй зрабіць: зламаць ці наладзіць?

Ці грэе вушы абяцаная шапка?

Ці астрыжэш голую авечку?

Што лягчэй: добра работу рабіць ці ў далоні пляскаць?

Ці сена ідзе да казы, ці каза ідзе да сена?

Ці напхаеш дзіравы мяшок?

Ці напоўніш бяздонную бочку?

Што бачыць далей: вока ці розум?

Ці можна купіць розуму?

Без чаго горш: без розуму ці без здароўя?

Ці льюць ваду ў калодзеж? А ў лес дровы возяць?

Ці можна з быка надаіць малака?

Ці вялікі звер для мышы — кот?

Ці наносіш ваду ў дзіравым вядры?

Ці вычарпаеш лыжкаю мора?

Ці можна верыць казлу ў капусце, а ваўку ў авечках?

Ці можна выкруціць ваду з сухой анучы?

Ці можна насіць агонь у шапцы?

Ці накорміш каня з кішэні?

Хто ўзімку галадае: той, хто летам халадку шукае, ці той хто не шукае?

Што лягчэй зрабіць: з'есці яблык ці вырасціць яблыню?

Ці адплацяць нам птушачкі вясною, калі мы іх пакормім зімою?

Ці лёгка зашпіліць гузік адным пальцам?

Ці рада птушка вясне, а дзіця маці?

Ці добра таго вучыць, хто хоча ўсё ведаць?

Ці ўсё тое золата, што блішчыць?

## ГУЛЬНІ

Гульня для дзіцяці — гэта захапляючы занятак, які прыносіць шмат радасці, задавальнення. Усе дзеці — больш і менш здольныя, больш і менш развітыя — могуць і ўмеюць прымаць удзел у гульнях як роўныя. Гэта пачуццё роўнасці, адчуванне свайго актыўнага, мэтанакіраванага ўдзелу ў дзеянні, надзея на выйгрыш даюць дзіцяці стымул пераадолець сарамлівасць, няўменне гаварыць на мове, якую яно дрэнна ведае і недастаткова добра засвойвае ў працэсе навучання. Дзеці звычайна спаборнічаюць у гульні, а жаданне стаць пераможцам мабілізуе думку, маўленчыя навыкі і ўменні ўдзельнікаў гульні. Таму мы не можам не звяртаць увагі на багатыя магчымасці гульні ў вывучэнні мовы. У гульні дзеці вучацца мове радасна. А гэта вельмі многа. Апрача таго, ёсць народныя гульні, якія знаёмяць дзяцей з бытам, культурай беларускага народа. Пра гэта таксама варта памятаць.

Выхаваўчы эфект гульні залежыць ад атмасферы, якую стварае педагог, ад яго актыўнага ўдзелу ў гульні, ад яго эмацыянальнасці. Яшчэ важна памятаць аб пачуцці меры. Нават самыя цікавыя гульні не варта зацягваць, інакш дзеці зморацца. Пераможцаў карысна адзначыць пахвалой, падарункам.

### Што гэта?

Выхавальнік прапануе пагуляць у настаўніка і вучняў. Паказвае, напрыклад, малюнак алоўка і пытаецца:

— Скажыце, калі ласка, што гэта такое?

— Гэта аловак.

Педагог паказвае іншыя рэчы або малюнкі і кожны раз задае адно і тое ж пытанне. Нарэшце ён кажа:

— Я ўжо стамілася вас пытаючы. Хто мне хоча дапамагчы? Хто будзе настаўнікам?

Безумоўна, жадаючых шмат. Тады педагог прапануе:

— Давайце падзелімся на дзве каманды — каманду настаўнікаў і каманду вучняў. Лепшая каманда (я буду суддзёй) атрымае прыз.

## Што ў маёй торбачцы?

— Дзеці, прыгадаем, якія рэчы бываюць у кухні: на стале, на сцяне, у шафцы, у халадзільніку. Кожны з вас называе адну рэч. Не паўтарайце таго, што скажа ваш сябра. Хто памыліцца — паўторыць назву рэчы, назаве тое, чаго ў кухні не бывае, альбо нічога не скажа, дае фант, а ў канцы гульні мы яму прысудзім выкуп. (Дзеці называюць: вазон, люстэрка, апалонік, абрус, сурвэткі, ножык, відэльцы, лыжкі, ваза, кветкі, соль, цукар, мука, масла, мяса, вяршкі, сода, воцат, цукеркі, мука.)

А цяпер глядзіце: у мяне поўная торбачка рэчаў. Я буду пытацца, а вы адказваць. Што ў маёй торбачцы?

— Сурвэткі.

— Так. У маёй торбачцы ёсць сурвэткі. А што яшчэ ёсць у маёй торбачцы? (Дзеці называюць розныя прадметы.) А цяпер суддзя праверыць маю торбачку, і калі ў ёй не будзе таго, пра што я сказала «ёсць», дык вы прысудзіце мне выкуп.

## Дзе мой аловак?

— Я згубіла аловак. Хто мне дапаможа знайсці яго? Хто падкажа, дзе ён можа быць? Як ты думаеш, Петрусёк?

— Можа ён у сумцы?

— Зараз пабачым. Не, няма там.

— Можа ён у кішэні? (На стале, у кніжцы, пад сталом, пад газетай, пад часопісам, на падлозе.)

— Малайчына, Жэнік. Ты мне дапамог знайсці аловак. табе за гэта цукерка!

## Што можна зрабіць з кнігай?

— Раздзелімся на дзве каманды. Выйграе каманда, якая прыдумае больш адказаў. Калі вы будзеце затрымлівацца з адказам, я ціхенька падкажу адным словам, а вы адкажаце цэлым сказам. Добра?

— Дзеці, што можна зрабіць з кнігай? (Чытаць.)

— Кнігу можна чытаць. (Узяць у рукі.)

— Кнігу можна ўзяць у рукі. (Пакласці ў партфель.)
— Кнігу можна пакласці ў партфель. (Разгарнуць.)
— Кнігу можна разгарнуць. (Загарнуць.)
— Кнігу можна загарнуць. (Напісаць.)
— Кнігу можна напісаць.
— Што можна зрабіць з мячыкам (з лялькай, з вадою, з кветкай і г. д.)?

За кожны правільны адказ каманда атрымлівае ачко.

### Без чаго людзі не могуць жыць?

Дзве каманды набіраюць ачкі за адказы на пытанні.
— Без чаго людзі не могуць жыць? (Без вады.)
— Людзі не могуць жыць без вады. (Без паветра.)
— Людзі не могуць жыць без паветра. (Без ежы.)
— Людзі не могуць жыць без ежы. (Без агню.)
— Людзі не могуць жыць без агню. (Без цяпла.)
— Людзі не могуць жыць без цяпла. (Без хаты, без дамоў.)
— Людзі не могуць жыць без дамоў. (Без працы.)
— Людзі не могуць жыць без працы.

### Адгадай!

Вы паміж сабою, каб я не чула, дамовіцеся, якую жывёліну мне загадаць. А я буду ўгадваць. Калі я адгадаю, вы мяне пахваліце, а калі не — прысудзіце мне выкуп.

— Гэта жывёліна поўзае?
— Не, не поўзае.
— Гэта жывёліна лятае?
— Не, не лятае.
— Гэта жывёліна бегае?
— Так, бегае.
— Гэта жывёліна есць траву?
— Так, есць.
— Гэта жывёліна палохаецца, як убачыць мяне?
— Не, не палохаецца.
— Гэта жывёліна жыве ў хляве?
— Так.
— Гэта жывёліна дае нам малачко?
— Так.
— Карова?
— Малайчына!

## Карагодная гульня «Маша»

Усе становяцца ў кола, пасярэдзіне знаходзіцца Маша з завязанымі вачамі. Дзеці прыгаворваюць:

Маша, ты пацеха наша!
Ручкі з золата, ножкі з долата,
Валасы кудлатыя, а вочы зыркатыя.

Маша хапае каго-небудзь з кола і спрабуе адгадаць, хто гэта. Калі яна адгадае імя дзіцяці, той становіцца Машай, калі не — працягвае лавіць дзяцей і адгадваць іх імёны.

## Хто ляціць?

Усе дзеці ставяць указальныя пальцы на стол у адно месца. Выхавальнік кажа: «Гусі ляцяць?» — і паднімае рукі ўгару, паказваючы, як ляцяць гусі. Дзеці адказваюць: «Ляцяць!» — і таксама паднімаюць рукі.

— Качкі ляцяць?
— Ляцяць!
— Вераб'і ляцяць?
— Ляцяць!
— Самалёт ляціць?
— Ляціць!
— Рыбка ляціць? (Бусел, жаба, вавёрка, матыль, малпа.)

Захапіўшыся гульнёй, дзеці часта адказваюць: «Ляціць!» — і паднімаюць рукі.

Выхавальнік спыняе іх і кажа:

— Не ляціць, не ляціць!

Гульню трэба закончыць тады, калі ўвага дзяцей аслабне і яны пачнуць як папала паднімаць рукі.

## Абярніся!

Дзеці становяцца ў кола, бяруцца за рукі і прыгаворваюць:

Топ, гоп, гоп!
На пагорку чабор.
На чабары — сучок.
Ля сучка-драпачка
Залаты мухамор.
А пагорак круты.
Абярніся, Юрась, ты!

Пры слове «гоп» усе прысядаюць. Юрась (дзіця, імя якога назвалі) пасля апошніх слоў паварочваецца спінай

да кола. З гэтай прыгаворкай звяртаюцца да кожнага. Гульня працягваецца, пакуль усе не павернуцца спінай да цэнтра кола.

### Каго няма?

У радок ставяцца крэслы. Дзеці садзяцца на іх. Адзін з удзельнікаў гульні ўстае, уважліва глядзіць на ўсіх, каб запомніць, дзе хто сядзіць, і кажа:

Я устану, вокам гляну
І запомню, хто дзе сеў.
Памяць маю, адгадаю,
Хто пакінуць месца ўспеў.

Потым ён выходзіць за дзверы. У другія дзверы выходзіць хто-небудзь з удзельнікаў гульні. Вяртаецца той, хто павінен адгадаць, каго няма. Калі адгадае, то садзіцца на месца, а адгадвае той, хто хаваўся.

Калі дзіця марудзіць з адказам, то яму дапамагаюць, называючы, у што апрануты той, хто хаваецца.

### Палачка-шукалачка

Па лічылцы дзеці выбіраюць таго, хто будзе ўсіх шукаць — шукальніка. Яму завязваюць вочы. Удзельнікі гульні хаваюцца хто куды. Калі ўсе схаваюцца, шукальнік на ўмоўленым месцы стукае палачкай і голасна гаворыць:

Палачка-шукалачка,
Я іду шукаць.
Каго я першага знайду,
Таго за палачкай пашлю!

Пасля таго як усе будуць знойдзены, месца шукальніка займае той, каго знайшлі першым. Гульня працягваецца.

### Гарлачыкі

Дзеці выбіраюць матку і ката. Потым усе садзяцца на падлогу, а матка гаворыць кату: «Глядзі ж, кот: я пайду ў поле на работу, а ты вартуй тут гарлачыкі, каб ніхто іх не перакуліў».

Матка адыходзіць, а кот абыходзіць сядзячых дзяцей і гаворыць, па чарзе звяртаючыся да кожнага і дакранаючыся да яго: «Гэта смятанка!», «Гэта сыроватка», «Гэта тваражок!», «Гэта вяршкі», «Гэта кісляк» і г. д.

Вяртаецца матка, бачыць перакуленыя гарлачыкі і ловіць ката (кот стараецца ўцячы). Калі зловіць, карае яго: «Не чапай смятанкі! Не бі гарлачы!» Выбіраюцца другія кот і матка.

## Баба Яга

З удзельнікаў гульні выбіраюць Бабу Ягу. На зямлі праводзяць лінію. Усе стаяць па адзін бок лініі, Баба Яга — насупраць. Дзеці хорам прыпяваюць:

Бабы Ёжкі не баюся,
Чапялой адбаранюся!
Ёсць у мяне спрыт і сіла,
Баба Ёжка мне не міла!

Потым бягуць насустрач Бабе Язе. Тая іх ловіць. Каго зловіць, той становіцца Бабай Ягой. Гульня працягваецца.

## Кот Апанас

Развучваецца лічылка. Пад яе дзеці лічацца і выбіраюць ката. Яму завязваюць вочы і вядуць (абавязкова ўсе) да дзвярэй. Кот бярэцца за ручку дзвярэй, а ўдзельнікі задаюць яму пытанні:

— Кот, кот, на чым стаіш?
— На дубе!
— За што трымаешся?
— За сук!
— Што на суку?
— Вуллі!
— Што ў вуллях?
— Пчолы!
— Што ў пчолах?
— Мёд!
— Каму ды каму?
— Пані ды пану.
— А нам што?
— Смала на лапаце!

Тады ўсе лёгенька ляпаюць ката па спіне пад такт песенькі:

Апанас, Апанас,
Твая жонка ў нас.
Увалілася ў квас.
Лаві сем год нас!

З апошнімі словамі ўсе ўцякаюць ад ката. Замяняе ката першы, каго ён зловіць. Гульня паўтараецца.

### Дзед і баба

Дзеці выбіраюць дзеда і бабу. Дзед садзіцца вярхом на палку, а баба і астатнія ўдзельнікі гульні адзін за адным садзяцца на падлогу: дзеці наперадзе, баба ззаду. Усе моцна трымаюць адзін аднаго пад пахі. Дзед аб'язджае ўсіх са словамі:

Еду, еду каля дзеда,
Еду, еду каля бабы,
Каля бабы, каля старэнькай.

Затым прыпыняецца каля пачатку рада, і, стукаючы палкай, пытае:

— Ці ёсць гаспадар у двары?

— А што табе?

— Свінні ў гародзе!

— Ну, выгані іх!

— А ці дазволіце рэпку вырваць?

— Ды рві сабе, толькі выгані!

Тады дзед дакранаецца палкай да пляча таго, хто сядзіць першым, і гаворыць:

— Юсь, вон! Юсь, вон! Мне пакіньце хоць адну рэпку!

Кідае палку, хапае першага за рукі і цягне да сябе. Другія яго не пускаюць. Дзед вырывае гэту «рэпку», садзіць яе асобна, а сам зноў пачынае аб'язджаць гульцоў з той жа песняй. Пасля просьбы рэпку вырваць дзеці пытаюць дзеда:

— А дзе ж ты тую падзеў?

Дзед прыдумвае розныя адказы («А вось, як ехаў цераз масток, чорт схапіў кабылу за хвасток, тады я яму рэпіну і кінуў»).

— Ну, вырві сабе.

Дзед пачынае цягнуць рэпку, а калі яму цяжка, то кліча на дапамогу таго, каго выцягнуў раней. Разам яны выцягваюць другую рэпінку. Гульня працягваецца, пакуль дзед не перацягне ўсіх яе ўдзельнікаў.

### Лянок

Дзеці выбіраюць бабулю і становяцца ў кола, бабуля ў цэнтры яго. Хорам дзеці пытаюць:

— Што ты, бабуля, нам прасці дасі?

Бабуля адказвае:

— Старым бабулькам воўны пасмачку,
А прыгожым маладзічкам белы лянок!

Пасля гэтага ўсе разам — і дзеці і бабуля — гавораць паўтараючы дакладна ўсе дзеянні бабулі:

А мы сеялі, сеялі лянок,
Белы, слаўны кужалёк!
Урадзіўся, наш лянок!
Урадзіўся, кужалёк!

Мы лянок ірвалі, жалі,
Абразалі, ў полі слалі,
У снапочкі абіралі...
Урадзіўся лянок
Белы, слаўны кужалёк.

### Дзядуля-ражок

Дзеці выбіраюць важака і называюць яго Дзядуля-ражок. У баку ад пляцоўкі абазначаюць для яго домік, падзяляюцца на дзве роўныя групы. Па абодва бакі ад дзядулевай хаткі, на роўнай адлегласці, абазначаюць свае домікі. Месца паміж двума домікамі называецца полем. Дзеці размяшчаюцца ў сваіх доміках, а Дзядуля-ражок у сваім, і гульня пачынаецца. Дзядуля-ражок глядзіць направа, потым налева і крычыць:

— Хто мяне баіцца?

Дзеці разам адказваюць:

— Ніхто!

Пасля гэтага яны перабягаюць цераз усё поле са свайго доміка ў другі. Бягуць і крычаць:

— Дзядуля-ражок
З'еў чужы піражок!

Дзядуля-ражок выбягае са свайго доміка і стараецца злавіць як мага больш дзяцей. Першы, каго ён зловіць, становіцца яго памочнікам і разам з ім ловіць астатніх.

## ПАЧЫТАЕМ, ПАСЛУХАЕМ

Дзеці любяць слухаць. Слухаць, як спяваюць песні. Слухаць, як апавядаюць пра што-небудзь цікавае. Слухаць, як ім чытаюць казкі, паданні, легенды, гісторыі пра сумленных, добрых людзей. Дзеці слухаюць, перажываюць

і суперажываюць таму, што адбываецца ў апавяданнях. Яны вучацца быць чулымі, добрымі, разумнымі.

У гэты раздзел увайшлі маленькія гісторыі, якія аўтары чулі ці чыталі некалі даўно. Тут можна знайсці апавяданні нашых старэйшых пісьменнікаў і творы нашых сучаснікаў, легенды са зборніка «Легенды і паданні» (Мн.: Навука і тэхніка, 1983). І безумоўна, не абмінуты ўвагай казкі, якія перадаваліся з вуснаў у вусны і якія збіралі і запісвалі руплівцы беларускай культуры.

---

● Я вам раскажу пра Галінку, вясковую дзяўчынку, пра Кральку, яе ляльку і пра Таку, яе сабаку. Дык колькі іх было? Так, іх было трое.

## АДНОЙЧЫ КАЛЯ РЭЧКІ

У Галінкі не было ні брацiка, ні сястрычкі. У яе было двое сяброў: Кралька і Така. Кралька — гэта Галінчына лялька, а Така — Галінчын сабака. Галінка сама прыдумала ім імёны, сама іх даглядала. Усе трое яны былі добрыя сябры.

Кралька — вялікая лялька. Така — вялікі сабака. Ён дужы і спрытны. Яны ўсе трое разам гуляюць у хаце. Разам гуляюць у двары. Разам гуляюць на полі. Разам гуляюць на рэчцы.

Аднойчы, у аўторак гэта было, пайшлі яны ўсе трое на рэчку. Галінка ўбачыла на беразе прыгожыя кветкі, і ёй захацелася нарваць іх і занесці сваёй матулі. Яе мама любіла кветкі, а Галінка любіла матулю і заўсёды хацела зрабіць ёй што-небудзь прыемнае.

Галінка сарвала некалькі кветак і хацела сарваць яшчэ адну, апошнюю, але паслізнулася і ўпала ў рэчку. Сабака Така — гоп! следам за ёй у рэчку, хоп! — схапіў яе за сукенку і выцягнуў з вады. Села Галінка каля дрэва, азірнулася і ўскрыкнула: «А дзе ж Кралька, мая лялька? Дзе яна?» Сабака Така зірнуў туды-сюды, скокнуў у ваду і паплыў наўздагон за Кралькай. Праз хвілінку ён ужо вяртаўся з лялькай Кралькай. Прынёс яе ў сваіх моцных зубах і паклаў каля Галінкі. Сам задаволены, язык высунуў, хвосцікам махае...

А цяпер давайце пагаворым пра Галінку, яе сяброў і пра нас саміх. Якія сябры былі ў дзяўчынкі? Ці любіла яна іх? Каго яшчэ любіла Галінка? Чаму яна

хацела падараваць кветкі маме? Як сабака Така вы-ратаваў Галінку? Каго ён яшчэ выратаваў? Ці хацелі б вы мець такога сабаку, як Така?

А можа мы зробім малюнкі да гэтага апавядання? Каго мы будзем маляваць? Галінку? Сабаку Таку? Лялъку Кральку? А што яшчэ мы можам намаляваць? Рэчку? Кветкі? Дрэва?

Мы пачулі апавяданне пра дружбу, пра верных сяброў. А цяпер давайце паслухаем прыказкі пра дружбу:

*Чалавек без друга, што яда без солі.*

*Птушка моцная крыламі, а чалавек дружбай.*

*Той не можа быць другам, хто ў бядзе абыдзе кругам.*

● Паслухайце, калі ласка, пра котку, сабачку, курку і мышку. А потым мы будзем гуляць у тэатр.

### КОТКА-МУРМОТКА

Яна заглядае ў вочы кожнаму, хто праходзіць міма яе. І кожны, хто міма яе праходзіць, пытаецца: «Котка, чаго ты хочаш?» Котка-Мурмотка кажа: «Я хачу мець сябра». Сабака Лыска спыняецца каля коткі і пытаецца:

— Можа, я буду тваім сябрам, Котка-Мурмотка?

— Праспявай мне сваю песню, калі ласка, — просіць Котка-Мурмотка.

— Гаў! Гаў! Гаў! — спявае сабака Лыска.

— Мне не падабаецца твая песня, — кажа Котка-Мурмотка. — Мне не хочацца, каб ты быў маім сябрам.

Чорная Курка-Шчабятурка спыняецца каля Коткі-Мурмоткі і цікавіцца:

— Можа, я буду тваім сябрам, Котка-Мурмотка?

— Праспявай мне сваю песню! — кажа ў адказ Котка-Мурмотка.

— Ко-ко-ко!

— Мне не падабаецца твая песня. Мне не хочацца, каб ты была маім сябрам.

Мышка-Карантышка, убачыўшы Котку-Мурмотку, спыняецца каля яе і кажа:

— Можа, я буду тваім сябрам, Котка-Мурмотка?

— Праспявай мне сваю песню, калі ласка, — просіць Котка-Мурмотка.

— Пі! Пі! Пі!

— Мне падабаецца твая песня. Давай будзем сябраваць.

— Вось добра! — кажа Мышка-Карантышка. — Будзем сябраваць. Будзем весела гуляць!

Пагаворым крыху. Што вы скажаце пра Мышку? Ці разумная яна? Ці не занадта даверлівая? А Котка-Мурмотка вельмі хітрая, праўда? Ашукала Мышку-Карантышку. А можа яны пасябруюць? Як вы думаеце?

А цяпер пагуляем у тэатр. Хто з вас будзе Коткай-Мурмоткай? Хто сабакам Лыскай? Хто будзе Куркай-Шчабятуркай? А хто хоча быць Мышкай-Карантышкай?

● Праслухайце гісторыю пра сабаку і кацянятак.

## САБАКА І КАЦЯНЯТЫ

У двары жыве сабака. У двары стаіць скрыначка. У ёй ляжаць два шчаняткі — дзеткі сабакі. У гэтым самым двары жыве котка. Непадалёк ад скрыначкі, дзе ляжаць шчаняткі, стаіць кошычак. У гэтым кошычку ляжаць тры кацяняткі.

Аднойчы, было гэта ў канцы лета, котка пайшла з двара і болей не вярнулася.

«Дзе наша мама?» — пытаюцца кацяняткі і пачынаюць плакаць. Яны маленькія, але ўжо ведаюць, што «без роднай мамачкі заклююць галачкі». Яны плачуць і плачуць.

Пачуў іх плач сабака. Сціснулася ў яго сэрца ад жалю. Пашкадаваў сабака маленькіх кацянятак. Падышоў ён да кошычка і кажа: «Не плачце, кацяняткі-немаўляткі, я вам дапамагу». І хоць ведаў сабака, што «дзетак узгадаваць — не грыбкоў назбіраць», але вырашыў не кідаць у бядзе кацянятак-немаўлятак.

Узяў сабака адно кацянятка з кошычка і прынёс яго ў скрыначку, дзе ляжалі яго шчаняткі. Маленькае кацянятка нясмела зірнула на шчанятак, маленькія шчаняткі прыязна агледзелі кацянятка.

А сабака зноў пайшоў да кошыка, узяў другое кацянятка і паклаў у скрыначку, дзе ляжалі, прыглядаючыся адзін да аднаго, двое шчанят і кацянятка-немаўлятка. «Цяпер вы ўсе, чацвёра, мае дзеці, — сказаў сабака. — Я — ваша мама, а вы ўсе браты і сёстры. Гуляйце дружненька. Не

крыўдзіце адзін аднаго. Дапамагайце адзін аднаму. Любіце адзін аднаго».

Ці сціхлі плакаць кацяняткі? Чаму яны больш не плакалі? Можа, таму, што ў іх паявілася мама і два брацікі? Ці ведаюць яны, што «ў каго ёсць матка, у таго галоўка гладка»? Што значыць гэта прыказка?

Ці палюбілі вы сабаку? Давайце разам прыдумаем яму прыгожае імя. Хто першы прапануе яму імя? За што мы палюбілі сабаку? За яго дабрыню? Шчырае сэрца? Спагаду да няшчаснага?

### ШАКАЛАДНЫ МЯДЗВЕДЗІК

Уладзік — маленькі хлопчык. Ён вельмі любіць усё салодкае. Асабліва яму даспадобы шакалад.

Неяк летам Уладзікава мама дастала з сумкі маленькую каробку і спыталася:

— Уладзік, як ты думаеш, што ў гэтай каробачцы?

— Шакалад! Шакалад!

Уладзіку вельмі хацелася, каб гэта быў шакалад. Мама ўсміхнулася і кіўнула галавой:

— Так, гэта шакалад. Шакаладны мядзведзік. Во, паглядзі, які ён!

— Мамачка, дай мне! Я яго не буду есці. Пакладу ў каробачку, а яе схаваю ў сваю скрынку з цацкамі і буду ім любавацца. Адчыню, зірну і зноў схаваю.

— Добра, Уладзік, — сказала мама і аддала яму шакаладнага мядзведзіка.

Уладзік паглядвае і паглядвае на мядзведзіка. Не можа наглядзецца. А з'есці яго так хочацца!

— У цябе, шакаладны мядзведзік, вялікія вушы, — кажа Уладзік і адкусвае шакаладныя вушкі. — Цяпер я пакладу цябе ў каробку.

Але ён раз за разам адчыняе каробку і зноў паглядвае на мядзведзіка.

— У цябе, шакаладны мядзведзік, доўгія ногі, — кажа Уладзік і адкусвае шакаладныя ногі. — Цяпер я пакладу цябе на месца.

Але ён не кладзе яго ў каробачку. Глядзіць, глядзіць, а тады і кажа:

— Мой ты мядзведзік, бязвухі, бязногі, вельмі ты смешны. Я цябе з'ем!

І Уладзік даядае свайго мядзведзіка.

А ты, Іванка, зрабіў бы як Уладзік, ці трымаў бы мядзведзіка ў каробцы? А ты, Юлік? А што было б, калі б Уладзік не з'еў свайго мядзведзіка ў той гарачы летні дзень? Як вы думаеце?

Мне здаецца, Уладзікава мама ведала, што яе сынок — ласунок, што ён не вытрымае і хутка з'есць шакалад. А вам як здаецца? Уладзік, пэўна, не ведаў прыказкі: «На хаценне ёсць цярпенне». І добра, што не ведаў, бо цярпеў бы, а шакалад тым часам растаў бы і сапсаваўся.

## МАЛЕНЬКАЕ КАЦЯНЯТКА

Маленькае Кацянятка глянула на свае лапкі і сказала: «Мамачка, зірні на мае чатыры маленькія лапкі. Адна, дзве, тры, чатыры! Што я магу рабіць імі?»

А мама кажа Кацянятку: «Ах ты маё дурненькае Кацянятка, ты ж можаш бегаць сваімі лапкамі!»

І Кацянятка-немаўлятка пабегла, пабегла...

На наступны дзень Кацянятка дакранулася лапкаю да сваіх вочак і сказала: «Мамачка, зірні на мае два вочкі. Адно, два! Што я магу імі рабіць?»

А мама-котка кажа: «Ах ты, маё дурненькае Кацянятка, ты ж можаш глядзець і бачыць сваімі вочкамі!»

І Кацянятка-немаўлятка глянула вакол: спачатку ў адзін бок, тады ў другі, а потым наперад і назад і кажа: «Так, так. Я магу глядзець вачамі і бачыць усё вакол. Я бачу цябе, мая прыгожая мамачка. Я бачу жоўценькіх куранятак. Я бачу маленькую шэранькую мышку. Вунь яна! Яна ў куточку».

● А цяпер пагутарым з вамі.

Ці спадабалася вам Кацянятка? Мне яно спадабалася, бо яно цікаўнае. Усім цікавіцца. Пытаецца, бо хоча ўсё ведаць. Прыказкі кажуць: «Добра вучыць таго, хто хоча ўсё ведаць», «За запытанне не страціш ні абеду, ні снядання». Вось і наша Кацянятка запыталася ў сваёй матулі і цяпер будзе ведаць. А што яно будзе ведаць?

Колькі ў Кацяняткі лапак? Што Кацянятка будзе рабіць сваімі лапкамі?

Колькі ў Кацяняткі вочак? Што Кацянятка імі будзе рабіць?

А колькі ў нас рук? Колькі ў нас пальчыкаў на адной руцэ? А на дзвюх? Давайце палічым. А цяпер хорам, усе разам. Адзін! Сагнём пальчык. Два! Сагнём другі пальчык...

А што мы робім рукамі? Чым мы бяром усё, што нам трэба? Чым мы апранаемся? Чым мы мыемся? А чым котка мыецца? Чым мы зашпільваем гузікі? Чым мы лыжку (відэлец) трымаем? Чым мы ляльку спаць укладваем? Чым мы робім іншую работу?

А колькі ў нас ног? Што мы імі робім? Так, так. Мы ходзім, бегаем, скачам. На лыжах ходзім, на веласіпедзе ездзім. А хлопчыкі яшчэ і ў футбол гуляюць нагамі. Праўда?

Прыгадаем, што Кацянятка ўбачыла сваімі двума вочкамі? А што мы бачым вось цяпер нашымі вачамі? Давайце паглядзім вакол: наперад, у адзін бок, у другі бок, і назад павернем галоўку.

Ці бачым мы белыя сцены? Ці бачым мы белую столь? Ці бачым мы чыстую падлогу? Ці бачым мы мэблю? Якую мэблю мы бачым? Канапу? Стол? Крэсла? А яшчэ што мы бачым? Мабыць, дыван? Цацкі? І безумоўна, мы бачым дзяцей.

Вось і мы з вамі шмат чаму навучыліся. І разам, дружненька скажам яшчэ тры прыказкі.

*Вучыцца заўсёды згадзіцца.*

*Навука не мучыць, а жыць вучыць.*

*Век жыві, век вучыся.*

Так рабіла і наша Кацянятка. І гісторыя пра яго працягваецца.

На наступны дзень Кацянятка-немаўлятка кажа сваёй маме: «Мамка, мамачка, глянь на мае маленькія вушкі! Адно вуха! Другое вуха! Што я магу рабіць сваімі вушамі?»

А мама-котка кажа: «Ах ты маё дурненькае Кацянятка! Ты можаш слухаць і чуць сваімі вушамі».

І Кацянятка паслухала, паслухала і кажа: «Так, так. Я чую сваімі вушкамі. Я чую, як вецер гудзе, як ты гаворыш, як жоўценькія кураняткі шчабечуць».

На наступны дзень Кацянятка кажа: «Мамка-мамачка, зірні на мой раток. Што я магу рабіць ім?»

А мама-котка кажа: «Ах ты, маё дурненькае Кацянятка! Ты можаш есці мышак сваім ротам».

І Кацянятка кажа: «А вось і мышка. Я яе з’ем».

Дык што мы робім вушамі? Навошта нам вушы?

Дык што мы робім ротам? Навошта нам рот? Каб есці? А яшчэ навошта? Ці патрэбны нам рот, каб гаварыць? Ці патрэбны нам рот, каб спяваць? Ці патрэбны нам рот, каб усміхацца? Ці патрэбны нам рот, каб апавяданні ўслых чытаць?

● Паслухайце і скажыце, якога звера прысніў певень.

## ПЕЎНІК І КУРАЧКА-ЧАРНУЛЬКА

Жыў-быў Пеўнік. Ён быў вельмі ганарысты, бо ў яго ногі былі моцныя, бо ў яго пер'і былі яскравыя, бо ў яго крылы былі вялікія. І яшчэ таму, што ў яго быў дзівосны голас. Ён так чароўна ўмеў кукарэкаць.

Ён хадзіў туды-сюды па двары і кукарэкаў, думаючы: «Я самы прыгожы певень. Найпрыгажэйшы ў свеце. І я ўмею кукарэкаць так, як ніхто іншы».

Але аднойчы ён не гуляў па двары і не спяваў, як заўсёды. Ён сеў на плот і звесіў галаву.

Птушкі пазіралі і дзівіліся. Не вытрымала курачка-Чарнулька, узляцела на плот, прысела каля яго і запыталася:

— Што з табою, Пеўнік?

— Я прысніў паганы сон, — сказаў Пеўнік і паківаў галавою.

— Раскажы сон, — папрасіла курачка-Чарнулька.

— Што ж, слухай, — кажа Пеўнік. — Я прысніў, што гуляю на двары. Са мною побач куры, качкі, індыкі і гусі. І раптам з кустоў паяўляецца звяруга. З вострым носам, з пушыстым хвастом-шчоткай. Раптам яна ўскідвае мяне на плечы і валачэ ў лес. «Божачка ты мой! Ратуйце, людцы добрыя», — крычу я ў сваім сне.

Ну які гэта быў звер? Які звер любіць курачак і пеўнікаў? А што сказала курачка-Чарнулька? Ці супакоіла яна Пеўніка? Якімі словамі яна яго супакойвала, як вы думаеце? («Не хвалюйся, гэта ж сон, дурненькі. Ідзі з намі гуляць. Зноў спявай, як заўсёды. Ліс не можа ў двор прабрацца. Двор жа загароджаны».)

Што зрабіў Певень? Ці забыўся ён на свой паганы сон? Як вы думаеце? Як вам хацелася б?

● Я вам прачытаю пра адну малпу, у якой забалеў зуб. Але спачатку мы крыху пагутарым. Адкажам на пытанні.

Скажыце, калі ласка, дзе жывуць малпы? Так. Праўду кажаце: малпы жывуць у лясах. Праўда, не ў кожным лесе вы сустрэнеце малпу. У нашым, беларускім лесе, няма малпаў. Яны жывуць у індыйскіх, афрыканскіх лясах, у Паўднёвай Амерыцы. Яны жывуць у джунглях. А яшчэ яны бываюць у заапарку, у цырку. Тут яны жывуць у клетцы. У клетцы яны бегаюць, скачуць. Хто з вас любіць хадзіць у заапарк? Хто вельмі любіць частаваць звяроў чым-небудзь смачным? Яблычкам? Арэшкам? Цукерачкай?

А што можа здарыцца, як мы ядзім шмат цукерак? Вось так. І ў малпаў, калі яны ядуць вельмі шмат цукерак, могуць балець зубы.

А што мы робім, калі ў нас баляць зубы? Хто нам лечыць зубы? Ну а што робіць малпа, калі ў яе забаліць зуб? Вось мы пра гэта і прачытаем.

### У МАЛПЫ ЗАБАЛЕЎ ЗУБ

Малое малпяня жыло ў клетцы са сваёй мамай-малпай. Клетка знаходзілася ў заапарку. Малпяня звалі Зубасцік. У Зубасціка два пярэднія зубы былі большыя, як у іншых маленькіх малпянятак.

Зубасцік бегаў па клетцы, скакаў і весела пазіраў на дзяцей. Дзеці любілі Зубасціка. Кожны дзень каля клеткі збіралася шмат хлопчыкаў і дзяўчынак. Яны глядзелі на Зубасціка, частавалі яго яблыкамі, арэшкамі, а найчасцей цукеркамі.

Аднойчы дзеці ўбачылі, што Зубасцік не бегае, не скача, а ціхенька сядзіць, як старэнькі дзядок. І нават не глядзіць на дзяцей. У Зубасціка забалелі зубы...

Мама-малпа пайшла да зубнога доктара і папрасіла:

— Шаноўны доктар, у майго дзіцяці забалеў зуб. Дайце лякарства, калі ласка!

— Каб вылечыць зуб у вашага дзіцяці, мне трэба бачыць хворага, — сказаў доктар.

Мама-малпа прывяла яго да Зубасціка.

— Разяў свой раток, — папрасіў доктар.

Зубасцік разявіў раток і паказаў зубы.

— Бачу, бачу! — сказаў доктар. — Малайчынка! Добра паказваеш свае зубкі. Я табе дапамагу. Зубы больш не

будуць балець. Але я цябе прашу: не еш шмат цукерак. «Што зашмат, то нездарова», «Зашмат і свінні не ядуць»,— кажуць прыказкі.

Доктар вылечыў Зубасціку зубы. Зубасцік зноў пачаў скакаць, бегаць і прыязна паглядаць на дзяцей. «Усё добра, што добра канчаецца».

Паўторым хорам прыказку: «Усё добра, што добра канчаецца». І на гэтым кончым нашу гісторыю.

### ПРА ЛЬВА І ШАКАЛАЎ

Жыў-быў Леў. Гэта было ў джунглях. Леў быў вельмі вялікі. Ён паеў усіх звяроў. Засталіся ў лесе толькі два шакалы. Яны страшэнна баяліся гэтага Льва. Леў роў цэлымі начамі і ўсё бліжэй падкрадаўся да шакалаў. Калі роў пачуўся вельмі блізка, шакалы з усіх сіл пачалі ўцякаць. Яны ўцякаюць, а Леў іх даганяе.

— Божачка мой, — кажа маці Шакаліха, — сёння да нас прыйдзе смерць. Што ж нам рабіць, бацька Шакал?

— Не бойся, — сказаў бацька Шакал. — Мы ўцячом.

І яны пабеглі наўцёкі. Але ж здарылася так, што адзін раз ноччу Леў ледзь-ледзь не схапіў іх. Калі шакалы ўбачылі Льва зусім блізка і ўцякаць ад яго ўжо не мелі сілы, яны ўздыхнулі цяжка і падышлі да яго.

— Дзе вы былі ўчора вечарам? — звярнуўся да шакалаў Леў. — Я быў вельмі галодны і хацеў вас з'есці!

— Жудасны-жудасны леў выйшаў з джунгляў і вельмі страшна роў, — сказаў бацька Шакал. — Так роў, што ажно дрэвы дрыжалі. Мы ад яго ўцяклі і схаваліся.

— Хіба вы не ведаеце, што ёсць толькі адзін леў. Гэта я!

— Не! Не! Ёсць яшчэ адзін леў, — сказалі шакалы.

— Ён большы за мяне? — спытаўся Леў. — Кажыце, хутчэй!

— Так, так. У два разы большы, як ты, — сказаў бацька Шакал. — І раве ён мацней у пяць разоў...

Леў раззлаваўся і як зараве! Ажно дрэвы затрашчалі і з каранямі вывернуліся.

— Завядзі мяне, бацька Шакал, да гэтага льва, я яго з'ем! — загадаў Леў.

Шакалы пабеглі наперадзе Льва. Дабеглі да вялізнай сажалкі.

— Вось дзе той другі леў. Ён жыве на дне гэтай сажалкі.

Леў зірнуў у сажалку і ўбачыў свой адбітак. Вада ж, як люстэрка. А Леў падумаў, што гэта не ён, а той другі леў.

— Выходзь! — закрычаў Леў. — Выходзь! Зараз жа выходзь! Морда яго ашчэрылася ад злосці, і ў таго другога таксама скрывілася морда.

— Страшылішча ты несусветнае! Пудзіла няшчаснае! Вылазь!

Нарэшце надакучыла Льву лаяцца, і ён скочыў у сажалку, каб падужацца з тым другім ільвом. І больш не вярнуўся! Утапіўся. Застаўся на дне сажалкі.

А шакалы пачалі танцаваць вакол сажалкі і спяваць свае любімыя песні.

● Дзе жыў Леў? А што такое джунглі? А дзе джунглі? Ці далёка ад нас? Ці ёсць у Беларусі джунглі? Якіх звяроў не паспеў з'есці той страшны Леў? Колькі было шакалаў? Калі шакалы пачалі ўцякаць ад страшнага Льва? Як бацька Шакал супакоіў маці Шакаліху? Хто з іх быў больш здагадлівы і больш адважны? Хто ўзяў на сябе ўвесь клопат?

Што сказалі шакалы Льву, калі ў іх не было больш сілы ўцякаць? Як яны апісалі другога льва? Ці сапраўды быў яшчэ адзін такі ж страшны і злосны леў, як гэты?

Чаму Леў ускочыў у сажалку? Што шакалы пачалі рабіць з радасці? А можа і мы патанцуем з радасці, што жудасны Леў утапіўся ў сажалцы, а шакалы засталіся жыць? Які наш любімы танец? «Бульба»? «Юрачка»? «Крыжачок»? «Лявоніха»?

## ВЯЛІКІ ВОЎК І МАЛЕНЬКАЯ ПЧОЛКА

Бяжыць маленькі Трусік. Бяжыць ён дадому, дахаты. Адчыняе дзверы і бачыць у сваёй хаце вялікага ваўка.

— Я вялікі, злы воўк, — кажа той. — Я хачу жыць у гэтым доме і я хачу з'есці цябе.

Маленькі Трусік уцякае з хаты. Бяжыць ён, бяжыць і сустракае каня.

— Ой, конік, дарагі конік, дапамажы мне! — просіць Трусік. — Я не магу ўвайсці ў сваю хату. Там вялікі воўк, і ён хоча мяне з'есці.

— Не, Трусік-трусічак, я не магу табе дапамагчы, — кажа конь. — Я не вялікі і не дужы, і воўк мяне таксама можа з'есці.

Бяжыць Трусік, бяжыць і сустракае сабаку.

— Ой, сабака, дарагі сабака, дапамажы мне! Я не магу ўвайсці ў сваю хату. Там вялікі воўк, і ён хоча мяне з'есці.

— Не, Трусік-трусічак, — кажа сабака. — Я не магу табе дапамагчы. Я не вялікі і не дужы, і воўк мяне таксама можа з'есці.

Маленькі Трусік пачынае плакаць. Бяжыць ён, бяжыць і бачыць маленькую, малюсенькую пчолку.

— Ой, дарагая мая пчолка, малюсенькая пчолка, — кажа Трусік. — Я не магу ўвайсці ў сваю хату. У ёй вялікі воўк. Ён хоча мяне з'есці. Конь не можа мне дапамагчы. Сабака не можа мне дапамагчы. І ты мне не зможаш дапамагчы. Ты маленькая.

А маленькая пчолка кажа:

— Я маленькая, але я табе дапамагу. Хадзем у тваю хату.

Яны прыходзяць у Трусікаву хату. У ёй вялікі воўк жыве цяпер. Воўк кажа:

— Прэч адсюль. Я жыву ў гэтай хаце. Я вас з'ем.

А маленькая пчолка лятае і лятае. Раптам як уджаліць вялікага ваўка! Раз уджаліла, другі раз, трэці раз. Вялікі воўк схапіўся і пабег, задраўшы хвост, з Трусікавай хаты. Ажно пяткі заблішчалі.

Зноў маленькі Трусік жыве ў сваёй хатцы. Да яго ў госці часта прылятае пчолка.

● Ці падабаецца вам гэта гісторыя? Хто вам найбольш спадабаўся? Трусік? Конь? Сабака? Воўк ці пчолка? Чаму вам спадабалася пчолка?

Што трэба рабіць, калі трапіш у бяду? Прасіць дапамогі?

Паслухаем прыказкі і падумаем, як яны датычаць гісторыі з Трусікам.

*Бяда не на век* (трапіў Трусік у бяду, але яна скончылася).

*Плачам гору не дапаможаш* (вось, калі б Трусік сядзеў і плакаў, яго воўк з'еў бы, а ён пайшоў шукаць дапамогі і знайшоў яе).

*Маленькі ды ўдаленькі* (хоць пчолка і маленькая, а дапамагла Трусіку).

*Просьба месца мае* (папрасіў Трусік пчолку, яна яму і дапамагла).

А цяпер хорам паўторым гэтыя прыказкі.

## ЛЮБОЎ МАЦІ ДА ДЗІЦЯЦІ

Паляўнічыя знайшлі ў джунглях маленькае тыгранятка. Не больш, як два тыдні было яму. Паляўнічыя прынеслі яго да сябе, прывязалі да коліка палаткі ланцужком, якім прывязваюць сабаку. Прывязаны звярок забаўляўся, як кацяня. Прыгожанькі — вачэй не адарваць! Але раптам тыграня пачула страшны, жудасны рык. Тыграня добра ведала гэты голас. Гэта быў голас яго маці-тыгрыцы. Тыграня адказала таксама рыкам і пачало цягнуць, ірваць ланцуг з усёй сілы. У палатцы пачаўся перапалох. Паляўнічыя спалохаліся ўсе да аднаго.

Раптам вялізная тыгрыца ўварвалася ў палатку. Ні на каго не звяртаючы ўвагі, яна схапіла тыграня за шыю, адарвала ланцуг і ўцякла ў джунглі.

Вось як тыгрыца выратавала сваё дзіця.

Адкажыце, калі ласка, на адно пытанне. Што дапамагло тыгрыцы адшукаць і выратаваць сваё дзіця?

А цяпер паслухайце прыказкі пра бацькоў і дзяцей.

Тыя, што нам найбольш спадабаюцца, мы вывучым. Але спачатку мы іх абгаворым, вытлумачым.

*Дзетак узгадаваць — не грыбкоў назбіраць.* (Што лягчэй зрабіць?)

*Самая балючая рана ад дзіцяці.* (Не трэба крыўдзіць сваіх бацькоў, бо яны вас любяць.)

*Шануй бацьку з маткаю: другіх не знойдзеш.* (А што з бацькамі будзе, як вы не будзеце іх слухаць, будзеце дрэнна сябе паводзіць?)

*У сваёй маткі ўсе дзеткі гладкі.* (Дагледжаныя, здаровенькія, вясёленькія.)

● Я вам прачытаю вельмі цікавую казку. Называецца яна «Першае яечка». У казцы многа прыгожых слоў. Можа, не ўсе яны вам вядомыя. Паслухайце, калі ласка.

*Паляванне.* Некаторыя мужчыны любяць хадзіць у лес з ружжом. Яны палююць на звяроў. Як убачаць

якога звера, дык і застрэляць. І дзед з нашай казкі таксама хадзіў на паляванне.

*Вечка.* Каструлю, слоік можна накрыць вечкам. Курка ў казцы села на вечка і знесла яечка.

*Скрынка.* Скрынка можа быць драўляная ці кардонная. У скрынку можна насыпаць чаго-небудзь ці пакласці што-небудзь. Мышка з нашай казкі хацела схавацца пад скрынку.

*Скарынка.* Дзеці, і я таксама, любяць есці скарыначку з хлеба, батона, булачкі. А старыя людзі не могуць есці скарыначкі. Яны любяць мякіш. Мышка з нашай казкі цягнула скарыначку ў скрыначку, хацела яе там з'есці.

*Гузак.* Як мы стукнемся лбом, дык на лбе сядзе гузак. Дзед у нашай казцы за нары зачапіўся, паваліўся і гузак набіў, вялікі гузак — з добры кулак.

*Патэльня.* На патэльні мы пячом яечню, бліны, дранікі. У нашай казцы бабка паклікала гасцей і спякла ім на патэльні яечню.

## ПЕРШАЕ ЯЕЧКА

(З народнага)

Хадзіў дзед на паляванне. Паляваў ад ранку да змяркання. Зморыцца, аж слова не прамовіць, а звярыны не зловіць. Ідзе дахаты, ледзьве не плача.

Вось дык няўдача!

Баба дзеда лае, што дарма гуляе, час траціць.

Ну і гора!

Слухаць дзеду горка бабіну гаворку.

— Ты, баба, мяне не лай, злаўлю табе звера, чакай!

Цэлы дзень хадзіў, курку-рабку злавіў.

Рада баба, скача, а курка кудахча: «Куд-куды, куд-куды! Дайце грэчкі і вады!»

Бабка курку накарміла, вадою напаіла. Села курка на вечка ды знесла яечка.

Бегла мышка пад скрынку, цягнула скарынку, хвастом вільнула, яечка скранула.

Яечка скацілася, трах! — і разбілася...

Убачыла баба, загаласіла ды з жалю ўсе гаршкі пабіла. Паламала і вечка, што недаглядзела яечка. Сама сярод хаты села і — абамлела...

Тут дзед стрэльбу схапіў, порахам набіў, кінуўся да мышкі, а мышка — на вышкі.

Дзед за ёю:

— Ілжэш! Ад мяне не ўцячэш!

За нары зачапіўся, плясь! — паваліўся.

Набіў дзед гузак з добры кулак. Ляжыць, уздыхае, мышку лае.

Ішлі бабы па ваду, пабачылі тую бяду, пачалі рукамі махаць, людзей на дапамогу склікаць.

Прыбеглі старыя, за старымі малыя. Дзеда паднялі, бабу вадой адлілі. Крычаць, бядуюць, яечка шкадуюць. Ну, вядома, і дзеда з бабай шкада. Вось дык бяда.

А пакуль там крычалі ды бедавалі, курка села ў падпечку ды знесла другое яечка. Круглае, белае, моцнае, спелае. Яшчэ лепшае за першае!

Рада баба, рад і дзед: будзе яешня на абед!

Баба патэльню ўзяла, яешню спякла. Паклікала гасцей — старых і дзяцей.

Усе елі, колькі хацелі. З-за стала ўсталі, песні заспявалі. Узяліся ў бокі, пусціліся ў скокі.

Скакалі, скакалі ды годзе сказалі.

Вось вам і казка. Чытайце, калі ласка! *Алесь Якімовіч.*

Чаму ўсе спачатку крычалі, плакалі, лямантавалі, гаравалі, бедавалі, а пасля пачалі скакаць, спяваць, весяліцца?

А можа, і мы з радасці, што прачыталі цікавую казку, возьмемся ў бокі і пусцімся ў скокі? Як? Ці ёсць такое жаданне?

● Я вам прачытаю казку. Мы пагаворым, а потым вывучым некалькі прыказак.

### ЯК ВАРОНА Ў ВЫРАЙ ЛЯТАЛА

Жыла-была каля возера старая варона. Многа гора нацярпелася яна за сваё жыццё. Часта ад зімовых халадоў нылі яе старыя косці. Здаралася, па тыдню нічога не трапляла ў дзюбу. Бачыць варона, збіраюцца птушкі ў вырай, і задумалася яна над сваёй доляй.

«Палячу на параду да качкі. Можа яна дапаможа чым», — вырашыла нарэшце варона і паляцела ў лазнячок да суседкі.

— Цяжка мне, качка, жыць тут зімою.

— Так, та-а-ак, — пацвердзіла старая качка. — Ляцець трэба.

— Куды ляцець?

— На поўдзень, у вырай, куды мы ляцім. Там заўсёды цёпла.

— Вазьмі мяне з сабою, качка, бо я дарогі не ведаю.

— Збірайся, варона, вазьму.

— Ур-ра, ур-ра. Кра! Кра! — усклікнула варона ад радасці на ўвесь лес. — У вырай, у вырай!

На яе крык адусюль зляцеліся птушкі.

— Што за крык? — спытаў дапытліва верабей. — Чырк, чырык, чырк, чырык...

— Я палячу з качкамі ў вырай, у выр-рай, — хвалілася варона.

Птушкі ў качкі пытаюцца:

— Ці праўда, суседка, што варона ў вырай ляціць?

— Та-ак, та-ак, — адказвае важна качка.

Цікаўная сарока як засмяецца:

— Ха-ха-ха... Варона ляціць у вырай... Чулі, сястрыцы?

Верабей толькі раскрыў дзюбу, каб таксама нешта сказаць, але варона так дзеўбанула яго, што аж пер'е пасыпалася. А сама ўзнялася ўгору.

— Бывай, родны кра-а-к-р-ай... — І разам з качкамі паляцела на поўдзень.

Ляцелі яны, ляцелі, а тым часам надышоў адвячорак. Качкі апусціліся на балота. Варона ўселася на сухую алешыну, агледзелася навокал і падумала: «Цікава, ці многа мы праляцелі за дзень?» — і паляцела назад праверыць свой шлях.

Вярнулася яна да качак на досвітку, змораная, ледзь жывая.

— Мы праляцелі, — кажа, — сорак лясоў і сорак палёў, дваццаць пяць рэк і трыццаць азёр... Ур-ра!

Пераглянуліся між сабою качкі. Што сказаць дурной вароне? Далёка яна так не праляціць.

На другі дзень варона ледзьве дагнала качак. А на трэці дзень яна налічыла да родных мясцін сто лясоў, і ляцець давялося ёй два дні і дзве ночы.

Прыляцела варона ў роднае гняздо каля возера і вырашыла трошкі адпачыць. Прысела ды так і заснула. А як расплюшчыла вочы, дык і зусім не захацела ляцець у далёкі вырай. Так і засталася яна зімаваць у родным краі.

● Чаму варона надумалася ляцець з іншымі птушкамі ў вырай? Ці многа яна гора нацярпелася? А якое ў яе было гора? Ці дапамагла ёй качка? Як яна ёй

дапамагла? За што варона дзеўбанула вераб'я? Хто з яе злосна смяяўся? Ці добра было з боку вераб'я і сарокі смяяцца з беднай вароны? Чаму варона ўсё вярталася да родных мясцін? Чаму яна лічыла лясы, палі, рэкі, азёры? Ці любіла яна свой край, сваё гняздо?

А цяпер паслухайце, калі ласка, што кажуць прыказкі пра сваю старонку. А потым кожны выбера дзве, вывучыць іх на памяць і раскажа дома.

*Кожнай птушцы сваё гняздо міла.*

*Родная зямля мякчэй за чужую пярыну.*

*Няма смачнейшай вадзіцы, як з роднай крыніцы.*

*Ідзі ў родны край, там і пад елкай рай.*

**ПІРОГ**

Расказаць вам гісторыю пра пекара? Дык слухайце.

Спёк ён аднойчы вялізны святочны пірог, румяны, духмяны, і пайшоў з ім у лес. «Падару, — думае, — гэты пірог найлепшаму зверу». Ідзе, а насустрач яму бяжыць барсук. Убачыў пірог і кажа:

— Ой, які цудоўны пірог! Каму ты яго нясеш?

— А, — кажа пекар, — хачу падарыць яго найлепшаму зверу. Як табе здаецца, хто найлепшы?

— Я, я найлепшы! — крыкнуў барсук. — Ці ж ты не ведаў?

— Не ведаў, — сказаў пекар і пайшоў далей. Не даў пірага барсуку.

Бяжыць насустрач заяц. Убачыў пірог і кажа:

— Ой, які румяны пірог! Куды ты яго нясеш?

— Хачу, — кажа пекар, — даць яго найлепшаму зверу. Хто тут у вас найлепшы?

— Вядома, я найлепшы! — адказвае заяц. — Ці ж ты не ведаеш?

— Не ведаю, — сказаў пекар і пайшоў далей. Не даў касавокаму пірага.

Бяжыць насустрач вожык:

— Ух ты! Во гэта дык пірог! Куды ты яго нясеш?

— Вось, — кажа пекар, — хачу даць яго ў падарунак найлепшаму зверу. Скажы, хто сярод вас найлепшы.

Задумаўся вожык. Потым кажа:

— Падары свой пірог бабру. Ён вельмі добры. А яшчэ адламі кавалачак для чарапахі, ваверкі, сусліка. Гэта так-

сама добрыя звяры. Барсука і зайца пачастуй: яны ж вельмі любяць пірагі.

Пекар усміхнуўся задаволены. «Цяпер, — думае, — я ведаю, каму падарыць свой пірог». *Паводле А. Лелеўрэ.*

Адгадайце каму.

● Які пірог спёк пекар? Вялікі. Духмяны. Румяны. Хто ўмее пячы такія пірагі? Мама? Бабуля? Пекар сам з'еў увесь пірог? Нікому не даў ні кавалачка? А каму ён падарыў свой пірог? Чаму ён не аддаў пірог барсуку, зайцу? Ці добра зрабіў пекар? А ты на яго месцы, што зрабіў бы?

Ці падабаюцца вам гэтыя прыказкі?

*Любі другога, як сябе самога.*

*Шануй людзей, то і цябе пашануюць.*

*Хто толькі сам сябе любіць, таго ніхто не любіць.*

**ХЛЕБ**

Была нядзеля. Гаспадыня накрыла святочны стол. Чаго толькі на ім не было: і грэцкая каша, і салата, і смажанае мяса, і нават фаршыраваны шчупак. Усе стравы атрымаліся вельмі смачныя. Але не паспела гаспадыня выйсці, як яны заспрачаліся паміж сабою, якая з іх самая галоўная. Кожная была ўпэўнена, што яна найважнейшая. Як тут быць? «А давайце дамовімся, — прапанавалі раптам агуркі, — каго першага людзі возьмуць у рукі, той і галоўны». На тым і пагадзіліся.

Гаспадыня запрасіла гасцей да стала. Калі ўсе паселі, самы стары і паважаны дзед агледзеў стол і запытаўся, ці ў кожнага ўсё ёсць. Потым яшчэ раз зірнуў на стол і хітравата ўсміхнуўся:

— Гаспадынька, а нешта ж я не бачу на стале самага галоўнага...

— Чаго? — падхапілася гаспадыня.

— Паглядзі, сама ўбачыш...

Жанчына акінула ўважлівым вокам стол і пляснула далонямі:

— Гэта ж трэба — хлеб не падала! Так закруцілася, што пра самае галоўнае забылася.

Людзі за сталом заўсміхаліся, павесялелі, а гаспадыня прынесла вялікі бохан свежага духмянага хлеба і падала дзеду. Той узяў нож і пачаў лусту за лустай кроіць яго. Рукі гасцей самі сабой пацягнуліся да хлеба.

Усе стравы сціхлі.

Хлеб! Ён ніколі не прыядаецца і ніколі не лішні. Ён і ёсць усяму галава. *Леанід Улашчанка*

## ВЕРНЫЯ СЯБРЫ

Жыў у лесе Заяц. Ні з кім не сварыўся, ні з кім не спрачаўся. Блізка ад яго, пад ядлоўцавым кустом, пасяліўся Вожык. Памяркоўны звярок, нікому вока не запарушыў. Пазнаёміліся Заяц і Вожык, пачалі разам гуляць. Убачыла іх Вавёрка і рассмяялася: такія яны розныя, сябры. Заяц вялікі, імчыцца, нібы вецер. А Вожык — маленькі, павольны, як чарапаха.

— Нядоўга вы будзеце сябраваць, — зацокала Вавёрка. — Лопне ваша дружба пры першай нязгодзе, як бурбалка дажджавая.

— Пажывём — пабачым, — сказалі Вожык і Заяц.

Аднаго дня прыйшла ў лес бяда. Галодны Воўк убачыў звяркоў і ўзрадаваўся: адразу з'есць Вожыка, а потым, калі прыбавіцца сілы, дагоніць Зайца.

— Ратуйцеся! Воўк-разбойнік набліжаецца! — трывожна зацокала Вавёрка.

Заяц стаў на заднія лапкі і ўбачыў драпежніка, які прытаіўся ў кустах.

— Уцякай, Вожык! — крыкнуў ён і даў драпака.

У Вожыка ножкі кароценькія — не ўцячы яму, небараку. Таму ён скруціўся ў клубочак, выставіў свае вострыя іголкі і замёр.

— Вось і скончылася ваша дружба! — зацокала Вавёрка. — Сапраўдныя сябры ў бядзе пазнаюцца.

А Воўк ударыў лапай Вожыка і аж заскуголіў ад болю — аб іголкі ўкалоўся.

Тым часам вярнуўся Заяц, каб неяк дапамагчы сябру. Воўк кінуў Вожыка — і за ім, даўганогім. Заяц зрабіў па лесе круг, другі. Не адстае Воўк, следам імчыцца. Чуваць толькі шумнае дыханне ды цяжкі тупат. І раптам... як заенчыць Воўк, як завые на ўвесь лес! Гэта Вожык кінуўся яму пад ногі і драпежнік зноў параніў аб калючкі нагу.

Пакачаўся Воўк па зямлі, рану залізаў і неахвотна паплёўся прэч — адступіўся ад звяркоў.

Вавёрка ўсё гэта бачыла. Яна спусцілася з яліны да Вожыка і Зайца, зацокала вінавата:

— Даруйце, што смяялася з вас. Цяпер ведаю, вы — сапраўдныя сябры. *Васіль Гурскі*

● Хто пасмяяўся з дружбы Зайчыка і Вожыка? Чаму Вавёрка думала, што іх дружба лопне, як бурбалка дажджавая? Ці падобныя Вожык і Заяц? Хто з іх большы? Хто з іх павольны, як чарапаха? Хто з іх імклівы, хуткі, як вецер? Што падумаў галодны Воўк, убачыўшы Вожыка і Зайца? Чаго ён узрадаваўся? Ці дапамагалі сябры ў бядзе адзін аднаму? Ці перамаглі яны Ваўка? Чаму яны перамаглі яго? Што сказала Вавёрка, спусціўшыся з яліны і падышоўшы да двух сяброў? Ці добра яна зрабіла, папрасіўшы прабачэння? Чалавек пакаецца ў сваім дрэнным учынку, папросіць прабачэння ў таго, перад кім вінаваты, і ўсім стане лепш. Праўда?

А цяпер паслухаем, што кажуць пра дружбу беларускія прыказкі.

*І службу служы, і сябру дапамажы.*

*Птушка моцная крыламі, а чалавек дружбай.*

*Сам згінь, а сябра з бяды вызвалі.*

*Той не можа быць другам, хто ў бядзе абыдзе кругам.*

*Дружба мацней каменных сцен.*

Пагуляем у тэатр. У сваёй сцэнцы пакажам, што адбылося з Зайцам, Вожыкам, Вавёркай і Ваўком.

Дзеючыя асобы: Заяц, Вожык, Вавёрка, Воўк.

*Дзеянне адбываецца ў лесе. Заяц і Вожык гуляюць у мяч, які катаюць з аднаго боку ў другі.*

Вавёрка *(гледзячы на іх, зайздросціць):* Нядоўга вы будзеце сябраваць. Лопне ваша дружба, як бурбалка дажджавая.

Вожык: Пажывём — пабачым.

Заяц: Пажывём — пабачым *(катаюць мяч).*

З'яўляецца Воўк.

Воўк: У-у-у-у!

Вавёрка: Ратуйцеся! Воўк-разбойнік набліжаецца! *(Уцякае, хаваецца за дрэва.)*

Заяц: Уцякай, Вожык!

*Заяц пабег, Вожык скруціўся ў клубок і застаўся ляжаць.*

Вавёрка *(з-за дрэва):* Вось і скончылася ваша дружба. Сябры пазнаюцца ў бядзе.

*Воўк ударыў Вожыка лапай і адскочыў назад, заскуліў.*

Воўк *(аблізвае лапу):* У-у-у!

*Заяц рагоча з-за кустоў.*

Воўк: Заяц! *(Пабег за ім. Вожык кінуўся Ваўку пад нogi.)*

Воўк: У-у-у! *(Пабег у лес залізваць раны.)*

Вавёрка: Даруйце, што смяялася з вас. Цяпер ведаю — вы сапраўдныя сябры! Можна, я буду з вамі сябраваць?

Вожык, Заяц *(радасна)*: Вось добра! Хадзі да нас!

*Вожык, Заяц, Вавёрка пусціліся ў скокі.*

## ЗАЙЧЫКАВЫ ІМЯНІНЫ

(К а з к а)

Жыў у лесе Зайчык. Надумаў ён аднаго разу справіць свае імяніны. Паклікаў шмат гасцей. Не запрасіў толькі Ваўка, Лісу і Мядзведзя — баяўся, каб не з'елі самога. Госці паелі морквы, зайчыкавага шчаўя, запілі бярозавым сокам, падзякавалі гаспадару і пайшлі. Зайчык правёў гасцей, ідзе па лесе і спявае — весела яму.

Раптам з-за куста выскаквае Воўк і кажа:

— Я цябе з'ем за тое, што ты мяне на імяніны не запрасіў.

Заяц спалохаўся — і наўцёкі. Воўк за ім. І хоць Заяц хутка бегае, а Воўк яго насцігае. Што рабіць? Бачыць Заяц — якраз на яго дарозе стаіць тоўстае дрэва. Заяц — проста на яго. Не дабег крокі тры, скокнуў убок — і абмінуў дрэва. А Воўк як грукнецца галавою аб дрэва! Упаў і ляжыць нежывы.

Заяц паглядзеў, паківаў галавою ды кажа:

— Так табе і трэба, ненаедны Воўча.

І пайшоў сабе далей. Аж тут раптам Ліса з-за кустоў — шусь!

— Чаму без мяне імяніны справіў?

Заяц зноў кінуўся ўцякаць. Бег, бег, стаміўся, а Ліса ўжо зусім блізка. Добра, што ў Зайца кароткі хвост, ніяк за яго не ўчапіцца Лісе, а так ужо канцы Зайцу былі б. Ды раптам паказалася рэчка. Заяц з размаху як скокне — і апынуўся на тым беразе. А Ліса цяжэйшая, скокнула — і плюх у ваду. Ледзьве выбралася рыжая на бераг, а Заяц тым часам уцёк.

Бяжыць, азіраецца, каб хаця яшчэ не сустрэць каго са сваіх ворагаў. І раптам — шусь з-за куста вялізны калматы Мядзведзь.

— Пачакай, Заяц, я цябе хачу з'есці.

Бачыць Заяц — з Мядзведзем жартачкі малыя, трэба ўцякаць. І кінуўся з усіх ног. Мядзведзь — за ім.

Бягуць. Заяц ужо ледзь дух пераводзіць — трэці раз уцякае. А тут Мядзведзь насядае, сапе, як кавальскі мех. У Зайца пацямнела ў вачах. Што рабіць, як ратавацца? Бачыць Заяц: растуць два дрэвы, адно пры другім.

І Заяц, доўга не думаючы, шась у шчыліну між дрэў. Стаў, аддыхаўся. І разабрала яго цікавасць: дзе ж Мядзведзь? Вярнуўся назад. Бачыць, Мядзведзь між дрэў завіс.

— Ну што, дагнаў? — спытаўся Заяц.

— Даруй, брацe, — сказаў Мядзведзь, — памажы выбрацца з бяды. Чэснае мядзведжае, ніколі больш цябе не крану...

Заяц падумаў хвіліну, стукнуў сябе лапай па лбе ды кажа Мядзведзю:

— Ну глядзі ж, не ашукай... Як да твайго берлагу дабрацца?

— А навошта табе? — пытае Мядзведзь.

— Кажы, мне трэба.

Мядзведзь сказаў. Заяц хуценька знайшоў бярлог, расказаў пра ўсё Мядзведзісе.

— Бяжым хутчэй ратаваць! — усхапілася Мядзведзіха.

Прыбеглі, а Мядзведзь ужо ледзь дыхае. Мядзведзіха адразу зламала адно дрэва, Мядзведзь вылез са свае пасткі, адсопся ды кажа Зайцу:

— Бачыш, я цябе хацеў з'есці, а ты мяне з бяды выручыў. Даруй мне за гэта... І я табе таксама хачу дабро зрабіць. Ідзі, ды стаў сабе хатку каля майго берлагу, і будзем мы жыць у добрым суседстве. І ніхто цябе болей не кране.

Заяц пачухаў лапай за вухам, падумаў і згадзіўся.

З таго часу Зайца болей ніхто не крыўдзіў.

● Ці спадабаўся вам Зайчык? Ці спадабаўся вам Мядзведзь? Ці спадабалася вам Мядзведзіха? Адкажыце, калі ласка, чаму Зайчык не запрасіў на імяніны Ваўка, Лісу і Мядзведзя? Чым частаваў Зайчык сваіх гасцей? Ці добра Зайчык зрабіў, што правёў сваіх гасцей дамоў? І што ён рабіў, калі вяртаўся дамоў? А чаму ён спяваў, як вы думаеце? Як Зайцу ўдалося выратавацца ад Ваўка? Чаму Воўк, Ліса, Мядзведзь злаваліся на Зайчыка? А што здарылася з Ваўком? Ці шкадаваў Зайчык, што Воўк грукнуўся галавою аб дрэва? Як Зайчыку ўдалося выратавацца ад Лісы? Чаму Зайчык пераскочыў праз ваду, а Ліса плюхнула

ў раку? Хто з іх цяжэйшы? Чаму Зайчык не завіс між дрэў, а Мядзведзь завіс? Якімі словамі Мядзведзь прасіў у Зайца прабачэння за тое, што на яго злаваўся і хацеў яго з'есці? Ці паверыў Зайчык, што Мядзведзь яго не з'есць? Навошта Зайчык запытаўся, дзе мядзведзеў бярлог? Як Мядзведзіха дапамагла свайму Мядзведзю? Ці будуць Мядзведзь і Заяц добрымі суседзямі, як вы думаеце? Чаму суседзі павінны сябраваць?

## У СТРАХА ВОЧЫ ВЯЛІКІЯ

(К а з к а)

За вёскай, за ўзгоркам, расце бярозавы гай. Яго відаць нават з акна хаты. Бярозы гойдаюць зялёнымі галінкамі, нібы запрашаюць да сябе ў госці.

Говорыць Кася свайму брацiку Янку:

— Хочаш, пойдзем вунь у той бор, што за пагоркам відаць.

— Добра, — згаджаецца Янка. — Назбіраем суніц для мамы.

Кася з Янкам ідуць павольна, на ўсе бакі аглядаюцца. Яны яшчэ ніколі так далёка ад дому не адыходзілі.

— Нічога не бойся, Кася, — гаворыць Янка. — Калі выскачыць воўк, я цябе абараню.

— Я і не баюся, — кажа Кася. Але сэрца яе стукае моцна-моцна. У лесе ўсё можа здарыцца.

Ідуць яны, ідуць і не ведаюць, што пад кустом затаілася малое шэрае зайчанятка. Ого, нехта ідзе па лесе... Наставіла зайчанятка свае доўгія вушкі і слухае. Можа, гэта паляўнічы са стрэльбамі ды сабакамі? Сэрца зайчаняці стукае моцна-моцна...

Трэснула галінка. Зайчанятка спалохалася, падскочыла.

— Воўк! Воўк! — крыкнула Кася і пабегла, цягнучы за руку Янку.

А зайчанятка што было сілы кінулася ў другі бок.

...Спыніліся дзеці толькі перад самым домам.

— Што з вамі? — пытае ўстрывожана маці.

— Вось гэткі воўк хацеў нас з'есці! — сказаў Янка, шырока разводзячы рукамі.

— Страшны ваўчышча! — дадала Кася. — Мы ледзь уцяклі ад яго.

А шэрае зайчанятка дабегла да лазовых кустоў на беразе ракі. Там убачыла свайго брата.

— Хто за табой гнаўся? — запытаў брат.

— Уф, уф, — пераводзячы дых, сказала зайчанятка. — Гналіся за мной паляўнічыя са стрэльбамі ды з сабакамі... Паслухай, як моцна б'ецца сэрца.

Праўду кажуць людзі: «У страха вочы вялікія».

Паслухайце, калі ласка, прыказкі:

*Баязліваму страх у вочы лезе.*

*Баязліваму адзін цень за тры ваўкі здаецца.*

*Горш, калі баішся: і ліха не мінеш, і надрыжышся.*

*Баязліваму і корч — мядзведзь.*

Пра каго і пра што гэтыя прыказкі? Можа, яны пра Касю і Янку? Не толькі Кася з Янкам, усе мы — і маленькія, і дарослыя калі-небудзь і чаго-небудзь баімся. Часам і трэба баяцца, трэба быць асцярожным. Але часцей страх нам шкодзіць. Трэба перамагаць страх, адганяць яго ад сябе: «Пайшоў прэч, страх!» Лепш быць смеламу, адважнаму, незалежнаму ад страху.

● Паслухайце: *эха, рэха.* Падобныя словы. Яны значаць адно і тое ж. Па-руску — *эхо*, па-беларуску — *рэха*. Рэха нельга ўбачыць. Яго можна толькі пачуць. Вось як цікава!

**РЭХА**

У адным прыгожым лесе жыло Рэха. Яно было вясёлае. Смяшыла ўсіх, хто з ім перагукваўся.

Упадзе старое дрэва — бух! Смяецца Рэха:

— Ха-ха-ух! Ха-ха-ух!

— Ку-ку! Ку-ку! — падасць голас зязюля.

— Ха-ха-ку! Ха-ха-ку! — смяецца Рэха.

Бом! — сарвецца з елкі шышка.

— Ха-ха-ом! Ха-ха-ом! — дражніцца Рэха.

Зойдзе чалавек у гушчар:

— Ой, якія тут грыбы!

— Бы-бы-бы! Бы-бы-бы! — рагоча Рэха.

Людзі толькі дзівіліся ды рукамі разводзілі: што за Рэха жыве ў лесе? Увесь час толькі і смяецца. А каму прыемна, калі цябе дражняць? І перасталі хадзіць у той лес.

Засумавала Рэха. З елак і шышак смяяцца надакучыла, з птушак і звяроў — таксама. І аднойчы, прычапіўшыся да грукату аўтобуснага матора, паехала ў горад.

Ад горада Рэха было ў захапленні: гэта ж толькі падумаць — колькі тут шуму! Машыны гудуць, заводы грукочуць, трамваі звіняць, дзверы рыпяць. Які прастор для Рэха!

І пачало жыць у горадзе. Што ні дзень — рагоча. Нават уначы не змаўкае. То раскацістае, то насмешлівае, то сцішанае.

Смяялася рэха дзень, смяялася два, смяялася тыдзень. Нарэшце нацешылася. Агледзеўшыся, убачыла, што ніхто яго не заўважае. Людзі кудысь спяшаюцца, а машыны наогул не звяртаюць на яго ніякай увагі.

Няўтульна стала Рэху. Яно зразумела, што тут, у горадзе, лішняе. І падалося дадому, у лес.

З таго часу яно нікога больш не пацвельвае. А калі хто прыходзіць у лес і хоча з ім пагуляць — заўсёды адгукаецца.

Рэ-ха!

— А-а-а! А-а-а!

— Дзе ты?

— А ты? А ты?

— Я ў лесе?

— Ле-се... Ле-се...

— Ха-ха-ха! — смяецца чалавек.

І Рэха смяецца. Яму радасна, што яно зноў жыве ў лесе, у сябе дома. *Сяргей Тарасаў*

Пра тое, што дома найлепш, гаворыць прыказка: «Усюды добра, а дома лепей».

## МАМА

Сяргейку прывезлі ў вёску. Там ён пабег па лужах, дзе хадзіла карова Рагуля з маленькім гарэзлівым бычком.

— Здароў, белалобы, — павітаўся Сяргейка.

А той узбычыў сваю лабастую галаву і пайшоў на хлопчыка.

— Букнуцца хочаш? — спытаў Сяргейка і, нагнуўшыся, выставіў наперад сваю галаву: — Давай!

Белалобы пабаяўся букнуцца, павярнуўся і пабег ад Сяргейкі. Сяргейка за ім, не дагнаў і схаваўся за кусцік. Бычок туды-сюды, а Сяргейкі няма.

— Не знайшоў! Не знайшоў! — закрычаў Сяргейка і выскачыў з-за куста. — Цяпер ты хавайся.

Ён закрыў рукамі вочы, а бычок — бягом у хмызняк. Сяргейка знайшоў яго адразу і застукаў:

— Бачу, вылазь!

А белалобы не можа выбрацца з хмызняку — забраўся аж у самы гушчар.

— Му-му! — паклікаў ён маці.

Рагуля нават не павярнулася на гэты кліч. Скубе сабе траву і скубе.

— Му-му-му! — яшчэ мацней загаласіў бычок.

Сяргейка яму і сказаў:

— Ты не так клічаш, не му-му, а ма-ма.

— Му-му!

— Мама, — паправіў Сяргейка і што ёсць сілы крыкнуў: — Мама!

Гэты кліч пачулі адразу абедзве мамы: Сяргейкава і белалобага. Сяргейкава маці абняла цяля за шыю, а Рагуля штурхнула яго пад бок пысай. І вывелі белалобага на лужок.

— Вось бачыш, — зарадаваўся Сяргейка, — паклікалі як трэба, мамы і прыйшлі.

Сяргейка і белалобы доўга яшчэ гулялі на лужку і так здружыліся, што калі хлопчыка паклікалі абедаць, то яны пайшлі абодва. *Васіль Хомчанка*

● Мамы ўсе падобныя. Чым яны падобныя? Усе мамы любяць сваіх дзяцей. Так ці не? Усе мамы кормяць сваіх дзяцей. Так ці не? Усе мамы засцерагаюць сваіх дзяцей. Так ці не?

### ТАНЯ І ВЕЦЕР

Нагуляўся Вецер на полі, на лузе і паляцеў у вёску. А ў той вёсцы быў маленькі дворык. А на тым дворыку стаяла невялічкая хатка. А ў той хатцы жыла гультаяватая Таня. Выйшла Таня з хаткі і пачала развешваць на вяроўцы свае хустачкі. Прыгледзеўся Вецер і ўбачыў, што хустачкі дрэнна вымыты. Здзівіўся ён і пытае ў Тані:

— Навошта ты брудныя хусткі вешаеш?

А Таня адказала:

— Дожджык пойдзе і вымые.

І пайшла ў хату. І вось сыпануў дожджык. Змачыў ён Таніны хусткі. А Вецер закружыўся, сарваў іх з вяровачкі

ды як шпурне іх на зямлю. І паляцеў. А Таніны хусткі яшчэ бруднейшымі сталі.

Назаўтра Вецер зноў прыляцеў на Танін дворык. І ўбачыў, што Таня ў скакалкі гуляе, а на ёй дзіравая сукенка. Пачаў ён дзьмуць з усяе сілы. Холадна стала Тані, і пабегла яна дахаты. А Вецер зноў паляцеў.

І на трэці дзень прыляцеў на Танін дворык. І ўбачыў, што Таня катаецца на веласіпедзе, а галава ў яе кудлатая, непрычэсаная. Падзьмуў Вецер на яе валасы, ды так моцна, што тыя ў касмылі пазакручваліся.

Прыляцеў Вецер да Тані на чацвёрты дзень. І вось што ён убачыў: на вяровачцы вісяць чыстыя хустачкі, на Танінай сукенцы не відаць дзірак, а валасы гладка прычэсаны.

Усміхнуўся Вецер, ласкава пагладзіў Таню па галоўцы, пахваліў за стараннасць і паляцеў. Больш яму тут не было чаго рабіць. *Алена Кобец-Філімонава*

● Ці спадабалася вам апавяданне? Ці хацелі б вы ўбачыць дзяўчынку Таню тады, калі яна стала ахайнай, чысценькай, гладка прычэсанай? А якая яна была раней? Чаму яна была ў бруднай сукенцы? Чаму яна была непрычэсаная? Чаму яна вешала хусцінкі сушыцца бруднымі, непамытымі? Праўду вы кажаце: таму, што яна была гультаяватая, не любіла працаваць. Умывацца, прычэсвацца, апранацца — гэта ж таксама праца. А хто быў добрым настаўнікам для Тані, якая жыла ў маленькай вёсцы, у маленькім дворыку, у невялічкай хатцы, якая ў скакалкі гуляць любіла, а працаваць не любіла? Так. Вецер палюбіў Таню, захацеў зрабіць яе добрай, прывабнай дзяўчынкай, навучыў яе працаваць. Можа, мы паспрабуем намаляваць усё тое, пра што прачыталі?

Паслухайце прыказку і скажыце, чый розум і рукі дужэюць ад навукі: «Ад навукі дужэюць розум і рукі».

● Паслухайце, калі ласка, як прыгожа напісана пра цудоўную Чараўніцу, якая зачаравала нашу мілую зямельку, яе лясы, рэкі, азёры.

### ЧАРАЎНІЦА

З далёкай Поўначы, з краю вечных снягоў ды льдоў, на пары белых касматых мядзведзяў, апранутая ў белыя пу-

ховыя футры, прыехала да нас Чараўніца. Зачаравала воды нашай мілай зямелькі, і зрабіліся яны камянямі празрыстымі. Зачаравала лясы і паркі нашы, і заснулі яны сном глыбокім. Патрэсла шырокімі рукавамі сваёй пуховай вопраткі, і пакрыліся палі снежнай беллю. І лёг наш край пад нагамі Чараўніцы белы... ціхі... задуменны. Рада яна сваёй уладзе над прыродай, усміхнулася смехам ясным, хоць халодным. І ад гэтага смеху заіскрылася ўсё кругом цэлым морам рознакаляровых брыльянтаў. І стаіць яна сярод гэтага мора белі і бляску, грозная, хоць прыгожая, ды халодная. Але вельмі ўсе нашы дзеткі яе любяць. Бо госця наша штогодняя з далёкай Поўначы — Чараўніца-Зіма. *Зоська Верас*

Ці здагадаліся вы, хто такая Чараўніца? Адкуль яна ў нас узялася? З далёкай халоднай Поўначы ці з далёкага цёплага Поўдня? А як яна прыехала? На аўтамабілі ці на санях прывезлі яе белыя мядзведзі? А як гэта Чараўніца апранута? У лёгкую паркалёвую сукенку ці ў белыя пуховыя футры? А як яна зачаравала нашы азёры, рэкі, палі, лясы? Можа яна заспявала калыханку чароўную і зямелька наша заснула? А потым што яна зрабіла? Чым яна патрэсла, і снег пасыпаўся на зямлю? Чараўніца засмяялася, і ўсё заіскрылася брыльянтамі. Так? Во які цікавы ў яе смех, праўда? Добра было б, каб засмяяўся чалавек, і ўсё стала вакол брыльянтамі? А якія гэта былі брыльянты ад смеху Чараўніцы? Гэта, мабыць, ільдзінкі? Зачаравала Чараўніца нашу зямельку, а сама стаіць уся ў белі, у бляску, прыгожая, хоць і халодная — Чараўніца-Зіма. Ці любім мы з вамі гэту Чараўніцу? Можа, мы ёй вершы прачытаем? Хто памятае які верш пра Зіму-Чараўніцу?

### КАМУ СКАЗАЦЬ ДЗЯКУЙ

Прынесла бабуля гладыш малака і пачала частаваць сваіх унукаў:

— Піце, дзеткі, малако. Яно смачнае, карыснае, будзеце здаровыя і дужыя.

— Дзякуем табе, бабуля, — выпіўшы малако, сказалі ўнукі.

— А вы не мне дзякуйце, а маёй кароўцы. Гэта ж яна дае малако.

Пабеглі дзеці на двор і пачалі дзякаваць карове, якая стаяла каля студні:

— Дзякуем табе, кароўка, за смачнае малако.

— Добра, што малако маё вам спадабалася. Але дзякаваць за яго трэба не мне, а траве, якую я скубу, — адказала карова.

Пабеглі дзеці на зялёны луг, пакланіліся нізка траве:

— Дзякуем табе, трава, што корміш нашу кароўку, якае дае смачнае малако.

— Карова цэлы дзень пасвіцца на лузе. Вось і падзякуйце зямлі, на якой я расту.

Пакланіліся дзеці зямлі і сказалі:

— Дзякуем табе, зямля, за траву, якую скубе наша кароўка і дае смачнае малако.

— Падзякуйце вадзе, якая поіць траву, — адказала зямля.

Пабеглі дзеці да ракі, пакланіліся вадзе:

— Дзякуем табе, вада, што поіш траву, якую скубе бабульчына кароўка, каб пачаставаць нас малаком.

— Гэта праўда, я дапамагаю зямлі вырошчваць траву. Але ж падзякуйце і сонцу за цяпло. І помніце, што толькі наша агульная праца дае вашай кароўцы смачнае малако.
*Ядвіга Бяганская*

● Дык каму мы павінны дзякаваць за малако? Давайце пералічым. Вы мне падказвайце. Малако дае кароўка, кароўка есць траву. Трава расце на лузе. Луг — на зямлі. Зямлю поіць вада. Зямлю грэе сонца. Даглядае кароўку і поіць дзетак малаком бабуля. Ну, а каб мы не працавалі, не кармілі кароўку, не даглядалі зямлю, дзе расце трава, ці было б у нас што-небудзь добрае? А каб дзеці не любілі сваю бабульку, ці хацелася б ёй даіць кароўку і паіць іх малаком?

● Мы з вамі любім часопіс «Вясёлка». Там шмат чаго цікавага для нас: і вершы, і апавяданні, і скорагаворкі, і загадкі. Там можна знайсці апавяданні пра тое, што было даўным-даўно, і біблейскія легенды пра тое, як стварыўся свет. А што такое Біблія і як стварыўся свет, мы зараз з вамі прачытаем. Можа, не ўсё зразумеем. Чаго не зразумеем — даведаемся пазней, як вырасцем. А прачытаць пра тое, як стварыўся свет, цікава. Праўда?

Біблія — самая старажытная кніга ў свеце. Людзі доўга верылі, што напісаў яе сам Бог, які жыве на небе і кіруе зямлёй. Пасля пачалі верыць, што Бог прадыктаваў гэту кнігу сваім вучням. Таму Біблію і называюць словам божым, свяшчэнным пісаннем.

На мову простых людзей — беларусаў гэту кнігу пераклаў, а пасля і надрукаваў яе Францыск Скарына, слаўны сын з горада Полацка. Мы за гэта вельмі ўдзячны яму, першадрукару.

Францыск Скарына пісаў, што ў Бібліі схавана мудрасць, як моц у дарагім камяні, як золата ў зямлі, як зерне ў арэху.

Давайце прачытаем некаторыя біблейскія легенды. Няхай яны стануць вашым першым урокам на шляху да разумення мудрай кнігі.

## ЯК БОГ СТВАРЫЎ СВЕТ

Некалі не было ні зямлі, ні неба. Быў толькі міласэрны Бог. І задумаў ён ажывіць усё вакол сябе. Напачатку стварыў памочнікаў-анёлаў. У іх ёсць душа, а цела няма. Анёлы — добрыя духі.

Пасля Бог стварыў зямлю, на якой мы жывём. І задумаўся: што трэба, каб на зямлі было добра і весела?

У першы дзень стварыў Бог святло, бо навокал была страшная цемра. І светла стала на зямлі.

На другі дзень стварыў Бог неба, якое вы бачыце над сабой.

На трэці дзень Бог сабраў усю ваду, якая цякла па зямлі, у моры, рэкі, азёры, ручайкі. А дзе вады не было, утварыліся вялікія і малыя горы.

І сказаў Бог на трэці дзень: «Няхай растуць на зямлі травы, гародніна, кветкі. Няхай на зямлі растуць розныя дрэвы і прыносяць плады. На кожным дрэве няхай растуць свае плады: на яблыні — яблыкі, на рабіне — рабіны, на арэшыне — арэхі, на вішні — вішні».

Так і сталася, як сказаў Бог. Зямля адразу папрыгажэла.

На чацвёрты дзень Бог стварыў на небе свяцілы. І загадаў, каб адно свяціла працавала днём, а другое — ноччу з мноствам зыркіх падсветак. Пэўна, самі здагадаецеся, што стварыў Бог.

На зямлі стала светла, але ўсюды панавала мёртвая цішыня. Падумаў Бог і на пяты дзень пусціў у ваду рыб, а ў паветра — птушак. Ажылі вада і паветра.

На шосты дзень Бог стварыў жывёл і звяроў. І з'явіліся яны на зямлі кожнага роду па пары, каб маглі размнажацца.

Вось цяпер на зямлі стала добра і весела. *Уладзімір Ліпскі*

Ці запомнілі вы, у якія дні і што стварыў Бог? Паўтарыце і запомніце. Ці цікава ўсё гэта?

## АДКУЛЬ ПЕСНЯ

Даўным-даўно жыў на нашай зямлі жорсткі, люты пан. Людзі працавалі на яго ад цямна да цямна, а яму ўсё было мала... Вырашыў ён аднойчы сам паглядзець, як працуюць сяляне. Пад'ехаў на ўскраек поля і чуе — гучыць песня: «Жніце, жнеечкі, жніце ды на сонейка глядзіце. Сонейка зайшло, а мы ўсё жнём».

Як гэта так! Яго сяляне ім незадаволены!

Раззлаваўся пан: на яго, пана, крыўдуюць! Захацеў ён даведацца, хто склаў тую песню. Панскія паслугачы падказалі свайму ўладару, што жыве ў лесе дзіўны хлапчук-музыка. Як зайграе на дудачцы вясёлую «Лявоніху», здаецца, снапы на полі скачуць.

Ой-ой-ой!
Ой, Лявоніха, Лявоніха мая,
Ты такою прыгажуняй не была.
Як збяромся мы ў свята пагуляць,
Нам Лявоніхі сваёй не пазнаць.
Ах, Лявоніха, Лявоніха мая,
Ты сягоння, нібы ружа, расцвіла!

А як заспявае песню сумную, дык рукі апускаюцца, плакаць хочацца.

Ой, палын мой, палыночак,
Палын — горкая трава,
Гарчэй цябе, палыночак,
Ва ўсім свеце ды няма.

Ой ты, доля, мая доля,
Доля горкая мая,
Гарчэй цябе, мая доля,
Ва ўсім свеце ды няма.

Напэўна, той хлапчук і склаў песню жнеям.

І загадаў пан адшукаць малога музыку. Ідуць слугі дзень, два, тры. Нідзе няма хлапчука, а наўкол усё спявае, гамоніць. Прыклаў адзін з хлапчукоў вуха да зямлі ды і кажа: «Браткі мае, дык гэта ж зямля спявае, зямля тут такая»... Так сказаў не толькі той хлапчук.

Ці то полем, ці то лесам ішлі тры падарожнікі. Ішлі яны тры дні і тры ночы, ды яшчэ паўдня. Прытаміліся. Прыселі. Раптам чуюць — спявае нехта. Прыслухаўся першы:

— Відаць, жаўранак.

— Не, — кажа другі, — гэта лес шуміць.

А трэці прыпаў вухам да зямлі і прашаптаў:

— Ды гэта ж зямля наша спявае.

● Вось якая ў нас зямля наша беларуская. Таму ў нас і песні народныя вельмі прыгожыя. Давайце з вамі заспяваем народную песню. Якую вы хочаце заспяваць песню: вясёлую ці сумную? Паслухайце, калі ласка, словы песень і мелодыі і самі выберыце. *Добра*? І скажыце мне, якая песня вясёлая, а якая **сумная**.

*Першая песня*

Саўка ды Грышка ладзілі дуду,
Павесяліцца ды прагнаць нуду.
Дуду, дуду, дуду, дуду,
Ды прагнаць нуду.

Як разышліся музыкі, гуча,
Згінула гора, згінула туга.
Гу-га-га-га, гу-га-га-га,
Згінула туга.

Дзядок старэнькі, ёмкі ўзяўшы спрут,
Кіем на дзверы паказаў ім тут.
Ту-ту-ту-ту, ту-ту-ту-ту,
Паказаў ім тут.

Вы сабе дуйце сваё го-ца-ца,
Толькі не страшце малога хлапца.
Го-ца-ца-ца, го-ца-ца-ца,
Малога хлапца.

*Другая песня*

Як памерла матулька
Ажаніўся татулька,
Ды паслалі сірацінку
У сыр-бор па малінку.

Ужо сонца заходзіць,
Сірата не прыходзіць...
Ідзі, бацька, шукаці
Сваяго ты дзіцяці.

Ды стаяла каліна,
А пад ёю маліна;
Там сіротка хадзіла
Сваю мамку будзіла.

Ой, устань, устань, мамка,
Цябе кліча дзіцятка,
Пашкадуй ты сіротку,
Расчашы мне галоўку.

## ВОЗЕРА НАРАЧ

### (Легенда)

У гушчары старых бароў, як сляза, упаўшая з неба, блішчала вялікае возера. Вельмі прыгожым яно было. Аповеды пра яго чароўнасць ішлі ад паселішча да паселішча і нават у далёкія краіны заходзілі.

А яшчэ казалі людзі, што ў вёсцы, што прыляпілася да аднаго з берагоў возера, жыла дзяўчына-сіраціна па імені Найрыта. Аднавяскоўцы звалі яе Нарай. Вочы яе блакітныя, колеру азёрнай хвалі, заўсёды весела ўсміхаліся. Залацістыя валасы тугой касой абкручвалі галаву. Голас у яе быў высокі і гучны.

Бывала, сядзе Нара на беразе пад разлапістым клёнам, дзе збіралася звычайна моладзь, на гусельках грае і спявае. Спачатку голас павольна плыве, а пасля ўзлятае высока і ляціць над прыбярэжжам. У гэты час і птушкі спынялі свой спеў. Людзі забываліся пра сваё гора.

Аднойчы, калі Нара спявала, праязджаў вёскай стары пан. Пачуў ён дзівосную песню і загадаў спыніць каня. Слухаў, слухаў і сазаў Нары:

— Прыгожая кветка вырасла ў бедным краі. Табе толькі спяваць у маіх пакоях.

— Кепская з мяне будзе служанка, — прамовіла Нара.

— Ты будзеш гаспадыняй, жонкай маёй — зазначыў пан.

Вакол Нары сядзелі на зялёнай мураве хлопцы і дзяўчаты. Адзін з іх, чарнявы хлопец, падышоў да пана.

— Гэта мая нявеста, — сказаў ён, — а пан няхай сярод паноў жонку шукае.

— Ці не сын ты таго Пятра, што бунтаваў мне народ? — успомніў пан, чырванеючы ад злосці. І закрычаў: — Узяць яго!

Прыслужнікі звязалі Андрэйку і павезлі ў маёнтак. Больш яго ніхто не бачыў. Праз некаторы час пасля гэтага здарэння пан зноў прыехаў да Нары даведацца, ці згодна яна да шлюбу. Дзяўчына зрабіла выгляд, што згадзілася. Тут жа дамовіліся пра вяселле.

Надышоў гэты дзень. Злосны вецер гнаў цёмныя хмары, а лес спяваў жалобныя песні. Нара ехала на фурманцы ў маёнтак, у руках трымала пакунак. Сустрэлі яе служанкі. Завялі ў панскія пакоі і апранулі ў шлюбнае адзенне. І Нара выйшла такой прыгажуняй, што ні пяром апісаць, ні ў казцы сказаць. Пакланілася яна пану ды папрасілася перад шлюбам крышку адной пабыць у пакоях. Пан згадзіўся. Ходзіць па дварэ, на служанак пакрыквае і на дзверы паглядае.

А Нара тым часам з пакунка дастала смалякі ды падпаліла пакоі адзін за другім. І калі шуганулў чорны дым з акон, а на даху заскакалі чырвоныя языкі полымя, выскачыла праз акно і на сваёй фурманцы, паганяючы каня, паехала ў вёску. Прыйшла на тое месца, дзе з Андрэйкам часта сустракала ўсход сонца, прыхілілася да клёна і горка заплакала.

Ды тут пачуўся конскі тупат. Прыехалі панскія служакі. Бегалі па ўсёй вёсцы. Людзей бізунамі білі. Дапытваліся, дзе Нара.

— Вось яна — закрычаў адзін з іх.

— Жывую не возьмеце, — крыкнула ворагам дзяўчына і кінулася да возера.

Цёмныя хвалі з белымі грабянямі ішлі адна за другой, а на беразе калыхаўся човен. Той човен, у якім Нара з Андрэйкам не раз каталіся. Спрытна і ўмела ўхапілася яна за карму і, адштурхнуўшыся ад берага, села ў човен.

— Я адпомсціла, пан, за Андрэйку, за яго бацьку і за ўсіх тых, хто загінуў ад тваіх рук у тваім маёнтку, — прашаптала Нара.

Ад злосці панскія служкі кінулі гуслі ў возера. А човен адплываў усё далей і далей, потым зусім знік у хвалях.

З таго часу і назвалі людзі возера імем смелай дзяўчыны. Да нашых дзён дайшла назва Нарач.

● Ці быў хто з вас на возеры Нарач? Ці хочацца вам цяпер паехаць на Нарач, прыгадаць, гледзячы на красу возера, вось гэту легенду? Дык чаму возера мае назву Нарач? Хто з вас што хацеў бы сказаць пра Найрыту — Нару? Якія ў яе былі вочы? Ці напаміналі яны хвалі возера? Ці вясёлая была Нара? Ці часта яна ўсміхалася? Ці прыгожая ў яе была ўсмешка? Ці насіла яна касу вакол галавы? Ці ўмела Нара іграць і спяваць? Чаму людзі забываліся пра сваё гора, калі спявала Нара? Чаму пан, пачуўшы голас дзяўчыны, загадаў спыніць каня? Ці ўсцешылася Нара, як пан запрасіў яе ў свой палац? А чаму яна не ўсцешылася? Там жа лепш было б ёй жыць: у раскошы, у багацці. Як вы думаеце? Чаму пан загадаў звязаць Андрэйку? Што ж ён зрабіў дрэннага? Ці згадзілася Нара стаць панскай жонкай? Што яна зрабіла ў дзень вяселля? Куды паехала пасля таго, як падпаліла панскія пакоі? Што Нара зрабіла, як убачыла, што за ёю прыехалі панскія служкі? У які човен яна села? Чаму ўсю ноч стагналі і плакалі хвалі ў возеры? За што адпомсціла пану Нара?

## ЛЕГЕНДА ПРА МАГІЛЁЎ

Кажуць, на тым месцы, дзе цяпер стаіць прыгожы горад Магілёў, шумела векавая пушча. А ў пушчы той жыў разбойнік Машэка. Дрымучыя лясы, задумлівая рэчка Дняпро ды неба над галавой былі для Машэкі домам і ўцехай.

Жах наводзіў Машэка на ўвесь край. Ніводнага падарожніка не прапускаў, забіваў.

А сам у начной цішы горка плакаў па любай дзяўчыне. Дзяўчыну звалі Прадаслава. Яе, яго нявесту, князь сілком забраў у свой замак. Туды не прабрацца Машэку Вось і жыве ён у лесе разам з сябрамі-разбойнікамі. Апрануты ў

воўчыя шкуры, помсціць усім, хто асмеліцца завітаць сюды, у пушчу.

Аднойчы сядзеў Машэка на камені, звесіўшы галаву ў журбоце, ды раптам чуе конскі тупат. Ён рынуўся да вазка і ледзь не аслупянеў, ледзь не страціў прытомнасць. Там сядзеў князь з яго Прадаславай...

Машэка ў гневе забіў князя, а сваю любую прынёс у сваё логава. Але гэта была ўжо не тая Прадаслава, якую ён бязмежна кахаў. Яна прызвычаілася да раскошы і беднага, бедна апранутага Машэку яна болей не кахала. Яна сумавала па свайму пану. І калі знясілены Машэка прылёг адпачыць, Прадаслава забіла яго нажом.

Сябры-разбойнікі пахавалі іх разам: забітага Машэку і жывую Прадаславу. Насыпалі над імі курган і назвалі Магілай Льва. А горад, які потым узнік на гэтым месцы,— Магілёвам.

Над магілаю дрэвы палі,
І горад вырас, як з зямлі,
Яго Магілёвам назвалі
Інакш прыдумаць не маглі.

● Вось якая сумная гісторыя пра горад Магілёў. Янка Купала, наш вялікі паэт, напісаў паэму, якая называецца «Машэка». Як вырасцеце, вы яе абавязкова прачытаеце і прыгадаеце гэту легенду. Мне б вельмі хацелася, каб вы сёння вечарам расказалі гэту легенду дома. Паспрабуем цяпер расказаць яе разам. Тады вечарам зрабіць гэта будзе лягчэй.

## СЛУЦКІЯ ПАЯСЫ

Ці чулі вы такую калыханку: «Пайшоў Лёнік у лясок, знайшоў сабе паясок слуцкае работы»? Мабыць, не, не чулі, бо калыханка гэта з даўніх часоў, і як сама легенда пра слуцкіх ткачых, пра іх умелыя «залатыя рукі, што тонка пралі, звонка ткалі ды размыслова ўзор клалі». Хочацца нагадаць яшчэ вам прыгожыя і сумныя радкі Максіма Багдановіча пра ткачых.

Ад родных ніў, ад роднай хаты
У панскі двор дзеля красы
Яны, бяздольныя, узяты
Ткаць залатыя паясы.

Паясы насілі ўсе. Больш просты, сатканы з воўны ды лёну, меў кожны беларускі селянін. Бо пояс лічыўся самым галоўным упрыгожаннем у тагачасным беларускім адзенні. Паны насілі шаўковыя паясы.

Першыя паясы пачалі ткаць у горадзе над Случчу ў майстэрні, якую заснаваў князь Радзівіл. Майстроў-ткачоў на Случчыне было шмат, бо гэта рамяство са старажытных часоў шанавалася ў народзе, лічылася за сапраўднае мастацтва. Беларускія майстры ўносілі ў малюнак паясоў узоры, што былі найбольш блізкія і родныя іх сэрцу, цешылі вока, зачароўвалі сваёй сціплай, але непаўторнай красой.

Паясы ткалі доўгія, з шаўковых, залатых і срэбраных нітак. На рагу пояса, з абодвух бакоў, ткалася метка: «Слуцк», «У горадзе Слуцку», «Зроблена ў Слуцку».

Слуцкія паясы даўно сталі нашай гісторыяй, найвялікшым скарбам беларускага народнага мастацтва. Іх можна ўбачыць у музеях.

Не звялося знакамітае рамяство слуцкіх умельцаў. Сёння ў горадзе Слуцку працуе фабрыка мастацкіх вырабаў. І на тканых паясах, што вырабляюць тут, можна ўбачыць малюнкі і ўзоры славутых калісьці слуцкіх паясоў, паясоў з легенды. Магчыма, як і ўзоры, жыве сярод людзей і даўняя прызабытая калыханка: «Пайшоў Лёнік у лясок, знайшоў сабе паясок слуцкае работы». Магчыма. *Паводле Міколы Чарняўскага*

● Людзі вучацца адзін у аднаго рабіць нешта прыгожае: ткаць ручнікі і паясы, рабіць посуд з гліны, цацкі з дрэва і саломы. Усе мы любім вырабы, зробленыя ўмелымі рукамі. Такія вырабы называюцца сувеніры. Калі на якое-небудзь свята ўмельцы прадаюць свае вырабы, там збіраецца шмат людзей. Яны ахвотнна купляюць прыгожыя рэчы, каб падарыць іх сваім родным, блізкім. Дзіва, як са звычайнай саломкі, з кавалка дрэва, з кудзелі нараджаецца цуд! А вы ўмееце рабіць прыгожыя цацкі?

Дзеці, якія жывуць каля Слуцка, на Случчыне, тыя, у каго мамы і бабулі ўмелі ткаць славутыя слуцкія паясы, навучыліся ад іх ткаць таксама. І цяпер ёсць слуцкія ткачыхі. Яны ткуць прыгожыя, хоць і не такія, як раней, паясы, якія славяцца не толькі ў нашай краіне, але і за мяжой.

А навошта нам паясы? Калі мы іх носім? Хто іх падпяразвае цяпер і калі? А раней пояс усе насілі — і простыя людзі і паны. Пра гэта мы і прачытаем верш.

Паясочак сіні — недзе ад матулі,
а чырвоны, яры — мужу да кашулі,
а вось гэты — гожы, доўгі, з кутасамі —
падпярэзваў святам бабін дзед часамі.

Загудзелі дуды, гуслі заігралі,
брат скакаў, а з ветрам кутасы ляталі...
І слязу змахнула рукавом бабуся,
бо адзіны брат — той з вайны не вярнуўся.

А шырокі пояс, зложаны ў дзве столкі,
падпярэзваў калісь дзед бабулін толькі.
Зіхацеў на свіце, шырынёй бы ў пана,
толькі што не слуцкі, а ўдома тканы.

### ПАДАННЕ ПРА ЗАСНАВАННЕ МІНСКА

Некалі, даўным-даўно, на гэтым месцы, дзе цяпер Мінск, пасяліўся славуты асілак-знахар па прозванню Менск, ці Менеск. І пабудаваў ён на рацэ Свіслачы вялікі каменны млын на сем калёс. Ніхто самога Менеска не бачыў, тым не менш у навакольных мясцовасцях свіслацкай зямлі чуваць былі самыя фантастычныя апавяданні пра яго сілу. Кажуць, што ў яго млыне мука малолася не з жыта, а з камення. Кажуць, што ўначы чуліся нейкія дзіўныя крыкі, галёканне, песні, музыка і скокі. Кажуць, што апоўначы раз'язджаў ён на сваім млыне па селішчах і набіраў дружыну з храбрых, смелых, дужых людзей, з якіх пазней утварыўся цэлы народ і пасяліўся побач з млынам.

Тут і быў заснаваны горад і названы імем волата — Менеск. Пасля назвалі яго Менск. Доўга горад наш называўся Менск, а потым Менск сталі называць Мінск. Многія гарады нашы памянялі сваю назву. Нядобра так рабіць, але ж часам так бывае, што лепшае мяняецца на горшае. Некалі нашае сучаснае Гродна называлася Гародня, сучасны Брэст — Бярэсце, Гомель — Гомля, Слуцк — Слуцак, Полацк — Полацак, Навагрудак — Наваградак. Можа, вернуцца да нас гістарычныя назвы гарадоў і вёсак? Як вы думаеце?

● Гісторыя. Ці ведаеце вы, што гэта слова значыць? Гэта такая навука, якая апавядае нам пра тое, што было даўней, пра наша мінулае. У кожнага народа сваё мінулае. Яго трэба ведаць. Як вы вырасцеце, то пра многае цікавае даведаецеся са старажытных кніг. Магчыма, некаторыя з вас будуць гісторыкамі: будуць вывучаць мінулае і пісаць новую гісторыю.

## МЫ ГУЛЯЕМ У ТЭАТР

У тэатр дзеці ходзяць з радасцю, а яшчэ з большай радасцю ўдзельнічаюць у тэатральнай дзейнасці. Яны лёгка пераўвасабляюцца, шчыра вераць у кожнае слова герояў тэатралізаванага дзеяння. Лепшых акцёраў, як дзеці, цяжка знайсці.

Драматычнае дзеянне аказвае эмацыянальнае ўздзеянне на маленькага гледача, прымушае яго суперажываць з героем спектакля, вучыць яго думаць, разважаць. Такі самы жыватворны ўплыў аказвае спектакль і на дзяцей-акцёраў.

Апрача сказанага, праз гульню ў тэатр дзеці вучацца мове, знаёмяцца з фальклорам, паэзіяй, з народнымі традыцыямі. Падрыхтоўка тэатралізаванай сцэнкі дае магчымасць выхавальніку вучыць дзяцей прыгожа, гучна вымаўляць словы, адчуваць рытм, музыку беларускай мовы.

У працэсе падрыхтоўкі любой, нават маленькай сцэнкі, якую будуць глядзець толькі дзеці ў групе, выхавальнік раскрывае лінію паводзін герояў драматычнага тэксту, тлумачыць іх узаемаадносіны, характары, вучыць маленькіх акцёраў слухаць партнёра, а не механічна паўтараць словы сваёй ролі. Выхавальніку неабходна імкнуцца да таго, каб дзіця не пераймала манеру вымаўлення, інтанацыю дарослага, а трымалася сваёй натуральнай інтанацыі.

Добра, калі педагог працуе над сцэнкай разам з дзецьмі, калі ён раіцца з імі, як і што лепш зрабіць. Добра, калі ролі вывучаць усе дзеці. Тады можна будзе мяняць акцёраў у паказах аднаго і таго ж спектакля. Падрыхтаваныя спектаклі трэба захоўваць у рэпертуары і час ад часу звяртацца да іх.

Рыхтуючы сцэнку, выхавальнік мае магчымасць патроху расказваць дзецям пра тое, як зарадзіўся тэатр, пра

батлейку, пра нашых тэатральных дзеячаў, пра сучасныя тэатры.

Мы спадзяёмся, што матэрыял гэтага раздзела дапаможа выхавальнікам зрабіць жыццё дзяцей не толькі змястоўным, але і цікавым, дзівосным, што работа над інсцэніроўкамі прынясе выхаванцам шмат радасці, узбагаціць іх веды.

Аўтары размеркавалі матэрыял для гульні ў тэатр наступным чынам. Пад загалоўкам «Мы гуляем у тэатр кожны дзень» аб'яднаны кароценькія сцэнкі, зробленыя паводле невялікіх апавяданняў ці вершаў. Дарэчы, пры жаданні педагог можа сам зрабіць інсцэніроўку якога-небудзь верша.

«Мы даём канцэрты для гасцей». У гэты падраздзел уваходзяць большыя па аб'ёму інсцэніроўкі, зробленыя паводле вершаў, казак, апавяданняў, а таксама сцэнарыі на розныя тэмы («Цацкі», «Музычная палічка» і г. д.). У падраздзел «Мы рыхтуемся да свята» ўвайшлі сцэнарыі правядзення такіх свят, як Каляды, Купалле, Новы год. І завяршаюць раздзел дзве невялікія інсцэніроўкі пад назвай «Гэта ведаць трэба ўсім».

## МЫ ГУЛЯЕМ У ТЭАТР КОЖНЫ ДЗЕНЬ

### Храбрэц

(Паводле верша Паўлюка Пранузы)

Дзеючыя асобы: вядучы хлопчык Аляксей, гусак.

*Дзея адбываецца на двары каля лаўкі.*

**Вядучы:** Расхрабрыўся Аляксей.

**Аляксей** *(ідзе і падкідвае мячык, хваліцца):* Не баюся я гусей! *(Стаў на лаўку).* Хто цяпер мяне дастане? *(Рукі ў бокі, мяч паклаў на лаўку.)*

**Гусь** *(ідзе і шыпіць, шчыпле хлопца з усіх бакоў):* Ш-ш-ш! Ш-ш-ш!

**Аляксей** *(падымае то правую, то левую нагу)*: Ой, баюся! Ой, баюся!

**Вядучы:** А гусак аж засіпеў,
Выхваляк ён не цярпеў.
*Хлопчык уцякае, гусак за ім.*
Вось так!
Хто пахваліцца,
Той праваліцца.

## Мышка, мышка, дзе была?

(З народнага)

Дзеючыя асобы: мама-мыш, дачка-мышка, кот.

*Маці-мыш ганяецца за дачкой-мышкай, якая бегае вакол стала. У куце сядзіць кот.*

**Маці:** Мышка, мышка, дзе была?

**Дачка** *(бегае):* Была ў пана караля.

**Маці:** Што рабіла?

**Дачка** *(бярэ са стала лыжку і паказвае):* Лыжкі мыла.

**Маці:** А што далі?

**Дачка:** Кусок сала. *(Паказвае рукамі, які вялікі кусок сала.)*

**Маці:** Дзе паклала?

**Дачка:** Пад лаўкаю. *(Глядзіць пад лаўку.)*

**Маці:** Чым накрыла? *(Таксама глядзіць пад лаўку, але нічога пад ёю не знаходзіць.)*

**Дачка:** Халяўкаю. *(Шукае сала пад лаўкаю разам з маці.)*

**Маці** *(грозна)*: Дзе падзела?

*З'яўляецца Кот. Убачыўшы мышак, ён пачынае ганяцца за імі. Не дагнаўшы, садзіцца на падлогу, дастае з торбы кавалак сала, пачынае есці. Мышкі моўчкі пазіраюць на яго. Кот, з'еўшы сала, пацягваецца, кажа «мяў» і засынае на падлозе.*

## Пчала і муха

(Казка)

Дзеючыя асобы: муха, пчала, вядучы.

*Дзеянне адбываецца на лузе, сярод кветак. Муха адпачывае каля кветак, пазяхае.*

**Муха:** Як добра на свеце жыць! *(Нюхае кветкі, а потым ад іх паху засынае.)*

**Пчала** *(ляціць)*: Ж-ж-ж!

**Муха:** *(прачнулася, сярдзіта)*: Хто гэта? *(Заўважае пчалу.)* Ах ты, нягодніца! Чаго тут над вухам стогнеш, мне спаць не даеш!

**Пчала:** Ж-ж-ж! Выбачай! Я шмат мёду нясу, дык і стагну ад цяжару. *(За плячыма ў пчалы торбачка з мёдам.)*

**Муха** *(смяецца):* Ха-ха-ха! Сядай! *(Пчала сядае побач з мухай.)* Шмат мёду нясеш, а сама, нябось, галодная: вунь якая худая. Як мыш з царквы. Адны косьці тырчаць.

**Пчала:** Так. Мы пчолы, збіраем цуды, а самі худы!

**Муха** *(здзіўлена)*: А чаму ж вы худы? Мёд жа ў вас ёсць.

**Пчала:** Дык жа мёд мы збіраем не толькі сабе, а і сваім дзеткам, і гаспадару, які нам хатку зрабіў, даглядае нас.

**Муха** *(махае крыламі)*: Чакай, чакай! Як гэта можна збіраць мёд для іншых? Мы, мухі, так не робім.

**Пчала** *(падымаецца і збіраецца дахаты)*: Няма мне калі з табою гаманіць: трэба дзеткам мядовую кашу варыць. *(Паляцела.)*

**Муха** *(ёй услед)*: А дзе возьмеш мядовую кашку?

**Пчала:** На сабе вязу!

**Муха:** У чым? *(Устае.)*

**Пчала:** У вазку, у палазку, і за пазушкай. *(Здалёк.)* Ж-ж-ж... *(Знікла.)*

**Муха** *(паляцела за пчалой)*: У чым? У чым?

**Вядучы** *(выходзіць на сярэдзіну сцэны)*: Адзін працуе цэлы дзень, а другі глядзіць, дзе лепшы цень.

## Дудка-чараўніца

(Паводле верша Вольгі Іпатавай)

Дзеючыя асобы: хлопчык, ліса, мядзведзь.

*Дзея I адбываецца ў лясной хатцы. Хлопчык бярэ дудку і іграе на ёй. Ліса пазірае на хлопчыка збоку праз акенца.*

**Хлопчык:** Дудка-чараўніца,
Паіграй, сястрыца!

*Хлопчык іграе на дудцы.*

**Ліса** *(убок)*: Чараўніца?

*Хлопчык іграе на дудцы мелодыю беларускай народнай песні «Перапёлачка», потым вырашае пазваць сваіх сяброў, каб паслухалі, як гучыць яго дудка. Кладзе дудку на лаўку, якая стаяла пад акном, і ідзе з хаты клікаць сваіх сяброў.*

**Хлопчык:** Пайду паклічу сваіх сяброў. Няхай яны паслухаюць, як я іграю. Янка! Алесь!

*Тым часам ліса крадзе дудку і ўцякае.*

**Хлопчык** *(вярнуўся без сяброў)*: Ні Алеся, ні Янкі няма дома. Пачакаю іх і зноў паіграю на дудцы *(ідзе да лаўкі, на якой ляжала яго дуда, шукае яе)*. Што за гора, за бяда? Дзе падзелася дуда?

Ні на лаўцы *(глядзіць на лаўку)*,
Ні на даху *(глядзіць на дах)*,
Ні пад печкай *(глядзіць пад печку)*,
Ні пад пахай *(глядзіць пад паху)*.

*Садзіцца на лаўку, апусціўшы галаву.*

Ах ты, дудка мая,
Дудка,
Дзе ж ты так
Прапала хутка?

Пайду яе шукаць *(устае і ідзе з хаты).*

*Дзея II адбываецца ў лесе.*

**Ліса** *(ідзе да мядзведзя, які сядзіць на пяньку, есць мёд, звяртаецца да яго):*

Дзядзька, вечарам прыходзь,
І мядзведзіху прыводзь!
Каб паслухалі дуду (паказвае дудку)!
Я ж пайду шукаць дзіка
Ды шаноўнага ваўка.
Ды астатніх прывяду,
Каб паслухалі дуду.

*(Круціць дудою перад носам мядзведзя).*

І яна — чароўная,
З іншымі не роўная!
Я скажу ёй: «Зайграй,
Каб пачуў мяне ўвесь край.

*Ліса збіраецца ісці.*

**Мядзведзь** *(устае з пянька):*

Не, цяпер, ліса, давай
Полечку зайграй!
І збяруцца ўсе сюды
Лясныя жыхары!

**Ліса:** Добра, пайграю. *(Дзьме ў дудку, дудка не іграе. Ліса глядзіць на яе здзіўлена.)* Дудка нешта не пяе!

**Мядзведзь** *(убок)*: Што ні робіць — усё дарма!

*Ліса і так і гэтак круціць дудку, яна ўсё не пяе. Недзе здалёк ідзе хлопчык, які шукае дудку. Ліса заўважае хлопчыка і ад сораму кідаецца наўцёкі, кінуўшы дудку.*

**Хлопчык:** Вось знайшлась мая дуда!

*Бярэ дудку.*

Дзьмухнуў ціха ў яе —
І дуда пяе *(грае на дудцы «Польку-Янку»).*

*Мядзведзь прытопвае нагой і пляскае ў далоні.*

**Мядзведзь:** Раскажы мне, а чаму
Табе, Янка, аднаму
Грае песенькі дуда?

**Хлопчык:** Трэба ўмець іграць —
Тады
З самай простае дуды
Паліецца песенька.
Звонкая ды весняя.
Будуць слухаць
Яе людзі,
Чараўніцай
Клікаць будуць!

*Хлопчык іграе на дудцы польку, мядзведзь пускаецца ў скокі, за ім скачуць усе звяры.*

## МЫ ДАЁМ КАНЦЭРТЫ ДЛЯ ГАСЦЕЙ

### Муха-пяюха

(Казка)

Дзеючыя асобы: муха-пяюха, вавёрка, мышка, жабка, заяц, воўк.

*На сцэне ў розных кутках стаяць хаткі звяроў. Вавёрка ў сваёй хатцы мяце падлогу, мышка ў сваёй хатцы шые сукенку, жабка прасуе бялізну. Заяц сцеражэ сваю хатку, ходзіць з ружжом вакол яе. Едзе муха ў калясцы. Спявае песеньку. Спыняецца каля хаткі вавёркі.*

**Муха:** Добры дзень, спадарыня!

**Вавёрка:** Добры дзень, спадарыня! Як спадарыню зваць-велічаць?

**Муха:** Я — муха-пяюха. А ты хто?

**Вавёрка:** А я — па елках скакуха. Сядай. Частуйся арэхамі *(частуе муху).*

**Муха:** Дзякуй *(частуецца).* А можа, паедзем разам на кірмаш?

**Вавёрка:** На кірмаш?

**Муха:** На кірмаш.

**Вавёрка:** Паехалі!

*Паставіла мятлу ў кут. Едуць яны разам у калясцы, спяваюць песеньку. Пад'ехалі да мышкінай хаткі.*

**Муха:** Добры дзень, спадарыня!

**Мышка** *(выходзіць з хаткі):* Добры дзень! Добры дзень, спадарыні! Як спадарыняў зваць-велічаць?

**Муха:** Муха-пяюха *(махае крыламі).*

**Вавёрка:** А я вавёрка, па елках скакуха (скача). Скок-скок!

**Муха, вавёрка** *(разам)*: А ты хто?

**Мышка:** А я на паліцах скрабатуха. Пі-пі-пі *(круціцца вакол сябе).*

**Муха:** Сядай, паедзем разам.

**Мышка:** Куды?

**Муха, вавёрка:** На кірмаш.

**Мышка:** Паехалі *(паклала іголку, сукенку).*

*Едуць яны разам, спяваюць песенькі. Спыняюцца каля жабкінай хаткі.*

**Жабка:** Добры дзень, панове! Як вас зваць-велічаць?

**Муха:** Муха-пяюха *(папраўляе стужку на шыі).*

**Вавёрка:** А я вавёрка, па елках скакуха *(скача).* Скок-скок!

**Мышка:** А я мышка-мышуха, па паліцах скрабатуха *(пляскае ў далоні).* Пі-пі-пі *(круціцца вакол сябе).*

**Муха, вавёрка, мышка** *(разам)*: А ты хто?

**Жабка:** А я жабка-жабуха, па сажалках рагатуха. Ква-ква-ква *(растапырвае пальцы і рагоча).*

**Муха, вавёрка, мышка:** Сядай, паедзем разам.

**Жабка:** Куды?

**Муха:** На кірмаш.

**Жабка:** Добра! *(Выцерла рукі аб фартух, зняла яго і паехала разам з гасцямі. Едуць яны, спяваюць песеньку. Спыніліся каля зайцавай хаткі.)*

**Муха:** Добры дзень, паночку!

**Заяц:** Добры дзень, панове! *(Падыходзіць да гасцей.)* Як вас зваць-велічаць?

**Муха:** Муха-пяюха *(кажа весела, нараспеў).*

**Вавёрка:** А я вавёрка, па елках скакуха. Скок-скок! *(Скача.)*

**Мышка:** А я мышка, па паліцах скрабатуха. Пі-пі-пі. *(Скрабе пальчыкам у паветры.)*

**Жабка:** А я жабка-жабуха, па сажалках рагатуха. Ква-ква-ква! *(Рагоча.)*

**Усе:** А ты хто?

**Заяц:** А я заяц-вартаўнік, праз дарогу скок *(робіць падскок).*

**Усе:** Сядай, паедзем разам.

**Заяц:** Куды?

**Усе:** На кірмаш!

**Заяц:** Згода! Паехалі! *(Ружжо пакідае ў хатцы. Едуць усе разам, спяваюць песеньку. Насустрач ім ідзе воўк і спыняе павозку, махаючы лапамі.)*

**Воўк:** Добры дзень, панове! Як вас зваць-велічаць?

**Муха:** Муха-пяюха.

**Вавёрка:** А я вавёрка, па елках скакуха.
**Мышка:** А я мышка, па паліцах скрабатуха.
**Жабка:** А я жабка-жабуха, па сажалках рагатуха.
**Заяц:** А я заяц-вартаўнік, праз дарогу скок.
**Усе:** А ты хто?
**Воўк:** А я галодны воўк, зубамі шчоўк, зараз я вас усіх з'ем. Гм... *(шчоўкае зубамі).*
**Усе:** Не трэба нас есці. Паехалі з намі.
**Воўк:** Куды?
**Усе:** На кірмаш! Там будзе што паесці.
**Воўк:** Паехалі *(садзіцца ў павозку).*
*(I ўсе разам з песняю паехалі на кірмаш).*

Баба Ева, дзед Тамаш.
Го-го-го!
Паехалі на кірмаш.
Го-го-го!
Што павезлі прадаваць?
Го-го-го!
Тое цяжка адгадаць.
О-хо-хо-хо-хо!

## Мядовая хвароба

(Паводле верша Міколы Гамолкі)

Дзеючыя асобы: 1-ы вядучы, 2-і вядучы, 1-я пчала, 2-я пчала, 3-я пчала, мядзведзь, ліса, воўк, вожык, бусел.

*Танец кветак. Вылятаюць пчолкі. Танец пчолак. Пчолы збіраюць мёд: падлятаюць то да адной кветкі, то да другой, нахіляюцца над імі.*

**1-ы вядучы** *(стаіць з правага боку пляцоўкі)*:
Рана-раненька пчала
Пакідала вулей,
**2-і вядучы** *(стаіць з левага боку пляцоўкі)*:
Заспявала-загула,
Каб усе пачулі:
**1-я пчала** *(сур'ёзна-сурова)*:
Жу-жу-жу, жу-жу-жу *(аблятае кветачку)*,
я без справы не сяджу,
Жу-у *(збірае з кветак мядок у збаночак).*
**2-я пчала** *(з кветкамі ў руках)*:
Палячу я на лужок *(паказвае рукой у бок лужка).*

Потым — на палетак.
І збяру духмяны сок
З самых лепшых кветак *(паказвае кветкі, а потым збірае мядок у кубак).*

**3-я пчала** *(прытанцоўвае):*
Жу-жу-жу, жу-жу-жу,
Я над кветкамі кружу,
Жу-у... *(збірае мядок у шклянку).*

*Гучыць музыка. Выходзіць мядзведзь. Падыходзіць да бочкі з мёдам. Лезе за мёдам. Пчолы ляцяць на мядзведзя, кусаюць яго. Мядзведзь раве і падымае лапу. Пчолы разлятаюцца.*

**1-ы вядучы:** У мядзведзя Патапа
Забалела лапа.

**Мядзведзь:** Ой, пячэ! Трываю ледзь *(перавальваецца з нагі на нагу, махае лапай, раве).*

**1-ы вядучы:** На ўвесь лес раве мядзведзь.

**2-і вядучы:** Мышкавала недзе блізка,
Дык прыбегла першай ліска
І бядуе:

*Бяжыць ліска.*

**Ліса:** Ой, кумок,
Дзе ж ты лапу так апёк?

*Спагадліва аглядае мядзведзеву лапу.*

Трэба пер'ем аблажыць —
І нічога — будзем жыць!

*Гладзіць мядзведзя, шукае пер'я.*

*Гучыць музыка. Выходзіць воўк, падыходзіць да мядзведзя, аглядае лапу.*

**1-ы вядучы:** Воўк спяшаўся, аж узмок,
Паглядзеў на той апёк.
Кажа:

**Воўк:** Пацярпі крыху! *(Лашчыць мядзведзя.)*
А я ў аптэку пабягу,
І ўздыхнеш з палёгкай, можа,
Націранне дапаможа.

*Усміхаецца, дае цукерку, выбягае.*

*Гучыць музыка. Выходзіць вожык з кошыкам і кійком. Абыходзіць мядзведзя, які сядзіць і плача ад болю.*

**2-і вядучы:** Вожык, глянуўшы на лапу *(глядзіць праз акуляры)*, супакойвае Патапа.

**Вожык:** Сапраўды, апухла дужа,
Ды не вешай галавы,

Прынясу табе я, дружа,
Ліст трыпутніку-травы *(шукае травы).*

*З'яўляецца бусел.*

**Бусел:** Ты жывы яшчэ, Патап? *(Дзюбаю дакранаецца да мядзведзя.)*

**Мядзведзь:** Ой, памру! *(Раве, качаецца па падлозе.)*
Трываю ледзь!

**1-ы вядучы:** Тут прыбеглі зноў звяры —
Клапатлівыя сябры,
Прынеслі для ратавання
Пер'е, зёлкі, нацiранне...

*Выбягаюць усе звяры: ліса з пер'ем, воўк са шклянкай, вожык з лісцем.*

**2-і вядучы:** Бусел кажа ім:

**Бусел** *(ходзіць ганарліва туды-сюды)*:

Не трэба
Шкадаваць яго, глядзець!
Я мядзведзя бачыў з неба,
Біўся з пчоламі мядзведзь.

**Усе** *(глядзяць адзін на аднаго, перагаворваючыся)*: Біўся з пчоламі мядзведзь... Ой!..

**Бусел:** Ёсць такі жыццёвы ўрок:
Атрымаеш, што заробіш, —
У Патапа не апёк,
А мядовая хвароба!

**1-ы вядучы:** І раве —
Чуваць далёка:
Мёд яму вылазіць бокам!

*Мядзведзь раве. А ўсе звяры разыходзяцца, прыгаворваючы: «Мёд яму вылазіць бокам».*

## Як хлопчык шукаў сабе сяброў

(Паводле казкі «Што падумаў вожык»
Валянціны Асеевай)

Дзеючыя асобы: дзеці, хлопчык Васілёк, вядучы, зайчык, паляўнічы, вавёрка, мядзведзь, баба, вожык, вавёрчыны дзеці.

*Хлопчык есць варэнне, да яго падыходзяць дзеці, хлопчык хавае збанок з варэннем.*

**Дзеці:** Васілёк, пайшлі з намі вадзіць карагод.

**Васілёк:** Не, не хачу! *(Адмахваецца.)*

*Дзеці водзяць карагод «Залатыя дні — веснавыя дні» (муз. С. Альхімовіч). Пасля карагода ўцякаюць.*

**Вядучы:** У аднаго хлопчыка не было сяброў. Ніхто чамусьці з ім не хацеў сябраваць. Вось і пайшоў ён у лес шукаць сабе таварыша. *(Гучыць музыка. Хлопчык ідзе ў лес.)* Ідзе па дарозе Васілёк і бачыць на палянцы зайчыка. *(Заяц іграе на цымбалах беларускую народную мелодыю «Бульба».)*

**Васілёк** *(слухае, як іграе зайчык, а потым пытаецца ў яго):* Зайчык, зайчык! Хочаш быць маім таварышам?

**Зайчык** *(узрадавана):* Хачу!

*Гучыць вясёлая музыка. Заяц і хлопчык пайшлі разам. Насустрач — паляўнічы. Заяц спалохаўся, схаваўся за куст.*

**Паляўнічы:** Хлопчык, хлопчык, ці не бачыў ты зайца? *(Дае хлопцу цукерку.)*

**Васілёк** *(бярэ ў паляўнічага цукерку):* Бачыў, дзядзечка.

**Паляўнічы:** А дзе ён?

**Васілёк** *(паказвае ўбок):* Ды вунь ён за кустом сядзіць.

*Стрэліў паляўнічы, але зайца ўжо і след прастыў.*

**Заяц** *(уцякаючы):* Здраднік!

**Вожык** *(з кустоў):* Ненадзейны друг страшней за ядавітага ворага *(знікае)*.

**Вядучы:** Ідзе хлопчык адзін па лесе. Зайшло сонейка. Падзьмуў ветрык. Сеў хлопчык і задумаўся.

**Васілёк:** Сумна аднаму жыць на свеце!

*Музыка. Раптам з'явілася вавёрка.*

**Вавёрка:** Хлопчык, хлопчык, што ты тут робіш?

**Васілёк:** Таварыша шукаю.

**Вавёрка:** Хочаш быць маім таварышам?

**Васілёк:** *(узрадавана):* Хачу. Вельмі хачу!

**Вавёрка:** Тады хадзі да мяне ў госці. *(Хлопчык ідзе да вавёркі ў госці. Вавёрка паклала перад ім арэхі, грыбы, ягады, шышкі.)* Еш і кладзіся спаць.

*Гучыць музыка калыханкі. З'яўляюцца дзеткі-вавёркі, ходзяць вакол хлопчыка і спяваюць яму калыханку. Хлопчык спіць. Вавёркі таксама паснулі. Хлопчык прачнуўся на досвітку, залез у вавёрчыну скрыначку, перасыпаў у сваю кішэню ўсе яе арэхі і пайшоў далей. З'яўляецца вожык.*

**Вожык:** Ненадзейны друг страшней за ядавітага ворага. *(Знікае.)*

*Хлопчык ідзе далей. Яму сустракаецца мядзведзь.*

**Мядзведзь:** Хлопчык, хлопчык, ты куды ідзеш?

**Васілёк** *(спалохана):* Та-та-таварыша шукаю.

**Мядзведзь:** Хочаш быць маім таварышам?

**Васілёк:** Хачу.

*Мядзведзь дае хлопчыку мёду. Сядаюць і разам ядуць. Чуецца брэх сабак. Выбягаюць сабакі.*

**Васілёк** *(звяртаецца да мядзведзя):* Не пакідай мяне, дружа!

**Мядзведзь:** Пабеглі разам! *(Бягуць.)*

**Васілёк:** Хутчэй! Хутчэй!

*Хлопчык і мядзведзь уцяклі ад сабак.*

**Мядзведзь:** Стаміўся я. Трохі пасплю, а ты павартуй.

*Мядзведзь спіць. Хлопчык есць цукерку.*

**Баба** *(ідзе, спыняецца каля мядзведзя):* Чый гэта мядзведзь? *(Кратае скуру мядзведзя.)*

**Васілёк:** Мой!

**Баба:** Прадай мне яго, я табе грошы заплачу.

**Васілёк** *(глядзіць на бабу з грашыма):* Добра, давай грошы *(бярэ грошы).*

*Мядзведзь прачнуўся, пачуў іх гутарку і ўцёк, сказаўшы: «Здраднік ты!» Баба паглядзела на хлопчыка, на ўцякаючага мядзведзя, забрала свае грошы і пайшла прэч. З'яўляецца вожык.*

**Вожык:** Ненадзейны друг страшней за ядавітага ворага. *(Знікае.)*

**Васілёк** *(сядзіць адзін, заве звяроў, плача):* Зайчык! *(У адзін бок гукае.)* Ваверка! *(У другі бок гукае.)* Міша! Дзе вы? *(У трэці бок гукае.)* Я ўсё зразумеў. Сябрамі не кідаюцца. Няможна прадаваць сваіх сяброў, няможна ім здраджваць. Я не буду так рабіць! Сябрамі трэба даражыць! *(Хлопчык ідзе шукаць сяброў. Гучыць сумная музыка.)*

**Вожык** *(з-за куста):* Ненадзейны друг страшней за ядавітага ворага. *(Знікае.)*

## «Каза-манюка»

(Народная казка)

Дзеючыя асобы: дзед, баба, дачка, каза, зайчык, воўк, мядзведзь, певень.

### I дзея

*Дзея адбываецца на сялянскім двары. Гучыць музыка. Дачка вядзе казу да плота і прывязвае яе. Да іх падыходзіць дзед.*

**Дзед** *(лашчыць казу і пытаецца ў яе):*

Каза мая, козачка, дзе была?
Што ты ела, што піла?

**Каза** *(маніць, скача каля дзеда):* Нідзе не была. Нічога не ела, нічога не піла. Толькі як бегла цераз масток, ухапіла кляновы лісток, а як бегла ля крынічкі, ухапіла кропельку вадзічкі...

**Дзед** *(сварыцца на дачку):* Дрэнна пасвіла казу. Ідзі прэч адсюль *(праганяе дачку са двара, а тая ідзе і плача. Дзед кліча бабу).* Баба, ідзі казу пасвіць!

*Сам сеў на прызбе, майструе кола. Гучыць музыка. Прыходзіць баба. Адвязвае казу ад плота.*

**Баба** *(звяртаецца да казы):* Пайшлі, мая козачка, у поле. *(Баба і каза пайшлі са двара.)*

**Дзед** *(майструе кола і спявае песню):*

Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець.
Калі ў маёй хатачцы
Парадак ідзець.

*Падыходзіць баба з казой. Баба прывязвае казу да плота. Падыходзіць дзед.*

**Дзед** *(лашчыць казу):*

Каза мая, козачка, дзе была?
Што ты ела, што піла?

**Каза** *(скача):* Нідзе не была, нічога не ела, нічога не піла. Толькі як бегла цераз масток, ухапіла кляновы лісток, а як бегла ля крынічкі, ухапіла кропельку вадзічкі.

**Дзед** *(сварыцца на бабу):* Дрэнна пасвіла казу. Ідзі прэч адсюль. *(Прагнаў бабу са двара.)* Пайду сам пасвіць казу. *(Гучыць музыка. Дзед адвязаў казу ад плота і пагнаў яе пасвіць. Накінуў на сябе хустку, надзеў сукенку, гоніць і кажа):*

Пі, мая козачка, пі.
Еш, мая козачка, еш.

**Каза** *(скача):* Добра наелася, добра напілася.

*Дзед пагнаў казу дахаты. Пераапрануўся.*

**Дзед** *(прывязвае казу, лашчыць яе):*

Каза мая, козачка, дзе была?
Што ты ела, што піла?

**Каза** *(скача):* Нідзе не была, нічога не ела, нічога не піла. Толькі як бегла цераз масток, ухапіла кляновы лісток, а як бегла ля крынічкі, ухапіла кропельку вадзічкі...

**Дзед** *(сярдзіта):* Не патрэбна мне каза-манюка! Ідзі прэч адсюль! *(Праганяе яе прутком.)*

**Каза:** Бэ-бэ-бэ. *(Уцякае.)*

## II дзея

*Дзея адбываецца ў лесе. Сярод дрэў, кустоў, елак стаіць хатка. Гучыць музыка.*

**Каза** *(убачыла хатку):* Якая цудоўная хатка! *(Абабегла яе вакол.)* Залезу ў яе і буду жыць у ёй. *(Зайшла ў хатку, убачыла зайца).* А ты, заяц, пайшоў прэч!

*Каза прагнала зайца. Сеў заяц пад елкай і плача. Ідзе воўк. Гучыць музыка.*

**Воўк** *(падыходзіць да зайца)*: Чаго, зайчык, плачаш? Чаго зажурыўся?

**Заяц** *(падняў галаву)*: Як жа мне не плакаць, як не журыцца? Была ў мяне хатка новая, яловая. Прыйшоў нейкі звер, рагаты ды барадаты, выгнаў мяне з хаткі, і сам у ёй жыве. А мяне не пускае. *(Плача нахіліўшы галаву.)*

**Воўк** *(храбра):* Ну, нічога. Не плач, нябога, я таго звера выганю. Пайшлі. *(Гучыць музыка. Заяц і воўк прыйшлі да хаткі.)* Гэй, звер рагаты-барадаты, збірай манаткі, ідзі прэч з зайчыкавай хаткі! *(Грукае ў дзверы.)*

**Каза** *(тупае нагамі, высоўвае рогі з акенца):* Закалю цябе рагамі, затапчу цябе нагамі, яшчэ і барадою замяту.

*Воўк спужаўся і ўцёк. Зайчык сеў каля елкі і плача. Музыка. Едзе мядзведзь на машыне, аб'язджае вакол елкі, дзе сядзіць заяц, спыняецца.*

**Мядзведзь** *(седзячы ў машыне):* Чаго, зайчык, плачаш? Чаго зажурыўся?

**Заяц** *(плачучы):* Як жа мне не плакаць, як не журыцца? Была ў мяне хатка новая, яловая. Прыйшоў нейкі звер рагаты ды барадаты, выгнаў мяне з хаткі і сам у ёй жыве. А мяне не пускае. *(Плача, выцірае хусцінкай вочкі.)*

*Мядзведзь выйшаў з машыны.*

**Мядзведзь:** Ну, нічога, нябога, не плач. Я таго звера выганю. Пайшлі. *(Мядзведзь з зайчыкам падыходзяць да хаткі.)* Гэй, звер рагаты, барадаты, збірай манаткі, ідзі прэч з зайчыкавай хаткі. *(Грукае ў акенца.)*

**Каза** *(тупае нагамі, высоўвае рогі з акенца):* Закалю цябе рагамі, затапчу цябе нагамі, яшчэ і барадою замяту!

*Мядзведзь спалохаўся, сеў у машыну ды і ўцёк. Зайчык сеў і плача. Музыка. Едзе певень на веласіпедзе і нешта спявае сабе, заўважыў зайчыка. Спыніўся каля яго.*

**Певень** *(пытае ў зайца, не сыходзячы з веласіпеда):* Чаго, зайчык, плачаш? Чаго зажурыўся?

**Зайчык:** Як жа мне не плакаць, як не журыцца? Была ў мяне хатка, новая, яловая. Прыйшоў нейкі звер рагаты

ды барадаты, выгнаў мяне з хаткі і сам у ёй жыве, а мяне не пускае. *(Плача.)*

**Певень:** Не плач, я такога звера, рагатага-барадатага, ведаю. Гэта дзедава каза-манюка. Скачы за мною, будзем казу выганяці. *(Певень паехаў на веласіпедзе, а зайчык паскакаў за ім.)* Ку-ка-рэ-ку! *(Спыніўся каля хаткі.)* Выходзь, каза, з хаткі!

**Каза** *(тупае нагамі):* Закалю цябе рагамі, затапчу цябе нагамі, яшчэ і барадою замяту!

**Певень** *(падыходзіць бліжэй да хаткі):*

Гэй, каза, збірай манаткі,
Уцякай хутчэй ты з хаткі,
Кукарэку! *(Махае крыламі.)*
Бо вунь дзед ідзе,
Ён касу нясе...

**Каза** *(спалохана выбягае з хаткі. Гучыць музыка. Певень лётае за ёю вакол хаткі, каза ўцякае ад яго):* Бэ-бэ-бэ! Не чапай мяне!

**Зайчык** *(падыходзіць да пеўня):* Дзякуй табе, братка-пеўнік! Будзем разам жыць, будзем шчыранька дружыць.

**Певень:** Будзем жыць-пажываць, ды дабра нажываць.

*Гучыць вясёлая музыка. Певень і зайчык скачуць вакол хаткі.*

## Цацкі

(Музычны занятак)

*Дзеці ўваходзяць у залу без музычнага суправаджэння, вітаюцца з гасцямі. Нехта за дзвярыма жаласліва цяўкае, скрабецца.*

**Музычны кіраўнік:** Дзеці, хто гэта там за дзвярыма? Ці мне здалося? *(Усе прыслухоўваюцца.)* Зараз я пайду ды пагляджу. *(Музычны кіраўнік выходзіць з залы, а потым зноў уваходзіць, але ўжо з сабакам, які жаласліва, з падвываннем цяўкае.)* Дзеці, хто гэта прыйшоў да нас?

**Дзеці:** Прыгожанькае шчанятка! Яго клічуць Чапа.

**Музычны кіраўнік:** Але ж паглядзіце, які ў яго знешні выгляд. Стужка развязана, сам ён запэцканы, брудны. Вушы апушчаныя. Давайце, дзеці, спытаем у шчаняткі, адкуль яно.

**Дзеці:** Шчанятка, ты адкуль прыйшло? Дзе і ў каго ты было?

*Шчанятка нешта кажа на вуха музычнаму кіраўніку.*

**Музычны кіраўнік** *(здзіўлена, незадаволена):* Ай-яй-яй! *(Дзецям.)* Дзеці, а вы ведаеце, адкуль прыйшло шчанятка?

**Дзеці:** Не, не ведаем!

**Музычны кіраўнік:** Шчанятка кажа, што яно ўцякло ад хлопчыка. Хлопчыкава імя сабачка ажно баішца вымавіць. Гэта хлопчык, які не глядзіць сваіх цацак, і ўсе цацкі згаварыліся і ўцяклі ад яго.

**Дзеці:** Ой! Ай-яй-яй!

**Музычны кіраўнік:** Дзеці, можа, з вас хто ведае таго хлопчыка?

**Дзеці:** Не! Не ведаем!

**Музычны кіраўнік:** А памятаеце, мы з вамі вучылі верш «Раскідач». Я вам прыгадаю, ці хто-небудзь з вас хоча расказаць нам?

*Дзеці чытаюць верш Рыгора Барадуліна «Раскідач».*

А да Ланы — хоць ты плач! —
Часта ходзіць Раскідач.
Нежаданы гэты госць
Раскідае ўсё як ёсць.
На падлозе мішкі, кніжкі.
На падлозе міскі, лыжкі.
Небарачка-качка крача.
Пад канапу скача мячык.
І злятае са стала
Бедны певень без крыла.
Давядзецца выгнаць з хаты
Шкоднага Раскідача,
Каб на радасць мамы, таты
Мчаўся ён наўцекача!

**Музычны кіраўнік:** Во якія бываюць яшчэ дзеці. А сярод нас такіх няма?

**Дзеці:** Не, няма!

**Музычны кіраўнік:** Дзеці, а дзе ж наш Чапа? *(Усе шукаюць яго, знаходзяць за спінай у музычнага кіраўніка.)* Не палохайся, Чапа, мы цябе нікому не аддадзім. Мы зараз табе завяжам стужку, абагрэем, супакоім. *(Завязваюць шчанятку стужку, лашчаць яго, даюць малака з аладкай.)*

**Музычны кіраўнік:** А каб зусім ты супакоіўся, павесялеў, мы зараз дадзім табе паслухаць беларускую народную мелодыю «Янка».

*Усе дзеці і Чапа садзяцца на крэсліцы. Выконваецца беларуская народная мелодыя «Янка» на цымбалах.*

**Музычны кіраўнік:** Дзеці, а вы ведаеце, чаму гэты музычны твор названы «Янка»? І хто такі Янка? Што гэта за хлопчык?

**Дзеці:** Не, не ведаем!

**Музычны кіраўнік:** Янка быў вясёлы хлопчык. Ён часта іграў на розных музычных інструментах. Ніхто на яго не глядзіць, а ён іграе, пускаецца ў скокі. А цяпер я яшчэ раз заіграю «Янку», а вы скажыце, якая гэта музыка? Вясёлая ці сумная? Хуткая ці павольная? Каму захочацца пусціцца ў скокі — калі ласка. Каму захочацца папляскаць у ладкі — калі ласка. *(Дзеці пляскаюць у ладкі, скачуць, тое самае робіць шчаня.)* Ну, што, Чапа, добра табе ў нас?

**Шчаня:** Цяў, цяў, цяў!

**Музычны кіраўнік:** А нашы дзеці ведаюць пра цябе песню *(выконвае музычны ўступ да песні «Цяў-цяў» С. Альхімовіч)*. Скажыце, калі ласка, якая гэта песня — жвавая ці павольная? А як яна называецца?

**Дзеці:** «Цяў-цяў!»

**Музычны кіраўнік:** Ну дык слухай, Чапа. Дзеці праспяваюць пра цябе песню.

*Выконваецца песня.*

На двары за градкай
Мы знайшлі шчанятка.
З намі яно вітаецца,
Брэхам заліваецца:
«Цяў-цяў-цяў!»

Мы прынеслі з Наткай
Малачко з аладкай.
З'еў усё сабака
І сказаў нам: «Дзякуй!
Цяў-цяў-цяў!»

**Музычны кіраўнік:** Ты хочаш нешта сказаць мне, Чапа? Кажы! *(Слухае шчаня, якое шэпча нешта на вуха.)* Дзеці, а вы ведаеце, што вам сказаў сабака?

**Дзеці:** Не!

**Музычны кіраўнік:** Чапа сказаў, што яму вельмі добра ў нас і весела, і ён хоча падараваць вам чароўны яблык. Вось ён! *(Бярэ яблык і перадае яго дзяўчынцы Радусе.)* Вазьмі, Радуся, гэты яблычак і праспявай пра яго песеньку.

*Выходзіць дзяўчынка Радуся на сярэдзіну залы. У яе руцэ яблык. Яна выконвае песню «Яблычак крамяны» (сл. М. Пазнанскай, муз. С. Альхімовіч).*

Я крамяны круглячок,
У мяне блішчыць бачок,
Яблычак, глядзі ты,
Смачны, сакавіты!

Саладзей мой сок за мёд,
Сам табе прашуся ў рот.
Яблычак, глядзі ты,
Смачны, сакавіты!

Хто галінку скалане,
Скіне з дрэва той мяне.
Яблычак, глядзі ты,
Смачны, сакавіты!

**Музычны кіраўнік:** А зараз кінь, Радуся, гэты яблычак, і мы пабачым, куды ён нас прывядзе: ён жа чароўны. *(Брэх шчаняці.)* Дзеці, Чапа кажа, што гэты яблычак нам пакажа, дзе знаходзіцца куфэрак, у якім схаваны цацкі, што ўцяклі ад тых хлопчыкаў і дзяўчынак, якія не шкадавалі іх. Дык пойдзем шукаць гэтыя цацкі?

**Усе:** Так! Пойдзем!

*Радуся кідае яблычак, ён коціцца да хаткі, у якой стаіць куфэрак. Дзеці падыходзяць да хаткі, выцягваюць з яе куфэрак і чуюць голас: «Каб цацку атрымаць, трэба загадку адгадаць» (або: «Хочаш цацку — адгадай загадку»).*

**Музычны кіраўнік:** Ну што, дзеці, будзем ратаваць цацкі?

**Усе:** Так! Будзем!

**Выхавальнік** *(уваходзіць у залу, пытаецца):* Што вы тут цікавае робіце? Я, мабыць, прыйшла ў самы цікавы момант?

**Музычны кіраўнік:** Мы будзем адгадваць загадкі, каб выратаваць цацкі, якія знаходзяцца ў куфэрку.

**Выхавальнік:** Ой! Я вельмі люблю загадваць і адгадваць загадкі.

*Музычны кіраўнік і выхавальнік па чарзе загадваюць дзецям загадкі.*

**Музычны кіраўнік:** Сядайце, дзеткі, падрыхтуйцеся адгадваць загадкі.

Носікі вусатыя,
Спінкі паласатыя,
Хвосцікі пушыстыя,
Лапкі кіпцюрыстыя.

**Выхавальнік:** Даўгавухі і касы,
Скача без аглядкі
Ад ваўка і ад лісы.
Хто знайшоў адгадку?

**Музычны кіраўнік:** Не кравец, а ўсё жыццё з іголкамі ходзіць.

**Выхавальнік:** Усіх буджу, хоць без гадзінніка хаджу.

**Выхавальнік:** А ў нас дзеці ведаюць вершы пра ўсіх гэтых звяркоў. Давайце прадэкламуем іх.

*Дзеці чытаюць вершы на фоне музычнага суправаджэння.*

## Вожык

Вожык, мой вожык,
Як цябе люблю я!
З лісцяў добры ложак
Мякка пасцялю.

Толькі ж я не маю
Для майго клубка
А ні цукру з чаем,
А ні малака. *Эдзі Агняцвет*

## Пеўнік

Пеўнік будзіць кожны дзень,
Ён у шортах да калень.
Я сябрую з ім даўно.
Знае, дзе маё акно.

Хто чужы — адразу ў стойку! —
Гарачыцца, лезе ў бойку.
Як прыпусціцца дарожкай,
Дык ажно мільгаюць ножкі. *Гаўрыіл Шутэнка*

## Каток

У мяне ёсць жвавы
Шэранькі каток,
Жэўжык, непаседа
Вечна скок ды скок!

Хвосцікам паводзіць,
Гнецца у дугу,
Трэцца шэрым бокам
Аб маю нагу. *Алесь Жаўрук*

**Музычны кіраўнік:** Яшчэ адна загадка вам:

Не дом, а з акенцамі,
Не птушка, а з крыламі.
Высока-высока лятае,
На роднае поле сядае.

**Выхавальнік:** А цяпер я загадаю:

Што за гаспадынька
Ходзіць каля гаю,
Залатую футру
Па зямлі цягае?

**Музычны кіраўнік:** Усе загадкі адгадалі, так што нам куфэрак павінен адчыніцца *(бярэ ключ і адчыняе куфэрак).* Гляньце: тут і заяц, тут і вожык, певень, ліса, самалёт. Пасадзім іх на дыван і хай у нас адпачываюць. *(Дастае цацкі і перадае іх выхавальніку, які размяшчае іх на дыване, падлозе ці канапе.)* Дзеці, а каб нашым сябрам не было сумна, давайце з вамі сыграем што-небудзь вясёлае на цымбалах.

*Мяўкае кот. Дзеці выконваюць беларускую народную мелодыю «Мяўкае кот».*

**Музычны кіраўнік:** Вы чуеце, дзеці, госць-коцік ад усіх кажа нам дзякуй. Ён хоча падараваць нам цацкі-вярцёлкі. Давайце яму скажам дзякуй!

**Усе:** Дзякуй!

*Гучыць музыка да танца «Вярцёлкі». Дзеці пускаюцца ў скокі.*

**Музычны кіраўнік:** Дзеці, нешта нашы цацкі засумавалі. Давайце пагуляем з імі ў жмуркі.

*Дзеці разбіраюць цацкі і гуляюць у жмуркі. Пасля гульні ўсе дзеці садзяцца на крэсліцы.*

**Музычны кіраўнік:** Вось і закончыўся наш занятак. І я хачу ў вас спытаць: ці будзем мы шанаваць свае цацкі, ці будзем мы іх берагчы?

*Дзеці адказваюць.*

**Музычны кіраўнік:** Бярыце свае цацкі і ідзіце гуляць з імі ў групу. Да сустрэчы.

## Музычная палічка

(Музычны занятак)

Дзеці, вы ведаеце, што гэта за ключык? Гэта ключык ад музычнай палічкі, дзе жывуць музычныя інструменты. Кожны з інструментаў мае сваю хатку. Давайце адчынім чароўную палічку і паглядзім, хто там жыве. Раз, два, тры. Адчыняю. Там на першай палічцы жыве ўсім вам вядомы — бубен.

Эй, грымяць званочкі-бомы,
Перасмешкі, пераклік.
Бубен, бубен, ты вядомы
Весялун і жартаўнік!

Так, бубен найлепшы інструмент для адбівання рытмікі. А што такое рытміка? Каб вы разумелі гэта слова, я вам пакажу на прыкладзе. *(Грукае ў бубен якую-небудзь фразу музычнага твора.)*

Бубен — гэта інструмент усіх народаў свету. Былі музыкі на Беларусі, якія спявалі народныя песні і гралі на бубне. Часам яны дазвалялі сабе жарты — стукалі бубнам па галаве (сваёй або суседа, які сядзеў побач), білі па скуры бубна сваім носам, падбародкам, локцямі, каленямі і г. д. Вось так яны рабілі *(паказвае)*. Абысціся без яго ніяк нельга і нам з вамі. Давайце зараз пагуляем з вамі ў гульню з бубнам. *(Праводзіцца гульня з бубнам.)*

А хто жыве на другой палічцы? На другой палічцы жыве дудка.

Хлопчык сцежкаю ідзе
Ды іграе на дудзе,
Дзесяць дзірачак у ёй,
А у кожнай голас свой.

Вось якая цікавая дудка — дудка-дуда беларуская!

Простыя дудкі любяць у народзе. Яны лёгка вырабляюцца з дрэва. Дудкі бываюць рознай велічыні. Нярэдка беларускія народныя музыканты бяруць дзве дудкі ў вусны і іграюць на іх адначасова. Вось так *(паказвае)*. А зараз давайце паслухаем верш пра дудку.

Былі ў бацькі тры сыны,
Ды ўсе яны Васілі.
Адзін коні пасе,
Другі лапці пляце.
Трэці сядзіць на камені,
Дзержыць дуду на рамені.

Ах ты, дудка мая,
Весялуха мая,
Весяліла ты мяне
На чужой старане!
Ух — я!

А цяпер праспяваем песню.

### Дудка

Словы народныя

Я іграў на дудцы,
Седзячы на будцы.
Ту-лю-лю, ту-лю-лю
Седзячы на будцы.

Грае мая дудка.
Пяе весялушка.
Ту-лю-лю, ту-лю-лю,
Пяе весялушка.

Як іграла дудка,
Прыскакаў тут Юрка.
Ту-лю-лю, ту-лю-лю,
Прыскакаў тут Юрка.

А за Юркам Янка,
А за Янкам Ванька.
Ту-лю-лю, ту-лю-лю,
А за Янкам Ванька.

А на трэцяй палічцы мы бачым скрыпку, якая прыйшла да нас з Захаду. На Беларусі людзі вельмі любілі і любяць скрыпку.

Скрыпка пявучая ёсць у мяне,
Ёсць таямніцы — у кожнай струне.

Гэта праўда, кожная струна па-свойму плача, спявае. (Кранае кожную струну скрыпкі.) Дзеці, а колькі струн мае скрыпка? (Адказ.) А можа, хто вучыцца іграць на ёй? (Адказ.) Давайце зараз паслухаем, як гучыць скрыпачка. (Музычны кіраўнік (дзіця) іграе на скрыпцы, або ў грамзапісе гучыць музычны твор у выкананні скрыпача.)

А вось і чацвёртая палічка. На ёй знаходзіцца гармонік. Ён прыйшоў у Беларусь з Расіі. У беларускай вёсцы пад гукі гармоніка весяліцца моладзь. Давайце і мы з вамі

паскачам пад гукі гармоніка «Беларускую-танцавальную» (сл. Э. Багуслаўскай).

Танцавалі мы гапак,
Танцавалі рускую.
Паглядзіце зараз, як
Скачам беларускую.

Прыпеў. Туп, Туп, чаравік,
Не ляніся!
Туды, сюды, чаравік,
Павярніся!

Дзяўчынка, Надзейка,
Выхадзі на круг хутчэй-ка,
Патанцуй-ка на памосце,
Будуць рады нашы госці.

Прыпеў.

На Палессі стук ды звон —
Гэта грае наш Лявон.
З Юрачкам да нас ідзе,
Мікіту з сабой вядзе.

Прыпеў.

Ўсіх сабралі! Ну, давайце
Дружна танцы пачынайце!
Трэба ўсім на свеце знаць,
Як мы ўмеем танцаваць.

Прыпеў.

На пятай палічцы жывуць цымбалы. На Беларусі яны з'явіліся даўно, іх вельмі любяць нашы людзі. На іх іграюць народныя песні, танцы, класічную музыку. Давайце паслухаем у выкананні нашых дзяўчынак беларускую народную мелодыю «Крыжачок». *(Дзяўчынкі іграюць на цымбалах.)*

Скрыпка, цымбалы, дудка, гармонік ствараюць народны беларускі аркестр, які можна паслухаць на беларускіх святах, канцэртах.

Музыка гучыць і ў нашай мове, у нашым слове. Каб не было музыкі, не было б у нас і песні, не было б і танцаў. Сумна было б жыць на свеце. Ці праўду я кажу? Якія мы з вамі ведаем танцы? Полька, вальс, танга, факстрот, ламбада.

А цяпер давайце прыгадаем, якія беларускія народныя танцы мы ведаем. Гэта «Крыжачок», «Полька-Янка», «Бульба», «Мяцеліца», «Чабаток», «Мікіта», «Лявоніха».

ВосЬ і патанцуем, пасляваем «Лявоніху». *(Дзеці выконваюць танец.)*

**У звярынцы**

(Паводле верша Паўла Марціновіча)

Дзеючыя асобы: 1-ы даглядчык звяроў, 2-і даглядчык звяроў, вярблюд. Дзеці: Зося, Рыгорка, Яўген.

*На сцэне расстаўлены цацкі звяркоў або іх малюнкі. Сярод звяроў ходзяць работнікі звярынца, даглядаюць жывёл, а пасля запрашаюць у звярынец дзяцей.*

**1-ы даглядчык звяроў:**

Паспяшайся ў наш звярынец!
Не чакай, пакуль зачыняць.

**2-і даглядчык звяроў:**

Наш звярынец — перасоўны
Заўтра ён — не там, дзе сёння!

*Дзеці падыходзяць да звярынца.*

**Зося:**

Пойдзем разам, пагамонім
І палашчым ўсіх звяроў.
Ад удаваў да ільвоў.

**Усе:** Пойдзем!

*Дзеці падыходзяць да бегемота, які спіць.*

**Рыгорка:**

Глядзі: страшэнная дрымота
апанавала бегемота.

**Яўген:**

Таўшчэзнага гі-па-па-та-ма
(Завецца гэтак ён таксама.)

**Зося** *(лашчыць бегемота, кладзе яму падушачку):*

Паспаць заўсёды ён гатовы,
Таму і важыць аж тры тоны.

**Рыгорка** *(падыходзіць да ўдава, нахіляецца над ім):*

У клубок скруціўся ўдаў,
Але я яго пазнаў.

**Зося** *(усміхнуўшыся):*

Гэта ж ім, дастаўшы з клеткі,
Дворнік палівае кветкі.

*Усе рагочуць. Зося кладзе каля ўдава кветкі. Усміхаецца.*

Вось якія вырастаюць,
Калі кветкі паліваюць.

**Яўген:**

Пойдзем мы усе далей
Паглядзім на рысь хутчэй.

*Усе накіроўваюцца да рысі.*

**Рыгорка** *(дакранаецца да рысі):*

Хто б, скажы, не ганарыўся
Мяккім футрам, што на рысі?

**Зося** *(весела):*

Да вушэй — як бы прышыты
Два кутасікі для шыку.
Вось табе прынесла, дружа,
Карабок ружовых стужак.

*Завязвае рысі стужку на вушка.*

**Яўген** *(падыходзіць да маржа):*

А вось тут сядзіць сам морж.
Іклы вострыя, як нож *(кладзе перад ім рыбку).*
Кожны гэтакі ікол —
Лёд прашыў, як ледакол!

**Рыгорка** *(гладзіць ільва):*

Закасмацеў дужа леў
І пастрыгчыся хацеў,
У цырульню скокнуў леў —
Ледзь цырульнік не самлеў.
Стрымгалоў уцёк цырульнік.
Леў — касматым шпацыруе.

**Зося:**

Не хадзі касматы леў!
Ты пастрыгчыся хацеў!
Дай цябе я прычашу
І люстэрка паднясу.

*Расчэсвае льва, падносіць яму люстэрка, а потым усе гэтыя рэчы аддае льву.*

**Яўген** *(аглядвае кенгуру і кенгуранятка, якое знаходзіцца ў сумцы мамы-кенгуру):*

Кенгуру заўсёды так:
Носіць спераду рукзак.

*Гладзіць кенгуранятка.*

Бо згубіць кенгуранятка
Больш за ўсё баіцца матка.

*Глядзіць на маленькае кенгуранятка з любасцю.*

Ты хутчэй падрастай
З сумкі мамчынай ўцякай.

*Ставіць кенгуранятку бутэлечку з малачком.*

**Рыгорка** *(падыходзіць да зебры):*

Холад зебру не пужае:
Круглы год яна ў піжаме.
Усе зайздросцяць зебранятку
І частуюць папарадку.

*Частуюць зебранятка травой.*

**Рыгорка:**

Паглядзіце, добры люд!
Ну й смяхоцішча-вярблюд!

**Яўген:**

Раптам — дзіва! Раптам цуд!
Гаварыць пачаў вярблюд!

**Вярблюд:**

Не такі ўжо я няўклюда.
Век хаджу я па пустэльні,
Па гарачай, як патэльня.
Я — выгод не патрабую,
Ем расліну я любую.
П'ю салёную ваду,
Калі іншай не знайду.
І вязуць на мне, вярблюдзе,
Сто мяхоў заўсёды людзі.

*Дзеці аглядаюць вярблюда, пахлопваюць яго па гарбу.*

**1-ы даглядчык звяроў:**

Колькі шуму, весялосці!
Па звярынцы ходзяць госці.

**2-і даглядчык звяроў:**

Госці — добра. Только мо
Час ісці гасцям дамоў?

**Зося:**

Так, дамоў ісці пара,
Ўся збірайся дзетвара!

**Рыгорка:**

Зачыняйце ўсе вароты.
Каб не збеглі бегемоты.

**Яўген:**

І удавы, і маржы,
І вярблюды, і ўсе львы.

**Зося:**

Час прыйшоў нам развітацца
І да хаты ўсім вяртацца.

**Усе** *(адыходзячы):* Да пабачэння! *(Махаюць рукамі звярам.)*

## МЫ РЫХТУЕМСЯ ДА СВЯТА

### Куды дзеўся Дзед Мароз?

Дзеючыя асобы: вядучы, дзеці: Ясь, Хрысціна, Васіль; Баба Яга, вожык, мыш, Дзед Мароз.

**Вядучы:** Дзеці, нешта Дзядуля Мароз спазняецца. Давайце пойдзем яго сустракаць!

*Дзеці апранаюцца. Пад музыку П. Падкавырава яны імітуюць катанне на лыжах, пасля заканчэння музычнага ўступу спяваюць песню «На лыжах» (сл. П. Пранузы).*

Толькі выпаў першы снег —
Мы на лыжы сталі.
Звонкі гоман наш і смех
Абуджае далі.

Мы ляцім з крутой гары,
Ўслед шумяць бярозы.
Не пужаюць нас вятры
Халады, марозы.

*Дзеці накіроўваюцца ў лес, дзе сустракаюцца з Бабай Ягой, якая сядзіць на пні, насунуўшы на сябе кажух.*

**Васіль:** Можа, гэта Дзед Мароз?

*Дзеці ідуць да пня і прыпыняюцца, бо Баба Яга ўстае і пачынае гучна ўдыхаць паветра, быццам чуе кагосьці побач.*

**Баба Яга** *(аглядаецца):* Нікога няма! Здалося *(садзіцца на пень і вяжа панчоху).*

**Ясь:** Хто гэта?

**Хрысціна:** Няўжо мы трапілі да Бабы Ягі?

*Баба Яга падымаецца, бярэ мятлу, глядзіць у бінокль. Дзеці ўцякаюць.*

**Баба Яга:** Чалавечым духам пахне. Але я сёння добрая і нікога не ем. Ні мам, ні тат, ні бабуль, ні дзядуль — нікога! Таму што сёння навагодняе свята!

*Баба Яга здымае кажух і красуецца перад люстэркам. Дзеці, пачуўшы яе словы, смела набліжаюцца да Бабы Ягі.*

**Хрысціна:** Добры дзень, бабуля, бабулечка Яга *(працягвае ёй яловую галінку).* Сядай, калі ласка.

*Баба Яга садзіцца на пень.*

**Васіль** *(паказвае на яе нагу):* Кволая, балючая, рыпучая нага!

**Ясь:** Як ты пажываеш, лясная сіраціна? *(Гладзіць Бабу Ягу.)*

**Хрысціна:** Як ты ў беднай хатцы хворая скрыпіш? *(Накідвае на яе плечы хустку.)*

**Вядучы:** І сказала бабка, бабулечка Яга.

**Баба Яга:** Больш мяне не мучае рыпучая нага.

*Паціху падымаецца, але з першага разу ўстаць не можа, ледзь-ледзь перасоўваецца, а потым пачынае рухацца больш жвава і пераходзіць у скокі. Падае на падлогу. Дзеці яе падымаюць.*

**Баба Яга:** Не чапайце мяне, не трэба! Я сама! *(Падымаецца, звяртаецца да дзяцей.)* Сядайце, мае даражэнькія!

**Васіль:** А ў цябе, бабулечка, і сапраўды нага не баліць!

**Баба Яга:** *(кранае сваю нагу):*

Вылечыла гразямі,
Націраннем, мазямі —
Лятала на ўсё лета
На поўдзень, на курорт,
Па авіябілету,
Што даў... *(шукае білет).*

Дзе ж ён? Дзе? Гэта чароўны білет. Па ім можна куды хочаш ляцець.

**Ясь** *(да Хрысціны шэптам):* Можа, гэта білет Дзеда Мароза? У яго ўсё чароўнае!

**Хрысціна:** Ага! А Баба Яга выкрала яго, таму Дзед Мароз і спазняецца да нас на ёлку.

*Баба Яга пачула размову дзяцей.*

**Баба Яга:** Знайшла! Знайшла! Але гэта білет не Дзеда Мароза, а мой *(хавае білет у кішэню).* Спалохалася, што згубіла яго. Ну дык слухайце далей:

Я жыву адменна,
Маю добры дом.
Лясныя слухаць песні
Выходжу на балкон.

**Дзеці** *(разам):* Якія?

*Баба Яга спявае «Калыханку» (сл. А. Вольскага) і зачароўвае ўсіх удзельнікаў спектакля і гледачоў. Дзеці «засынаюць».*

Змрок ляжыць навокал,
Як гушчар лясны.
Да сцямнелых вокнаў
Падыходзяць сны.

Спаць усім належыць
На зыходзе дня.
Недзе ў Белавежы
Дрэмле зубраня.

Між ялін кашлатых
У сваім дупле
Спяць ваверчаняты
У цішы, у цяпле.

І крыклівай сойцы,
Што ў гняздзечку спіць,
Аж да ўсходу сонца
Дзетак не будзіць.

Спяць у лузе краскі, —
Ты чаму не спіш?
Можа, сёння ў казку
Ў сне ты паляціш...

**Баба Яга:** Вой, што я нарабіла? Сёння свята, а ўсе паснулі.

*Бярэ мятлу і дакранаецца да кожнага дзіцяці. Усе адразу прачынаюцца.*

**Дзеці:** Як мы доўга спалі.

**Васіль:** Дык гэта ж Баба Яга нас зачаравала!

**Баба Яга:** Прачынайцеся і слухайце далей:

Жыву, адпачываю
У доглядзе, цяпле.
Даўно ўжо не лятаю
Я верхам на мятле.

Я лятаю на самалёце. Але зараз палячу на мятле.

*Бярэ мятлу, садзіцца на яе і вылятае.*

**Хрысціна:** Можа, Баба Яга зачаравала Дзеда Мароза, як і нас, і ён знаходзіцца ў яе хатцы? Пойдзем пашукаем.

*З'яўляецца Баба Яга. Дзеці падбягаюць да яе.*

**Ясь:** Мілая Бабуся,
Дазволь нашай экскурсіі
Наведаць домік твой.

**Баба Яга:** Заходзьце, калі ласка, ды заставайцеся ў мяне. *(Дзеці ўваходзяць у хату.)* Жывіце са мною, як і я. Толькі ціха, не шуміце! Я зараз вас нечым пачастую *(выходзіць).*

**Ясь:** Давайце шукаць Дзеда Мароза!

*Дзеці шукаюць у хатцы Дзеда Мароза.*

**Хрысціна:** І пад лаўкай няма.

**Васіль:** І за шафай няма.

**Ясь:** Дзе падзеўся Дзед Мароз?

*Уваходзіць Баба Яга з падносам у руках. На падносе кубкі з гарбатай і тры талеркі з падарункамі, якія схаваны пад сурвэткамі.*

**Баба Яга:** Няма, няма ў мяне Дзеда Мароза. Лепш частуйцеся.

*Дзеці п'юць гарбату, потым здымаюць сурвэткі з талерак, на якіх знаходзяць завадныя цацкі. Дзеці іх заводзяць і ставяць на падлогу.*

**Дзеці:** Які цуд! Якая прыгажосць!

**Баба Яга:** Гэта вам навагоднія падарункі.

**Дзеці:** Вялікі дзякуй, бабулечка!

**Хрысціна:** Але нам трэба ісці далей шукаць Дзеда Мароза, бо без яго не пачнецца свята ў дзяцей.

**Ясь:** Можа, ты нам падкажаш, дзе ён?

**Баба Яга:** Добра! Рассуньцеся крыху! *(Баба Яга пачынае круціцца з мятлой вакол сябе. Спыняецца і паказвае дзецям дарогу да Дзеда Мароза.)* Вось там!

**Дзеці:** Дзякуй! Бывай! *(Радасныя выходзяць з хаты.)*

**Васіль:** Як нас прывячала
Бабуля за сталом,
Частавала чаем
З брусьнічным пірагом!

**Хрысціна:** Мы ўсе куткі абтупалі —
Адзін раз і другі —
І не знайшлі ні ступы
І ні качаргі.

**Ясь:** І ні Дзеда Мароза!

**Васіль:** Пайшлі туды, куды нам паказала Бабуля Яга. Бо мы мусім прывесці Дзеда Мароза на свята.

*Гучыць музыка. Дзеці імітуюць катанне на лыжах вакол ёлкі. Выходзіць вожык.*

**Дзеці** *(разам)*: Добры дзень, вожык!

**Вожык:** Пых-пых! Добры дзень! *(Бяжыць далей, шукае мыш.)*

**Хрысціна:**

Вожык-вожык — тупу-туп! *(Тупае нагамі.)*
Увесь іглісты, востры зуб.

**Ясь:**

Вожык-вожык, ты куды?
Ад якой бяжыш бяды? *(Бяжыць за вожыкам.)*

**Васіль:**

Вожык ножкамі туп-туп! *(Тупае нагамі.)*
Вожык вочкамі луп-луп! *(Маргае вачамі.)*

**Ясь:**

Навакол пануе ціш,
Вожык чуе ў лісці мыш.

*Вожык ловіць мыш.*

**Мыш** *(жаласліва):* Пі-пі-пі! Не ешце мяне, я вам нешта пакажу *(паказвае чароўны клубок).* Ён давядзе вас туды, куды вы хочаце дайсці, і знойдзе вам таго, каго вы хочаце знайсці. Толькі скажыце: «Раз, два, тры! Клубок, вядзі!» *(Мыш аддае клубок і знікае.)*

**Дзеці** *(кідаюць клубок):* Раз, два, тры! Да Дзеда Мароза вядзі! *(Ідуць за клубком і вяртаюцца з Дзедам Марозам.)* Ура! Ура! Знайшлі Дзеда Мароза!

## Купалле

Дзеючыя асобы, вядучы, 1-я дзяўчынка, 2-я дзяўчынка, 1-ы хлопец, 2-і хлопец, Купалінка, Купаліш, гаспадынька, чэрці.

*Дзяўчаты сядзяць паўколам і ўюць вяночкі.*

**Вядучы:** Купалле — адно з прыгажэйшых святаў беларускага народа. На Купалле ад паўночы да світання шукаюць папараць-кветку. Яна прыносіць шчасце таму, хто яе знойдзе.

*Вядучы і дзеці спяваюць песню «Купалінка». На сцэну выбягаюць дзве дзяўчынкі.*

**1-я дзяўчынка:** Вой, сёння Купалка, а заўтра Ян. Хадзем, дзяўчынкі, у цвяточкі ды паўём сабе вяночкі.

**2-я дзяўчынка:** На галоўкі надзенем вяночкі ды пойдзем усе разам у таночкі.

*Усе дзеці ўстаюць і водзяць карагод, пасля садзяцца на падлогу, нібыта на палянку. Выбягаюць хлопцы з колам у руцэ.*

**1-ы хлопец:** На Купалле ідзём! Кола нясём!

**2-і хлопец:** Збірайцеся на Купалле! Усе разам на Купалле!

**Вядучы:** Перад тым як на Купалле ісці, трэба загадкі адгадаць. Дзве загадкі загадаю. Хто з вас, дзеткі, адгадае?

**Усе:** Я... я... я...

**Вядучы:** Добра, слухайце! Што без вады плавае? *(Хмара.)* Што нас корміць, а есці не просіць? *(Зямля.)* Загадкі

вы ўмееце адгадваць, можна ісці на Купалле. Але каб на Купалле ісці, трэба Купалінку знайсці. Дзе яна?

**Дзеці:** Вось яна!

*На сярэдзіну залы выходзіць дзяўчынка Купалінка.*

**Вядучы:** А мы нашай Купалінцы загадаем загадачку. Ці ўмее яна адгадваць? Пабачым. Загадвайце дзеці.

**1-ы хлопец:** Што бяжыць без повада?

**Купалінка:** Вада бяжыць без повада.

**2-і хлопец:** Што плача без слёзачак?

**Купалінка:** Скрыпка плача без слёзачак.

**1-я дзяўчынка:** Што гарыць без вогнішча?

**Купалінка:** Зара гарыць без вогнішча.

**Вядучы:** Малайчына, Купалінка, добра адгадваеш загадкі. За гэта табе і вяночак надзенем *(надзявае дзяўчынцы на галаву вянок).*

**Купалінка:** Сёння Купалле, а заўтра Ян.
Зайграй, сонейка, зайграй!
Мы ж цябе, Купалле,
Шанаваць будзем!
Мы ж цябе, Купалле,
Святкаваць будзем!

*Дзеці спяваюць песню.*

Свяці, свяці, сонейка,
Каб нам было цёпленька.
Ай, люлі-люлі,
Люленькі-люлі.

Пад хаткаю седзячы
Ды на неба гледзячы.
Ай люлі-люлі,
Люленькі-люлі.

**Вядучы:** Пайшлі па хатах, грамаду збіраць на Купалле.

*Усе ідуць да хаткі ў кутку залы, стукаюць у дзверы.*

**Усе:** Добры вечар добрым людзям! Клічам мы вас на Купалле. Самі ідзіце ды радню бярыце.

**Гаспадынька:** Дзякуй, госцейкі дарагія! Частуйцеся ды слухайце. Я іграць буду сваю любімую песню *(раздае пачастункі, а потым іграе на цымбалах «Лявоніху»).*

**Вядучы:** Дзякуй, гаспадынька, за тваё пачастункі, за музыку. Пайшлі разам з намі да вогнішча.

*У гэты час два хлопчыкі поясам перакрываюць дарогу дзецям.*

**Дзеці:** Прапусціце нас да вогнішча!

**Хлопцы:** Прапусцім, калі дасце выкуп.

*Дзяўчаты даюць хлопцам цацкі. Хлопцы падымаюць пояс угару, дзяўчаты прабягаюць пад ім і бягуць да вогнішча, пераскокваюць цераз яго.*

**Вядучы:** Ой, рана на Йвана.
Выйшлі дзеўкі на луг, на луг,
Ой, ды сталі ў круг, у круг.
Распалілі касцёр, касцёр.
Ой, ды гулялі да зор, да зор.

*Дзеці скачуць цераз вогнішча.*

**Вядучы:** А зараз паглядзім, хто з хлопчыкаў самы спрытны.

*Гульня з паясамі. Угару падкідваюцца паясы. Хлопчыкі стараюцца злавіць зубамі як мага больш паясоў.*

**Вядучы:** Сёння апоўначы расцвітае кветка папараці. Хто сарве гэту кветку і будзе насіць пры сабе, той будзе шчаслівы. Знайсці яе можа толькі спрытны, смелы чалавек, бо як распускаецца кветка, то падымаецца навальніца, б'е маланка, весяляцца нячысцікі, ведзьма і чэрці. Калі ўбачыш «агністую» кветку і сарвеш яе, то трэба ісці дадому, не аглядваючыся, а калі азірнешся, кветка адразу знікне. Давайце мы пойдзем у лес і пашукаем гэту цудоўную кветку.

*Выходзяць. Уваходзіць хлопчык.*

**Купаліш:** Ці не бачылі вы Купалінку?

**Усе:** Бачылі!

**Купаліш:** Яна прыходзіла да вас?

**Усе:** Так!

**Купаліш:** Дзе ж яна падзелася?

**Усе:** Пайшла папараць-кветку шукаць.

**Купаліш:** Так і я разам з ёю быў! Толькі адбіўся ад яе. Голас яе чую, а падысці не магу. Напэўна, нячысцікі яе не пускаюць. Пайду далей яе шукаць *(адыходзіць убок).*

*З другога боку чэрці цягнуць Купалінку. Танец чарцей. Пасля заканчэння танца ўваходзяць Купаліш і дзеці.*

**Купаліш:** Вось хто нашу Купалінку ўкраў! Дзеці, вяжыце іх!

*Усе ўскакваюць і вяжуць чарцей.*

**Купаліш:** Што з імі рабіць?

**Дзеці:** Прагнаць! Знішчыць!

**Купаліш:** Трэба іх ачысціць!

*Бярэ кветку і ўзмахам ачышчае чарцей, а потым іх выпускае. Чэрці ўцякаюць.*

**Дзеці:** Пайшлі прэч адсюль!

**Купаліш** *(падыходзіць да Купалінкі, бярэ яе за руку)*: Купалінка, ці не знайшла ты ў лесе якое дзіва?

**Купалінка:** А хіба гэта не дзіва? *(Паказвае папараць-кветку і выконвае з ёй танец.)* А гэтыя вянкі я прынесла дзяўчатам. *(Дзяўчынкі разбіраюць вянкі і выконваюць з імі танец.)* А зараз пойдзем варажыць да рэчкі. Калі вяночак паплыве па вадзе — будзе добра, а калі не паплыве, — дрэнна. Пабеглі!

*Усе выбягаюць з песняй «Купалінка». Гледачы спяваюць разам з акцёрамі.*

## Калядкі

*Зала прыбрана па-святочнаму. На сценах малюнкі казы, бусла, мядзведзя, каляднай зоркі, плакаты з тэкстамі: «Прыйшлі Калядкі — бліны ды аладкі!», «Калядныя бліны — ладныя, а пшанічныя — вельмі пышныя».*

*У цэнтры залы — стол, па баках — лаўкі. Развешаны беларускія ручнікі, на покуце — абраз.*

### I дзея

Дзеючыя асобы: вядучы, 1-я дзяўчынка, 2-я дзяўчынка, Каця, Мікіта, Ясік, дзеці-калядоўшчыкі (8 чалавек).

*З розных бакоў адзін за адным выбягаюць чатыры калядоўшчыкі.*

**1-ы:** Каляды, Калядкі.
Везлі бліны, аладкі.
**2-і:** У маляваным вазочку
На вараненькім канёчку.
**3-і:** Бегла Калядка пяшком.
**4-ы:** Пяшком?
**3-і:** Несла піражкі мяшком.
**4-ы:** Мяшком?

*Дзеці разбягаюцца. З'яўляюцца два новыя калядоўшчыкі.*

**5-ы:** Прыехала Каляда звечара.
**6-ы:** Звечара?
**5-ы:** Ды прывезла дудак рэшата.
**6-ы:** Рэшата?
**5-ы:** Ды наставіла на стале.
**6-ы:** На стале?
**5-ы:** А сама села на куце.
**6-ы:** На куце?

*Дзеці выбягаюць. Прыбягаюць адзін за адным яшчэ два чалавекі.*

**7-ы:** А вы, дудачкі, іграйце, іграйце!

**8-ы:** А вы, дзевачкі, гуляйце, гуляйце!

**7-ы:** А вы, хлопчыкі, свісціце, свісціце!

**8-ы:** А вы, бабачкі, скачыце, скачыце!

*Дзеці разбягаюцца. Гучыць беларуская калядная музыка. Выходзіць вядучы.*

**Вядучы:** Каляды — гэта даўняе народнае свята нашых бабуль і дзядуль. Лічылася, як сустрэнеш Каляды, навагодні вечар, такім будзе і ўвесь год. Таму рыхтавалі пад Новы год багатую вячэру, якая называлася «шчодрая куцця». На Каляды вадзілі «казу», каб на полі быў добры ўраджай, «мядзведзя», каб у сям'і ўсе былі здаровыя і багатыя. Спявалі песні — калядкі, шчадроўкі. Сярод калядоўшчыкаў быў і зорканоша, які насіў зорку — сімвал дабра і святла.

*Прыбягаюць дзве дзяўчынкі з розных бакоў. Адна трымае ў руцэ зорку.*

**1-я дзяўчынка:** Калядачкі далёка,
Кілбасачкі высока.

**2-я дзяўчынка:** Калядачкі прыблізіліся —
Кілбасачкі панізіліся.

*Дзяўчынкі разбягаюцца. Прыбягаюць Каця, Мікіта, Ясік, вітаюць прысутных.*

**Каця:** Я дзяўчынка маленькая,
У мяне сукеначка рабенькая.

**Мікіта:** Я хлопчык невялічкі
У мяне новыя чаравічкі.

**Ясік:** І я маленькі хлопчык
Узлез на ўслончык,
У дудачку йграю
Хрыста забаўляю.

*Іграе на дудачцы, потым усе трое кланяюцца, і гавораць разам.*

**Каця, Мікіта, Ясік:** Дарагія госцейкі, на святыя святачкі заўсёды будзьце здаровыя, як рыжыкі баровыя. *(Выходзяць.)*

## II дзея

Дзеючыя асобы: дзед, баба, каза.

*З песняй у залу ўваходзяць баба, дзед і каза.*

**Баба, дзед** *(разам)*: Добры вечар, людзі дарагія! *(Кланяюцца.)*

**Дзед:** Добры вечар таму,
Хто ў гэтым даму. *(Здымае капялюш.)*
**Баба:** Нам не хочацца чакаць —
Загадайце калядаваць. *(Прытупвае нагой.)*
**Дзеці:** Калядуйце!
Калядуйце, людцы,
Калядуйце даражэнькія! *(Кланяюцца.)*
**Каза** *(ганарліва)*: Я каза калядная,
Прыгожая ды ладная.
Я і гора і бяду
Вакол рога абвяду.
**Дзед:** Го-го-го, каза.
Го-го-го, шэрая! *(Гладзіць казу.)*
Ну-ка, козка, павярніся,
Людзям добрым пакажыся!
*Каза скача вакол сябе.*
**Каза:** Бе-бе-бе! Бе-бе-бе!
Пачынаецца гульня.
Збірайся, дзетвара!
*Усе дзеці становяцца вакол казы.*
**Каза:** Я каза-барада.
Ду-ду-ду.
Я пабегла да Міра.
Ду-ду-ду.
Ды купіла коску.
**Дзеці:** А нашто коска?
**Каза:** Сянцо касіць *(паказвае, як косяць сена)*.
**Дзеці:** А нашто сянцо?
**Каза:** Каровак карміць *(паказвае, як кормяць каровак)*.
**Дзеці:** А нашто кароўкі?
**Каза:** Млечка даіць *(паказвае, як дояць каровак)*.
**Дзеці:** А нашто млечка?
**Каза:** Дзяцей карміць *(паказвае на дзяцей)*.
**Дзеці:** А нашто тыя дзеці?
**Каза:** Каб іх лавіць *(ловіць дзяцей)*.
**Дзед** *(лашчыць казу)*: А ў маёй козачкі спрытненькія ножачкі.
**Баба:** Добрая ў нас каза, спрытная, вясёлая.
**Дзед:** А дзе каза рожкі дзела? *(Шукаюць усюды.)*
**Баба:** Дзеці, давайце ўсе разам спытаем у казы, дзе яна рожкі падзела?
*Выконваецца народная песня «Го-го-го, каза». Запеў «Го-го-го, каза, го-го-го, шэрая» паўтараецца перад кожным радком.*

Дзе рожкі дзела? На соль праела.
Лезь, каза, на печ, пакажы чапец.
Лезь, каза, на кут, пакажы хамут.
Лезь, каза, на пол, пакажы хахол.
На полі авёс, вялікі парос.
На полі жыта, нагамі збіта.
А ў тым жыце перапёлачка.
Вывела дзеці, міла глядзеці.
Дзе каза ходзіць, там жыта родзіць.
Дзе каза рогам, там жыта стогам.
Дзе каза нагой, там жыта капой.
Дзе каза хвастом, там жыта кустом.
**Баба:** Ўсе хутчэй сюды бяжыце.
З козкай весела скачыце.

*Дзеці бяруцца за рукі, становяцца ў кола, водзяць карагод і спяваюць. Словы прыпеву суправаджаюцца адпаведнымі рухамі.*

Пакажы, казелінька,
Павітай, казелінька,
Як бабулькі скачуць?
Вось і так,
Так і гэтак,
Так бабулькі скачуць.
Пакажы, казелінька,
Павітай, казелінька,
Як дзядулі скачуць?
Вось і так,
Так і гэтак
Так дзядулі скачуць.
Пакажы, казелінька,
Павітай, казелінька,
Як дзяўчынкі скачуць?
Вось і так,
Так і гэтак.
Так дзяўчынкі скачуць.
Пакажы, казелінька,
Павітай, казелінька,
Як хлопчыкі скачуць?
Вось і так,
Так і гэтак
Так хлопчыкі скачуць?
Пакажы, казелінька,
Павітай, казелінька,
Як наш козлік скача.

Вось так,
Так і гэтак,
Так наш козлік скача.

*У канцы гульні каза падае па падлогу. Баба і дзед бегаюць вакол яе.*

**Баба:** Хутчэй дарыце, нас не барыце!

*Баба, дзед і каза падыходзяць да дзяцей, якія частуюць іх блінамі, падносяць гасцінцы. Дзеючыя асобы застаюцца на свяце.*

## III дзея

Дзеючыя асобы: Аленка, Мак, вядучы.

*У залу ўваходзіць Аленка.*

**Аленка:** А ці дома гаспадары гэтай хаты? *(Абыходзіць хату.)*

**Дзеці:** Дома!

**Аленка:** Добры дзень, сёстры-браточкі! Хочаце паслухаць шчадроўкі! Спяваць ці не?

**Дзеці:** Спявай! Спявай, калі ласка!

*Аленка выконвае песню «Шчодры вечар».*

Шчодры вечар, добры вечар,
Усім людзям на ўвесь вечар.
Ой, ці дома пан гаспадар?
Ой, я знаю, што ён дома.
Вынясь, пане, піражочка,
Хоць малога, ды смачнога.

**Дзеці:** Вынесем піражок, калі з намі паскачаш, пагуляеш.

**Аленка:** Добра! Я скажу лічылку і выберу дзяўчынку: «На зялёным на лужку скача Танечка ў кружку».

*Выходзіць дзяўчынка — Мак. Дзеці становяцца вакол яе, бяруцца за рукі, ходзяць і спяваюць:*

А на гары мак, мак,
На даліне так, так.
А вы, мае маковачкі —
Залатыя галовачкі.
— Ці паспеў мак?

**Мак:** Паехалі араць!

*Запеўка з тым жа пытаннем паўтараецца некалькі разоў, а Мак па чарзе адказвае: «Пасеялі», «Узышоў», «Расцвітае», «Паспеў». Пасля таго як Мак скажа, што ён паспеў, усе дзеці падбягаюць да яго і тармосяць.*

**Аленка:** Вынесіце мне піражочак, хоць маленькі ды смачненькі.

**Дзеці:** Няма!

**Аленка:** Ой, пахадзіце каля печачкі, пашукайце мне перапечачкі.

**Дзеці:** Няма!

**Аленка:** Ой, пахадзіце каля кваскі, пашукайце мне каўбаскі.

**Дзеці:** Няма!

**Вядучы:** Не слухай іх, яны жартуюць. Частуйся, калі ласка! *(Частуе Аленку аладкамі.)*

**Аленка:** Шчасця вам, весялосці! А я пайду ў новыя госці.

## IV дзея

Дзеючыя асобы: цыганка, цыган, конь, вядучы.

*У залу ўваходзяць цыганка і цыган з канём.*

**Цыганка:** Раманэ! Раманэ! *(Б'е ў бубен.)*

**Цыган:** Добры вечар!

**Конь:** І-га-га! *(Скача.)*

**Дзеці:** Добры вечар, людцы добрыя! *(Кланяюцца.)*

**Цыганка** *(звяртаецца да вядучага):* Адкажы мне, чалавеча, ці ісці, ці сесці, ці каўбаскі з'есці?

**Вядучы:** Хто вы і адкуль?

**Цыган:** Раманэ! Раманэ!

**Цыганка:** Ідзём мы ад пана года, што носіць бараду шырокую, сівую, калматую.

**Дзеці:** Куды едзеш, Раманэ?

**Цыган:** Ой вір-вір, бан-бан! На кірман.

**Дзеці:** Што вязеш, Раманэ?

**Цыган:** Каня *(гладзіць каня).*

**Дзеці:** Колькі каштуе?

**Цыган:** Семсот залатовак. Ану, конь, паскачы, як валожынскі бугай.

*Конь скача і ржэ.*

**Конь:** Ой, Каляда! Ой, Калядачкі! Пойдзем мы біць у ладачкі! *(Б'е ў далоні.)* Пойдзем круціцца вясёла! *(Круціцца, скача.)* Усе навокал наўкола! (Скача, а пасля падае.)

**Цыганка:** Што ж рабіць? Што ж рабіць? *(Бегае вакол каня, хапаецца за галаву.)*

**Дзеці:** Трэба нам яго ажывіць! *(Пырскаюць на яго вадой.)*

**Цыган:** Чаму не хоча конь уставаць?

**Дзеці:** Трэба нам яго пачаставаць.

*Даюць каню каляднай каўбаскі. Конь ускаквае.*

**Цыганка:** Каня ажывілі! *(Б'е ў бубен, прытанцоўваючы.)* За гэта я вам паваражу. *(Бярэ саломку.)* Вось саломка. Той, хто выцягне вялікую, як пойдзе ў школу, будзе вучыцца на пяцёркі. А хто выцягне маленькую, будзе атрымліваць чацвёркі. *(Прапануе кожнаму дзіцяці выцягнуць саломку.)*

**Цыган:** А зараз трэба і нам папрасіць пачастунку. *(Звяртаецца да дзяцей.)* Дайце каўбасу, занясу Міхасю.

**Цыганка:** Дайце пышку, занясу Мішку.

**Конь:** Дайце скварку, занясу Міхалку. І-га-га! *(Скача вакол дзяцей.)*

*Дзеці частуюць цыгана, цыганку і каня. Цыган і цыганка выконваюць «Цыганскі танец» і застаюцца на свяце.*

## V дзея

Дзеючыя асобы: вядучы, павадыр, мядзведзь.

*У залу ўваходзіць павадыр, які вядзе мядзведзя.*

**Павадыр:** Добры вечар вам! Ці рады вы нам?

**Вядучы:** Мы вам рады. Ды хто вы такія?

**Павадыр:** Мы з далёкага краю — са Смаргоні, вядзём мядзведзя.

**Мядзведзь:** Ці шырокія сцены тут, каб нам патанцаваць ды добрых людзей назабаўляць?

**Дзеці** *(разводзяць рукі ў бакі):* Шырокія!

**Павадыр:** Тады, Міша, не ляніся, добрым людзям пакланіся! *(Мядзведзь кланяецца на чатыры бакі.)*

Ну, смаргонскі мядзведзь, пакажы, як дзеці ідуць у школу. *(Мядзведзь ідзе, ледзь перастаўляючы ногі.)*

А як дзеці вяртаюцца са школы? *(Мядзведзь хутка перастаўляе ногі.)*

Як дзеці рыхтуюцца да заняткаў? *(Мядзведзь пазяхае, пацягваецца, засынае.)*

А як добрыя дзеці вучацца? *(Мядзведзь старанна піша, высунуўшы язык.)*

Міша, як дзеці ядуць? *(Мядзведзь аблізвае лыжку, выціраецца лапай.)*

А як ядуць акуратныя дзеці? *(Мядзведзь бярэ сурвэтку і есць старанна.)*

**Дзеці:** А як дзеці спяваюць песні? *(Мядзведзь раве.)*

А як дзеці гуляюць у футбол? *(Мядзведзь б'е нагой па мячу, але не цэліць і падае. Дзеці падымаюць мядзведзя. Вядучы яго супакойвае.)*

Як дзеці гуляюць на калядках? *(Мядзведзь скача, куляецца.)*

**Павадыр:** Зноў ты, Міша, не ляніся, добрым людзям пакланіся! *(Мядзведзь робіць паклоны на чатыры бакі.)*

**Павадыр:** Свой спектакль мы паказалі. Вас усіх пазабаўлялі (кланяецца, робіць паўзу, глядзіць на дзяцей, усміхаецца). А дзе ж вашы падарункі: смакалыкі, пачастункі?

*Дзеці падносяць павадыру і мядзведзю пачастункі.*

### VI дзея

Дзеючыя асобы: вядучы, Каця, Ясік.

**Вядучы:** Першы дзень Новага года даўней называўся Васіллем. У гэты дзень існаваў абрад засявання. Людзі хадзілі па хатах і пасыпалі кругом зярнятамі, каб у новым годзе шчодра радзілася ў полі, каб было багата і смачна на стале.

*Хлопчык Ясік і дзяўчынка Каця ходзяць з рэшатам і сеюць жыта.*

**Каця:** Ходзіць Ілля на Васілля,
Носіць пугу жыцяную,
Дзе замахне — там жыта расце,
Дзе не махае — там не бывае.
А ў полі ядром, а ў доме дабром!

**Ясік:** Радзіся, жыта-пшаніца
І ўсякая пашніца!

*Хлопчык і дзяўчынка, пасеяўшы, выходзяць. Гучыць беларуская народная мелодыя.*

***Заўвага:*** Пры падрыхтоўцы святочнага спектакля «Калядкі» можна выкарыстаць як увесь сцэнарый, так і асобныя яго часткі. Пры жаданні выхавальнік можа ўключыць у спектакль наступныя калядныя песні.

Шчадрую, шчадрую,
Каўбаску чую,
Святы вечар
Добрым людзям!
Дайце каўбасу,
Я дамоў панясу.
Дайце другую,
Яшчэ пашчадрую.
Дарыце,
Не бярыце.
Кароткія світкі,
Памерзлі лыткі.

Будзь здароў,
Будзь здароў,
Як рыжок бароў!
Май торбу грошы,
Жыві ў раскошы,
Усяго даволі,
А бяды ніколі.
Стары год канчаем.
Новы пачынаем
З ранняю вясною,
З буйнаю травою,
Жытам каласістым,
Зернем ядраністым,
Урадлівым летам,
Багатым пры гэтым,
І з восенню яснай,
І з долечкай шчаснай!

### ГЭТА ВЕДАЦЬ ТРЭБА ЎСІМ

## Святлафор

(Паводле казкі Рамана Аўраменкі)

Дзеючыя асобы: Чароўны Святлафор, Васілёк, кароль Святлафорыі, віцязь, вартаўнік.

*Дзея адбываецца на скрыжаванні. На сцэне ўмацаваны святлафор, паразвешваны знакі дарожнага руху. Хлопчык з ранцам ідзе дахаты. Раптам перад ім з'яўляецца чароўны Святлафор.*

**Чароўны Святлафор:** Добры дзень, Васілёк!

**Васілёк** *(спалохана)*: Д-добры дзень! Хто вы?

**Чароўны Святлафор:** Не пужайся мяне, Васілёк. Я Святлафор. З таго скрыжавання, праз якое ты кожны дзень ходзіш у школу.

**Васілёк:** Так, я ведаю цябе:

Святлафор на скрыжаванні
Свеціць ноччу, днём і ўранні.
Ўсе глядзяць на святлафор:
Пешаходы і шафёр.

**Чароўны Святлафор:** Так, гэта пра мяне.

**Васілёк** *(здзіўлена)*: А хіба святлафоры могуць гаварыць, як людзі?

**Чароўны Святлафор** *(смяецца)*: Дык я ж не просты святлафор. Я чароўны!

**Васілёк:** Чароўны?

**Чароўны Святлафор:** Так! Я і хадзіць, і гаварыць умею! *(Сумна.)* А вось свяціць я ўжо не магу: сапсаваўся, знасіўся.

**Васілёк:** Як гэта сапсаваўся? Як гэта знасіўся?

**Чароўны Святлафор:** Лямпы мае патухлі... І паможа мне толькі той, хто дасканала ведае правілы дарожнага руху. Вось ты, напрыклад!

**Васілёк:** Я?

**Чароўны Святлафор:** Так, ты. Дык згодзен дапамагчы мне, Васілёк?

**Васілёк:** Згодзен. Толькі, як і чым я магу дапамагчы табе?

**Чароўны Святлафор** *(таямніча)*: Слухай мяне, Васілёк, уважліва. Ёсць на свеце краіна Святлафорыя. У караля гэтай краіны захоўваецца чароўная іскра.

**Васілёк:** Чароўная іскра?

**Чароўны Святлафор:** Так, яна мне якраз і патрэбна. Ты павінен трапіць у гэту краіну.

**Васілёк:** Але як?

**Чароўны Святлафор:** А трапіць туды вельмі проста. Трэба сказаць такія словы. Слухай і запамінай: Ікс... Бікс... Трэкс...

**Васілёк** *(паўтарае кожнае слова следам за чароўным Святлафорам)*: Ікс... Бікс... Трэкс...

**Чароўны Святлафор:** А калі трэба будзе вярнуцца назад, скажаш гэтыя словы ў адваротным парадку.

**Васілёк:** Добра. Я пайду. Да пабачэння! Трэкс, бікс, ікс.

**Чароўны Святлафор:** Да пабачэння! *(Знікае.)*

**Васілёк** *(ціха, таямніча)*: Ікс... Бікс... Трэкс... *(Гучыць музыка.)* Куды гэта я трапіў? *(Азіраецца і сутыкаецца з віцязем. Спалохана адскокваюць адзін ад аднаго.)* Дзе я?

**Віцязь:** У казцы.

**Васілёк:** У казцы?

**Віцязь.** Так, у казцы. У краіне Святлафорыі.

**Васілёк:** А ты хто?

**Віцязь:** Я Віцязь на раздарожжы. Мне ўжо даводзілася неяк ехаць тут шмат гадоў назад. Тады на гэтым месцы ляжаў камень. А на ім быў надпіс: «Направа паедзеш — багаты будзеш, налева паедзеш — жанаты будзеш, проста паедзеш — забіты будзеш». А цяпер замест камня я бачу нейкія незразумелыя знакі і не ведаю, якую дарогу мне выбраць.

**Васілёк:** А куды табе трэба?

**Віцязь** *(сумна)*: Са мной здарылася непрыемная гісторыя. Выкраў маю жонку-прыгажуню Змей Гарыныч. І я іду вызваляць сваю любую Васілісу. А якая дарога вядзе ў царства Змеева — забыўся. Даўно быў тут...

**Васілёк:** Паспрабую табе дапамагчы. Вось бачыш *(паказвае)*: гэты знак з чырвоным шматкутнікам і літарамі «стоп» забараняе ехаць без прыпынку, гэты — з перакрэсленай стрэлкай — не дазваляе ехаць налева. А гэты знак з клічнікам у трохкутніку азначае, што ехаць можна. Толькі трэба быць уважлівым, каб не здарылася бяда.

**Віцязь:** Небяспекі я не баюся! Не ўпершыню мне з ёю сустракацца. Пайду ў гэтым напрамку — пад знак з клічнікам. Можа, нам па дарозе? Дык хадзем разам!

*Хлопчык і Віцязь ідуць разам. На раздарожжы стрэлкі-ўказальнікі. На адной стрэлцы намалявана галава Змея Гарыныча, на другой — святлафор.*

**Васілёк:** Ну, вось мы і прыйшлі. Час развітвацца. Разыходзяцца нашы дарогі. Ты ідзі ў той бок, куды паказвае стрэлка з намаляванай галавой Змея Гарыныча, а я пайду ўбок, дзе намаляваны святлафор, да караля Святлафорыі.

**Віцязь:** Так. Усяго табе добрага, хлопчык!

**Васілёк:** Бывай, адважны віцязь. *(Віцязь і Васілёк абдымаюцца і разыходзяцца. Васілёк пераходзіць дарогу па паласатай дарожцы.)* Пераход для ўсіх свабодны, па дарожцы пешаходнай...

*Раптам яму заступае дарогу каралеўскі вартаўнік.*

**Вартаўнік:** Нельга далей!

**Васілёк** *(настойліва)*: Мне да караля Святлафорыі трэба.

**Вартаўнік:** Навошта?

**Васілёк:** Папрасіць у яго чарадзейную іскру.

**Вартаўнік:** Да караля ты трапіш толькі ў тым выпадку, калі зможаш адгадаць загадку. Згодзен?

**Васілёк:** Так, згодзен! Кажы хутчэй сваю загадку.

**Вартаўнік:** Ён над вуліцай вісіць,
Ён на вуліцу глядзіць.
Як міргне зялёным вокам,
Дык ідзі спакойным крокам.
Як чырвонае святло —
Стой, каб ліха не было.

**Васілёк** *(узрадавана)*: Святлафор!

**Вартаўнік:** Так, малайчына! Праходзь!

**Васілёк** *(падыходзіць)*: Добры дзень, ваша вялікасць!

**Кароль:** Добры дзень! Хто такі будзеш?

**Васілёк:** Я Васілёк.

**Кароль:** А што табе трэба, Васілёк?

**Васілёк:** Я прыйшоў са скрыжавання, дзе знаходзіцца чароўны Святлафор. Ён сапсаваўся: яго лямпы патухлі. Толькі чароўная іскра можа вярнуць яму сілу. Таму я прыйшоў да вас па яе.

**Кароль:** Добра! Калі ты правільна адкажаш на мае пытанні — атрымаеш чароўную іскру, не адкажаш — сам на сябе наракай! Перш-наперш, я хачу ведаць, як ты вывучыў мае святлафорныя законы.

**Васілёк:** Вашы законы ў вашых сігналах. Чырвонае святло — стой, жоўтае — увага, зялёнае — ідзі.

**Кароль:** Правільна! А што гэта за знак *(паказвае знак «пешаходны пераход»)*?

**Васілёк:** Пешаходны пераход.

Толькі там ісці павінен,
Дзе адзначан пераход.
Калі ж ты без дысцыпліны,
Значыць — дрэнны пешаход!

**Кароль:** Так, добра ведаеш знакі! А якія астравы размяшчаюцца на сушы?

**Васілёк:** Астравы бяспекі. Гэта месца пасярэдзіне дарогі, дзе людзі чакаюць, пакуль праедуць машыны.

**Кароль:** Правільна! І апошняе маё пытанне: дзе дазваляецца катацца на веласіпедзе, не трымаючыся за руль? І такіх веласіпедыстаў не толькі не ганяць, а нават пляскаюць ім...

**Васілёк:** У цырку. Там нават на аднаколавым веласіпедзе катаюцца. Я гэта сам бачыў.

**Кароль:** Усё правільна. Варта! *(З'яўляецца вартаўнік.)* Прынясіце хлопчыку іскру. *(Вартаўнік прыносіць і аддае хлопчыку чароўную іскру.)*

**Васілёк:** Дзякуй, ваша вялікасць, і да пабачэння! *(Застаецца адзін на сцэне.)* Ікс... Бікс... Трэкс... *(Чакае, але нічога не адбываецца.)* Забыўся. Трэба ж вымаўляць гэтыя словы ў адваротным парадку. Трэкс!.. Бікс!.. Ікс!.. *(Гучаць таямнічыя гукі, і Вася вяртаецца на скрыжаванне.)* Вось я зноў у сваім любімым горадзе *(прыслухоўваецца)*. Чую знаёмыя гукі. Ды гэта ж мой Чароўны Святлафор *(падыходзіць да яго)*. Зараз я цябе адрамантую *(падносіць чароўную іскру да лямпачак святлафора)*.

**Чароўны Святлафор:** Дзякуй табе, Васілёк! Прымі ад мяне ў падарунак кніжку «Правілы дарожнага руху». Ты добра ведаеш гэтыя правілы і павінен пазнаёміць з імі сваіх маленькіх сяброў, а кніга табе дапаможа ў гэтым. Да пабачэння!

**Васілёк** *(бярэ кнігу)*: Да пабачэння, Чароўны Святлафор!

## Хто даўжэй жыве на свеце?

(Паводле верша Валянціна Лукшы)

Дзеючыя асобы: дзеці, мятлік, мышка, пчала, салавей, сабака, змяя, дэльфін, конь, пугач, лебедзь, чарапаха.

*Хаткі дзеючых асоб намаляваны на аркушах паперы і прымацаваны на спінках крэсельцаў, якія размешчаны ў розных месцах залы. Дзеючыя асобы — жывёлы знаходзяцца каля сваіх хатак. Дзеці — Стасік, Ясік, Кацярынка скачуць, гуляюць у мяч, будуюць з пяску, потым заводзяць спрэчку.*

**Стасік:** Хто даўжэй жыве на свеце?

**Кацярынка:** У каго спытацца?

**Ясік:** Так! Хто даўжэй жыве на свеце? Можа, конь?

**Стасік:** А можа, слон?

**Кацярынка:** У каго спытацца? Дзе?

*Мятлік кружыцца каля дзяцей.*

**Дзеці** *(разам)*: У мятліка! У мятліка! *(Звяртаюцца да мятліка.)* Хто даўжэй жыве на свеце?

**Мятлік** *(маша крыльцамі)*:

Век кароткі мой — гадзіны.
Мышка болей жыць павінна...

*Дзеці ідуць да «норкі» мышкі, грукаюць.*

**Стасік:** Хто даўжэй жыве на свеце?

**Мышка** *(завіхаецца па гаспадарцы)*:

Тры гадочкі — ўвесь мой век.
Можа пчолка больш жыве?

*Дзеці ідуць да «вулля».*

**Ясік:** Хто даўжэй жыве на свеце?

**Пчала** *(трымае слоік мёду)*:

Хто даўжэй — не знаю я.
Лепш спытай у салаўя!..

**Кацярынка** *(разам з хлопчыкамі падыходзіць да салаўя)*: Хто даўжэй жыве на свеце?

**Салавей** *(з музычным інструментам і нотамі)*:

Я пяю
Песню звонкую сваю.
Што яшчэ магу дадаць?
Лепш сабаку распытаць...

**Стасік** *(звяртаецца да сабакі)*: Хто даўжэй жыве на свеце?

**Сабака** *(грызе костку)*:

Дваццаць год мне ўжо мінула,
Як кароткі міг адзін.
Хто даўжэй жыве?
Акула.
А магчыма, і дэльфін..

**Ясік:** Мы не пойдзем
Да акулы,
Каб яшчэ не праглынула...

*Дзеці ідуць да дэльфіна.*

**Дэльфін** *(гуляе з мячом)*:

Трыццаць маю...
Ды, аднак, я...
Лепш спытайцеся ў вужакі.

*Дзеці накіроўваюцца на «балота» да вужакі.*

**Кацярынка:** Хто даўжэй жыве на свеце?

**Змяя** *(выгінаецца і сыкае)*:

Трыццаць тры жыву гады.
А хто больш?
Мо, конь гняды?..

**Стасік** *(разам з дзецьмі падыходзіць да каня)*: Хто даўжэй жыве на свеце?

**Конь** *(іржэ і скача)*:

Мне за пяцьдзесят...
Стары.
Ды пугач,
Што ў гушчары
Лес вартуе,
Той — старэй...

*Дзеці ідуць у «лес», углядаючыся ва ўсе бакі.*

**Ясік:** Го-го-го! Пугач, адгукніся! Хто даўжэй жыве на свеце?

**Пугач** *(вухкае)*:

Семдзесят гадоў жыву...
А старэй хто?
Лебедзь вунь...

**Кацярынка** *(разам з хлопчыкамі падыходзіць да «стаўка» ў парку)*: Лебедзь, хто даўжэй жыве на свеце?

**Лебедзь** *(глядзіцца ў люстэрка)*:

Мне гадоў ужо за сто...
Хто старэй?
І праўда — хто?..
Ці не тая чарапашка,
Што паўзе па сушы цяжка?..

*Дзеці шукаюць чарапаху.*

**Стасік** *(звяртаецца да чарапахі)*: Хто даўжэй жыве на свеце?

**Чарапаха** *(у акулярах чытае газету)*:

Дзвесце год —
Такі мой век...
Ды скажу сур'ёзна я вам:
Самы вечны —
Ча-ла-век,
У сваіх жыве ён справах.
Справу добрую зрабіў —
Памяць добрую здабыў.
І жыве яна
Стагоддзі
У народзе...

**Стасік:** Каб даўжэй пражыць на свеце...
**Ясік:** Працавітым трэба быць.
**Кацярынка:** Справы добрыя рабіць!

## ЗМЕСТ

Слова да выхавальнікаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3
Мы пазнаём свет . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5
Вучымся прыгожа, выразна вымаўляць . . . . . . . . . . . 54
Фізкультхвілінкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 86
Слухаем вершы і гутарым . . . . . . . . . . . . . . . . . 92
Мы адказваем на пытанні . . . . . . . . . . . . . . . . . 116
Забаўлянкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 138
Узбагацім сваю мову . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 154
Дыялогі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 174
Якія будуць адгадкі на гэтыя загадкі? . . . . . . . . . . 182
Мы ўмеем дэкламаваць вершы . . . . . . . . . . . . . . . 196
Прыказкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 219
Гульні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 226
Пачытаем, паслухаем . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 233
Мы гуляем у тэатр . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 271

Вучэбнае выданне

**Марціновіч** Леаніла Сымонаўна
**Юрэвіч** Таццяна Уладзіміраўна
**Іўліева** Ларыса Уладзіміраўна

**СЦЯЖЫНКА**

Загадчык рэдакцыі *А. А. Дзераш.* Рэдактар *В. М. Дударава.* Вокладка мастака *Р. С. Каваленка.* Мастацкі рэдактар *Л. У. Паўленка.* Тэхнічны рэдактар *З. У. Раманкевіч.* Карэктары *С. А. Яновіч, Р. С. Ахрэмчык.*

Здадзена ў набор 17.11.93. Падпісана ў друк 11.03.94. Фармат 84×108 1/32. Папера друк. № 1. Гарнітура літаратурная. Афсетны друк. Умоўн. друк. арк. 16,8. Умоўн. фарба-адбіт. 17,22. Ул.-выд. арк. 16,55. Тыраж 80 000 экз. Заказ 1053.

Выдавецтва «Народная асвета» Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ № 4. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку». 220013, Мінск, пр. Ф. Скарыны, 79.

(1994)

СЦЯЖЫНКА